Віталь Вольскі

# Падарожжа па краіне беларусаў



Віталь Вольскі

# Падарожжа па краіне беларусаў

Нарысы



Мінск
«Мастацкая літаратура»
2006

УДК 821.161.3
ББК 84(4Беи)
В71

*Выпуск выдання ажыццёўлены па заказу*
*і пры фінансавай падтрымцы*
*Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

**ISBN 985-02-0835-X**

© Вольскі В. Ф., 2006
© Афармленне. ВРУП «Мастацкая літаратура», 2006

## *Падарожжа ў нязнанае*

Уявіце, што для нас з вамі казачнымі ўмельцамі сканструяваны цудоўны кілім-самалёт, у салоне якога могуць размясціцца многія тысячы пасажыраў. Самалёт спецыяльна абсталяваны для падарожжаў у мінулыя стагоддзі. Хто ж не згодзіцца на такую экскурсію? Важна толькі, каб гід, экскурсавод, быў здольны даць правільнае, вычарпальнае тлумачэнне ўсяму, што даўно стала далёкай гісторыяй.

Давайце папросім беларускага пісьменніка Віталя Вольскага, каб экскурсаводам быў ён. Мяркуючы па яго кнізе «Падарожжа па краіне беларусаў», Віталь Вольскі сам прыдумаў такі самалёт і сам жа аблятаў на ім адну за адной шмат якія мінулыя эпохі. За Віталя Вольскага, акрамя ўсяго іншага, гавораць яго энцыклапедычныя веды, яго багаты жыццёвы і пісьменніцкі вопыт.

Віталь Вольскі вучыўся, працаваў у розных установах культуры. Менавіта ўдзел у культурнай рэвалюцыі і нарадзіў думку аб спробе пяра, літаратурнай дзейнасці. Спачатку былі літаратуразнаўчыя працы, прысвечаныя фальклору, тэатральныя рэцэнзіі, потым былі напісаны п'есы «Цудоўная дудка», «Несцерка»,— яны зрабіліся класікай беларускай драматургіі. Паглядзіце, якія ў пісьменніка разнастайныя творчыя інтарэсы: яго захапляе

літаратурная спадчына выдатнага майстра слова Эдуарда Самуйлёнка, і Віталь Вольскі прысвячае яму манаграфію. Для студэнцтва ён піша кнігі «Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры эпохі феадалізму», «Нарыс гісторыі беларускай савецкай літаратуры»; адначасова ствараюцца сцэнарыі для кінафільмаў «Белавежская пушча» і «Несцерка», п'еса «Машэка», краязнаўчыя кнігі «Па лясных сцежках», «У лясах над Бярозай», «Месяц за месяцам», «На бабровых азёрах», «Чайкі над Нараччу», «Падарожжа па краіне беларусаў». Дзве кнігі апавядаюць пра краіны Афрыкі.

Цяпер вы згодны, што экскурсавод у нас найлепшы? Застаецца толькі глядзець на панарамы пад самалётам і ўважліва слухаць каментарыі пісьменніка. Гаручага ў машыне хопіць на падарожжа ў самую далёкую мінуўшчыну, бо такія кілімы-самалёты, як вядома, запраўляюцца фантазіяй. Дзіўны краявід разгортваецца там, дзе многія з нас бывалі ў піянерскіх лагерах, ваявалі з фашыстамі, сеялі збажыну, будавалі заводы і фабрыкі. ...Няма ні дарог, ні гарадоў, ні вёсак. Скрозь — балоты, люстры азёр, непраходныя пушчы. Экскурсавод звяраецца з геаграфічнай картай і гаворыць, што мы ляцім уздоўж Бярозы-ракі.

Ажно не верыцца: у вадзе плёхаюцца маманты, праганяюць смагу сланы. Недалёка ад берага хаваецца ў засадзе насарог. Там-сям зямля пакрыта нейкімі норамі, над якімі віецца дымок. Няўжо гэта паселішчы людзей? Так і ёсць, бо вось і яны самі, абы-як захутаныя ў звярыныя шкуры. А зуброў колькі! Іх, бадай, хапіла б на ўсе пушчы цяперашняй Еўропы...

Экскурсавод раіць вярнуцца на некалькі тысячагоддзяў бліжэй да нашага часу і паказвае турыстам тыя ж мясціны. Ужо зніклі апошнія сляды ледавіка. На берагах тае ж Бярозы-ракі з'явіліся ўмацаваныя паселішчы людзей, узброеных лукамі, стрэламі. Прыручаны дзікія коні. Ад вярхоўяў да вусця Прыпяці — густыя лясы,

балоты, пясчаныя выспы, аблюбаваныя для будаўніцтва паселішчаў нашымі продкамі.

Вяртаемся назад яшчэ на некалькі стагоддзяў і ляцім над мясцінай, дзе зліваюцца Няміга і Свіслач. Каб не экскурсавод з яго дакладнымі гістарычнымі даведкамі, то наўрад ці паверыў бы хто-небудзь, што пад крылом самалёта — Мінск, такі гэта невялічкі гарадок, дзе няма нават вуліц.

Самалёт робіць круг над зямлёй беларусаў, і мы у дваццатым стагоддзі, пра якое ўсе мы ведаем значна больш, чым пра далёкую мінуўшчыну.

А хіба нецікава адправіцца на экскурсію па сённяшняй Беларусі? Што ж, для гэтага ёсць і сучасныя зусім не казачныя віды транспарту. Кожны маршрут прыносіць свае радасці.

Кілім-самалёт створаны фантазіяй пісьменніка ў якасці мастацкага прыёму, каб найлепш расказаць нам пра гісторыю беларускай зямлі. Разлічваць на падарожжа ў такой машыне мы, вядома, не можам. Але кожнаму даступна экскурсія па старонках таленавітага нарыса Віталя Вольскага «Падарожжа па краіне беларусаў».

Гэткія ж карысныя і цікавыя будуць падарожжы па старонках краязнаўчых нарысаў «У лясах над Бярозай», «Чайкі над Нараччу», «На сініх азёрах». Лясы над Бярозай — гэта перш за ўсё славуты запаведнік на плошчы ў семдзесят тысяч гектараў. Багністыя, непраходныя балоты і рэчкі, некранутыя лясы запаведніка з'яўляюцца надзейным прытулкам для рэдкіх і каштоўных звяроў, разнастайнага птаства. Ёсць тут шмат ласёў, мядзведзяў, дзікоў, ёсць рысі, касулі, выдры, куніцы, гарнастаі, з незапомных часоў у натуральных умовах жывуць у запаведніку бабры.

У памочнікі сабе пісьменнік бярэ егера Аляшкевіча, і ўдвух яны адказваюць на кожнае пытанне, якое цікавіць экскурсію.

Настойлівасць і нястомнасць экскурсавода проста здзіўляе. Пад праліўным даждом па хісткім насціле

праз балота ідзе пісьменнік следам за лесніком Аўтушкам, каб наведаць бабровую хатку.

У наступны раз Віталь Вольскі высачыў бабра, бачыў, як асцярожны звярок вылез з вады і падсілкаваўся карой маладой асіны, затым заняўся сваім туалетам, паплаваў у канале і знік у зарасніках рагозу. Было гэта ўлетку, калі бабры не займаюцца будаўнічымі работамі. Давялося пісьменніку яшчэ раз прыехаць сюды, каб паглядзець, як рачныя дойліды валяць дрэвы, будуюць хаткі, абжываюць іх. Гаспадар нарыхтоўвае ўсе патрэбныя матэрыялы, гаспадыня дае ім належны лад, абмазвае сцены, як сапраўдная тынкоўшчыца. А тады, не чакаючы спецыяльнага запрашэння, прыходзіць з самымі найлепшымі намерамі выдра. Даволі часта яна застаецца жыць у бабровай хатцы ў якасці кватаранткі. Ніжні паверх застаецца бабрам, верхні займае выдра, і жывуць яны ў згодзе. Падгадаваўшы дзяцей у чужой кватэры ці ў сваёй уласнай нары, выдра кідае абжытае месца і па-цыганску бадзяецца па наваколлі ў пошуках новых выгод. Хто хоць раз бачыў такое, той абавязкова захоча вярнуцца сюды для новых назіранняў. У наступны раз можа пашанцуе, і ты ўгледзіш рэдкую з'яву: на бабровую хатку ўзбіраецца воўк, каб разбурыць яе і паласавацца тлустым мясам гаспадароў. Але дарэмны намаганні драпежніка: ні зубам яго, ні лапам рачная цытадэль не паддаецца.

Услед за пісьменнікам вы, напэўна, захочаце наведаць і ласіную ферму. Калі ласка, работнікі запаведніка пакажуць вам прыручаных ласёў, падзеляцца сваімі планамі.

«Прыручылі ж людзі ў свой час і аленя ў паўночнай тундры, і доўгавалосага яка ў высакагорных раёнах Кіргізіі, і буйвала ў Закаўказзі... Ёсць падставы меркаваць, што і прыручэнне лася, блізкага сваяка аленя, мае ў нашых умовах пэўныя перспектывы».

Хто не ведае звычайнага белага бусла? А да яго чорнага ляснога родзіча, дзікуна, не кожны і дабярэцца праз глухую беларускую тайгу і забалочаныя нізіны, пакрытыя густым хмызняком. Віталь Вольскі дабраўся і расказаў нам і пра зялёнае мора, дзе нават паветра ў прасветах паміж дрэў здаецца зеленаватым, і пра гняздо чорнага бусла на суку старога дуба, і пра самога птаха, ад якога ў сонечны дзень не адарвеш вачэй. Так перапляцаюцца краязнаўства і паэзія, рэальнасць беларускай прыроды і яе мастацкае адлюстраванне ў творчасці пісьменніка-следапыта.

З некаторага часу над Свіслаччу, амаль у самым цэнтры Мінска, каля плошчы Перамогі, пачалі з'яўляцца чайкі. Адкуль яны? Якія ў іх звычкі? Карысныя гэта птушкі ці шкодныя? Пісьменніку параілі: «Вам трэба паехаць на возера Нарач... Калі не на Нарач, то на Мядзель. Нарэшце вы можаце пабываць і на Мястры. Гэта азёры-суседзі». І Віталь Вольскі едзе на паляванне без стрэльбы. Трафей — новая кніга, сама назва якой гаворыць пра яе змест,— «Чайкі над Нараччу». Але ці ж толькі пра чаек расказаў нам аўтар? А крыніцы з серабрыстай сцюдзёнай вадою, якая вясёлымі ручайкамі спяшаецца ў Нарач? А назіранні за палявым лунём, якога людзі паважаюць за яго паляванні на мышэй-палёвак? А паляванне мясцовых людзей на балотнага луня, якога можна і трэба страляць за яго разбойны характар? Чайкі чайкамі, хоць і яны бываюць розныя. Прачытайце нарыс Віталя Вольскага, і вы таксама навучыцеся самастойна адрозніваць: «Вось гэта — звычайная рачная чайка... Гэта — малая чайка, гэта — шызая чайка, а вось гэта — клуша». Адны з'яўляюцца мясцовымі жыхарамі, другія прылятаюць з берагоў Балтыкі.

Суседзі ў белакрылых прыгажунь таксама вартыя ўвагі. Вы не пашкадуеце, калі разам з пісьменнікам будзеце шукаць гняздо сокала-пустальгі. Пакуль дойдзеце, то ўволю нацешыцеся меладычным свістам івалгі,

марзянкай дзятла, пераклічкай берасцянак, журботнымі скаргамі дзікіх лясных галубоў. А вось і пустальга-маці, «прыгожая птушка, лёгкая і зграбная, як і ўсе сокалы». Яна кідае ў гняздо палёўку і ляціць па новую здабычу, а мы тым часам прыглядаемся да сакалянят і не можам не згадзіцца з трапнай характарыстыкай, якую даў ім пісьменнік: «Выраз вачэй у сакаляняці непрыемны, нібы ў старога скнары. Я гляджу на яго і смяюся: вельмі ўжо яно нагадвае нейкага банкіра, ліхвяра з карыкатурнага плаката — і лысая галава з рэдкім белым пухам, і худая маршчыністая шыя, і дзюба, падобная на кручкаваты нос, дапаўняюць знаёмыя шаржыраваныя вобразы фінансавых драпежнікаў капіталістычнага свету. Хіба толькі традыцыйнага цыліндра не хапае для поўнага ўражання». З такой жа мастацкай дасканаласцю выпісаны і партрэты падводных жыхароў Нарачы, ад жорсткага драпежніка-шчупака да мірнага вандроўніка-непаседы вугра.

Куды б ні прыехаў Віталь Вольскі, ён усюды заводзіць шматлікія знаёмствы з такімі ж аматарамі роднай прыроды, якія робяцца яго добрымі сябрамі і актыўнымі памочнікамі. У Бярэзінскім запаведніку яго ведаюць усе леснікі, егеры, на Нарачы ён жаданы госць у рыбакоў, у Белавежскай пушчы любы з навуковых работнікаў ахвотна згодзіцца паказаць пісьменніку сваіх падшэфных зуброў, аленяў, падзяліцца назіраннямі. Пра гэтых людзей у нарысах расказана столькі цікавага, што і чытач пачынае лічыць іх знаёмымі незнаёмцамі, вартымі прапіскі ў сваім удзячным сэрцы. Дзякуючы ім і іх сябру-пісьменніку пазнаём і мы з вамі тое, аб чым Віталь Вольскі з шчырым захапленнем піша: «Які цудоўны свет і якая прыгожая наша краіна!»

*Якаў Герцовіч*

# *Падарожжа па краіне беларусаў*

## *ПАЛЁТ СКРОЗЬ СТАГОДДЗІ*

### ПАВЕТРАНЫЯ ЛАЙНЕРЫ І...
### КІЛІМ-САМАЛЁТ

Які сёння прыгожы дзень!

Неба высокае, блакітнае. Сонца ззяе на ўсю сілу, і асобныя белыя воблачкі нікольки яму не замінаюць. Яркія праменні зіхацяць на металічнай паверхні помніка, што стаіць каля Мінскага аэрапорта, нагадваючы крыло самалёта. Палымнеюць чырвоныя кветкі на газонах. Ля ўвахода на ўзлётнае поле цясніцца стракаты, маляўнічы натоўп. Пасажыры развітваюцца з блізкімі, знаёмымі. Апошнія абдымкі, пацалункі, пажаданні, усмешкі. А ўводдалі, на шэрым цэментаваным полі аэрадрома, чакаюць адпраўкі ў палёт магутныя пасажырскія лайнеры. «АН-10» нагадваюць вялікіх, крыху нязграбных стракоз з чырвонай паласой уздоўж светлага тулава, «ТУ-124» больш падобныя на стралу, якая чакае таго моманту, калі туга напятая цеціва дасць ёй штуршок для імклівага ўзлёту. Побач з гэтымі асілкамі паветранага флоту «ІЛы-14» выглядаюць зусім маленькімі, а «АН-2» здаюцца падобнымі на тыя самалёцікі, што стаяць на паліцах дзіцячых магазінаў разам з іншымі цікавымі цацкамі.

Пачалася пасадка ў самалёт на Сімферопаль. Праз дзве гадзіны і дарослыя курортнікі, і піянеры-артэкаўцы з Мінска апынуцца на крымскай зямлі. Вось ужо і апошні пасажыр паднімаецца па трапе і знікае ў чэраве паветранага карабля... Дзверы шчыльна зачынены,

трап ад'ехаў, і аўтамашына, якая здаецца мурашкай у параўнанні з лайнерам, вядзе «АН-10» на буксіры да ўзлётнай паласы.

Тым часам прызямліўся другі лайнер. Ён прывёз замежных турыстаў, а праз паўгадзіны зноў узнімецца ў паветра, каб узяць курс на Маскву. Пакуль госці знаёмяцца з Мінскім аэрапортам, аўтамашына-цыстэрна запраўляе самалёт гаручым.

Адны самалёты ўзнімаюцца, другія садзяцца. Нязмоўчна гудуць магутныя маторы і турбіны...

І мне ўспамінаецца, з якім захапленнем глядзелі мы на адзін з першых, недасканалых яшчэ самалётаў. Тады самалёт называўся аэрапланам. Ён выглядаў, як этажэрка, змайстраваная з жэрдак, фанеры і парусіны. Слабенькі матор быў адкрыты. Лётчык, якога называлі ў той час авіятарам, ледзь трымаўся на сваім няпэўным, таксама адкрытым сядзенні. На адважнага рызыканта моўчкі і недаверліва паглядаў нешматлікі натоўп.

І раптам адбыўся цуд.

Матор жудасна затарахцеў, недарэчнае збудаванне страсянулася, пакацілася на невялікіх колах, падскочыла і... апынулася ў паветры. Аэраплан узняўся над дрэвам, пераляцеў цераз двухпавярховы дом і зрабіў над нашымі галовамі круг. Мы, хлапчукі, беглі за ім і крычалі: «Ура!..»

Гэта было платнае відовішча. Каб паглядзець, як лятае аэраплан над іпадромам, дзе раней адбываліся толькі конскія скачкі, трэба было купіць білет. І каштаваў ён вялікія па тым часе грошы — пятнаццаць капеек...

Задуманы як цыркавы атракцыён, той публічны палёт аэраплана ператварыўся на нашых вачах у вялікі трыумф, у сапраўдны цуд навукі і тэхнікі. Падумайце, чалавек здолеў адарвацца ад зямлі і лятае ў паветры, не маючы ад прыроды крылаў. Усе прысутныя былі ўзрушаны.

А сёння нікога не здзіўляе, што за некалькі гадзін можна апынуцца на другім кантыненце. Крылаты лай-

нер даставіць вас у любую краіну зямнога шара з найвялікшым камфортам і ўсімі выгодамі, як дэкляруюць агенцтвы аэрафлоту. Магчыма, што ў недалёкім часе падарожжа на суседнія планеты будзе такім жа звычайным, як сёння паездка з Мінска ў Маскву. А куды ж мы паляцім?

Для таго незвычайнага падарожжа, у якое я хачу вас запрасіць, лётных рэйсаў, на жаль, няма. І ўся сучасная, высокаразвітая тэхніка не можа нам дапамагчы апынуцца ў мінулым...

Машыны часу, прыдуманай Уэлсам, у нас з вамі няма. Людзі яе пакуль што не вынайшлі. А нам так хочацца паглядзець, як жылі калісьці нашы продкі, далёкія і блізкія.

На чым жа ляцець у мінулае? Як туды трапіць?.. Ці не звярнуцца нам да старога, выпрабаванага спосабу цудоўных падарожжаў — да кіліма-самалёта? Нашы продкі вельмі любілі лятаць на ім у сваіх казках. Нават і само слова «самалёт» мы ўзялі з такіх казак, каб назваць сучасныя паветраныя машыны. А падарожжа ў мінулае вельмі ж падобна на казку. І тэхніка такога палёту зусім не складаная. Замест гаручага — крыху фантазіі. Вось і ўсё!.. Дапусцім, што ў нас ёсць кілім-самалёт.

Што ж, паляцім?

Паляцім!

Білеты і пасадачныя талоны нас зусім не турбуюць. І багаж таксама. Нашто гэта нам? З сабою мы возьмем толькі геаграфічную карту і гістарычны каляндар, каб не заблытацца ў прасторах часу. У календары адзначаны па датах усе падзеі, якія могуць нас цікавіць. Я буду вашым экскурсаводам. Я вам усё растлумачу. Раскажу і пра тое, што вы не зможаце ўбачыць самі.

Кілім-самалёт пададзены. І дыктар абвяшчае па ўсяму аэрадрому:

— Грамадзяне, якія ляцяць у мінулае! Спяшайцеся! Праз хвіліну адпраўленне!

І вось мы ўжо ляцім.

Ляцім... насустрач мінуламу. Вецер свішча ў вушах. Зоркі над намі і зоркі пад намі.

Гады пралятаюць як мінуты.

Што, занадта хутка?

Але ж нам трэба перш за ўсё дабрацца да найбольш далёкай ад сучасных дзён эпохі. Падарожжа наша вялікае — на тысячы год.

І ляцець павольна, і спыняцца ў кожным стагоддзі мы не зможам.

Хай будуць асноўнымі нашымі прыпынкамі толькі найбольш важныя і цікавыя падзеі ў гісторыі нашага краю.

## КРУГ НАД СТАРАЖЫТНЫМІ ЛЯСАМІ

*Дзіўны пейзаж. Добрыя знаёмыя. Маманты купаюцца ў Бярэзіне. Што ўстрывожыла мамантаў? Хаціна з мамантавых костак*

Кілім-самалёт ідзе на зніжэнне.

Ранішні туман развеяўся, і ўнізе ўсё добра відаць.

Што гэта?

Глядзіце, які дзіўны, незвычайны пейзаж!

Няўжо мы на Беларусі?

Так, гэта Беларусь. Але такая, якой яна была дзесяткі тысяч год назад. І характар мясцовасці пад намі мала нагадвае прывычныя абрысы, знаёмыя нам па сучасных картах.

Але прыгледзьцеся добра.

Далёка ўнізе працягнуліся светлымі стужкамі рэкі.

Вы пазнаеце іх?

Вось Дняпро і Прыпяць, Бярэзіна і Сож. А вось і Нёман, і Заходняя Дзвіна. Яны цякуць у тых жа напрамках, што і цяпер. Дняпро нясе свае воды ў Чорнае мора,

Нёман і Дзвіна ў Балтыйскае. У параўнанні з Дняпром і Прыпяццю гэта яшчэ зусім маладыя рэкі. Але ўсе яны, і старыя, і маладыя, выглядаюць значна шырэй і магутней за цяперашнія.

Рэкі, гэтыя шырокія, блакітныя дарогі, стануць у далейшым асноўнымі сродкамі зносін паміж рознымі плямёнамі і народамі. На берагах гэтых рэк адбудуцца потым вялікія гістарычныя падзеі. Рэкі будуць абвеяны славаю гэтых падзей. Пра іх будуць складаць паданні, спяваць песні. На гэтых берагах вырастуць вялікія і шумныя гарады з заводамі і фабрыкамі, з высокімі мастамі, з бясконцымі лініямі чыгунак і асфальтавых дарог.

Паплывуць па рачных хвалях спачатку толькі чаўны і плыты, потым судны на вёслах і ветразях, з людзьмі і таварамі, а пазней — параходы і цеплаходы. Усё гэта будзе праз тысячы год. А пакуль — спакойна цякуць паўнаводныя рэкі, безыменныя і невядомыя, цякуць між дзікіх і бязлюдных берагоў у нязведаную даль.

Калісьці, да ледавіка, клімат тут быў вельмі цёплы. Прыблізна такі, як цяпер у Афрыцы. Побач з соснамі, ялінамі, бярозамі, дубамі і клёнамі раслі пальмы і фікусы, лаўры і ліяны, нібы ў афрыканскіх джунглях.

Калі клімат змяніўся, трапічныя расліны не вытрымалі пахаладання і паступова зніклі. Ім не хапала цяпла, а сучасныя нашы дрэвы здолелі прыстасавацца да новых, суровых умоў існавання. Яны сталі характэрнымі для прыроды Беларусі. Без іх, таксама як і без хвалістага рэльефу мясцовасці, без лясістых узгоркаў і нізін з палямі і лугамі, шматлікімі рэчкамі, азёрамі і балотамі, немагчыма ўявіць сабе беларускі краявід.

Клімат і расліннасць, якія ўласцівы Беларусі ў сучасныя дні, устанавіліся тут каля дваццаці тысяч год назад.

А што гэта за белыя гурбы дзе-нідзе ў нізінах сярод зялёных узгоркаў? Зямля не так даўно вызвалілася з-пад

апошняга ледавіка, які пакрываў яе тоўстым пластом. Відаць, яшчэ не ўвесь лёд сышоў. Рэшткі яго засталіся асобнымі астраўкамі, як сумёты пасля суровай снежнай зімы. Але і гэтыя асобныя астраўкі з кожным годам змяншаюцца.

У нізінах — неабсяжныя прасторы балот. Святлеюць шматлікія люстры азёр. Не відаць ні дарог, ні гарадоў, ні вёсак, ні статкаў хатняй жывёлы на лугах. Толькі дзікія звяры, ідучы на вадапой, пакінулі сляды на вільготнай зямлі.

Чакайце, а гэта хіба не статак?

Вунь на той палянцы сярод лесу пасуцца нейкія буйныя жывёліны.

Зірніце ўважлівей!

Здаецца, яны крыху падобны на кароў? Толькі ж нейкія калматыя. І колер у іх аднолькавы. Усе цёмнабурыя, каштанавыя.

Спусцімся крыху ніжэй. Трэба ж іх разгледзець як след.

Э, ды гэта ж нашы добрыя знаёмыя! На палянцы пасуцца зубры.

Пазнаяце?

Тут і дарослыя, і маладыя зубры, і падлеткі, і зубрыцы з малымі зубранятамі.

Зусім як у Белавежскай пушчы.

Цяпер вы самі бачыце, што зубры тых далёкіх часоў нічым не адрозніваюцца ад сучасных. Знешні выгляд іх нікольки не змяніўся за некалькі дзесяткаў тысяч год.

Толькі тут зубры не абмежаваны пэўнай тэрыторыяй. У нашы дні яны жывуць пад наглядам чалавека, у запаведніку, куды прыязджаюць паглядзець на іх, як на гістарычную рэдкасць, шматлікія экскурсанты з розных гарадоў і краін...

А ў пасляледавіковы перыяд зуброў усюды вельмі многа. Незлічонымі статкамі блукаюць яны не толькі па Беларусі, але і па ўсёй Еўропе, ад Атлантычнага акіяна і аж да Уральскага хрыбта.

Жывецца ім тут няблага. Раслінны свет багаты. Корму хапае і ў дзікіх першабытных лясах, якімі пакрыта зямля, і на лугах з высокімі травамі. Таму і выглядаюць зубры так добра. Бачыце, якія яны вялізныя, магутныя, сытыя?!

Вось адзін з зуброў ударыў раптам рагамі ў ствол бярозы.

З вяршаліны дрэва з шумам сарваўся спалоханы глушэц і, лопаючы крыламі, праляцеў над статкам. А малады зубр-гарэзнік адступіў для разгону і зноў ударыў, на гэты раз яшчэ імклівей і мацней. Бяроза нібы жаласна застагнала, затрапятала лісцем і пахіснулася.

Астатнія зубры не звяртаюць ніякай увагі на практыкаванні бейбуса. Шумна дыхаючы, яны скубуць траву пад нагамі і павольна пасоўваюцца ў лясны гушчар.

Адзін толькі малады зубр застаўся на палянцы.

Пакінем яго забаўляцца і паляцім далей. Паглядзім, што робіцца на берагах Бярэзіны. Яна ж адсюль зусім недалёка.

За цёмнай сцяною лесу з'явілася серабрыстая паласа вады. Павольна цячэ рака сярод шырокай лугавой поймы.

Людзей мы пакуль усё яшчэ не бачым, але на берагах Бярэзіны кіпіць жыццё.

Як многа тут птушак! І ўсё гэтыя птушкі нам добра знаёмыя. Тут і розныя кулікі, і гусі, і качкі, і кнігаўкі. Вось праляцелі над вадою два белыя лебедзі. А крыху далей апусцілася на балотныя купіны некалькі шэрых жураваў. З хрыплым карканнем лятаюць над водмеллю вароны. Сярод асін і бяроз узвышаюцца над нізкім зялёным берагам бабровыя хаткі. Крыху далей ад вады пасецца на зялёнай лугавіне табун дзікіх коней. Звонка ржуць і гарэзліва гойсаюць па траве жарабяты.

Якія жвавыя і спрытныя гэтыя цёмна-шэрыя коні! Усе яны невялікага росту, прысадзістыя і дужыя, на

кароткіх нагах, з буйной галавой на тоўстай і шырокай шыі, з кароткай і жорсткай грывай, якая тырчыць нібы шчотка. Яны вельмі падобны да таго дзікага каня, які захаваўся да нашых дзён толькі ў далёкіх стэпах Цэнтральнай Азіі і называецца цяпер канём Пржавальскага.

А на тым беразе з'явіліся на ўзвышшы нейкія жывыя цёмныя гурбы. Яны спускаюцца па адхоне ўніз, у пойму Бярэзіны.

Мы падлятаем бліжэй.

Цяпер нам добра відаць, што да ракі спускаецца з узвышша статак мамантаў, вялізных калматых сланоў.

Вы, зразумела, адразу пазналі гэтых карычневых волатаў. Кожны з іх не менш трох з паловаю метраў у вышыню.

Па дарозе да ракі маманты рвуць хобатамі і засоўваюць у рот пучкі густой і высокай травы, абрываюць і пераважоўваюць галінкі лазы, маладых елак, асінак і бярозак.

Каля матак мітусяцца нязграбныя малыя. Яны то адбягаюць убок, то адстаюць, то подбегам даганяюць дарослых.

Вось усе маманты падышлі да ракі і п'юць. Некаторыя з іх увайшлі ў ваду па самае бруха. Яны набіраюць ваду ў хобат і паліваюць сабе гарбатыя спіны. Некаторыя купаюцца. З вады тырчаць толькі галовы з вялікімі і доўгімі, загнутымі ўгару біўнямі. Іншыя цяжка кладуцца ў плыткую ваду каля берага і нерухома ляжаць на пясчаным дне. Калматыя, тоўстыя маманціхі мыюць вадой і шаруюць пяском сваіх малых.

Маманты купаюцца ў Бярэзіне! Хіба не дзіўнае відовішча?

Але гэта яшчэ не ўсё.

З высокага трысця каля затокі выходзіць нейкая цёмная валасатая пачвара і спыняецца на адкрытым месцы. Сонца асвятляе звера, такога ж непрывычнага для нас, як і мамант.

Мы можам яго добра разгледзець. Ён стаіць, нібы сонны, апусціўшы галаву і выставіўшы наперад вялікі і востры рог, закручаны ўгару. З верхняй губы, якая завостраным мыском навісла над ніжняй, капаюць серабрыстыя кроплі вады. Відаць, пачвара толькі што напілася ўволю.

Гэта — насарог.

Але не той насарог, што жыве ў трапічных краінах і якога вы ведаеце па малюнках і апісаннях у кніжках, а яго сваяк, паўночны насарог, які жыве на берагах Бярэзіны і Дняпра, Сожа і Прыпяці, на зямлі, якая вызвалілася ад ледавіка. Наш насарог не баіцца холаду, бо пакрыты густой шэрсцю.

Гэта вельмі небяспечнае стварэнне, нястрымнае ў нападзе, але маманты не звяртаюць на яго ўвагі, і насарог на іх не глядзіць. З мамантам ён жыве ў добрым суседстве. Цёмныя насарогі часта пасвяцца вось так, побач з мамантамі, і ніколі не сварацца з імі.

Маманты пераправіліся цераз раку і выйшлі на другі бераг.

Бярэзіна ў гэтым месцы хоць і шырокая, але не вельмі глыбокая, а маманты добра плаваюць.

Цяпер яны ідуць чарадою па сцежцы, пратаптанай у густым хмызняку. Павольна і цяжка ступаюць магутныя ногі, тоўстыя, як слупы, густа пакрытыя доўгімі валасамі. Пагойдваюцца гнуткія хобаты між вялікіх закручаных біўняў. Варушацца вялізныя валасатыя вушы. Да матак ціснуцца малыя. Тут, сярод лесу, яны нікуды не адыходзяць ад маманціх.

Наперадзе выступае стары мамант. Маленькія вочкі яго пільна аглядаюць наваколле. Раптам велікан спыніўся. Нерухома стаіць ён, як гара. Не адрываючыся, глядзіць наперад.

Спынілася і ўся чарада.

Пярэдні мамант падняў угару хобат, з шумам уцягнуў паветра і затрубіў. Потым адразу падаўся ў бок ад

сцежкі і рушыў, падмінаючы кусты і маленькія дрэўцы, у лес. За ім паслухмяна пасунуўся ўвесь статак. Неўзабаве маманты зніклі ў лясным гушчары.

Што ўстрывожыла мамантаў?

Паляцім над сцежкай далей.

Сцежка даволі шырокая і цвёрдая. Кусты і дрэвы навокал паламаны. Мабыць, даўно ўжо ходзяць па ёй буйныя жывёліны.

Куды ж прывядзе нас гэтая сцежка?

Глядзіце, яма!

Пасярод сцежкі выкапана глыбокая яма. Вакол ляжаць раскіданае сухое галлё і спарахнелыя калоды, яловыя галіны і шышкі, шматкі травы і моху.

Спынім наш кілім. Ён жа можа вісець у паветры нерухома на патрэбнай вышыні, зусім як сучасны верталёт.

На зямлі каля ямы ляжаць усюды косці, і малыя, і вялікія. Усе яны старанна абгрызены, ачышчаны ад мяса, нібы адпаліраваныя.

На дне ямы тырчыць тоўсты завостраны кол, чорны ад засохлай крыві. Ляжаць рэшткі нейкай вялікай тушы.

Што ж тут адбылося? Хто ж гэта ўваліўся ў яму і загінуў, пранцяты калом?

А гэта што? Цяпер усё зразумела.

Яму выкапалі людзі. На зямлі відаць сляды іх босых ног.

Вунь і зламанае кап'ё ляжыць — дрэўка з абчасанага кала, наканечнік з каменя.

Людзі выкапалі яму пасярод сцежкі для таго, каб злавіць буйнога звера — маманта, зубра ці насарога. Зверху яны замаскіравалі яму жэрдкамі, галлём, травою і мохам.

Вось нейкая буйная жывёліна і правалілася ў яму, стала здабычай першабытных паляўнічых.

Людзі разабралі тушу і цяпер, мабыць, кормяцца ёю. Яны прыходзяць сюды, да ямы, і бяруць столькі

мяса, колькі могуць з'есці. Прыходзяць сюды проста як у сталоўку. Пад'ядуць каля ямы і тут жа прылягуць адпачыць у кустах ці пад дрэвам.

Значыць, людзі жывуць недзе паблізу. Яны пяройдуць на другое месца толькі тады, калі звяры зразумеюць небяспеку і пачнуць абыходзіць пастку, як гэта зрабілі маманты.

Тысячы год жылі побач людзі і маманты. Усе баяліся мамантаў — нават мядзведзі. Баяўся маманта і чалавек. Але з цягам часу чалавек развіўся, паразумнеў.

Розум замяніў яму сілу.

Чалавек навучыўся здабываць агонь. З дрэва, каменя і косці ён навучыўся рабіць сабе зброю і абараняцца ёю ад дзікіх звяроў. Ён навучыўся шыць сабе адзенне з футра, будаваць сабе жыллё.

Чалавек перастаў баяцца маманта. Ён пачаў паляваць на маманта, здабываць для сваіх патрэб яго мяса, шэрсць і косці.

Вялізны і магутны паўночны слон стаў для чалавека не толькі жаданай, але і звычайнай здабычай. Цяпер ужо мамант, нягледзячы на ўсю сваю сілу і магутнасць, пачаў баяцца чалавека.

Статак мамантаў, які ішоў нядаўна па сцежцы, таму і збочыў раптам у лес, што пачуў пах людзей і пах крыві забітага імі звера.

Раней мамантаў тут было вельмі многа. Цяпер, калі клімат значна пацяплеў, іх становіцца ўсё менш і менш. Яны перабіраюцца на Поўнач, следам за ледавіком, які адступае ўсё далей і далей. Маманты шукаюць там мясцін, дзе няма людзей. Разам з мамантамі знікаюць пастуова і насарогі.

Хто ведае, можа маманты і здолелі б прыстасавацца да новых умоў, як і шмат якія іншыя звяры, іх сучаснікі. Але паўночныя сланы зрабіліся, на сваю бяду, асноўнай крыніцай існавання чалавека. Гэта, мабыць, і вырашыла іх лёс. На адной стаянцы людзей каменнага

веку вучоныя нашых дзён знайшлі косці каля тысячы мамантаў, забітых першабытнымі паляўнічымі. А хіба мала было такіх стаянак? Знішчэнне мамантаў людзьмі набывае ўсё большыя памеры. Вось калматых волатаў і становіцца менш і менш. Надыдзе час, калі маманты знікнуць назаўсёды не толькі ў гэтай мясцовасці, але і наогул з твару зямлі.

Але што гэта за людзі, якіх баіцца нават і мамант?

Дзе яны?

Бачыце, над дрэвамі ўзнімаецца дымок? Хутчэй туды! Хутчэй па слядах нашых самых далёкіх продкаў!

Сярод дрэў зелянеюць нейкія невысокія грудкі, ці ўзгоркі, вышынёй у два-тры метры. Але ж гэта зусім не грудкі! Гэта нейкія напалову зямлянкі, напалову буданы з галля. Гэта — проста норы, выкапаныя ў зямлі і пакрытыя зверху жэрдкамі, палкамі, яловымі галінамі, мохам і зямлёй. Хатамі такія норы ніяк не назавеш. Але ў іх жывуць людзі.

Замест увахода — круглая дзіра наверсе. Увайсці праз яе немагчыма, можна толькі прапаўзці ў зямлянку, спусціўшыся ўніз па сукатым бервяне, якое служыць замест лесвіцы.

Глядзіце, вунь з той, крайняй, зямлянкі спрытна вылез на жывацце, нібы яшчарка, голы хлапчук. За ім напалову высунулася жанчына, паглядзела навокал і, пераканаўшыся, што хлапчуку нішто не пагражае, знікла зноў у глыбіні цёмнай адтуліны.

Зямлянкі густа зараслі травой і кустамі. Яны нагадваюць хутчэй бабровыя хаткі, чым жыллё чалавека.

У такіх норах і буданах дагістарычны чалавек хаваецца ад дажджу і туманаў, ад суровых вятроў, ад вільготнай восеньскай сцюжы, ад лютага зімняга марозу. Тут ён спіць на падсцілцы з сухіх лісцяў, травы, моху і звярыных шкур. Тут ён адпачывае, гадуе малых. Усё астатняе яго жыццё праходзіць пад адкрытым небам.

У кожнай такой зямлянцы жыве па некалькі вялікіх сем'яў, якія належаць да аднаго роду. Усе жыхары пасёлка — блізкія сваякі. Усё ў іх агульнае. Разам ім лягчэй жыць, лягчэй знаходзіць корм, абараняцца ад небяспекі.

Дарослыя мужчыны ўсе разам палююць на звяроў, здабываюць мяса для ўсяго пасёлка. Жанчыны робяць харчовыя запасы, скрабуць і ачышчаюць шкуры, шыюць з іх адзенне і абутак, разам з дзецьмі збіраюць карэнні і ягады, грыбы і арэхі, падтрымліваюць безупынна агонь у агульным вогнішчы.

Падлеткі прыносяць птушыныя яйкі і розную дробную здабычу, ловяць рыбу, дапамагаюць чым могуць дарослым. Земляробства гэтым людзям яшчэ невядома.

Зямлянкі знаходзяцца недалёка ад ракі. Першабытныя людзі жывуць заўсёды каля вады. У шырокай рачной затоцы жаўцеюць гарлачыкі, зусім такія ж, як і сёння. Па схіле лясістага ўзгорка чырванеюць суніцы. Вакол зямлянак шуміць і хвалюецца зялёнае мора бязмежнага лесу.

Крыху ў баку ад зямлянак мы бачым нейкае дзіўнае збудаванне. Яно адрозніваецца сваім знешнім выглядам ад усіх астатніх чалавечых нор. Гэта ўжо нешта накшталт невялікай хаціны.

Сцены яе складзены з касцей, каменняў і гліны. Замест слупоў выкарыстаны вялікія бярцовыя косці мамантаў.

Перад хацінай з мамантавых костак гарыць вогнішча. Вакол сядзяць людзі. Каля іх ляжаць вялікія кавалкі сырога мяса.

Гэта, мабыць, мяса насарога, бо побач ляжыць яго вялікая галава з рогам. Людзі падпякаюць мяса над агнём і тут жа яго ядуць.

Стройныя і шыракаплечыя, яны і знешнім выглядам, і ростам, і рысамі твару амаль зусім не адрозніваюцца ад сучасных людзей. Толькі апрануты, зразумела,

па-свойму. І адзенне іх цалкам адпавядае ўмовам іх жыцця. На адных мы бачым нешта накшталт безрукаўкі — у воўчай шкуры прарэзаны дзіркі для галавы і рук. У другіх мядзведжыя, воўчыя і конскія шкуры накінуты проста на голыя плечы, як плашчы, а на нагах — штаны, пашытыя таксама са звярыных шкур. Добра вытачаныя пласцінкі з касцей маманта ўпрыгожваюць адзенне. Пласцінкі маюць і прамавугольную, і авальную, і круглую форму. Яны размешчаны вакол каўняра, спускаюцца зверху ўніз па рукавах і, нібы лампасы, па штанах.

Адважнымі і дужымі зрабіла гэтых людзей суровая і безупынная барацьба за існаванне. У іх шырокія грудзі і плечы, мускулістыя рукі. Гэта вельмі моцныя людзі з рашучым і смелым позіркам. Вочы ўважліва паглядаюць з-пад зблытаных над высокім ілбом валасоў. На тварах выраз уласнай годнасці. У мужчын густыя бароды. У жанчын доўгія валасы спускаюцца з галавы ніжэй пояса.

Людзі задаволены.

У іх многа мяса, яго хопіць на некалькі дзён, бо ў яму ўваліўся вялікі насарог. Паляўнічыя разабралі яго і лепшыя часткі тушы прынеслі сюды, да агульнага вялікага вогнішча перад хатай старэйшага ў родзе.

Цяпер можна пад'есці ўволю.

І яны ядуць з асалодаю, у добрым настроі.

Некаторыя ўжо насыціліся і спяць тут жа, на зямлі каля вогнішча. Іншыя пазалазілі ў свае зямлянкі.

На шыях мужчын, жанчын і дзяцей вісяць пацеркі з ракавінак, з зубоў і кіпцюроў мядзведзя, ваўка, лісы. На руках шырокія бранзалеты з біўняў маманта.

Прыемна грэцца каля вогнішча.

Яны ўмеюць здабываць агонь, рабіць сабе прылады і з каменя, і з косці, і з дрэва, ляпіць начынне з гліны. Але ў іх няма яшчэ прыручаных жывёл.

Зусім старых сярод жыхароў пасёлка не відаць. Першабытны чалавек рэдка калі дажывае да пяцідзесяці

год. Занадта цяжкае і небяспечнае жыццё ў гэтых нястомных і знаходлівых людзей.

Увесь час мусяць яны змагацца з суровай прыродай. На кожным кроку падпільноўваюць іх розныя нечаканыя небяспекі. Людзі гінуць заўчасна ад холаду, ад дзікіх звяроў, ад хвароб, ад розных няшчасных выпадкаў.

Да стаянкі набліжаецца некалькі маладых людзей. Глядзіце, якія ў іх дакладныя рухі! Як лёгка і спрытна, амаль бясшумна прасоўваюцца гэтыя хлопцы праз заснікі хмызняку. Часам, абапёршыся з разбегу на кап'ё і адштурхнуўшыся ўсім целам, то той, то другі робіць даволі вялікія скачкі.

Маладыя людзі падышлі да старэйшага і нешта яму сказалі. Той моўчкі кіўнуў галавой. Тады хлопцы паклалі на зямлю свае коп'і з крамянёвымі наканечнікамі і селі каля вогнішча побач з усімі. Відаць, старэйшы пасылаў іх некуды на разведку. Прагна ўзяліся яны цяпер за мяса.

Глядзіце, як ядуць першабытныя людзі.

У адной руцэ яны трымаюць вялікі кавалак мяса, а ў другой — тонкі і востры ашчэпак крэменю. Ухапіўшы мяса зубамі, яны спрытна адразаюць яго каля самых губ. Моцныя зубы рвуць валокны і жылы, пяражоўваюць з хрустам храшчы. З асаблівай асалодай разбіваюць яны каменнямі косці і высмоктваюць мозг. Гэта для іх, мабыць, самы любімы ласунак.

Ці не далучыцца і нам да іх бяседы. Ці не пасядзець разам з імі ля вогнішча?

Але нешта не вельмі гаваркія гэтыя людзі. Моўчкі робяць яны сваю справу. Зрэдку толькі абменьваюцца адрывістымі гукамі, часта карыстаюцца замест слова жэстам.

Не, прызямляцца не варта!

Усё роўна мы не зразумеем адзін аднаго. Занадта далёкія ад нас і думкі, і пачуцці, і разуменні першабытных насельнікаў Беларусі, людзей позняга каменнага веку.

Ды і страва ў іх, мабыць, на наш густ, не вельмі смачная. Мяса насарога — напалову сырое. Яно толькі крыху падгарэла зверху і, зразумела, без солі. Хлеба таксама няма.

Паляцім лепш далей, у часы крыху бліжэйшыя. Бывайце, нашы далёкія, першабытныя продкі!

## КРУГ НАД ЗНАЁМЫМІ РЭКАМІ

*Праз тысячагоддзі. Паселішчы на ўзвышшах. Людзі, якія жывуць на дрыгве. Патомкі Радзіма. Сваякі па крыві*

Не спыняючыся, ляцім мы адразу праз тысячагоддзі. Паглядзім, што робіцца цяпер на той зямлі, якую мы толькі што бачылі.

Тыя ж рэкі, балоты. Дрымучыя лясы пакрываюць амаль усю краіну. Няма ні канца ні краю бярозавым гаям, дубровам, сасновым і яловым барам.

Клімат пакуль што яшчэ даволі суровы, але ўсё ж крыху пацяплеў.

Зямля падсохла.

Нідзе ўжо няма белых плям нерасталага лёду. Зніклі канчаткова апошнія сляды ледавіка, калі не лічыць шматлікіх азёр, балот і тых вялікіх камянёў-валуноў, якія захаваліся і да нашага часу на палях паўночнай часткі Беларусі.

Сярод суцэльнага зялёнага акіяна непраходных лясоў з'явіліся асобнымі астраўкамі палі, пакуль яшчэ, праўда, не вельмі вялікія.

Па цячэнню рэк мы бачым на ўзвышшах умацаваныя паселішчы. Сустракаюцца яны не часта. Іх нават не лёгка заўважыць сярод густой зеляніны лясных масіваў.

Людзі, якія тут жывуць, займаюцца не толькі паляваннем і рыбнай лоўляй, але і земляробствам, і жывёлагадоўляй. Земляробства зрабілася ў іх галоўным заняткам, асновай іх існавання. Зямлю яны апрацоўваюць матыкай, сахой і бараной. Яны навучыліся лавіць і прыручаць дзікіх коней.

Узброены гэтыя людзі лукамі і стрэламі, коп'ямі, мячамі і шчытамі. І зброя ў іх ужо не з каменя і косці, а з жалеза. І жывуць яны не ў зямлянках-буданах, а ў хатах, пабудаваных з бярвенняў.

Хто ж гэтыя людзі, якія будуюць вёскі і ўзводзяць гарады, адваёўваюць у дзікага лесу ўчасткі зямлі пад ворыва, выпальваюць, выкарчоўваюць і аруць цаліну, каб пасеяць жыта, авёс, ячмень, проса?

Гэта — усходнія славяне, непасрэдныя продкі сучасных рускіх, украінцаў і беларусаў.

Пазнаёмімся з імі бліжэй.

Паляцім спачатку над Прыпяццю, прытокам Дняпра, ад вярхоўяў яе да вусця.

Павольна цячэ Прыпяць па вялікай нізіне, якая называецца з даўніх часоў Палессем.

Тут, сярод дзікіх лясоў па берагах Прыпяці, а таксама Бярэзіны і іншых рэчак, раскінуліся між глыбокіх азёр і дрыгвяных балот аж да вытокаў Нёмана паселішчы племені дрыгавічоў. Адсюль, з зямлі дрыгавічоў, сіні Нёман цячэ ў землі літоўскіх плямён.

Дрыгавічы маюць такія гарады, як Пінск, Мазыр, Брэст, Слуцк, Рэчыца, Рагачоў. Галоўны ж над усімі дрыгавіцкімі гарадамі — Тураў, цэнтр княства Тураўскага.

Зразумела, гарады гэтыя зусім не такія, якімі мы ведаем іх сёння. Вы самі бачыце з нашай вышыні, што няма тут ні мураваных дамоў, ні шырокіх вуліц. Гэта проста невялікія пасёлкі — дзесяткі, часам сотні звычайных вясковых хат, пабудаваных на беразе ракі, на схілах узвышша. Пасярод узвышша — умацаваны

дзядзінец[1] з вежай, абкружаны высокім частаколам з завостраных дубовых бярвенняў. Тут жыве князь у сваіх таксама драўляных харомах разам з сям'ёй, дружыннікамі і слугамі.

Рэкі зямлі дрыгавічоў паўнаводныя і глыбокія. Спакойна, задумліва цякуць яны ў нізкіх топкіх берагах з густой высокай расліннасцю. Шматлікія звілістыя рэчкі з непрыкметнай плыннню губляюцца ў трысці, асацэ і чароце, у густых зарасніках асіны і вербалозу.

Нялёгка прабірацца дрыгавічу скрозь калючыя хмызнякі. У лясным гушчары часта трапляюцца глыбокія яміны з цёмнай вадой. Асцярожна ходзіць дрыгавіч па сваёй зямлі, каб не праваліцца ў балотнае бяздонне, каб не загрузнуць у дрыгве.

Вільготная і вязкая глеба, пакрытая мохам, варушыцца пры кожным кроку. Вось чаму жыхары Палесся звычайна пераязджаюць з месца на месца па вадзе ў чаўнах, вычасаных ці выпаленых з калоды. Ад балоцістай мясцовасці яны і атрымалі сваё імя. Дрыгавічы, гэта значыць — людзі, якія жывуць на дрыгве.

Цяпер мы ляцім над Сожам.

Па яго берагах жыве племя радзімічаў. Паводле старадаўніх паданняў, назва племені паходзіць ад родапачынальніка Радзіма. Племя радзімічаў значна меншае за племя дрыгавічоў. Свайго ўласнага княства яно не мае. Не відаць на зямлі радзімічаў і гарадоў. Там, дзе цяпер гарады Гомель, Чэрыкаў, Чачэрск, Слаўгарад, мы бачым са сваёй вышыні толькі невялікія вёскі сярод дрымучых лясоў. Па некаторых паданнях, цэнтрам радзімічаў было сяло Радомля.

Шырокай светлай паласою нясе свае воды Дняпро — любімая рака ўсходніх славян. Нездарма называюць яго «бацькам» і беларусы, і ўкраінцы.

Дняпро Славуцічу...

---

[1] Дзядзінец — двор вакол замка.

Так здаўна з вялікай пашанай і любоўю звяртаецца да Дняпра беларускі народ у сваіх песнях, казках і паданнях, якія дасталіся яму ў спадчыну ад далёкіх продкаў.

Пакінем магутны Дняпро і накіруемся адсюль на паўночны захад. Там жывуць крывічы — самае магутнае і шматлікае з усходнеславянскіх плямён. Назва іх паходзіць, мабыць, ад слова «кроў». Крывічы — сваякі па крыві.

Паселішчы крывічоў раскіданы ў прыгожай і маляўнічай мясцовасці па ўзвышаных берагах Заходняй Дзвіны і па верхнім цячэнні Дняпра. Зямля тут не такая вільготная і балоцістая, як на Палессі, і таму заселена больш густа. Жывецца крывічам лягчэй, чым дрыгавічам і радзімічам.

Галоўны цэнтр крывічоў — вялікі і слаўны горад Полацк. Таму і княства сваё яны называюць княствам Полацкім. Сябе полацкія крывічы называюць палачанамі, бо першыя іх паселішчы ўзніклі на рацэ Палаце, прытоку Дзвіны.

Шмат гарадоў у Полацкім княстве. Вось Віцебск, малодшы брат Полацка, таксама на беразе Дзвіны. Вось і Барысаў, Лагойск, Орша. Усе яны лічацца прыгарадамі Полацка, бо залежаць ад яго.

Крывічы-палачане, дрыгавічы і радзімічы — непасрэдныя продкі беларусаў. З гэтых трох усходнеславянскіх плямён, якія спакон веку жылі на тэрыторыі сучаснай Беларусі, і склаўся ў працэсе далейшага гістарычнага развіцця беларускі народ.

З іншых усходнеславянскіх плямён узніклі братнія рускі і ўкраінскі народы.

## ПРЫЗЯМЛЕННЕ ПЕРШАЕ

*Замак над Свіслаччу. Мы ідзём у горад. Хто тут жыве? Княжыя харомы. Купецкія судны. Два рынкі. Зноў на кіліме. Бітва на Нямізе. Пачатак гістарычнага жыцця*

Мінула яшчэ адно-два стагоддзі. Унізе пад намі серабрыцца рака. Не такая шырокая, як Дняпро ці Сож, але караблі і па ёй плывуць.

З гэтай ракой зліваецца другая рэчка, вузкая і звілістая. А на тым месцы, дзе абедзве рэчкі злучаюцца, мы бачым драўляны горад, абнесены высокай сцяною з дубовых бярвенняў.

Паміж плынямі рэк выступае як мыс насыпаная гара, а на ёй узвышаецца драўляны замак, абнесены сцяной з вежамі.

Які ж гэта горад?

Давайце зірнем на карту. Мы ж яе ўзялі з сабой.

Э, ды гэта ж Мінск! Старажытны Мінск!

Шырэйшая рака — Свіслач, а вузкая — Няміга.

Так, гэта Мінск.

Але як цяжка яго пазнаць! Як непадобны ён на сучасную сталіцу Беларусі, вялікую і прыгожую!

Пакуль гэта яшчэ зусім невялікі гарадок нават і для тых часоў. Адзін з многіх прыгарадаў Полацка, ён не мае яшчэ самастойнага значэння, служыць умацаваннем на самай мяжы зямлі крывічоў з дрыгавічамі, Полацкага княства з Тураўскім. Гарадок не большы, калі не меншы, за Ізяслаўль і Лагойск, такія ж умацаваныя суседнія гарады, якія ўзніклі раней.

Населены старажытны Мінск патомкамі дрыгавічоў, але з'яўляецца фарпостам Полацка на паўднёвай граніцы яго ўладанняў.

Ці не пахадзіць нам па вуліцах старажытнага Мінска? Для гэтага трэба прызямліцца. Вось і зручная лясная палянка. Якая тут свежая, ярка-зялёная трава! Цяпер трэба наш кілім скруціць і схаваць у кустах.

Вось і ўсё. Мы ідзём у горад.

А што рабіць з адзеннем? Нельга ж хадзіць па горадзе адзінаццатага стагоддзя ў сучаснай вопратцы.

Але для нас гэта вельмі проста.

Мы ж дамовіліся з вамі яшчэ раней, што будзем дзейнічаць, як у казцы, будзем карыстацца ў сваім падарожжы казачнымі сродкамі. Вось цяпер і надышоў выпадак, калі мы можам звярнуцца да аднаго з тых казачных прыёмаў, якіх у нас так многа ў запасе. Варта нам толькі павярнуць шапкі спераду назад, і ніхто з людзей мінулага не зможа нас убачыць. Мы зробімся невідзімкамі, будзем смела хадзіць сярод іх і спакойна разглядаць усё, што захочам, без ніякіх непаразуменняў.

Няроўная, зрэзаная глыбокімі каляінамі дарога, па якой мы ідзём, прыводзіць нас з лесу да гарадской брамы. Мы падышлі да горада з поўдня. З поўначы дарогі няма. Праз некаторы час горад будзе мець некалькі ўваходаў, і гэты, паўднёвы, перад якім мы стаім, зробіцца галоўным з іх, а пакуль што, у адзінаццатым стагоддзі, ён з'яўляецца адзіным.

Сюды, да Замкавай брамы, сыходзяцца з усіх бакоў лясныя дарогі. Потым яны ператворацца ў асноўныя вуліцы Мінска, забудаваныя за межамі першапачатковай, умацаванай часткі горада.

На плошчы перад Замкавай брамай — шумны і людны рынак. Цяпер гэта — плошча 8 Сакавіка, а ў тыя часы яна называлася проста Нізкі рынак. Сюды выходзіць і адна з самых старых вуліц Мінска — Гандлёвая, якая захавала сваю назву да нашых дзён. Раней яна называлася Зыбіцкай, можа, таму, што глеба, па якой яна праходзіла, была зыбкая, балоцістая. У назвах вуліц адлюстраваліся асаблівасці гістарычнага жыцця горада.

А вось і Няміга, пакуль яшчэ не вуліца, а рэчка, абодва берагі якой забудаваны ў межах горада дамамі.

Некаторыя з прасёлачных дарог ужо і цяпер лічацца вуліцамі. Ад Нямігі ўзбягае на пагорак вуліца, якая цяпер

называецца вуліцай Астроўскага. Далей яна збочвае на поўнач і ператвараецца ў дарогу, што вядзе ў Ракаў. Таму яна і называлася раней Ракаўскай вуліцай. Каля самага горада дамы на гэтай вуліцы пабудаваны шчыльна, а далей мы бачым толькі асобныя хаты, раскіданыя сярод агародаў, палёў і пералескаў.

Вуліцы ў гэтай частцы горада незабрукаваныя, пыльныя. Тут жывуць кавалі, бондары, ганчары, гарбары, рэзчыкі па косці, дрэваапрацоўшчыкі, ювеліры. З крыкам гойсаюць у вулічным пыле босыя дзеці ў адных зрэбных кашулях.

Старажытны Мінск — горад рамеснікаў. Але ёсць сярод яго жыхароў і нямала земляробаў, рыбакоў. Амаль усе мінчане гадуюць свіней, кароў і коз. Кожны дом — асобная невялікая сядзіба з садам і агародам.

Уся тэрыторыя горада падзелена на асобныя ўчасткі з такімі сядзібамі. Кожная мае некалькі жылых і гаспадарчых будынкаў. Кожная аддзелена ад суседняй сядзібы і ад вуліцы высокім частаколам з варотамі.

Адразу відаць, хто ў якім доме жыве.

Заглянем хаця б вось у гэтую, бліжэйшую да нас сядзібу.

У заднім кутку двара, каля агарода, працуе ў кузні гаспадар сядзібы — каваль. Тут стаіць пад паветкай кавадла і вялікі цэбар з вадой. Левай рукою каваль трымае доўгімі абцугамі распалены дабяла кавалак жалеза і паварочвае яго то адным, то другім бокам, спрытна падстаўляючы пад удары цяжкага молата. Памочнік каваля, малады хлопец з доўгімі бялявымі валасамі, відаць, яго сын, узнімае молат і праз роўныя прамежкі часу абрушвае на кавадла. А майстар паспявае паміж рытмічнымі ўдарамі вялікага молата зрабіць некалькі дробных удараў маленькім малатком, які трымае ў правай руцэ.

Паслухайце, як зладжана і раўнамерна ідзе ў іх праца:

— Бум!.. так... так... так!.. Бум!.. так... так!..

Кавалак жалеза спачатку выцягваецца ў даўжыню, сплюскваецца з аднаго боку, набываючы пэўную форму, патрэбную для каваля.

Цяжка сказаць, што атрымаецца з гэтага кавалка, якая карысная рэч выйдзе з-пад умелых рук майстра, бо каваль кідае жалеза ў халодную ваду. Як зашыпела вада ў цэбры! Воблачка пары ўзнялося ў паветра. Работа яшчэ далёка не скончана. І хлопец мяхамі з казінай шкуры ўзяўся раздзімаць агонь у горне.

Ляцяць іскры, успыхваюць чырвона-сінімі агеньчыкамі вугалі і асвятляюць твар юнака, цёмны ад дыму і сажы.

На абодвух кавалях скураныя фартухі. Ільняныя прадымленыя кашулі расшпілены, рукавы закасаны. Валасы на галаве перацягнуты вузкімі раменьчыкамі, каб не падалі на вочы.

Праца каваля не лёгкая, але вясёлы і лагодны выраз не пакідае загарэлага твару старога майстра з шырокай цёмнай барадой і высокім ілбом, на якім блішчаць дробныя кропелькі поту.

Па блакітным небе павольна плывуць над Мінскам белыя воблачкі. Свеціць сонца. У садзе за хатай каваля спяваюць берасцянкі, свішчуць шпакі. Каля маленькіх дзвярэй ляжыць кудлаты сабака.

Дзверы адчынены, і мы можам зазірнуць у дом. Толькі адзін невялікі пакой мае гэтая хата пад саламянай страхой, як і амаль усе хаты простых людзей у горадзе. Па выглядзе яны нічым не адрозніваюцца ад сялянскіх хат у тагачаснай вёсцы.

Падлога ў хаце каваля драўляная, добра вышараваная, але не фарбаваная. З правага боку — печ. Акенцы зусім маленькія, а замест шкла ўстаўлена тоўстая, напалову празрыстая слюда.

Гэты гарадскі каваль, відаць, добры майстар, які ведае сваю справу. З вёскі прывозяць яму ў горад жалеза, здабытае з балотнай і лугавой руды, а ён вырабляе

з гэтага жалеза не толькі зброю — мячы, наканечнікі коп'яў і стрэл — і розныя сельскагаспадарчыя прылады, але і такія дробныя рэчы хатняга ўжытку, як іголкі, шылы, шпількі, гузікі і засцежкі для адзення.

Каля майстра стаяць два чалавекі і з пашанай паглядаюць на яго работу. Гэта, мабыць, заказчыкі ці пакупнікі. Яны цярпліва чакаюць, калі гаспадар скончыць сваю працу.

Абодва — гарадскія жыхары.

На абодвух кароткія льняныя кашулі, падпяразаныя поясам. На поясе вісяць нож, крэсіва, ключы. На адным кашуля зашпілена меднымі гузікамі, круглымі, як шар. На другім — драўлянымі. У аднаго штаны запраўлены ў шарсцяныя шкарпэткі, у другога абмотаны ўнізе льнянымі анучамі і абвязаны тонкімі скуранымі раменьчыкамі. На нагах у абодвух скураныя лапці. Гэта — адзенне простага мінчаніна тых часоў.

Мы з вамі ідзём далей, але доўга яшчэ чуем грукат цяжкага молата аб кавадла...

Ходзім мы па вуліцах пасада, той часткі горада, якая знаходзіцца па-за сценамі замка. Называюць яго яшчэ і Вакольным горадам. Ён акружаны Пасадскім валам, які прымыкае да Замкавага.

Паглядзім цяпер на драўляны замак, да якога мы падышлі. Потым, праз многа стагоддзяў, гэтае месца будзе вядома пад назвай Замчышча.

Над валам са светлага жвіру ўзвышаюцца магутныя сцены з дубовых бярвенняў. Перад намі высокая драўляная брама з дзвюма вежамі па баках.

Ад брамы дзядзінец перасякае вуліца, якая пазней будзе вядома пад назвай Стара-Мясніцкая. На захад ідзе Замкавая вуліца — самая доўгая і галоўная вуліца дзядзінца. Яна пакрыта насцілам з дубовых бярвенняў, як і ўсе вуліцы ў цэнтры старажытнага Мінска.

Большасць прахожых апранута вельмі проста, нават бедна. Некаторыя ходзяць у лахманах, але нож вісіць на поясе ў кожнага гарадскога жыхара.

Адкуль жа ўзяліся ўсе гэтыя людзі?

З навакольных вёсак прыходзяць у пасад сяляне, наймаюцца на работу, авалодваюць рамёствамі, будуюцца і застаюцца ў горадзе назаўсёды. Адны з іх становяцца самастойнымі майстрамі-рамеснікамі, другія — гандлярамі, трэція працуюць да канца жыцця чаляднікамі, слугамі і работнікамі ў заможных гараджан.

Усё шырэй і шырэй рассоўваюцца межы пасада. З году ў год расце і шырыцца старажытны Мінск. Усё даўжэй і даўжэй робяцца гарадскія вуліцы, паглынаючы навакольныя дарогі.

Мы праходзім пад брамай па драўляным насціле. Здалёку відаць высокі двухпавярховы дом у самым цэнтры ўмацаванага горада. Ён драўляны, як і ўсе дамы ў Мінску, але як адрозніваецца сваім выглядам і памерам ад усіх астатніх, маленькіх, нічым не прыкметных хатак гарадскіх жыхароў. Паглядзіце, з якіх бярвенняў ён складзены! Дубовыя, тоўстыя, адно ў адно. І ўпрыгожаны дом асабліва маляўніча. На дзвярах, на аканіцах, на высокім ганку — усюды майстэрская разьба, пафарбаваная ў розныя колеры.

У гэтым вялікім і прыгожым гмаху жыве князь.

Насупраць харомаў князя, пасярод прасторнага двара з зялёнай травой, стаіць недабудаваная царква. Гэта — першы мураваны будынак, які ўзводзіцца ў драўляным Мінску адзінаццатага стагоддзя.

Так гэтая замкавая царква і засталася недабудаваная. Чаму? Нам гэта невядома. Пазней у падмурку недабудаванай царквы пачнуць хаваць памёршых членаў княжай сям'і.

Каля харомаў размешчаны ў розных канцах двара гаспадарчыя будынкі і хаты, у якіх жывуць княжыя людзі — поп з сям'ёй, дружыннікі, цівуны і слугі. На вежах замка, які пануе са свайго ўзвышша над ваколіцамі, і ўдзень і ўночы стаяць воіны ў бліскучых шаломах і кальчугах, узброеныя лукамі і стрэламі. Пільна

паглядаюць яны ўдалечыню. Ці не плыве па рацэ судна з таварамі?

Па сігнале з вежы княжыя людзі адразу прымусяць такое судна спыніцца і спагоняць з купцоў выкуп ці падатак за права праезду. Ніводнага не прапусцяць.

Плывуць па шырокай і паўнаводнай Свіслачы плыты, чаўны і судны з заморскімі таварамі, а таксама з хлебам, мёдам, воскам, скурай і футрамі. Купцы спыняюцца ў пэўныя, загадзя вызначаныя дні каля мінскага замка. Князю яны плацяць і за права гандлю на гэтым месцы. Да купцоў прыходзяць на рынак ля гарадскіх сцен лю-дзі з навакольных, часам даволі далёкіх селішчаў.

Можа, ад гэтага і пайшла назва горада, які ў тыя часы называўся не Мінск, як цяпер, а Менеск, ці Менск, як сказана ў летапісах. Ёсць меркаванне, што назва гэтая паходзіць ад слова «мена». Менск — гэта значыць месца, дзе мяняюць тавары.

Да замкавай брамы спакойна і паважна ідзе багата апранутая жанчына. На ёй доўгае адзенне, падпяразанае шарсцяным вышытым поясам з бронзавай спражкай. На нагах мяккія скураныя пантофлі, упрыгожаныя вышыўкай. Валасы заплецены ў дзве касы, укладзеныя вакол галавы. На лбе шырокая стужка, да якой падвешаны розныя ўпрыгожанні. На шыі — шкляныя пацеркі, на руках бранзалеты. Такія бранзалеты чорнага, сіняга і блакітнага колеру мы бачым на руках у многіх жанчын, якія сустракаюцца нам на вуліцах горада.

Дзяўчына, апранутая па-вясковаму, нясе за багатай жанчынай кошык, сплецены з лазовых дубцоў. Абедзве, гаспадыня і служанка, выходзяць за браму. Яны ідуць, мабыць, на рынак.

Пойдзем і мы за імі.

На плошчы перад брамай, на Нізкім рынку, а таксама і на суседнім узвышшы недалёка ад замка і берага ракі ідзе ажыўлены гандаль. Тут і прадаюць, і мяняюць розныя рэчы.

Каля самага замка выстаўлены найбольш дарагія і рэдкія тавары. Мы бачым тут і адзенне з заморскай парчы, і саф'янавыя боты з тонкай і мяккай чырвонай, зялёнай, жоўтай скуры, упрыгожаныя мудрагелістымі ўзорамі. Вісяць рознакаляровыя кашулі з шоўку. Немалы шлях прайшоў гэты шоўк, пакуль трапіў на плошчу перад мінскім замкам. З Сярэдняй Азіі, а можа, і з яшчэ больш далёкіх краін.

А вось і здабыча адважных і спрытных паляўнічых. Мядзведжыя і воўчыя шкуры навалены кучай, адна на адну, а над імі — вязкі шкурак баброў, куніц, лісіц, вавёрак.

Недалёка ад брамы стаіць стары манах з сівой барадой. У яго даволі бойка ідзе гандаль жоўтымі васковымі свечкамі і крыжыкамі — сярэбранымі і меднымі. Сівому манаху памагае малады, з рэдкай русай бародкай. За свой дробны тавар, які ляжыць перад імі на зямлі на даматканай пасцілцы, манахі бяруць у пакупнікоў і лён, і воўну, і яйкі, і сала, і розныя іншыя прадукты. Абодва манахі ў белых палатняных падрасніках і ў чорных шапках-скуфейках. Яны паўтараюць нараспеў завучаныя набожныя сказы.

Жанчына, за якой мы ідзём, не звяртае ўвагі ні на свечкі, ні на крыжыкі, хоць манахі і кланяюцца ёй нізка. Шпарка праходзіць яна міма.

Багатую мінчанку зацікавіла нешта іншае. Бачыце, як заблішчэлі яе вочы, калі яна спынілася перад паветкай ювеліра?

На цёмным абрусе стаяць перад ёю сярэбраныя каўшы, кубкі і чаркі, ляжаць залатыя пярсцёнкі з каштоўнымі каменьчыкамі, завушніцы, каралі і пацеркі, бісерныя павязкі.

Тавар дарагі, але, відаць, такі прывабны, што нават і служанка не можа адвесці ад яго вачэй, як і яе гаспадыня. Неахвотна адыходзяць яны ад спакусы.

Цяпер жанчыны накіроўваюцца да рыбнага рада. Зялёным і светла-жоўтым колерам зіхацяць перад імі

вялікія, нядаўна выцягнутыя з вады шчупакі. Серабрацца луской ліні і язі. Свежую рыбу прынёс сюды рыбак, што жыве на беразе, недалёка ад замка. Да яго і падышла жанчына са служанкай.

Пакінем іх выбіраць рыбу, узважваць яе на руцэ, правяраць чырвоную свежасць шчэлепаў.

Пойдзем лепш па дарозе ўгару, на суседняе ўзвышша, куды паскакалі, абганяючы вазы на рыпучых колах, два коннікі, узброеныя мячамі.

Следам за імі паднімаемся на ўзгорак і мы. Перад намі шырокая паляна з вытаптанай травой, акаймаваная цёмна-зялёнай сцяною лесу.

Пазналі, дзе мы знаходзімся?

Не?

Зразумела, цяжка пазнаць.

Нічым не нагадвае гэта паляна за горадам плошчу Свабоды ў сучасным Мінску, якую мы з вамі так добра ведаем.

Паглядзіце навокал.

Адсюль добра відаць і ўвесь горад унізе, каля Замкавай гары, і лукавіна ракі. Мінчане старажытных часоў называлі гэтую паляну Высокім месцам. Потым, праз некалькі стагоддзяў, узвышша насупраць замка забудуецца і ўвойдзе ў межы горада, а яшчэ пазней нават стане яго новым цэнтрам.

Але колькі тут народу! Глядзіце, што тут робіцца! Тавары на паляне прасцейшыя за тыя, што каля замкавай брамы. Пераважаюць вырабы тутэйшых майстроў, мясцовыя багацці, дары мінскай зямлі, але народу на ўзвышшы больш, чым унізе, каля замка.

Вось мёд у драўляных кадушках і воск. Скруткі даматканага палатна і сукна. Драўлянае начынне — бочкі, кадкі, цабэркі, балеі. Мяхі са збожжам, мукой і крупамі. Сушаныя грыбы. Сала і каўбасы. Вэнджаныя ў дыме ядлоўцу кумпякі хатніх свіней і лясных дзікоў.

Простых людзей цікавяць сярпы, сякеры і косы, нажы, наканечнікі стрэл і коп'яў, медныя конаўкі, розныя гаспадарчыя прылады. Вабіць іх салёная і сушаная рыба.

Перш чым набыць патрэбную рэч, пакупнікі доўга вагаюцца ў нерашучасці, усебакова абмяркоўваюць, радзяцца між сабой, настойліва таргуюцца з прадаўцом.

Тут, у гэтым тлуме, трэба нам ісці асцярожна. Хоць нас ніхто не бачыць, але штурхацца ці дакранацца да людзей не варта. Гэта можа выклікаць зусім непажаданыя для нас нечаканасці і ўскладненні. Ці мала што можа здацца старажытнаму чалавеку, калі ён пачуе, як датыкнулася да яго нешта жывое, але нябачнае?

Асабліва людна каля ганчара, які расставіў на траве свае разнастайныя гліняныя вырабы.

Тут многа жанчын. Яны перабіраюць збаны, гаршкі і міскі, паварочваюць іх на ўсе бакі, стукаюць па іх пальцамі, прыслухоўваючыся, ці добра звініць, перастаўляюць з месца на месца. То яны прыглядаюцца да збаноў і місак з адлегласці, то зблізу.

Пажылы ганчар у белай кашулі, з валасамі і вусамі светлымі і мяккімі, як лён, цярпліва тлумачыць пакупнікам усе выгоды і добрыя якасці свайго тавару. Яму памагае жонка. Яна паказвае прысутным усё новыя і новыя збаны і міскі. Гучны голас ганчарыхі не змаўкае ні на хвіліну.

Каля ганчара круціцца вёрткая чародка дзяцей у доўгіх зрэбных кашульках. Яны шчабечуць, як птушкі, з захапленнем пазіраючы на гліняныя цацкі-свісцёлкі. То адзін, то другі хлапчук вытыркаецца наперад, але дакрануцца да цацкі рукамі ніхто не адважваецца. Як добра свішчуць глазураваныя пеўнікі і качкі, зробленыя ўмелаю рукою добрага майстра...

Усюды рух, мітусня, гоман, крыкі, жвавая гаворка. Раптам пачуліся над шумным рынкам гукі нейкага велічнага і сумнага спеву. Панура брыдуць сляпцы.

Чарадою, адзін за адным. Першы з іх, высока ўзняўшы галаву, намацвае дарогу вялікім кіем. Ветрык варушыць сівыя валасы на непакрытай галаве. Песня, якую спяваюць сляпцы, поўная тугі і нейкай вялікай унутранай сілы, робіць моцнае ўражанне. Моўчкі расступаецца перад імі натоўп.

Цікава глядзець на жыццё старажытнага Мінска, але нам нельга затрымлівацца надоўга.

Паглядзім яшчэ толькі, што сталася з Мінскам праз некалькі гадоў.

Хутчэй на лясную палянку за горадам, дзе чакае нас слаўны і верны, надзейна схаваны ў кустах кілім-самалёт!

І вось мы зноў над Мінскам, які належыць цяпер полацкаму князю Усяславу Чарадзею.

Вялікай славай карыстаецца гэты князь сярод сваіх сучаснікаў. Жыццё Усяслава, поўнае прыгод і подзвігаў, натхняе паэтаў. Розум, энергія і знаходлівасць, з якой ён абараняе сваё княства, яго ўменне знайсці выхад з самых цяжкіх і складаных абставін здзіўляюць людзей, робяць моцнае ўражанне нават на ворагаў. Поспехі Усяслава, яго спрытнасць і рашучасць, людзі лічаць чараўніцтвам. У народзе ходзяць чуткі, быццам князь Усяслаў умее абярнуцца ў рысь ці ваўка і блукае ўначы па дарогах. Кажуць, быццам ён можа ператварыцца ў туман і знікнуць у адным месцы, каб апынуцца непрыкметна ў другім, дзе яго зусім не чакаюць.

Гэта пра Усяслава вобразна гаворыць невядомы аўтар «Слова аб палку Ігаравым»: «Ён на кані памчаў да горада Кіева і дакрануўся кап'ём да залатога пасада Кіеўскага. Скочыў ад іх лютым зверам[1]. Апоўначы з Белгарада ахінуўся сіняй імглой, а на раніцу, узняўшы-

[1] Лютым зверам называлі ў тыя часы рысь.

ся, адчыніў браму ў Ноўгарадзе, разбіў славу Яраслава і скочыў воўкам да Нямігі з Дудутак... Усяслаў князь людзям суд судзіў, князям гарады дзяліў, а сам уначы воўкам блукаў. З Кіева да пеўняў дасягаў Тмутаракані... Яму ў Полацку рана званы пазванілі ў Сафіі святой, а ён у Кіеве звон чуе».

Часта даводзіцца Усяславу трапляць у цяжкае і як быццам бязвыхаднае становішча. Вось і сёння бязрадасны дзень для Чарадзея. Халодны сакавіцкі дзень 1067 года. Усяляк намагаецца Усяслаў захаваць незалежнасць Полацкай зямлі ад вялікіх князёў Кіеўскіх, але сілы няроўныя. Вялікі князь кіеўскі Ізяслаў рушыў з двума братамі на Полацкую зямлю і падступіў да Мінска.

Мінчане замкнуліся ў горадзе. Яны ўпарта супраціўляліся спачатку на вале і сценах, потым у вузкіх вуліцах пасада. Але кіеўскія воіны ўзялі Мінск.

Бушуе агонь над хатамі рамеснікаў. Гараць і княжыя харомы, а на берагах Нямігі ўсё яшчэ ідзе жорсткі бой кіеўскага войска з полацкім. Змагаюцца яшчэ і на плошчы пасярод дзядзінца, у кожным доме.

На вуліцах, асветленых пажарам, воіны Ізяслава рабуюць і забіваюць жыхароў. Мінчане абараняюцца хто чым можа — каламі, нажамі, сякерамі, але нялёгка ім супрацьстаяць добра ўзброеным воінам кіеўскага князя.

Гарыць і хата знаёмага нам каваля. Вунь і сам ён ляжыць на спіне пасярод свайго двара. Шырока раскінуты дужыя рукі, з грудзей тырчыць варожая страла. Побач з кавалём ляжыць яго верны молат. Ім каваль працаваў, ім і абараняўся ў гэты апошні дзень свайго жыцця.

Па ўсім двары раскіданы дробныя рэчы. Яны, відаць, не спатрэбіліся рабаўнікам.

Усюды крыкі, лямант, стогны і плач, просьбы аб літасці. Усюды ляжаць трупы.

Па агародах, па загуменні прабіраюцца тыя нямногія жыхары, якія здолелі выратавацца ад лютай разні.

Абарваныя і знясіленыя, счарнелыя ад дыму, шукаюць яны прытулку ад бязлітасных стрэл, ад мячоў і коп'яў ворагаў у навакольных лясах, якія абступілі Мінск з усіх бакоў.

Глядзіце, хто гэта брыдзе, кульгаючы, сярод няшчасных людзей?

Гэта ж сын каваля!

Мы адразу яго пазналі, хоць ён і вырас прыкметна, узмужнеў за гэты час. Адна рука яго вісіць бездапаможна. За другую чапляецца пажылая, змарнелая ад раптоўнага гора жанчына. Гэта, мабыць, яго маці.

На брудным расшпіленым кажушку хлапца сляды крыві. На твары — таксама, але яго не пакідае выраз гневу, смутку і рашучасці. Юнак часта аглядаецца назад, на горад, які палае нібы адно вялізнае вогнішча.

Як высока шугае полымя!

Рушацца з трэскам будынкі. А зверху, з шэрага, пахмурнага неба густа падае мокры снег.

Далей, далей ад гэтага сумнага відовішча... Потым, праз колькі год, аўтар «Слова аб палку Ігаравым» скажа пра гэтыя падзеі: «На Нямізе снапы сцеляць галовамі, малоцяць цапамі булатнымі, жыццё кладуць на таку, душу веюць ад цела. Нямігі бо крывавыя берагі не дабром засеяны, засеяны касцямі сыноў рускіх».

У сувязі з бітвай на берагах Нямігі ўпершыню трапіў Мінск на старонкі гісторыі. Пад 1067 годам упершыню было ўпамянута яго імя ў летапісе.

Таму гэты год, такі няшчасны для маладога Мінска, год руйнавання, і лічыцца пачаткам яго гістарычнага жыцця.

Пад знакам вайны і разбурэння ўвайшоў наш горад у гісторыю, у літаратуру. З гэтага часу ён усё часцей упамінаецца ў гістарычных дакументах, і кожны раз зноў і зноў у сувязі з войнамі, бітвамі, пажарамі і няшчасцямі.

Такі быў яго лёс.

Такі быў лёс усёй нашай краіны. Яго вызначыла геаграфічнае становішча зямлі, якую потым пачалі называць беларускай — на скрыжаванні вялікіх дарог між Усходам і Захадам, Поўначчу і Поўднем, у самым цэнтры Еўропы.

## АДХІЛЕННЕ АД КУРСУ

*З тлумачэнняў экскурсавода. Белая — значыць вольная. Нашчадкі Кіеўскай Русі. У новай дзяржаве. Заваёўнікі з захаду. Следам за аб'яднаным войскам. Рыцары бягуць*

Мы ў наступным — дванаццатым — стагоддзі.

Многія гарады, якія нядаўна яшчэ былі не вельмі значныя, зрабіліся такія ж магутныя і людныя, як і Кіеў. І жывуць у іх такія ж багатыя купцы, такія ж умелыя рамеснікі, майстры на ўсе рукі, як і ў Кіеве. І ўзведзены ў гэтых гарадах такія ж моцныя замкі, і прыгожыя харомы і вялікія цэрквы. І не хочуць больш князі гэтых гарадоў падпарадкоўвацца ні адзін аднаму, ні нават самаму старэйшаму з іх — вялікаму князю кіеўскаму.

Кожны князь хоча, каб яго горад быў галоўны і адзіны цэнтр для ўсіх рускіх зямель, каб усе аб'ядноўваліся вакол яго.

Б'юцца князі між сабою за ўладу і багацці, пустошаць сваімі войскамі суседнія землі, паляць і руйнуюць гарады, нішчаць людзей. Дзейнічаюць і сілай і хітрасцю. Абы нажыцца, абы разбагацець яшчэ больш. Лёс дзяржавы, лёс народа іх мала турбуе.

Нам з вышыні свайго кіліма добра відаць, як па дарогах, а дзе і проста па палетках рухаюцца ў розных напрамках конныя і пешыя войскі. Коні б'юць капытамі недаспелае жыта, бясконцыя рады пешых воінаў топчуць пасевы.

Мінскі князь Глеб, сын Усяслава Чарадзея, паліць горад Слуцк. А ў 1119 годзе Уладзімір Манамах, вялікі князь кіеўскі, бярэ і разбурае Мінск, знішчае насельніцтва, а потым сам хваліцца, успамінаючы пра свае паходы: «Зруйнаваў горад Менск і не пакінуў у ім ні чалавека, ні жывёлы».

Паўтарылася тое, што адбылося ў 1067 годзе. Адноўлены горад зноў зруйнавалі ўшчэнт.

Князі руйнуюць краіну сваімі бясконцымі міжусобіцамі, а тым часам грозная небяспека навісла над усімі рускімі землямі. Нібы чорная навальнічная хмара, насоўваюцца з усходу незлічоныя полчышчы мангола-татарскіх заваёўнікаў. Яны прыйшлі з далёкіх краін Азіі, захапілі і зруйнавалі Кіеў і большасць усходніх і паўднёвых рускіх гарадоў. Адно княства за другім трапляе паасобку пад ярмо заваёўнікаў.

Толькі заходнія княствы пазбеглі татарскай заваёвы. Дакаціліся і да іх магутныя хвалі навалы, але прайшлі і адхлынулі назад. Вольныя ад татарскага ярма засталіся землі сучаснай Беларусі.

Адсюль, можа, і пайшла назва, якая замацавалася за нашай краінай — Белая Русь. Гэта значыць — вольная Русь. У тыя часы слова «белы» мела той самы сэнс, што і слова «вольны».

Ляціць і ляціць наш кілім-самалёт... Хвіліна — стагоддзе. Яшчэ хвіліна — яшчэ адно стагоддзе.

Няма ўжо Кіеўскай Русі. Але ёсць яе нашчадкі.

Беларускія землі цяпер уваходзяць у склад Вялікага княства Літоўскага. Культура Кіеўскай Русі, якая захавалася на Беларусі, была вышэй за культуру літоўскіх плямён, якія яшчэ толькі пераходзілі ад родавага ладу да ранняга феадалізму. Таму літоўцы даволі хутка пераймалі гэтую культуру. Тая мова, якая пазней будзе называцца беларускай, зрабілася ў Вялікім княстве Літоўскім мовай дзяржаўнай. На ёй гавораць пры двары літоўскіх

князёў, на ёй пішуцца кнігі і летапісы, выдаюцца законы, складаюцца дзяржаўныя дакументы.

Жывучы ў адной дзяржаве, літоўцы і беларусы разам бароняцца і ад татарскіх заваёўнікаў, якія нападаюць з усходу і поўдня, і ад нямецкіх рыцараў-крыжаносцаў, якія насоўваюцца з захаду.

Мы пралятаем цяпер над нашымі землямі ў самым пачатку пятнаццатага стагоддзя. Сталіца дзяржавы, якая раней была ў Навагрудку, перанесена ў Вільню.

Ужо галіцкі князь Данііл перамог крыжаносцаў у бітве каля Драгічына, спыніўшы іх прасоўванне на поўдзень. Ужо ноўгарадскі князь Аляксандр Неўскі разбіў нямецкіх рыцараў на Чудскім возеры, спыніўшы іх прасоўванне на паўночны ўсход. Ужо вызваліўся ад крыжаносцаў часова захоплены імі Полацк. Але рыцарскі ордэн усё яшчэ захоўвае сваю драпежную ваяўнічую сілу.

Крыжаносцы падступаюць пад Вільню, Гродна, Ліду. Яны паляць вёскі і сёлы, рабуюць і разбураюць гарады, забіваюць мірных жыхароў. Яны імкнуцца заваяваць і заняволіць беларускія, літоўскія, украінскія, рускія землі.

І вось, прыгледзьцеся ўважлівей! Рушыць на захад па дарогах Беларусі вялікае войска. Ідуць не толькі добра ўзброеныя воіны. У войску нямала і сялян, і рамеснікаў з косамі, сякерамі, нажамі, доўбнямі і рагацінамі. Да войска далучаюцца ўсё новыя і новыя палкі. Яны ідуць з усіх канцоў Беларусі, Літвы, Украіны, Польшчы. Яны аб'ядноўваюцца ў адзінае вялікае войска. Ім усім пагражае адна агульная небяспека. Ім усім ненавісны агульны люты вораг — хітрыя і вераломныя рыцары-крыжаносцы.

Варта і нам паляцець за гэтым войскам.

Хоць далейшыя падзеі адбудуцца не на беларускай зямлі, але будуць мець для яе немалое гістарычнае значэнне.

І вось мы ляцім за бясконцымі злучэннямі воінаў.

Пыл клубіцца па дарогах ад дзесяткаў тысяч ног. Зіхацяць на сонцы бліскучыя шаломы, шчыты і кальчугі. Іржуць коні, трубяць трубы. Развяваюцца каляровыя сцягі.

Войска сапраўды вялікае — дзевяноста адна харугва[1] выступіла ў паход. І дваццаць з іх — беларускія. Нам вядомы іх назвы — Брэсцкая, Ваўкавыская, Віцебская, Гродзенская, Драгічынская, Лідская, Мінская, Мсціслаўская, Навагрудская, Пінская, Полацкая, Тураўская і іншыя. З Украіны прыйшлі харугвы Кіеўская, Галіцкая, Львоўская, Крамянецкая і тры Падольскія. Тры харугвы прыслаў Смаленск.

Крыжаносцы таксама добра падрыхтаваліся да рашучай бітвы. Яны запрасілі да сябе рыцараў-добраахвотнікаў і наёмнікаў з Францыі, Англіі, Даніі, Нідэрландаў.

Мы ляцім на сваім кіліме над далінай каля прускіх вёсак Грунвальд і Таненберг, куды прыйшло саюзнае войска.

Паглядзіце на крыжаносцаў! Яны ўзброены вялікімі цяжкімі мячамі і коп'ямі. І самі рыцары пад сваімі доўгімі белымі плашчамі з чорным крыжам і іх рослыя дужыя коні закуты ў браню.

Над шчыльнымі радамі крыжаносцаў лунаюць шматлікія сцягі і штандары з малюнкамі злавесных чорных арлоў, ваўкоў, мядзведзяў, з крыжамі, мячамі і living рознымі рыцарскімі эмблемамі. Шаломы рыцараў упрыгожаны пер'ем паўлінаў, рагамі зуброў і тураў. На шчытах намаляваны рыцарскія гербы. Усё разлічана на тое, каб застрашыць, запалохаць, прыгнесці праціўніка, стварыць уражанне сілы, магутнасці, непераможнасці.

Раніца 15 ліпеня 1410 года...

Затрубілі трубы... Пачынаецца бітва...

---

[1] Харугвай называлі ў тыя часы атрад ці полк, асобную вайсковую часць, якая мела свой уласны сцяг — харугву.

З гучнымі баявымі крыкамі і шматгалосым спевам кінуліся воіны на ворага. Рады сутыкнуліся. Ламаюцца коп'і, грымяць даспехі. Бразгат мячоў выразна даносіцца і да нас.

Што?.. Далучыцца і нам да саюзнага войска? На жаль, мы не можам. Не забывайце, што мы — з другой, пазнейшай эпохі. Мы можам толькі назіраць за ходам падзей...

Амаль усе коп'і пераламаны. Баявыя рады так самкнуліся, што воінам немагчыма ні змяніць месца, ні прасунуцца хаця б на крок, ні размахнуцца як след рукой.

Забітыя не падаюць на зямлю. Сціснутыя з усіх бакоў, яны рухаюцца разам з жывымі. Людзей падмінаюць і топчуць коні.

Вось ужо гадзіна прайшла, а ні той, ні другі бок не адступае і не можа перамагчы праціўніка.

Сонца пачало хіліцца да захаду.

І тут аб'яднаныя войскі зламалі нарэшце супраціўленне крыжаносцаў.

Бягуць рыцары, ратуючыся ад пагібелі.

А самы галоўны іх кіраўнік, вялікі магістр ордэна Ульрых фон Юнгінген, застаўся ляжаць на полі бою. Тысячы рыцараў забіты, тысячы ўзяты ў палон.

Так скончылася бітва пры Грунвальдзе, якая паклала канец заваёўніцкім планам нямецкіх рыцараў. Марна імкнуліся крыжаносцы заняволіць народы паўночнаўсходняй Расіі, Літвы, Беларусі, Украіны, Польшчы...

# КРУГ НАД НЯСВІЖАМ
# І ПРЫЗЯМЛЕННЕ ДРУГОЕ

*Пад уладаю польскіх паноў. Замак на востраве. Песня над пожняй. Да родных братоў, на вольныя землі. За гарадской брамай. Чаму ў гэтым доме не спяць?*

А наш кілім-самалёт усё ляціць і ляціць...

Цяпер мы трапілі ў эпоху, не такую ўжо далёкую. Шмат чаго адбылося на нашай зямлі за гэтыя гады. Мінулі, адышлі ў нябыт на Вялікай Русі змрочныя часы татара-мангольскага ярма. Паўночна-ўсходнія рускія княствы, аб'яднаныя вакол новай сталіцы — Масквы, ператварыліся ў моцную і незалежную дзяржаву. Князі маскоўскія пачалі называцца царамі.

А Белая Русь?

Разам з Літвой яна ўваходзіць цяпер у склад польскай дзяржавы. Пад уладу польскіх магнатаў трапіла і большасць зямель Малой Русі — Украіны. Усё горш, усё цяжэй жывецца простым людзям — рамеснікам і сялянам. Усё бязлітасней прыгнятаюць народ паны. Адзін за адным пераходзяць мясцовыя памешчыкі ў каталіцкую веру, пераймаюць мову і звычаі польскіх паноў, выракаюцца свайго народа, лічаць простых людзей быдлам.

Чаму ж яны церпяць, простыя людзі? Іх жа больш за паноў. Але на баку прыгняталььнікаў узброеная сіла, наёмнае войска, а царква і касцёл вучаць цярпець, падпарадкавацца пану. Дый не знайшліся яшчэ пакуль сярод сялян і рамеснікаў людзі, якія маглі б згуртаваць усіх прыгнечаных і павесці на барацьбу з заклятым ворагам. Праўда, то ў адным горадзе, то ў другім успыхваюць мяцяжы, узнікаюць хваляванні. Здараецца, што і сяляне пускаюць часам «чырвонага пеўня» — паляць панскія маёнткі. Жорстка распраўляюцца паны з тымі, хто асмеліўся паўстаць супраць іх улады.

Мы пралятаем над невялікім гарадком на беразе возера. На востраве, ад якога ідзе да гарадка шырокая грэбля з вербамі па баках, высіцца замак. Ён акружаны высокай сцяной з чатырма вежамі і безліччу байніц. Тым, хто асмеліўся б падступіцца пад сцены замка, давялося б пераадолець і роў з вадой і высокі абарончы вал. Нялёгка ўзяць такі замак, і ўладары яго адчуваюць сябе ў поўнай бяспецы.

Замак гэты — рэзідэнцыя князёў Радзівілаў, а гарадок — Нясвіж.

На ўскраіне гарадка, якраз супраць замка, будуецца новы касцёл. Колькі народу сагналі сюды княжыя гайдукі! Не на адзін год разлічана будаўніцтва, бо ўсё робіцца ўручную.

Ніякіх механізмаў, якія маглі б палегчыць працу будаўнікоў, няма. Людзі на руках цягнуць па рыштаваннях цяжкія каменныя пліты. Нястомна працуюць над кладкай муляры. Чародамі, адзін за адным, подбегам спяшаюцца па рыштаваннях падносчыкі, несучы на спінах цэглу.

Набожны і пыхлівы князь хоча, каб касцёл выглядаў не так, як усе навакольныя, і архітэктара выпісаў з Італіі. Усё гэта каштуе немалых грошай. Але што князю?! Хіба мала ў яго зямлі? Мала прыгонных?

Адразу за гарадком пачынаюцца палі. Няцяжка здагадацца, дзе панская зямля, дзе сялянская. Панскае поле — шырокае, прасторнае, бязмежнае, нібы вялікае возера ў далёкіх зялёных берагах гаёў і бароў. У пана — найлепшая зямля. А сялянскія палеткі — вузкія палоскі па пясчаных узгорках сярод хмызнякоў і лесу. На іх не відаць ні душы.

Затое на панскім полі кіпіць работа. Нізка згінаюцца жнеі з сярпамі ў руках. Ланцужком ідуць касцы. Павольна адступае перад імі высокая, хвалістая збажына.

Не па сваёй волі працуюць і жнеі, і касцы.

Цяжкая стома налівае іх рукі.

Прыслухайцеся...
Чуеце, як сумна спяваюць жнеі?

> Сонейка каля е-е-лі,
> А мы шчэ нічога не е-е-лі...
> Сонейка каля гру-у-шы,
> Не шкадуе пан нашы ду-у-шы...

На самым досвітку выйшлі яны ў панскае поле і працуюць, не разгінаючы спіны. Нават і сонца стамілася за дзень, схілілася зусім нізка, вось-вось схаваецца за лесам, ляжа на адпачынак, а ім, прыгонным сялянам, і ўночы адпачынку не будзе. Трэба ж і на сваіх палосках управіцца, бо асыплецца жыта. Сядзі потым усю зіму без хлеба. А яго і так штогод да вясны не хапае.

На полі з'явілася некалькі ўзброеных коннікаў. Адразу відаць — панскія гайдукі. Старэйшы з іх, нязграбны мужчына ў карычневым кунтушы з адгорнутымі малінавымі абшлагамі, прыўзняўся на страмёнах і, махаючы бізуном, пракрычаў нешта касцам і жнеям.

Але ж чаму стомленыя сяляне так неахвотна кідаюць абрыдлую работу?

Чаму гайдукі пагналі іх з поля?

Ці не спусціцца нам зноў на зямлю і бліжэй паглядзець, што там робіцца?

Незаўважаныя для людзей мінулых часоў, мы ідзём па калючай пожні. І вось ужо на дарозе даганяем сялян, якія панура брыдуць пад аховай гайдукоў.

— Але ж і нарабіў гэты Янук бяды,— нездаволена скардзіцца адзін з касцоў.— Цяпер бацька за яго ў адказе, ды і нам усім можа не паздаровіцца.

— А што? — запярэчыў другі. — Малайчына! Добра штурхануў пана, а сам на панскага каня ды — шукай ветру ў полі. Хай пан ведае!..

— Можа, ён ужо недзе далёка, можа, за Дняпром,— з надзеяй адгукнулася маладая жняя з бледным, схуднелым тварам.

Адзін з гайдукоў, які прыслухаўся да гутаркі, пагразіў сялянам бізуном.

— Гэй, вы!.. Цішэй!.. Чаго языкі развязалі?.. Вось як дадуць зараз старому Міхалу ў косці, то і скажа, дзе яго сын-валацуга хаваецца.

— Небарака,— уздыхнула пажылая жанчына і махнула безнадзейна рукой.— А чаго дамогся Янук? Сястру ж усё роўна на край свету звезлі...

Гайдук усміхнуўся з-пад абвіслых вусоў, прыцмокнуў языком:

— Добрых выжлаў[1] пан за яе ўзяў. Не прагадаў.

Дарога тым часам перайшла ў алею, абсаджаную высокімі густымі ліпамі. У самым канцы алеі відаць драўляны дом з белымі атынкаванымі калонамі пры ўваходзе.

Вядома, мясцовы пан не раўня Радзівілу. Замка ён не мае, але ўлада над прыгоннымі сялянамі ў яго такая ж неабмежаваная, як і ў князя. Што пан захоча, тое і зробіць. Люта можа пан пакараць за непаслушэнства.

На двары панскага дома ўсё падрыхтавана для допыту і пакарання. Стаіць пасярод двара доўгая лаўка, на ёй ляжаць вяроўкі, а побач стаіць цэбар з вадой, каб мачыць дубцы...

Моўчкі стаяць сяляне. Іх прыгналі сюды для таго, каб бачылі, што чакае кожнага, хто праявіць непакорнасць.

Вось ужо вядуць старога Міхала, бацьку непакорнага Янука. Высокі, крыху ссутулены, ён пазірае навокал разгублена, нібы шукаючы спагады ў аднавяскоўцаў. А чым яны могуць яму памагчы? Зараз прывяжуць старога да лаўкі, выйдзе на ганак пан, дасць загад, і пачнецца бязлітаснае, бесчалавечнае пакаранне.

У напружанай, злавеснай цішыні пачуўся раптам прарэзлівы, поўны тугі і роспачы жаночы голас:

— А што ж гэта робіцца?.. Людцы добрыя!.. Дачушку забралі, а цяпер яшчэ і старога майго знявечаць!..

---

[1] Выжал — паляўнічы сабака.

Да Міхала кінулася з натоўпу сівая жанчына, але гайдукі схапілі яе і адцягнулі назад.

Не, не можам мы глядзець! Няма ніякіх сіл прысутнічаць пры гэткім здзеку з людзей. А ўмяшацца, перашкодзіць няма ў нас магчымасці.

Мы ж людзі з іншай эпохі.

Пойдзем хутчэй адгэтуль.

Паглядзім, што робіцца ў гарадку.

Можа, пайсці туды пеша? Добра! Да Нясвіжа не так ужо і далёка.

Як ціха вакол і спакойна!

Усё жывое ў прыродзе змаўкае, спыняе сваю дзейнасць, хіліцца да сну, да адпачынку.

Толькі ластаўкі бясшумна лятаюць перад намі над дарогай, грудкамі сваімі ледзь не дакранаючыся зямлі.

Ад кустоў кладуцца густыя падоўжаныя цені.

У траве скрыпучымі галасамі пераклікаюцца яшчэ дзеркачы. Наладзілі дружны канцэрт конікі. У яго ўключаюцца з захапленнем усё новыя і новыя выканаўцы.

Толькі дзеркачы ды конікі і парушаюць цудоўную вячэрнюю цішыню палёў. Але музыка іх гарманічна зліваецца з усім навакольным пейзажам. Яна цалкам сугучна яму.

Які кантраст паміж лагодным спакоем прыроды і тым, што робіцца на панскім двары!

Вось ужо і зусім сцямнела. Сціхлі паступова апошнія гукі ў полі. Але чаму гэта неба афарбавалася раптам у чырвоны колер? Вячэрняя зара даўно ўжо згасла...

Глядзіце, глядзіце!..

Там, дзе толькі што адбывалася панская расправа над старым селянінам, узнялося полымя. Зарыва пажару асвятляе далягляд.

Відаць, адважны Янук, перш чым падацца ў дзікі стэп, да казакоў, на вольныя землі, здолеў адпомсціць пану за сястру, абмененую на сабак, за збітага бацьку, за матчыны слёзы...

Вось мы ўжо каля гарадской брамы. Яна называецца Слуцкай, бо дарога ідзе ў Нясвіж ад Слуцка.

Брама яшчэ не зачынена, і мы праходзім у горад.

Ноч ясная, месячная. Нам добра ўсё відаць, а вартаўнік, зразумела, нас не бачыць. Ён прыслухаўся да пошчаку нашых крокаў па бруку, пільна агледзеўся і, перакінуўшы алебарду з правай рукі ў левую, спалохана жагнаецца.

Нам смешна, а ён — чалавек мінулых часоў і непахісна верыць у нячыстую сілу. І як яму не баяцца, калі толькі на тым тыдні на плошчы перад ратушай спалілі «ведзьму».

Ціха на вуліцах.

Нідзе ні агеньчыка. Спаць кладуцца рана. Горад нібы вымер.

Паснулі ў горадзе людзі, спяць на возеры лебедзі і качкі. Толькі вокны замка ўсё яшчэ свецяцца, адлюстроўваюцца ў цёмнай паверхні вады.

На востраве гучыць музыка. Гаспадары замка балююць там са сваімі шматлікімі гасцямі.

Мы спыняемся перад двухпавярховай прысадзістай камяніцай, што стаіць на вузкай вуліцы паміж ратушай і касцёлам.

З маленькіх акон першага паверха прасочваецца скрозь аканіцы святло.

Чаму ў гэтым доме не спяць? Што там можа быць? Падыдзем да яго бліжэй.

Нам пашанцавала. Нехта знутры адкінуў аканіцы і расчыніў акно. Відаць, у доме душна ў гэту цёплую, летнюю ноч.

Мы бачым чалавека, які стаіць за высокай канторкай і піша нешта гусіным пяром. На ім шырокае цёмнае адзенне, як і ва ўсіх вучоных сярэдневякоўя. Свечка зусім апплыла і капціць, а ён і не заўважае. Пасярэдзіне пакоя — драўляны станок. Каля станка завіхаецца малады хлопец,

які толькі што адчыніў акно. Ён з намаганнем круціць ручку, і станок на нейкі час прыходзіць у рух.

Хлопец бярэ са станка вялікі аркуш тоўстай паперы са свежым адбіткам тэксту. Побач, на дубовым стале, ляжыць цэлы стос такіх жа аркушаў.

— Паглядзіце, пане доктар,— гаворыць хлопец, паказваючы аркуш вучонаму.

Усё зразумела, тут друкарня! А чалавек за канторкай — не хто іншы, як Сымон Будны, адзін з першых друкароў на Беларусі. Хто, акрамя яго, можа друкаваць у Нясвіжы кнігі ў канцы шаснаццатага стагоддзя.

Францішак Скарына, доктар медыцыны і філасофіі, слаўны сын Полацка, жыў раней і першую беларускую кнігу надрукаваў у 1517 годзе ў Празе, а потым заснаваў друкарню ў Вільні.

Сымон Будны — наступнік Скарыны ў справе друкавання кніг і пашырэння асветы сярод народных мас. Ён, адзін з найбольш адукаваных людзей свайго часу, ведае польскую, чэшскую, італьянскую, лацінскую, грэчаскую і старажытнаяўрэйскую мовы. Але больш за ўсё любіць ён сваю родную мову.

Сымон Будны выступае ў сваіх кнігах супраць папоў і ксяндзоў, заклікае шанаваць народную мову, змагаецца за свабоднае развіццё навукі і пашырэнне ведаў сярод простых людзей.

Адначасова з ім за некалькі сот кіламетраў ад Нясвіжа працуе ў сваёй друкарні, заснаванай у фальварку Цяпіна, на Віцебшчыне, яшчэ адзін змагар за народную асвету, аднадумец Буднага — Васіль Цяпінскі.

Ці не да яго, «брата свайго мілага», піша ў гэтую хвіліну ліст вучоны ў Нясвіжы?

Хлопец-памочнік падае Буднаму толькі што зняты са станка аркуш. Вучоны, адарваўшыся нарэшце ад рукапісу, уважліва разглядае надрукаванае. Потым тлумачыць нешта хлопцу і сам ідзе да станка.

Нялёгка прыходзіцца першым асветнікам, пачынальнікам друкарскай справы, змагарам супраць цемры і ад-

сталасці, супраць сярэдневяковай схаластыкі. Іх праследуюць, цкуюць, кідаюць у турмы, часам нават паляць на вогнішчы.

Такія людзі, як Сымон Будны, не могуць доўга жыць на адным месцы. У далейшым ён пакіне Нясвіж, таксама як перад тым пакінуў Клецк, і ўцячэ ў Лоск. Там ён заснуе новую друкарню.

Польскія салдаты, вярнуўшыся з паходу на Маскву, схопяць Буднага і пасля пабояў і здзекаў кінуць у рэчку, каб утапіць вучонага за тое, што ён выступаў супраць цемрашальства ксяндзоў і папоў. Ён выратуецца...

Усё гэта здарыцца ў недалёкім будучым, а пакуль што Сымон Будны жыве і дзейнічае ў Нясвіжы, піша тут і друкуе свае трактаты. Яго яшчэ падтрымлівае гарадскі магістрат.

Карысную справу робяць вучоны і яго вучань. Праз колькі стагоддзяў мы будзем удзячны ім, Францішку Скарыне, Сымону Буднаму, Васілю Цяпінскаму, за тое, што яны першыя на Беларусі пачалі друкаваць кнігі.

## ПРЫЗЯМЛЕННЕ ТРЭЦЯЕ

*Казакі ў Пінску. Абарона горада. Нават жанчыны змагаюцца. Бывай, непакорны Пінск!*

Ад Нясвіжа мы скіроўваем свой кілім-самалёт на поўдзень. Разам з кіламетрамі мінаюць і дзесяцігоддзі.

Пад намі — балоцістая нізіна, кранутая фарбамі восені. Нізіну перасякаюць шматлікія рэчкі, якія віюцца сярод балот, лугоў, лясоў і пералескаў. Гэта ж тут жылі калісьці старажытныя дрыгавічы!

Вось і Піна, буйнейшы прыток Прыпяці. Ад Піны і ўзяў сваю назву горад, што раскінуўся на яе левым беразе.

Чым бліжэй да Пінска, тым усё больш войска бачым мы на пыльных дарогах. Тут і шматлікія коннікі, і пешыя жаўнеры, і цяжкія гарматы на непаваротлівых, рыпучых колах. Дужыя коні натужна цягнуць іх па выбітай дарозе.

І ўсё гэта рушыць у адным напрамку — туды, дзе ў восеньскай смузе віднееецца Пінск. Там даўно ўжо чуваць страляніна, грымяць гарматы. І да свежага ранішняга ветрыку, які дзьме з таго боку, выразна прымешваецца гаркаваты пах дыму.

Высокая гарадская сцяна падковаю ахапіла горад з трох бакоў, а канцы гэтай падковы ўпіраюцца ў Піну. Толькі тут, з боку ракі, Пінск не аблажаны ворагамі. Многія дамы, і драўляныя, і мураваныя, ахоплены полымем. Сцены цэркваў з круглымі купаламі і касцёлаў са спічастымі вежамі званіц пашарпаны кулямі, пашчэрблены ядрамі. Цэнтр горада, плошча і рынак, што знаходзяцца на самым беразе, абязлюднелі.

Тут мы і зможам прызямліцца і агледзецца, разабрацца ў падзеях. Схаваўшы кілім-самалёт пад ніцай вярбой, мы ідзём па адной з вуліц, якія веерам разыходзяцца ад плошчы ля берага Піны.

Усё бліжэй і бліжэй чуваць гукі бою.

Мы бачым гараджан, узброеных самымі рознымі стрэльбамі, сякерамі і самаробнымі пікамі. Сярод іх няцяжка пазнаць па адзенні і сялян-паўстанцаў з навакольных вёсак. Некаторыя, не маючы добрай зброі, цягнуць камяні і бярвенні. Яны спяшаюцца да гарадскіх сцен, каб памагчы абаронцам адбіць чарговы наступ панскага войска.

Каля галоўнай гарадской брамы сабраўся вялікі атрад коннікаў у папахах, у яркім каляровым адзенні і шырокіх шараварах. Гэта — казакі, якія прыйшлі сюды з суседняй Украіны. Нямала спешаных казакоў і на сцяне. Разам з гараджанамі і сялянамі яны не даюць панскім салдатам уварвацца ў горад.

Вы цяпер і самі зразумелі, што трапілі мы ў Пінск у кастрычніку 1648 года. Казакоў прывёў сюды з Украіны па заданні гетмана Багдана Хмяльніцкага палкоўнік Антон Нябаба.

Жыхары Пінска самі пусцілі ў горад казакоў, да якіх далучыліся і мясцовыя сяляне. Вось ужо трэці дзень абараняюць яны горад ад войск князя Януша Радзівіла, які павінен быў, па загаду польскага караля, прайсці праз Беларусь на Украіну і ўдарыць у тыл арміі Хмяльніцкага.

Трэці дзень не спыняецца заўзяты бой. Князь Радзівіл пасылае пад сцены Пінска ўсё новыя і новыя сілы. А казакам і пінчанам няма адкуль чакаць дапамогі. На сценах застаецца ўсё менш і менш абаронцаў горада, але ніхто і не думае здавацца на літасць ворагу. На змену забітым ідуць жанчыны. Тут жа на вуліцах распальваюць яны вогнішчы і грэюць ваду і смалу. Потым усцягваюць катлы на сцены і выкульваюць іх на галовы панскіх салдат. Іншыя скачваюць уніз бярвенні, кідаюць вялікія камяні...

А горад гарыць ужо з усіх бакоў. І тушыць пажары няма каму. Гараць нават плывучыя млыны на Піне...

Раптам чуюцца страшэнны трэск і скрогат. Гарадская брама падалася націску варожых салдат і расчынілася. Панскае войска ўварвалася ў горад...

Разам з апошнімі абаронцамі, нікім не заўважаныя, адыходзім мы да плошчы ля ракі. Казакі і пінчане змагаюцца да апошняй магчымасці. Прарвацца яны не могуць, адступаць няма куды.

Некаторыя з абаронцаў горада спрабуюць пераплысці на той бераг, але кулі насцігаюць іх і ў вадзе.

І тым, хто застаўся ў горадзе, таксама няма ратунку. Лютуюць панскія салдаты. Яны хапаюць людзей, сякуць іх шаблямі, кідаюць у полымя. Не шкадуюць ні малых, ні старых, ні жанчын, ні хворых.

Са смуткам глядзім мы на зруйнаваны і спалены Пінск. Зноў, і ў каторы ўжо раз, прыходзіцца нам шкадаваць, што не можам мы ні змяніць, ні спыніць ход падзей, якія адбыліся ў мінулым.

Як добра было б, калі б мы змаглі ўзяць з сабой на кілім-самалёт хаця б вунь таго мужнага казака ў чорнай папасе з чырвоным верхам, які з дзесяткам коннікаў прабіўся скрозь рады ворагаў... Гэта ж сам Антон Нябаба!

Вось імчыцца ён на кані, з шабляй у руцэ па зялёным лузе за горадам. Але луг пераходзіць неўзабаве ў балота. Коні грузнуць у дрыгве. І атаман паварочвае свайго каня проста насустрач ворагам...

Дорага аддаў сваё жыццё Антон Нябаба. На тры дні затрымалі яго атрады панскае войска. Так і не ўдасца князю Янушу Радзівілу прарвацца знянацку на Украіну. Яго войскам давядзецца яшчэ змагацца на Беларусі і з атрадамі паўстанцаў Гаркушы, Хвеські, Крывашапкі...

Хутка ўжо Украіна аб'яднаецца з Масквой, і на дапамогу паўстанцам выступіць рускае войска. Потым цар падпіша мірны дагавор з Польшчай, па якім польскі кароль аддасць Маскве смаленскую зямлю і Украіну з Кіевам. Але беларускія землі застануцца яшчэ пад уладаю польскіх паноў.

Я расказаў вам пра гэта таму, што мы не можам затрымлівацца больш у семнаццатым стагоддзі. Бывай, спалены і зруйнаваны, але непакорны Пінск!

Кілім-самалёт імчыць нас насустрач новым часам і новым падзеям.

# ТРЫ КРУГІ НАД МІНСКАМ

*Ці той гэта горад? Козы на княжым дзядзінцы. Конная хеўра. Шлагбаум, будка і коміны. Новыя вуліцы. За Доўгім Бродам. Крумкач крумкачу вока не выдзеўбе. Французы на Саборнай плошчы. Пераправа ля Студзёнкі*

А Мінск?

Што зрабілася з ім за гэтыя некалькі стагоддзяў?

Мы падлятаем да знаёмых мясцін.

Робім круг, зніжаемся...

Вось і Свіслач... Якая яна стала вузкая, мелкая. А Няміга зусім знікла. Вуліца ёсць, а рэчкі не відаць. Толькі каля самай Свіслачы невялікім ручаём выбягае яна з-пад драўлянага насцілу.

Апускаемся яшчэ ніжэй...

Вось яна, знаёмая Замкавая гара. Але выгляд у яе зусім не той. Ні замкавай сцяны, ні брамы, ні княжых харомаў. Вал абваліўся. Схілы гары паасыпаліся, і яна выглядае цяпер не такой высокай. Сярод счарнелых бярвенняў былога дзядзінца пасвяцца козы, свінні, гусі.

Стары драўляны мост, перакінуты цераз раку ад замчышча да супрацьлеглай гары, якая называецца Траецкай, стогне і рыпіць. З’езджаныя дошкі насцілу хістаюцца, трашчаць і грукаюць пад коламі рэдкіх павозак. Ціха і непрыкметна плыве сонная, звілістая Свіслач сярод балоцістых лугавін і пустак з кучамі смецця.

Пад гарой жанчыны мыюць у рацэ бялізну. Крыху далей ходзіць па зялёнай лугавінцы бусел.

Ціха вакол, спакойна. Адразу відаць, што месца гэтае абязлюднела, страціла сваё былое абароннае і эканамічнае значэнне.

І сам горад з выгляду бадай ужо і не горад, а глухі закутак, занядбанае мястэчка. Калі б мы з вамі паспрабавалі падлічыць колькасць дамоў у Мінску канца XVIII стагоддзя, а мы знаходзімся над ім якраз у гэты час, то

налічылі б не больш за тысячу. І амаль усе яны, як бачыце, драўляныя. Гэта хутчэй хаціны, а не дамы. Толькі некалькі дзесяткаў будынкаў мураваныя.

На плошчы драўляныя столікі з паветкамі сведчаць аб тым, што тут у рыначныя дні ідзе такі-сякі дробны гандаль. Вуліцы не брукаваныя. На некаторых нават расце трава. Нізенькія шэрыя домікі хаваюцца за шэрымі платамі сярод садоў і агародаў.

Вас цікавіць, чым займаюцца жыхары Мінска ў канцы XVIII стагоддзя? Большасць з іх — непісьменныя земляробы. Яны амаль нічым не адрозніваюцца ад сялян. Рамёствы ў горадзе амаль забыты. Насельніцтва збяднела. Некалькі кузняў і чатыры млыны — вось і ўся прамысловасць. Некалькі невялікіх крам — вось і ўвесь гандаль...

Гэта вынік бясконцых войнаў і панскай бязладзіцы. Адна толькі Паўночная вайна, якую вёў рускі цар Пётр Першы з каралём Швецыі Карлам XII цягнулася з 1700-га па 1721 год. А яна ж захапіла тэрыторыю Беларусі, Можаце сабе ўявіць, якія вялізныя страты і разбурэнні прынесла Паўночная вайна беларускаму народу за гэтыя цяжкія дваццаць гадоў!

Але глядзіце ўніз!.. Пакуль мы з вамі гаворым, там нешта здарылася.

Цішыню соннага горада парушае конскі тупат, брэх сабак, п’янае галёканне. З канца ў канец вуліцы імчыцца конная хеўра. Прыгледзьцеся да коннікаў. Рознакаляровыя шляхецкія кунтушы... Зухавата закручаныя вусы... Наперадзе — вяльможны пан з аголенай шабляй. У яго і конь лепшы і адзенне багацейшае. Астатнія — дробная шляхта, якая залежыць ад пана, і гайдукі.

Рэдкія прахожыя кідаюцца ў бакі, хаваюцца за агароджамі, каб не трапіць на вочы раз’юшаным коннікам.

Толькі шыракаплечы гарбар выйшаў з нізкіх дзвярэй сваёй майстэрні. Выцершы дужыя рукі аб скураны фартух, ён з нядобрай усмешкай глядзіць услед панскай

хеўры, нібы хоча сказаць: «Пачакайце! Даскачацеся, панкі!..»

Куды ж гэта выправіўся пан са сваімі прыхлёбнікамі? Я магу вам сказаць беспамылкова — у «наезд». Наляціць такая хеўра на суседні маёнтак, абрабуе, спаліць, а зямлю далучыць да ўладанняў свайго пана. Забярэ пан сабе і прыгонных сялян, што застануцца жывыя пасля «наезду».

А тым часам другі пан, яшчэ больш вяльможны і магутны, можа напасці на гэтага...

Краіна даведзена да агульнага заняпаду, а паны ні аб чым не дбаюць, ні аб чым не хочуць задумвацца. Няма мяжы іх самавольству і самаўпраўству.

Калі б мы наведалі зараз іншыя гарады Беларусі, то ўбачылі б тое ж самае. Большасць гарадоў ператварылася ў вёскі.

Акрамя Мінска, толькі сем гарадоў — Брэст, Гродна, Пінск, Мазыр, Ліда, Навагрудак і Ваўкавыск — захавалі права называцца гарадамі. Можа, паглядзець і на іх? Паляцець туды? Але ці варта затрымлівацца доўга ў адным стагоддзі? Нам трэба яшчэ столькі ўсяго пагледзець. І вось наш кілім робіць другі круг над Мінскам...

Ну і кілім-самалёт!..

Нездарма мы яго запазычылі ў казках.

Гэта ж падумаць трэба! Толькі што мы бачылі Мінск у поўным заняпадзе, а цяпер... Зусім як у кіно, дзе кадры, знятыя ў розныя часы, змяняюцца на экране ў некалькі хвілін.

Пад намі як быццам той самы, добра знаёмы краявід. Замкавая гара з рэшткамі драўляных абарончых збудаванняў. Нізінка ля Свіслачы, дзе знаходзіўся калісьці старажытны гарадскі цэнтр са старым рынкам... Але глядзіце, як вырас горад. Як змяніўся яго выгляд. Колькі новых дамоў. І не такія, як раней. Многія ў два паверхі.

Першы — мураваны, а другі — драўляны. Ёсць нават і дамы ў тры паверхі. Гэтыя ўжо цалкам мураваныя. І новыя драўляныя дамы — вялікія, не падобныя на вясковыя хаты.

Новыя гарадскія вуліцы ўзбеглі на бліжэйшыя пагоркі. Адна з іх, самая доўгая, пралегла якраз там, дзе потым вырасце наш цудоўны Ленінскі праспект. З нашага пункту погляду, яна яшчэ даволі вузкая, але шырэйшая і раўнейшая за ўсе іншыя. Канец гэтай новай вуліцы ўпіраецца ў гарадскую заставу з паласатым шлагбаумам і такой жа паласатай будкай, ля якой стаіць вартавы. На ім чорны лакіраваны ківер[1], зялёны мундзір і белыя штаны. Такія вартавыя, іх называлі будачнікамі, стаяць ва ўсіх гарадах Расійскай імперыі. Стаяць яны цяпер і ў Мінску.

Месцамі новая вуліца забудавана яшчэ не поўнасцю. Тут цягнуцца ўчасткі густога лесу, а недалёка ад заставы, якраз там, дзе цяпер узнімае свае магутныя зялёныя кроны цэнтральны сквер, знаходзіцца... гарадская звалка. З усяго горада звозяць сюды смецце і розныя адкіды. Затрымлівацца над гэтым месцам не вельмі прыемна...

Адразу за шлагбаумам ідзе круты зялёны спуск уніз, да Свіслачы. На тым беразе ракі раскінуўся гарадскі парк з маладзенькімі ліхцвянымі дрэўцамі. Ён з'явіўся тут зусім нядаўна. Потым, больш як праз сто трыццаць гадоў, гэты парк будзе называцца паркам імя Максіма Горкага.

За маладым паркам пачынаецца топкае балота, перасечанае дарогай, якую мясцовыя жыхары называюць Доўгім Бродам.

Цяпер зірніце сюды. Крыху далей, на паўночным усходзе, віднеюцца хаціны невялікага мястэчка. Гэта — Камароўка. Яна пачынаецца адразу за балотам, якое ператворыцца потым у плошчу Якуба Коласа. А пакуль

[1] Ківер — вайсковы галаўны ўбор з цвёрдай лакіраванай скуры.

што Камароўка знаходзіцца ў трох вярстах ад горада. З гэтага мястэчка, жыхарам якога ўлетку надта дакучаюць камары, разыходзяцца дзве дарогі. Адна вядзе да Лагойска, а другая — да Барысава і далей аж да самай Масквы.

Другі канец новай вуліцы ў супрацьлеглым баку горада пераходзіць таксама ў дарогу, якая называецца Койданаўскай. Яна вядзе да Брэста і далей да Варшавы.

І на Маскоўскім, і на Лагойскім, і на Койданаўскім трактах даволі ажыўлена. Бачыце, як, вязнучы ў пяску, паўзуць па іх то асобныя фурманкі, то цэлыя абозы з купецкімі таварамі...

А вось імчыць, абганяючы абоз, памешчыцкая карэта з параю белых сытых коней. Фурман на высокіх козлах зухавата пакрыквае, памахваючы ў паветры доўгім гнуткім бізуном...

І на вуліцах горада даволі людна. Усюды крамы, і маленькія, і вялікія. На шматлікіх базарах поўна людзей. Ніхто ўжо, відаць, не баіцца, што наляціць раптам аднекуль конная хеўра панскіх свавольнікаў і наробіць гвалту.

Мінск, нядаўна яшчэ заняпалы, абудзіўся да жыцця. А між тым часу пасля таго, як мы зрабілі свой папярэдні круг над Мінскам, прайшло зусім мала. Усяго якіх дваццаць — дваццаць пяць гадоў!.. Чвэрць стагоддзя!.. Для гісторыі, як і для нас — уладальнікаў кіліма-самалёта, гэта ўсё роўна што адно імгненне. Але здараюцца ў жыцці народаў і краін такія падзеі, якія адразу змяняюць іх далейшы лёс.

Што здарылася з Мінскам за гэты невялікі час? Што адбылося на Беларусі? Зірнём у наш каляндар...

Ну, вядома! У 1795 годзе Беларусь уз'ядналася з Расіяй. Гэта і вывела яе з разрухі і заняпаду. А Мінск апынуўся на адным з асноўных шляхоў гандлю паміж Масквой і Заходняй Еўропай.

Мы бачым першыя вынікі ўз'яднання, бо кружым над горадам у пачатку XIX стагоддзя.

А што гэта за будынкі на ўскраінах горада, незвычайныя для нядаўняга Мінска? Над некаторымі з іх узнімаюцца высокія жалезныя коміны. Гэта ўжо нешта зусім новае. Гэта падобна на фабрыкі...

Так, мы не памыліліся.

Гэта і ёсць фабрыкі, хоць пакуль яшчэ і вельмі маленькія.

Першыя фабрыкі, якія выраслі з асобных малых майстэрняў.

У Мінску растуць не толькі склады гандлёвых тавараў, але і суконныя, гарбарныя, ганчарныя, мылаварныя майстэрні, лесапільныя і цагельныя заводы. Пашырылася яго тэрыторыя, расце колькасць жыхароў. Развіваецца лёгкая і харчовая прамысловасць. Цяпер Мінск — губернскі горад Расійскай імперыі.

Вы ўсміхаецеся?

Зразумела, той, хто ведае сучасны Мінск, не можа не ўсміхнуцца, калі мы называем саматужныя майстэрні і невялікія заводзікі прамысловасцю. Але для таго часу, у якім мы апынуліся, дзякуючы нашаму кіліму, гэта ўжо не малое дасягненне. Асабліва, калі мы ўспомнім тое, што бачылі ў Мінску зусім нядаўна, у канцы XVIII стагоддзя.

Дарэчы, хто гэты чалавек, што выйшаў з невялікага цаглянага будынка? Ці не падобны ён на таго гарбара, якога мы бачылі ў час нашага першага круга над Мінскам? Помніце?

Так, гэта, бясспрэчна, ён. Толькі пасівеў, пастарэў, небарака. А будынак, перад якім ён стаіць, нічым не нагадвае тую пахілую брудную хаціну, у якой ён тады працаваў. Гэта не саматужная гарбарня, а невялікі скураны завод. І працуе на ім не менш двух дзесяткаў чалавек. Выгляд у гарбара стомлены. Нялёгка, напэўна, жывецца старому. Відаць, давялося яму, як і многім іншым дробным саматужнікам, кінуць сваю прымітыўную майстэрню і наняцца працаваць да больш спрытнага і заможнага гаспадара.

Гарбар падышоў да чалавека ў сялянскай світцы, павітаўся. Пра нешта яны гавораць.

Мы нават пачулі некалькі сказаў.

— Вось,— кажа гарбар,— чакалі мы ад новай улады палёгкі...

— Ат, братка,— адказвае селянін,— каму новая ўлада, а нам — усё тая ж. Як быў над намі наш пан, так і застаўся.

— Крумкач крумкачу вока не выдзеўбе,— змрочна згаджаецца гарбар.

Мы ўжо адляцелі і далейшай размовы не чуем. Але чаму — крумкач крумкачу?.. Што мелі на ўвазе гарбар і селянін?

Здагадацца не цяжка.

На чале Расійскай дзяржавы стаяць цар і памешчыкі. Царская ўлада зусім не збіраецца крыўдзіць магнатаў.

Па-ранейшаму забаронена беларуская мова. Па-ранейшаму сяляне застаюцца прыгоннымі. Па-ранейшаму працоўным жывецца вельмі цяжка...

А новыя дамы, што выраслі ў Мінску? Яны належаць царкве, памешчыкам, многія з якіх перабіраюцца на зіму ў горад, купцам, уладальнікам фабрык і заводаў, буйнейшых майстэрняў...

Вось і скончыўся другі наш круг над Мінскам. Пачынаецца трэці...

Але як усхадзіўся раптам вецер. А снегу, снегу... Яшчэ толькі восень па календары — і такая завіруха... Нічога не відаць...

Што ж, паспрабуем апусціцца ніжэй...

Нарэшце замільгалі крыжы на званіцах. Паказалася вежа гарадской ратушы. Мы над Саборнай плошчай — так пачалі называць пасля ўз'яднання з Расіяй былое Высокае месца. Вось і прыгожы двухпавярховы губернатарскі дом, пабудаваны нядаўна каля ратушы і касцёла.

Але чаму на плошчы столькі людзей у вайсковай форме? І форма на іх нейкая незнаёмая! Мільгаюць дзе-нідзе чырвоныя даламаны[1] і цёмныя шапкі гусараў, бліскучыя каскі кірасіраў, упрыгожаныя чорнымі конскімі хвастамі, зялёныя мундзіры, шэрыя плашчы і чорныя чатырохвуголкі пехацінцаў. Хто гэтыя людзі? Адкуль яны ўзяліся? Усюды гучыць французская мова.

Усё зразумела, гэта — салдаты французскага імператара Напалеона. На гэты раз мы апынуліся над Мінскам восенню 1812 года.

Парадку сярод вайскоўцаў нешта не відаць. На плошчы перамяшаліся салдаты і афіцэры розных родаў войск. І апрануты многія з іх больш чым дзіўна. На плячах у некаторых мы бачым паверх вайсковай формы конскія папоны, цёплыя жаночыя кофты і хусткі, купецкія футры, сялянскія кажушкі, а вунь той хударлявы чарнавусы артылерыст нацягнуў на сябе нават папоўскую расу і грэе рукі ў шырокіх рукавах, а сам калоціцца ад холаду.

Салдаты ўсхваляваны. Змрочныя дайшлі да іх чуткі. Кожны імкнецца праціснуцца наперад. Кожны хоча на ўласныя вушы пачуць, што скажа начальства.

Ці праўда, што Напалеон пакінуў спаленую Маскву і Вялікая армія адступае ў непарадку? Ці праўда, што рускія наблізіліся да Мінска з захаду, адкуль іх ніхто не чакаў? І што атрад, высланы ім насустрач, разбіты пад Койданавам? Што рабіць, каб не трапіць у акружэнне, не апынуцца ў палоне?

Але на балкон губернатарскага дома ніхто не выходзіць. Французскі губернатар, прызначаны Напалеонам, уцёк з усёй сваёй світай...

Неба цямнее. Дзьме халодны вецер. Мокры снег пачынае ісці мацней. На плошчы расце паніка.

Ці не час спыніць нам свой трэці круг над Мінскам? Паглядзім цяпер, што робіцца на дарогах з Масквы на захад.

---

[1] Д а л а м а н — куртка.

Вецер суняўся, завея скончылася. У цёмным небе з'явіўся месяц, засвяціліся зоркі. Мы чуем, як патрэскваюць ад марозу дрэвы. Але нам з вамі ніякі мароз не страшны. На сваім кіліме-самалёце мы не адчуваем ні холаду, ні спякоты, ні вільгаці, ні ветру. Такая ў кіліма асаблівасць. На ім і вакол яго трымаецца заўсёды ўстойлівая, нармальная для нас тэмпература, нібы ў кабіне касмічнага карабля.

А ўнізе што робіцца?

Яшчэ лістапад, а дарогі занесены снегам. Толькі бярозы ў шэрані паказваюць, дзе праходзіць так званы Кацярынінскі шлях, пракладзены ад Масквы да Варшавы рукамі прыгонных сялян адразу пасля ўз'яднання Беларусі з Расіяй.

І Бярэзіна недалёка ад Барысава нібы заснула пад покрывам пушыстага снегу.

Паглядзіце ўважлівей на гэтую мясцовасць. Што? Нічога асаблівага? Так, пазнаць яе цяпер нялёгка. А між тым мы з вамі былі ўжо тут раней. Гэта тое самае месца, дзе некалькі дзесяткаў тысячагоддзяў назад мы бачылі статак мамантаў і паселішча нашых вельмі далёкіх продкаў...

А гэта што? Проста з-пад снегу тырчаць печы і коміны. Іх даволі многа. Дзе-нідзе снег не паспеў яшчэ прыцерушыць рэшткі дамоў, хлявоў, пуняў...

Яшчэ нядаўна тут было сяло... Вось яно — на канцы... Гэта Студзёнка... Ну, цяпер усё зразумела. Усе хаты ў сяле разабраны французскімі сапёрамі па загаду Напалеона. Бярвенне і дошкі пайшлі на пабудову двух мастоў, каб адступаючая армія магла пераправіцца цераз Бярэзіну.

Вось і сапёры. Адны з іх скончылі сваю працу і грэюць цяпер здубянелыя рукі і ногі. Астатнія, як мурашкі, мітусяцца на другім, не дабудаваным яшчэ мосце.

А на гэтым баку ракі, на Кацярынінскім шляху, цягнецца нейкая бясконцая цёмная стужка.

Гэта брыдуць французскія салдаты. Яны адступаюць ад спаленай Масквы, ад разбуранага Смаленска. Адно ў іх жаданне, адно імкненне — хутчэй пакінуць Расію, хутчэй дабрацца да Францыі. Яшчэ нядаўна, у чэрвені, прайшлі яны праз гэтыя мясціны на ўсход як гордыя і непераможныя заваёўнікі свету, а цяпер брыдуць назад няшчасныя, знясіленыя. Брыдуць па спустошанай імі ж краіне, і цяпер самім няма чаго есці. Яны падаюць ад стомы, пакутуюць ад непрывычнага холаду, ад якога не ратуюць ні коўдры, ні шалі, ні жаночыя хусткі.

Перадавая калона французскіх салдат падыходзіць да Бярэзіны...

Глядзіце, глядзіце, што тут робіцца! Кожны спяшаецца да пераправы, кожны імкнецца хутчэй апынуцца на тым беразе. Ля двух хісткіх мастоў узнікае штурханіна і мітусня. Масты перапоўнены людзьмі, і гэта замаруджвае пераправу.

Але ж дзе рускія войскі? Яны не могуць спазніцца! Хіба могуць яны дапусціць, каб французы пераправіліся цераз Бярэзіну? Мы ж ведаем з гісторыі, што якраз тут, ля Студзёнкі, Напалеон павінен страціць сваю армію...

І вось — бачыце? Нарэшце!

Па заснежаным полі ляціць на французаў конная лавіна. Пагрозна нахілены вострыя пікі, блішчаць клінкі казацкіх шабляў.

З бліжэйшага ляска паказалася тым часам другая група — пешая. Мы заўважаем шмат людзей у звычайным сялянскім адзенні. Замест зброі ў многіх да бляску навостраныя косы і вілы. Гэта мясцовыя сяляне — беларусы. Яны пайшлі ў партызаны і разам з рускімі войскамі гоняць цяпер чужынцаў з роднай зямлі. Паміж іх вылучаецца сваім вайсковым убраннем і сапраўднай зброяй некалькі коннікаў — рускі афіцэр са сваімі гусарамі...

А яшчэ далей узнікаюць раптам на фоне белага снегу дзве вялізныя хмары. Французы яшчэ не бачаць іх, а

нам добра відаць, як з двух бакоў пераправы набліжаюцца рускія войскі. Загрымелі гарматы.

Пад агнём рускай артылерыі французы кідаюцца на масты вялікім натоўпам.

Масты — адзіны ратунак.

Заднія нецярпліва націскаюць на пярэдніх. Зробленыя наспех парэнчы не вытрымліваюць. Многія салдаты, коні і павозкі падаюць уніз. Тонкі лёд праламваецца, многія тонуць у халоднай вадзе.

Глядзіце, як угінаюцца пад непамерным цяжарам масты. Трашчаць дошкі, рыпяць бярвенні. І раптам — жудасны крык павісае над ракой. Адзін з мастоў абрушваецца, і ўсе, хто на ім быў, падаюць у ваду...

А сам Напалеон даўно ўжо на тым беразе. Вось ён стаіць на пагорку. Невысокага росту, у зялёным мундзіры і чорнай трохвуголцы. На плечы накінута цёплае футра. Рукі скрыжаваны на грудзях. Пра што думае імператар, гледзячы, як гінуць рэшткі яго непераможнай арміі, ад якой засталіся толькі асобныя разрозненыя групы?

Твар Напалеона пабялеў і стаў нібы высечаны з каменя. Раптам ён паклікаў аднаго з афіцэраў сваёй світы. Нешта яму загадаў. Той спачатку нібы аслупянеў ад нечаканасці, потым схамянуўся і пабег.

І вось — людзі з факеламі ў руках падпальваюць уцалелы мост. Людзі ў французскай форме. Што ж гэта яны робяць?! На тым беразе застаецца большая частка французскіх салдат, застаюцца іх таварышы. Але такі загад Напалеона — спаліць мост, каб перашкодзіць пераправе рускіх. Што яму да салдат, якія не паспелі пераправіцца...

Мы ведаем, што адсюль Напалеон уцячэ ў Смаргонь. А там ён пераапранецца ў форму польскага афіцэра і на самых лепшых конях памчыцца ў Парыж, пакінуўшы сваіх салдат у вялікай бядзе...

Але мы не паляцім за ім. Не паляцім мы зараз і ў іншыя мясціны, дзе адбываліся славутыя падзеі вайны супраць Напалеона. А на Беларусі такіх мясцін нямала. Вялікія бітвы пад Магілёвам, пад Віцебскам, пад Полацкам назаўсёды ўвайшлі ў гісторыю. На беларускай зямлі французам было гэтак жа нясоладка, як і ў Расіі...

Усё хутчэй і хутчэй імкнецца кілім-самалёт да больш блізкіх нам часоў...

## БЫВАЙ, КІЛІМ-САМАЛЁТ!..

Шмат цяжкіх нягод давядзецца яшчэ пераадолець беларускаму народу...

Кілім-самалёт ідзе на пасадку.

Вось і скончылася наша падарожжа ў мінулае!

Дзіўныя карціны былога жыцця народа, вобразы прыгнёту і пакут, цяжкай працы і гераічнага змагання прайшлі перад нашымі вачамі. Прайшлі і адышлі ў нябыт, як сон, зніклі ў віры гісторыі.

Мы зноў у нашай эпосе. Як добра, што мы вярнуліся! Тут усё нам так блізка, знаёма, зразумела.

Чароўны кілім-самалёт саслужыў нам добрую службу, але ўсяму свой час. Для другой паловы дваццатага стагоддзя кілім як сродак перасоўвання, мабыць, ужо і не вельмі падыходзіць. Цяпер да нашых паслуг столькі разнастайных відаў сучаснага транспарту!

Бывай, наш слаўны, цудоўны кілім! Вяртайся ў свае казкі, а мы пачнём новае падарожжа.

Падарожжа ў сучасную Беларусь.

## *НА ПРАСТОРАХ БЕЛАРУСІ*

### БЕЛАВЕЖСКАЯ ПУШЧА

Мы едзем у паўночным напрамку ад Брэста. Шэсцьдзесят кіламетраў — нязначная адлегласць у наш час. Нават калі ехаць звычайным аўтобусам.

Наперадзе паявілася высокая белая вежа. Значыць, і да пушчы ўжо рукой падаць. І назву сваю яна атрымала ад гэтай белай вежы, якую продкі беларусаў пабудавалі тут разам з паселішчам Камянец у XIII стагоддзі. Тады яна была назіральным пунктам для вартавых. Цяпер гэта проста гістарычны помнік, маўклівы сведка падзей, што адбываліся тут на працягу многіх стагоддзяў.

З гістарычных крыніц вядома, што, пачынаючы з XV стагоддзя, у Белавежскую пушчу ездзілі на паляванне літоўскія князі, польскія каралі і, нарэшце, рускія цары. У час апошняга палявання ў жніўні 1900 года цар і яго прыдворныя на працягу дванаццаці дзён забілі ў пушчы 40 зуброў, 36 ласёў, 530 аленяў, 138 дзікоў, 325 казуль. Гэта было не паляванне, а сапраўдная бойня.

Пакуль мы гаворым, на нас няўхільна наплывае высокая і шчыльная сцяна спрадвечнага лесу. Магутным зялёным морам раскінуўся ён у водападзеле Заходняга Буга, Нёмана і Прыпяці і займае тэрыторыю каля 130 тысяч гектараў.

Дзяржаўная граніца падзяляе Белавежскую пушчу на дзве амаль роўныя часткі. Заходняя належыць Польшчы, а ўсходняя — нам.

Аўтобус збочыў з галоўнай дарогі і падскоквае на карэннях, што выбіліся з-пад наезджанай зямлі. Перад намі адкрываюцца прыгожыя і маляўнічыя пейзажы пушчы, то змрочныя, поўныя суровай велічы, то светлыя, лёгкія і радасныя.

Чыстае паветра сасновага бору пахне жывіцай. Стромкія ствалы «карабельных» соснаў высока ўзнімаюцца

ў сіняе неба. Быццам звонкія залатыя мачты, гнуцца яны і звіняць пры самым нязначным павеве ветру. А крыху далей, за вясёлым сасоннікам на ўзгорку, стаяць у задуменным спакоі кучаравыя дубы-асілкі і моўчкі паглядаюць уніз, на каляровую ад кветак лугавіну, дзе сабраліся разам, нібы на карагод, тонкія беластвольныя красуні бярозкі.

Бярозавы гай змяняецца змешаным лесам. Тут растуць і вялізныя сівыя яліны, і ясень, і вяз, і граб, і дуб, і клён, і рабіна, і ліпа, і арэшнік. Здаецца, няма ні канца ні краю незлічонаму лясному багаццю, паэтычнай лясной разнастайнасці.

Белавежская пушча з'яўляецца часткай тых вялікіх першабытных лясоў, якія пакрывалі ў дагістарычныя часы амаль увесь абшар Еўропы. Па сваіх памерах, па багацці і разнастайнасці флоры і фауны, па прыгажосці краявідаў Белавежская пушча займае першае месца сярод буйных лясных масіваў Еўропы. Тут захаваліся ў прыродных умовах рэдкія звяры і птушкі, якія даўно ўжо зніклі ва ўсіх іншых краінах.

Яшчэ ў 1915 годзе ў пушчы налічвалася 730 зуброў. Амаль усе яны былі знішчаны ў час Першай сусветнай вайны, а многія вывезены ў Германію, адкуль іх прадалі розным звярынцам і заапаркам. У 1941 годзе, напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны, у пушчы было ўсяго дваццаць зуброў. Цяпер іх налічваецца больш за восемдзесят. Частка зуброў знаходзіцца пад навуковым наглядам на тэрыторыі гадавальніка. Астатнія жывуць у лесе на волі.

Глядзіце, глядзіце! З ляснога гушчару, з-пад векавых ялін, выходзіць на паляну зубр. Вось ён спыніўся, схіліў магутную галаву. Увесь выгляд яго здзіўляе веліччу і магутнасцю. Такіх самых зуброў мы бачылі з кіліма-самалёта, калі рабілі падарожжа ў далёкае мінулае. Цяпер вы яшчэ раз можаце пераканацца ў тым, што сучасныя нашы белавежскія зубры нічым не адрозніваюцца ад сваіх дагістарычных продкаў.

У Белавежскай пушчы шмат дзікіх свіней. Зімою ў пошуках корму яны ходзяць па лесе чарадой, пракопваючы ў снезе цэлыя траншэі. Наперадзе ідуць, пракладаючы дарогу, старыя і самыя дужыя дзікі, а за імі спяшаецца маладняк. З дзікімі кабанамі сустракаюцца часам хатнія свінні, якія ходзяць у лес па жалуды. І ў навакольных вёсках на ўскраіне пушчы нярэдка можна ўбачыць на сялянскім панадворку жоўтых стракатых парасят — патомства дзікага вепра.

Жывуць у пушчы і высакародныя еўрапейскія алені — прыгожыя, стройныя і дужыя, з раскідзістымі рагамі. Многа тут і невялікіх казуль — спрытных, палахлівых і грацыёзных. У балоцістых зарасніках, у поймах рэчак з нізкімі і топкімі берагамі, з высокай травой можна сустрэцца неспадзявана з ласём.

Бабры, якіх калісьці было так многа ў белавежскіх лясах, зніклі яшчэ ў пачатку мінулага стагоддзя. Але пасля вайны, узятыя пад ахову дзяржавай, яны з суседніх вадаёмаў перасяліліся сюды зноў і восеньскімі начамі пачалі будаваць на ціхіх лясных рэчках свае хаткі і грэблі.

У пушчы вядуцца і такія каштоўныя ў прамысловых адносінах звяры, як выдра, куніца, тхор, гарнастай, ваверка, ліса.

На тэрыторыі запаведніка бязлітасна знішчаюцца драпежнікі. Ваўкоў тут адстрэльваюць ва ўсякую пару года. На гэтых шэрых разбойнікаў ніякіх абмежаванняў няма. Адстрэл ваўка з'яўляецца службовым абавязкам белавежскіх егераў.

Нямала ў белавежскіх лясах глушцоў, цецерукоў, рабчыкаў і курапатак, вальдшнэпаў і бекасаў, а на балотах і рэчках — дзікіх качак, жораваў, буслоў, розных кулікоў. У непраходнай глухамані гняздзіцца на векавых дрэвах рэдкі птах — чорны бусел.

Вясной і ў пачатку лета лясы Белавежскай пушчы поўны кіпучага жыцця, птушынага спеву і гоману.

Непадалёку ад лясных рэчак выводзіць свае чароўныя трэлі сціплы начны спявак — салавей. Гарэзна свішчуць вясёлыя шпакі. Спяваюць берасцянкі, чыжы, шчыглы, дразды, пеначкі. Кукуе зязюля. У свежым маладым лісці ад зары да зары не змаўкае шматгалосы птушыны хор. Чуеце? Паспрабуйце адрозніць песні адной лясной пявунні ад другой!

Добра зараз у пушчы. Але нялёгка прыходзіцца яе жыхарам у суровы зімовы час. Маладыя дзікі не могуць часам выбрацца з глыбокага снегу і выкапаць сабе корм з абледзянелай зямлі. Яны выбіваюцца з сіл і гінуць ад холаду і голаду. Амаль адзіным кормам казулі і аленя з'яўляюцца зімою галінкі маладых дрэўцаў і кустоў. Казулі і алені слабеюць ад недахопу корму, ад барацьбы з завеямі і нярэдка становяцца здабычай ваўкоў.

Зуброў ахоўвае ад сцюжы густая і цёплая поўсць, але зімой не хапае корму і зубрам. Яны выкопваюць з-пад снегу леташнюю траву, кормяцца карой і галінкамі дрэў. Вось тут і прыходзіць на дапамогу лясным звярам чалавек.

Бачыце на палянцы кармушку? Зараз яна пустая. А зімой егеры прывозяць сюды і кладуць пад паветкай сена, авёс, гародніну і соль, раскідваюць па снезе бульбу, каб падтрымаць сілы казуль, аленяў, ласёў, дзікоў і зуброў у бяскорміцу, каб лясным жывёлінам лягчэй было перажыць суровую сцюжу. Для зуброў рыхтуюць на зіму цэлыя стагі сена. Лясныя жыхары знаюць гэтыя месцы і часта сюды наведваюцца. Тут лёгка за імі назіраць.

У новым будынку знаходзіцца сядзіба запаведніка, заалагічны музей, прэпаратарная і лабараторыі. Тут вядзецца вялікая навукова-даследчая работа, вывучаюцца прыродныя багацці пушчы, яе жывёльны і раслінны свет. Тут робіцца ўсё, каб гэтыя багацці не скарачаліся, а павялічваліся. Тут праходзяць сваю першую навуковую практыку студэнты. Тут гасцінна прымаюць турыстаў і экскурсантаў, якія жадаюць непасрэдна

азнаёміцца з цудоўнай прыродай пушчы, з яе рэдкімі звярамі і птушкамі.

Вопытныя егеры штодзённа вядуць назіранні за жыццём пушчы. Кожны егер добра ведае птушак і звяроў з усімі асаблівасцямі іх паводзін, з усімі іх звычкамі і норавамі. Егеры кальцуюць не толькі птушак, але і звяроў, пачынаючы ад маладых дзікоў і канчаючы такімі дробнымі, як соні. Звесткі, атрыманыя егерамі, абагульняюцца і вывучаюцца навуковымі работнікамі.

Нездарма гаворыць паэт Пімен Панчанка:

У славутай нашай пушчы —
Рай для птушак і вучоных.

Белавежская пушча — сапраўдны музей жывой прыроды, вялізная навуковая лабараторыя. І як добра, што мы з вамі хоць трошкі змаглі пазнаёміцца з ёю.

## КРАЙ ЛЯСОЎ, БАЛОТ І КАЗАК

Мы ляцім на самалёце ў Пінск.

Пад намі рассцілаецца непаўторны пейзаж Беларускага Палесся.

Прыгледзьцеся да яго ўважлівей! Такога краявіду вы не знойдзеце бадай што нідзе на ўсёй тэрыторыі Еўропы. Ляцім мы даволі нізка, і нам добра відаць амаль усе яго дэталі.

Зялёныя масівы лясоў, бясконцыя балоты з густой, высокай травой і хмызнякамі, блакітныя люстэркі азёр, малых і вялікіх. Звілістыя рэкі, рэчкі і рачулкі прабіваюцца вузкімі стужкамі скрозь зараснікі вербалозу, трысця і чароту. Яны то знікаюць у балоце, то раптам з'яўляюцца зноў і часам так пераплятаюцца, што нялёгка разабрацца, дзе канчаецца адна рэчка і дзе пачынаецца другая.

Павольна расплываюцца яны між балоцістых лугоў, ствараюць шырокія плёсы і затокі з жоўтымі гарлачыкамі і белымі лілеямі ў цёмнай вадзе.

Берагі ў палескіх рэк нізкія, топкія. Назвы — старажытныя, казачныя, летапісныя — Ясельда, Цна, Случ, Лань, Пціч, Арэса, Славечна, Смердзь...

Ад вялікай колькасці такіх рэк і рэчак з непрыкметнай, нібы соннай, плынню бярэ свой пачатак вялікая і паўнаводная Прыпяць, галоўная рака Палесся. Шырокай светлай паласой серабрыцца яна перад намі на даляглядзе.

Бачыце гэтыя светла-жоўтыя, амаль белыя, часам даволі вялікія выспы сярод зялёных пералескаў, лугоў і балот? Вы, напэўна, і самі іх заўважылі. Вось яшчэ адна, вось другая, крыху меншая. Вось і трэцяя...

Так, гэта пяскі. Гэта выдмы, ці дзюны. Іх на Палессі нямала. Дзе няма вады, там амаль заўсёды пясок. А часам бывае і так, што на адкрытым месцы балота хаваецца пад верхнім пластом навеянага ветрам пяску. Ідзе чалавек па пяску,ісці цяжка, ногі вязнуць, але ўсё ж такі ідзе, бо трэба. Вось ён выходзіць на роўнае месца паміж дзюн і раптам адчувае, што ногі страцілі цвёрдую апору. З кожным крокам усё глыбей пагружаюцца яны ў пясок. Спачатку па калені, потым яшчэ вышэй. Чалавек пачынае тануць у зыбучым пяску. Вось пясок ужо яму па грудзі. Бяда, калі не здолее падарожнік выбрацца, павярнуўшы своечасова назад...

Лес, балота, пясок. Добрай глебы мала. Зямля ўсюды скупая, няўдзячная, неўрадлівая. Таму і хлеба на Палессі ў старыя часы заўсёды не хапала. Мясцовыя жыхары часта дамешвалі да жытняй мукі кару дрэў, сухія травы, мох і розныя карэнні. Памяць аб гэтых нядобрых часах захавалася ў такіх красамоўных назвах палескіх вёсак, як Караеды і Махаеды. Удумайцеся ў сэнс гэтых слоў!..

Прыслухайцеся і да такіх назваў палескіх сёл, як Белая Лужа, Жоўты Бераг, Ставок, Прудок, Бродні-

ца, Парэчча, Макрэц, Гліна, Пяскі, Замошша, Рагозна, Арэхава, Бярозцы, Сосны, Вярбовічы. У гэтых назвах трапна і выразна адлюстраваны прыродныя асаблівасці нізіннага, лясістага, балоцістага і пясчанага краю...

Раней Палессе справядліва лічылася ўвасабленнем беднасці, адсталасці, патрыярхальшчыны. Скажа хто-небудзь: «Палессе», і адразу ўяўляюцца вільготныя і змрочныя лясы, непраходная дрыгва, нізенькія хаткі, як старыя, гнілыя грыбы пад саламянымі, замшэлымі стрэхамі, зрэбныя доўгія кашулі і лыкавыя лапці, прыгнёт і пакорлівасць, цемра і непісьменнасць, прымхі і забабоны, знахары і шаптухі, балотныя ліхаманкі. І зразумела, нячэсаныя валасы, збітыя ў каўтун.

Пра гаротнае жыццё палешукоў дарэвалюцыйнага часу так пісаў Янка Купала:

Пад шум бесканечны
Бярозаў і соснаў
Сахой недарэчнай
Аруць пясок млосна.

Іх розум балота
Трымае палонна,
Красуе цямнота,
Растуць забабоны.

Легенды і казкі
Прыгонных законаў
Паўзуць мохам вязкім,
Багуннем зялёным.

Праз леты і зімы
Паданне йшло ў векі:
— Палешукі мы,
А не чалавекі!

Так вось і жылі ў той, не такі ўжо і далёкі час палешукі. Так здабывалі цяжкі свой хлеб людзі дарэвалюцыйнага Палесся. Такім яно паўстае ў казках і паданнях, у творах літаратуры. Такім яго помняць яшчэ старыя людзі.

Цяпер ад былога Палесся засталіся толькі асаблівасці прыроды. Але і прырода змяняецца пад уздзеяннем чалавека. Значная частка адвечных балот Палескай нізіны асушана. Там, дзе была топкая дрыгва, каласуецца жыта, ячмень і пшаніца, цвіце сінявокі лён, расце бульба і буракі, квітнеюць маладыя сады.

Толькі палескія дзюны пакуль яшчэ не адолены. Але і зыбучым пяскам засталося тут панаваць нядоўга. Усё настойлівей праводзяцца работы па пераўтварэнню бясплодных пясчаных глеб пры дапамозе торфу ва ўрадлівыя землі.

Даўно ліквідавана непісьменнасць. Усюды ў раёнах школы, бальніцы, бібліятэкі, кінатэатры, лазні. Адышлі ў нябыт, зрабіліся здабыткам фальклорных зборнікаў старадаўнія казкі пра злых чараўнікоў і варажбітоў, пра лесуноў, вадзянікоў і балацянікаў, пра чарцей, русалак і іншую балотную нечысць, пагалоскі пра розныя страшныя выпадкі і незвычайныя здарэнні. А пра каўтун маладыя пакаленні нават і не чулі.

Край старадаўніх казак і паданняў, край тугі і галечы, край лясоў і балот змяняецца з кожным днём. Жыць і працаваць на Палессі цяпер і радасна, і перспектыўна.

Паляшук выпрастаў спіну, зірнуў навокал. Шырока раскрыліся яго вочы. Смела глядзіць ён наперад, бо адвечныя туманы развеяліся. І зразумеў паляшук, што зусім не беднае яго Палессе, а багатае. Дый сам ён, зразумела, зусім не той. Ён адчуў, што можа падпарадкаваць і пераўтварыць неспрыяльную прыроду свайго краю. І Палессе пачынае аддаваць чалавеку свае незлічоныя, раней схаваныя скарбы.

## БЛАКІТНАЯ КАРОНА ПААЗЕР'Я

Толькі што мы вярнуліся з Беларускага Палесся.

Давайце разгорнем геаграфічную карту і разгледзім на ёй тыя мясціны, дзе мы не паспелі пабываць.

Так... Тут мы былі, тут — таксама... А вось з поўначчу рэспублікі вы яшчэ зусім не знаёмы.

Глядзіце, колькі на карце блакітных плямінак і кропак! Гэта — азёры. Яны густа рассеяны па ўсёй Віцебшчыне і па ўсёй паўночна-заходняй частцы Мінскай вобласці. Больш за дзве тысячы азёр нанесены на геаграфічныя карты. І ўлічыце, між іншым, што самыя маленькія на карту не трапілі. Нездарма гэты край называюць на Беларусі Паазер'ем.

Разумна прыдумляе народ назвы для родных мясцін. Палессе — край лясоў. Паазер'е — край азёр.

Некаторыя азёры раскіданы паасобку, некаторыя — невялікімі групамі. Вось цэлыя «сузор'і» азёр пад Мядзелем, пад Браславам. Тут сыходзяцца граніцы Беларусі, Літвы і Латвіі. Шмат азёр на Віцебшчыне — вакол старажытнага Полацка, пад Ушачамі, Лепелем і Сянно.

Самае вялікае з беларускіх азёр — Нарач. Гэта і на карце відаць. Паэты часта параўноўваюць гэтае возера з морам. Побач з Нараччу размясцілася яшчэ некалькі азёр: Баторына, Мястра, Рудакова, Белае, Блакітнае, Мядзельскае, Швакшты...

Нарачанская група азёр — самая вялікая і вядомая на Беларусі. Азёры размешчаны тут вянцом. Яны ствараюць своеасаблівую блакітную карону Паазер'я.

На самым стыку трох рэспублік — Літвы, Латвіі і Беларусі — знаходзіцца возера са старажытнай назвай Дрысвяты.

А гэта — возера Доўгае. З выгляду яно невялікае, але затое дна ў ім не дастанеш. Глыбіня яго дасягае пяцідзесяці метраў.

Ёсць, праўда, і глыбейшыя азёры на Беларусі. Так, у возеры Рудакова, што ўваходзіць у блакітную карону нарачанскай групы, глыбіня дасягае месцамі сямідзесяці метраў.

А якія прыгожыя краявіды вакол азёр! Якія багацці хаваюцца ў іх глыбінях! Рыбакі здабываюць тут шчупака, акуня, ляшча, сяляву, плотку. Браслаўскія азёры багатыя яшчэ і на судака. А на Нарачы і некаторых іншых паўночна-заходніх азёрах не дзіва, калі маторныя катэры і чаўны рыбгасаў вяртаюцца з багатым уловам вугра, рэдкай і смачнай рыбы, падобнай з выгляду на змяю.

Не ўступаюць азёрам па сваіх багаццях і прыбярэжныя лясы. Колькі ў іх улетку суніц, чарніц і іншых ягад, а пад восень — грыбоў і арэхаў!

На лясістых берагах некаторых азёр Браслаўшчыны можна ўбачыць хаткі бабра. Вядзецца тут і выдра. Прыходзяць да берага паласавацца выкінутай хвалямі рыбай барсукі і лісіцы. Наведваецца часам і сам гаспадар лесу — мядзведзь.

Побач з жывёламі і звярамі, якія спакон веку жывуць на азёрах і ў лясах Паазер'я, з'явіліся ў апошнія гады і навасёлы. Гэта — янотавідны сабака, якога завезлі сюды з Далёкага Усходу, андатра і норка, прывезеныя з Паўночнай Амерыкі. Перасяленцам спадабаліся новыя мясціны. Яны прыжыліся тут, і Беларускае Паазер'е стала для іх другой радзімай. Янотавідныя сабакі даюць цяпер значную частку ўсёй прамысловай пушніны, якая здабываецца на Віцебшчыне.

Вялікая колькасць азёр уплывае нават на клімат Паазер'я. Калі набліжаешся да групы азёр, яшчэ здалёк пачынаеш адчуваць, якое тут чыстае паветра...

Але чаму я гэта ўсё расказваю вам? Ці не лепей уключыць азёры ў наш маршрут? Бачу, што і вам не церпіцца самім пазнаёміцца з Беларускім Паазер'ем.

Куды ж мы з вамі паедзем? Выбірайце самі...

На Нарач? Вас больш за ўсё вабіць «блакітная карона»? Што ж, выбар не благі! Ды і дабрацца да Нарачы зусім не цяжка. Туды штодня ляцяць два самалёты, а часам нават і трэці, дадатковы...

Значыць, вырашана: зноў у палёт!

## АЗЁРНЫ КРАЙ

Наш невялікі самалёт запоўнены. Ні аднаго вольнага месца.

Мо таму, што дарога нядоўгая, паміж пасажырамі хутка завязваецца размова.

— Я,— кажа адзін,— упершыню ў гэтыя мясціны... Пуцёўку атрымаў... у санаторый...

— А мы ў дом адпачынку,— абзываецца адна з дзяўчат, што сядзяць насупраць.

— У які? — цікавіцца іх сусед, пажылы чалавек.

— У прафсаюзны...

— Гэта трошкі далей ад берага,— тлумачыць пажылы,— у сасновым лесе. Але нічога... Месца цудоўнае... Сумаваць не будзеце. Цэлы гарадок там вырас. Дамы — як у Мінску.

— А мне ці далёка ісці? — пытаецца першы.

— Ваш санаторый — на самым беразе... Дый што там! Хто тут хоць аднойчы пабываў, той яшчэ раз прыехаць захоча. Я тут штогод адпачываю. У друкарні працую, наборшчык... У нас свой дом адпачынку — «Звязда»... Раней то на поўдзень, то на Рыжскае ўзмор’е ездзіў. А як пабыў на возеры... Шчыра скажу вам, няма лепшых мясцін. А рыбалка якая! Апошні раз вось такога шчупака выцягнуў...

Наборшчык ажывіўся яшчэ больш. Умяшаліся ў размову і іншыя пасажыры, многія з якіх таксама былі на славутым возеры і прыахвоціліся да рыбнай лоўлі.

Пайшлі расказы пра самыя незвычайныя рыбацкія здарэнні і прыгоды.

Цікава слухаць, праўда?.. Вы ўсміхаецеся... Не дужа, мусіць, верыце ўспамінам заўзятых рыбакоў?..

Заўважыла гэта і маладая чарнявая жанчына з маленькім хлопчыкам на руках.

— А вы не думайце, што ўсё гэта выдумкі,— гаворыць яна, звяртаючыся да нас.— Я сама неяк паехала з мужам акунёў лавіць. І, хоць верце, хоць не, ладнага шчупака выцягнула. Пялёхаецца ён на дне чаўна, прыгожы, як вясёлка, а я і вачам сваім не веру...

— Вы, прабачце, нетутэйшая? — звярнуўся да жанчыны наборшчык.

Жанчына і сапраўды крыху падобна з твару на татарку ці ўзбечку.

— Родам я з Ташкента,— адказвае яна,— а цяпер у Мінску жыву... І таксама лічу, што няма для адпачынку месца лепшага за Нарач...

У гэты момант суседка жанчыны радасна закрычала на ўвесь самалёт:

— Глядзіце!.. Глядзіце!.. Возера!..

І ўсе адразу прыніклі да ілюмінатараў.

Пад крыламі самалёта раскінулася вялікая водная прастора. Мы пралятаем над паўднёва-заходнім берагам. Тут шчыльна да вады падступае густы лес. Толькі ў адным месцы сосны крыху расступіліся, утварыўшы пры самым беразе даволі прасторную паляну. На ёй віднеюцца шэрыя дахі дашчаных домікаў і палаткі. Там размясціўся піянерска-камсамольскі турысцкі лагер...

Доўгая і вузкая каса з пясчанымі адхонамі дзеліць возера амаль на роўныя часткі. Лесу на касе няма. Сярод палеткаў віднеюцца толькі асобныя дрэвы. А на самым носе пясчанай касы прытулілася невялікая вёска. Яна так і называецца — Наносы.

Прыгледзьцеся ўважлівей і вы ўбачыце, што з вышыні вада ў возеры здаецца размаляванай у розныя колеры. І межы колераў вызначаны даволі выразна.

Уздоўж берага працягнулася шырокая жоўтая паласа. Тут неглыбока, і скрозь празрыстую ваду прасвечвае пясчанае дно. Крыху далей паверхня возера робіцца зеленаватая. Там — сапраўдныя джунглі з водарасцей, прытулак жыхароў падводнага царства. Чым далей ад берага, тым цямнейшая і гусцейшая здаецца вада. Месцамі яна цёмна-сіняя, амаль чорная. Тут — самыя вялікія глыбіні, вадзяная тоўшча дасягае пяцідзесяці метраў. Але і побач з імі віднеюцца жаўтаватыя палосы і плямы. Гэта водмелі, падводныя косы, ці, як гавораць мясцовыя рыбакі, «пагуркі».

Самалёт крыху нахіліўся набок і пайшоў на пасадку. Цяпер да нас імкліва набліжаецца паўночна-ўсходні бераг. Пад крылом прамільгнулі два вялікія карпусы санаторыя з асфальтаванай набярэжнай, з каменнымі прыступкамі, якія спускаюцца да вады, з шырокім пляжам, а далей — бляшаныя і чарапічныя, дашчаныя і нават саламяныя стрэхі — вуліца вялікай вёскі ў зелені шматгадовых ліп і таполяў.

І раптам — зноў лес і поле...

Самалёт заскакаў па няроўнай пляцоўцы і спыніўся.

Вялізная пляцоўка расчышчана ад лесу і хмызняку, засеяна травой, абмежавана спецыяльнымі знакамі — і ўсё. На ўзмежку пляцоўкі сохнуць рэшткі вывернутых бярозак, ялінак і хмызоў. Грэюць на сонцы свае шырокія спіны вялізныя камені-валуны. А далей — вясёлыя бярозкі па ўзлесках, празрыстыя і сонечныя сасновыя бары, змрочныя яловыя лясы.

Валуны пакінуў тут каля трыццаці тысяч гадоў назад ледавік, які пакрываў амаль усю тэрыторыю Еўропы. І самі азёры — вынік дзейнасці ледавіка.

Паміж полем і невялікім мураваным домікам, вакол якога размясціліся метэаралагічныя ўстаноўкі і

радыёстанцыя, пралегла пясчаная прасёлачная дарога. У адзін бок яна вядзе да мястэчка, а ў другі — да сяла. Сяло гэтае размясцілася на самым беразе возера. Туды мы з вамі і накіруемся.

Між іншым, па плану мястэчка і вёска ў бліжэйшыя гады павінны зліцца ў адзін курортны гарадок.

Мы перасякаем высокі насып, па якім зусім нядаўна пракладзена шырокая шаша. Будаўніцтва яшчэ не закончана. Неўзабаве гэтая шаша апярэжа возера і звяжа паміж сабой усе санаторыі, дамы адпачынку, турысцкія базы, лагеры і населеныя пункты, якія ёсць і якія яшчэ вырастуць на берагах возера.

## ХТО НА РЫБАЛКУ, А ХТО ПА ГРЫБЫ

На наступны дзень мы прыехалі ў вёску, што стаіць на беразе возера Нарач.

Дамы ў вёсцы розныя: і звычайныя сялянскія хаты, і так званыя фінскія домікі, і сучасныя мураваныя катэджы на адну або дзве сям'і. Прыгожыя веранды, чыстыя двары. Праз некаторы час сяло ператворыцца ў адну з вуліц новага гарадка, дзе ўсё будзе прыстасавана для адпачынку працоўных.

А цяпер зойдзем у гэты двор. Не ўсё ж нам ездзіць і ездзіць. Трэба, нарэшце, і адпачыць няштога. А дзе ж і адпачываць, як не на возеры Нарач, як казаў той наборшчык у самалёце! Давайце затрымаемся тут ненадоўга.

У доме жыве мой добры знаёмы — стары нарачанскі рыбак. Вось ён ідзе якраз нам насустрач, невысокага росту, каржакаваты, з пасівелымі вусамі.

— Добры дзень, дзед Ігнат!

— Дзень добры... Ці надоўга да нас?

— Ды вось пазнаёмлю сваіх юных сяброў з Нараччу і — назад, у Мінск.

— Тады вы ў мяне ключы ад лодкі вазьміце. І снасці я вам такія-сякія дам,— усміхаецца дзед Ігнат выцвілымі блакітнымі вачамі.— Якое ж гэта знаёмства з Нараччу без рыбалкі!..

— Дзякуем!.. Дзякуем!..

І вось у нас з'явіўся дадатковы груз: даволі цяжкі жалезны якар, пабялелы ад вады і сонца канат да яго, два вяслы, вялікі брызентавы мяшок. У ім мы панясём рыбу, калі, вядома, будзе што несці. А пакуль у мяшку ляжаць стары спінінг з кароткім дзяржальнам і вялікай бліскучай блясной, вудачкі з доўгімі лёскамі, маленькімі блёсенкамі і кароценькімі вудзільнамі, выразанымі з галінак ядлоўцу, і яшчэ бляшанка з дажджавымі чарвямі.

— Можа, вы і кошыкі прыхопіце? — гукае нам услед стары рыбак.— Дзяўчынкі ж, відаць, рыбу лавіць не пойдуць. Ім у грыбы ды ў ягады цікавей...

Мы бяром некалькі лазовых кошыкаў. Дзед Ігнат пляце іх сам.

— І я пайшоў бы з вамі,— нібы просіць ён прабачэння,— ды часу няма. З сенам трэба ўправіцца... А за праважатага хай у грыбнікоў будзе мая ўнучка... Аня! Хадзі сюды...

Дзед Ігнат даўно ўжо на пенсіі. Але ў гарачую пару сенакосу ці ўборкі ўраджаю не сядзіцца яму на сваім прысядзібным палетку, ходзіць ён памагаць калгасу.

Пыльная вуліца змянілася брукам. Дарога раздвоілася. Адна павяла да возера, другая да санаторыя. Мы пойдзем першай, адразу да возера, пакладзём у лодку свой «багаж», тады і агледзімся.

Прасмоленыя рыбацкія чаўны чарнеюць, напалову выцягнутыя з вады, каля самага рэстарана-паплаўка. Крыху далей — прадуктовы магазін. Тут мы можам узяць усё, што нам спатрэбіцца. Што? Нічога не хочаце з магазіна? Спадзеяцеся на здабычу рыбакоў і шукальнікаў грыбоў ды ягад? Але хлеб нам усё ж такі патрэбны...

Пакінуўшы ў лодцы свой рыбацкі рыштунак, мы паднімаемся па асфальтавай дарожцы з прыступкамі да санаторыя. З блізкай адлегласці возера выглядае яшчэ больш маляўнічым, чым з вышыні птушынага палёту. Вялікае, прасторнае, яно і сапраўды падобна на мора. Восемдзесят квадратных кіламетраў вады...

Чаму супрацьлеглы бераг відаць? Ды не, вы памыліліся! Гэта зусім не бераг. Гэта тая каса, якую мы бачылі з самалёта. Ад яе да таго берага не бліжэй, чым да нас.

Празрыстыя хвалі, узнятыя лёгкім ветрыкам, набягаюць на прыбярэжны пясок. Іх плёскат зліваецца з шумам сосен, якія акружылі возера з усіх бакоў. А два прыгожыя будынкі санаторыя, што ўзвышаюцца на самым пагорку, нагадваюць вялікія караблі, калі глядзець на іх з возера. Здаецца, вось-вось знімуцца яны з якараў і паплывуць у далёкае падарожжа...

Скрозь густую зяляніну сосен віднеюцца на суседнім узгорку блакітныя домікі з чырвонымі дахамі. Гэта той самы дом адпачынку «Звязда», пра які гаварыў нам у самалёце друкар. Яшчэ далей, на самым беразе, мы бачым лодачную станцыю і шырокую паласу пляжа з паветкамі, каб хавацца ад пякучага сонца.

У другім баку ад санаторыя, таксама ўздоўж берага, размясціліся турысцкая база і біялагічная станцыя. Недалёка адсюль і піянерскі лагер «Зорачка». Яшчэ далей мы маглі б убачыць беларускі Артэк...

Колькі палатак у лесе! Цэлы гарадок. Іх паставілі тут аматары пажыць на вольным паветры. Адны з іх прыязджаюць на ўсё лета, другія на месяц, трэція на некалькі дзён ці нават толькі з суботы на нядзелю. Многім палюбіліся гэтыя мясціны.

Я і сам вось ужо дванаццаты год праводжу свой адпачынак на берагах Нарачы. Тады, у самым пачатку, сюды нялёгка было дабірацца. Таму і дачнікаў было нямнога. І размяшчаліся яны ў хатах мясцовых жыха-

роў. Не было ні санаторыя, ні дамоў адпачынку. І вёска была бяднейшая...

Але вас, мабыць, больш за ўсё цікавяць цяпер скарбы вады і лесу? Тады зробім так: хлопчыкі пойдуць са мной на чоўне, а дзяўчынкі — з Аняй у лес. Вы не глядзіце, што Аня малодшая за вас. Яна тут кожную сцежку ведае.

Згодны? Вось і добра.

Ну, хлопчыкі, давайце ссунем човен на ваду. Раз, два!.. Што, цяжкі? Затое ўстойлівы. Ніякай хвалі не баіцца. А на Нарачы з хвалямі і ветрам жарты кепскія. Як разгуляецца раптоўна бура, на звычайнай лодцы да берага не дабярэшся...

Веславаць будзем па чарзе. Хто першы? Не, не ўсе разам. Давайце па двое. Сядай вось ты... І ты? Добра, сядай таксама. Толькі старайцеся веславаць дружна, у лад. Р-раз! Р-раз!.. Ну, дык вы ж сапраўдныя весляры!..

Усё далей і далей адплывае ад нас высокі бераг з дамамі санаторыя, з прыступкамі набярэжнай. Ужо не відаць каменьчыкаў на пясчаным дне. Глыбіня пад намі ўсё павялічваецца. А вось і паласа водарасцей... Нарэшце і іх прамінулі. Цяпер ужо можна разгледзець асобныя дрэвы на носе касы і стрэхі хат...

Значыць, надышоў час паспытаць нам сваё рыбацкае шчасце.

Кідаем якар за борт. Замацоўваем канат. Вось так... Вымяраем глыбіню. Для гэтага апускаем у ваду доўгі трывалы шнур з грузам на канцы. Спачатку шнур нацягваецца. Адпусцім трохі больш... Яшчэ больш... Шнур нарэшце аслаб... Значыць, груз дасягнуў дна. Цяпер трэба нам вымераць даўжыню той часткі шнура, што была ў вадзе... Ого! Каля дзесяці метраў. Значыць, паміж дніўшчам нашага чаўна і дном возера мог бы змясціцца трохпавярховы дом. Што ж, на такой глыбіні і ловяцца самыя вялікія акуні.

Ціха на возеры.

Толькі ўдалечыні чуваць аднастайная гаворка матора. Гэта рыбгасаўскі катэр вядзе дадому з начнога лову караван рыбацкіх лодак. Адна, дзве, тры, чатыры... Мусіць, нямала злавілі рыбакі шчупакоў, ляшчоў, акунёў і сялявы, так добра вядомай пад назвай «капчушка».

Кружаць над вадой белыя чайкі ў цёмных масках. То адна, то другая апусціцца на ваду і тут жа ўзнімаецца, трымаючы ў дзюбе бліскучую рыбку. Тады бліжэйшыя суседкі ўзнімаюць гвалт і стараюцца адабраць здабычу.

Чайкам, відаць, шанцуе больш, чым нам. Ні ў кога з нас ні разу нават і не клюнула. А чайкі пад'елі і цяпер адпачываюць, пагойдваючыся на хвалях.

Гэта добрая прыкмета. Калі чайкі садзяцца на ваду, значыць, і заўтра будзе пагода.

А ў нас усё не клюе. Але хмурыцца не трэба. Адпусцім лепш паболей якарнага каната, і ветрык аднясе нас трохі ўбок, на новае месца...

Прынаду на кручках праверылі? Цяпер зноў закінем...

Ціха... Ёсць!..

На дне чоўна заплёхаўся не дужа вялікі, але ўсё ж такі прыстойны акунёк.

І ў цябе ёсць?..

І ў цябе?..

Эх, сарваўся!.. Не паслабляй лёску, калі цягнеш акуня, бо зноў сарвецца...

Бачыце, як добра пайшла справа.

Значыць, мы натрапілі на чародку акунёў. Яны звычайна чародкамі ходзяць.

А цяпер зноў зменім месца, пашукаем новую чародку...

Захопленыя сваім заняткам, мы і не заўважылі, як сонца схілілася да самага лесу. Па вадзе, цераз усё возера і паўз нашу лодку, прайшла яркая чырвона-жоўтая сцежка. Непадалёку ад нас заплескалася рыба. Вось яна — якая ж вялікая! — выскачыла з вады і, бліснуўшы на

сонцы луской, знікла зноў. А за ёй — другая, яшчэ большая. Гэта шчупак разбойнічае...

Крыху далей селі на ваду дзікія качкі. Да нас даносіцца іх гучнае краканне...

Як добра на возеры! Асабліва, калі рыба ловіцца. Але нам ужо час вяртацца. Дзяўчынкі, пэўна, чакаюць. Ды і налавілі мы нямала. На ўсіх хопіць...

## РАСКАЗ СТАРОГА РЫБАКА

Дзяўчынкі і сапраўды зачакаліся. Яны даўно вярнуліся з лесу, сядзяць і абіраюць грыбы. Ім памагае наш знаёмы рыбак.

— Вось сапраўдны баравік,— тлумачыць ён,— усім грыбам грыб. І ножка моцная, і шапка цэлая. А гэта яго бліжэйшыя сваякі — падасінавік з чырвонай галавой і падбярозавік з рудой. А махавікоў колькі. А лісічак... Малайцы, дзяўчынкі...

Тут дзед спрактыкаваным вокам зірнуў і на наш улоў.

— Эге, ды і вы не зломкі! Кілаграмы чатыры будзе...

Пакуль мы абіраем грыбы і чысцім рыбу, дзед прынёс на паляну сухога ламачча, ачысціў месца для вогнішча, уваткнуў у зямлю дзве рагуліны, а зверху паклаў на іх тоўстую жардзіну. Тым часам Аня прынесла з дому два вядры: адно пад грыбы, другое — пад рыбу.

Вось ужо вёдры вісяць над агнём. Булькоча вада. Пара мяшаецца з дымам. І ў паветры так смачна запахла свежай юшкай, распаранымі грыбамі, сасновай смалой і ёдавым настоем водарасцей.

Дзед Ігнат прысеў побач з намі. Ён узяў загрубелымі пальцамі цыгарэту і прыкурыў ад вугольчыка. Сядзіць і маўчыць...

Давайце і мы памаўчым. Я ж ведаю, дзед настроіўся расказаць нам нешта. А пабачыў ён на сваім вяку нямала.

Так, я не памыліўся. Стары рыбак пакорпаў галінкай абгарэлае сучча ў вогнішчы — проста так, ні для чаго,— і пачаў...

— Сяджу я гэта з вамі, з маладымі, а сам мінулае ўспамінаю... Можа, не цікава, га? Дык я не буду...

— Гаварыце, дзядуля, гаварыце!..

— Так, значыцца... Край наш нарачанскі, самі бачыце, на ворныя землі не багаты. Усё лес ды пясок, пясок ды лес. Нават і лугоў мала для пашы. Затое возера спакон веку тутэйшых людзей выручала...

Даўно гэта было, яшчэ за польскім часам. Наловіш рыбы, лепшую на продаж у мястэчка, а драбнейшую — сабе, дзецям. Так і жылі...

Ды выйшаў аднойчы загад. Вядома, ад панскай улады; забараніць сялянам лавіць рыбу не толькі сеткай, але нават і звычайнай вудаю, а возера наша Нарач здалі ў арэнду памешчыку Яблонскаму.

Ну, усе, вядома, абурыліся. Што гэта за рабаўніцкія парадкі?!

Неяк улетку, як зараз помню, сабраліся рыбакі і паехалі на возера. Арандатар бачыць, што пагрозамі нічога не даб'ешся, і выклікаў паліцыю.

Паселі паліцэйскія ў маторку і давай ганяць рыбакоў. А тым часам на бераг сем'і рыбацкія збегліся. Старыя лаюцца, жанчыны лямантуюць, дзеці плачуць.

На вёслах, самі ведаеце, ад маторкі не ўцячэш. Падчапілі паліцэйскія некалькі чаўноў і цягнуць да берага. Але тут жанчыны яшчэ больш залямантавалі ды як кінуцца ў ваду, абступілі маторку з усіх бакоў і, як вокам міргнуць, перакулілі разам з паліцэйскімі. Пялёхкаюцца тыя ў вадзе, а рыбакі пазабіралі свае снасці і хутчэй па хатах. Шукай потым, хто вінаваты.

З гэтага і пачалося. Усе навакольныя вёскі забунтавалі. І чаго толькі не выдумлялі, каб панам дапячы. Збяром,

бывала, сотню ці болей кос ды паўтыкаем у дно. А як толькі панскія служкі закінуць у возера невады, так і дастаюць адны толькі дзіркі. На косы, вядома, напароліся...

І што б вы падумалі? Пайшоў-такі арандатар на сякія-такія ўступкі.

Потым не раз яшчэ бунтаваліся рыбакі і сяляне. Аж пакуль не прыйшла Чырвоная Армія і не вызваліла нас ад паноў...

Дзед, задаволены ўвагай слухачоў, падняўся, падышоў да вогнішча, зірнуў у вядро з рыбай:

— Эге, стары гаварун, так і юшка пераварыцца! Хто ў вас за галоўнага кухара? Солі трошкі падсыпаць трэба...

Якія смачныя здаюцца нам і грыбы, і рыба на свежым паветры. Дзіва што. Самі ўсё здабылі, самі і згатавалі.

А сонца зусім схавалася. У небе запаліліся незлічоныя зоркі. Кожная з іх мае свайго двайніка ў вадзе. Глядзіш, і здаецца, што гэта не адбіткі нябесных зорак, а залацістыя, сярэбраныя, чырванаватыя вочы ляшчоў, акунёў, шчупакоў падміргваюць нам з глыбіні возера.

— Што ж,— кажа дзед Ігнат,— апошнім аўтобусам ехаць вам няма сэнсу. Толькі сярод ночы ў Мінску будзеце. Лепш пераначуйце ў мяне на вышках, там якраз сена свежае, а ранічкай і паедзеце.

Стары, відаць, мае рацыю. Трэба нам згадзіцца з яго прапановай і шчыра падзякаваць за ўсё тое прыемнае, што ён для нас зрабіў.

## ПЕРАД РАЗВІТАННЕМ

Вось і канчаецца наша падарожжа.

Хутка мы з вамі развітаемся, раз’едземся ў розныя бакі. Хто ў гарады і раёны Беларусі, а хто і за межы рэспублікі.

Шмат чаго пабачылі вы за час нашых вандровак. Але шмат чаго пабачыць і не паспелі.

Хіба можна за такі кароткі час убачыць усю Беларусь?

Я буду вельмі рады, калі наша падарожжа вам спадабалася, калі яно памагло вам лепш пазнаць і яшчэ больш палюбіць сваю родную Беларусь.

Я буду вельмі рады, калі вам захочацца зноў павандраваць па Беларусі, яшчэ і яшчэ раз наведаць тыя мясціны, дзе мы толькі што пабывалі.

А цяпер — шчаслівай дарогі, сябры!

Да пабачэння!

Да новых сустрэч! Да новых падарожжаў!

*1964—1966*

# *У лясах над Бярозай*

## ПАЕЗДКА Ў ЗАПАВЕДНІК

У пачатку чэрвеня 1947 года, у ясны сонечны дзень, выехалі мы на машыне з Мінска ў Беларускі дзяржаўны запаведнік на рацэ Бярэзіне.

У шырокім кузаве грузавіка размясціліся дырэктар запаведніка, яго намеснік па навуковай частцы і некалькі супрацоўнікаў. Усе яны вяртаюцца дамоў з камандзіроўкі. Яны вязуць з сабой прэпараты, лабараторнае абсталяванне і ўсялякія прыпасы, неабходныя для жыцця і працы ў лясах запаведніка.

Машына ідзе па Лагойскім тракце. Абапал раскінуліся бяскрайнія калгасныя палеткі.

Не спыняючыся, мінулі мы Астрашыцкі Гарадок, размешчаны на ўзвышанай мясцовасці, непадалёку ад невялікага прыгожага возера.

Потым праехалі летапісны Лагойск, дзе да гэтага часу захаваўся яшчэ высокі насып старадаўняга замчышча, і Плешчаніцы.

За Бягомлем, па дарозе на Лепель, усё часцей сустракаюцца лясы, пералескі. Адсюль недалёка ўжо і да запаведніка. Яго лясныя масівы, што раскінуліся на плошчы ў 70 тысяч гектараў, віднеюцца цёмнай зубчастай сцяной на гарызонце. Перасечаныя вялікімі балотамі і азёрамі, яны цягнуцца паласой з поўначы на

поўдзень па верхнім цячэнні ракі Бярэзіны і яе шматлікіх прытокаў.

Гадзін пасля шасці вечара мы праязджаем праз сяло Домжарыцы.

Недалёка ад сяла віднеецца возера. Мы знаходзімся ў межах запаведніка.

Машына ідзе берагам Сергучоўскага канала. Яна спыняецца перад старой, пахілай хацінкай.

Тут, каля самай вады, жыве егер Аляшкевіч, які ехаў з намі. Ён працуе егерам і адначасова вартаўніком пры шлюзе на канале. Гэта — здаровы, дужы дзядзька, гадоў пад сорак восем, які любіць пагаварыць, пажартаваць і пасмяяцца. Усю дарогу ён расказваў розныя адмысловыя гісторыі і сам заўзята рагатаў, сам шчыра з іх цешыўся.

— Ну, Юры Ігнатавіч, вылазь! Прыехаў! — гаворыць яму дырэктар.

Егер спрытна выскоквае з машыны, а за ім таксама і мы, каб размяць крыху ногі.

З хаты выходзіць жонка егера, жанчына невысокага росту, але гэткая ж дужая, зграбная і здаровая з выгляду, як і муж.

Яна бачыць, што гаспадар вярнуўся з пустымі рукамі, і пачынае праяўляць выразныя адзнакі нездавальнення.

— Няўжо нічога з горада не прывёз? — пытаецца яна коратка.

— Як гэта нічога? А вабік для рабчыкаў? А другі для качак? А патроны для стрэльбы?

— Згары ты са сваімі патронамі! Цьфу!.. Людзі стараюцца, дбаюць, працуюць, а ён сабе бадзяецца па лесе ды ваду пільнуе! Хіба гэта работа? Адна назва! Дырэктару трэба ў Мінск, тыц — і ён туды ж! І ён ужо начальнік,— торбу за плечы ды за ім. Вялікую справу робіць! А каб чаго ў дом, дык аб гэтым і клопату няма! Я яго выправіла, як чалавека, і сала, і хлеба дала, і грошай, а ён...

Раззлаваная, не знаходзячы слоў ад крыўды, жанчына павярнулася, каб ісці дахаты.

Егер тым часам выцягнуў з машыны стары шынель.

— А гэта што? Глядзі, на рынку купіў! — сказаў ён крыху няўпэўнена.

— Купіў?.. Гэта?.. — У голасе жонкі загучала невыказная знявага. — Людзі насіць не хочуць, з плеч даўно паскідалі, а ён падхапіў!..

Яна вырвала з рук мужа злашчасны шынель, шпарка падбегла да канала і кінула ў ваду. Потым моўчкі, не аглядаючыся, рушыла ў хату.

— А на зіму штаны з чаго шыць? — заўважыў ёй наўздагон Аляшкевіч.

Пачухаўшы збянтэжана патыліцу, ён узяў жэрдку і выцягнуў шынель з канала.

Калгасны вартаўнік, якога мы ўзялі ў машыну, каб падвезці да сяла Кветча, уважліва і зацікаўлена сачыў за гэтай сцэнай.

— Бачылі? — сказаў ён, хаваючы ўсмешку ў вусы.— Не дай Бог, што вырабляе! Гэта ж перад усёй публікай у ваду кінула! Ціятр! Добра, што чалавек спакойны. Другі б адразу ў развод! Ці ж няпраўда?

Аляшкевіч нездаволена глянуў на вартаўніка.

— Стары чалавек, а няправільна гаворыце! — заўважыў ён стрымана.

І, звярнуўшыся да нас, растлумачыў з філасофскай развагай:

— Усе яны гэткія. Яшчэ невядома, што дырэктарава жонка скажа, ён жа таксама нічога не прывёз.

А пасля невялікай паўзы дадаў зусім іншым тонам, нібы суцешыў сам сябе:

— Пагодзімся!

Яму было, відаць, непрыемна, што гэты маленькі інцыдэнт адбыўся на нашых вачах. Ён адчуваў сябе крыху няёмка.

Мы развіталіся з Аляшкевічам і паехалі далей.

Праз некалькі кіламетраў машына павярнула ўправа і спынілася.

Перад намі — вялікая пясчаная паляна, агароджаная з боку канала частаколам. На гэтай паляне, акружанай сасновым лесам, высяцца сярод агародаў, на прыстойнай адлегласці адзін ад аднаго, некалькі новых драўляных будынкаў.

Гэта — пасёлак Крайцы, сядзіба запаведніка.

У адным з невялікіх, бярвенчатых, з прыемным сасновым пахам дамоў размясцілася дырэкцыя. У астатніх жывуць навуковыя супрацоўнікі.

Пачынае церушыць дробны дождж.

Машыну акружаюць сем'і прыехаўшых. Чуюцца радасныя воклічы дзяцей, узаемныя прывітанні, абмен навінамі.

Дождж тым часам мацнее. Да мяне падыходзіць дырэктар.

— Прыйдзецца вам спыніцца ў нас,— гаворыць ён.

## РАЗМОВА З ДЫРЭКТАРАМ

Мы сядзім за сталом.

У вокны б'е дождж. Кроплі яго струменьчыкамі збягаюць па шкле.

На стале перад намі карта.

Дырэктар расказвае пра прыродныя багацці запаведніка, пра баброў і ласёў у дрымучых лясах, пра партызанскую вайну ў гэтай мясцовасці, пра вялікія страты ад акупацыі і пра перспектывы далейшай работы.

— Запаведнік на рацэ Бярэзіне,— кажа ён,— быў створаны па ўказу Савецкага ўрада ў 1925 годзе. І трэба сказаць, што мерапрыемства гэтае цалкам сябе апраўдала. Тутэйшыя мясціны самой прыродай прызначаны

для запаведнасці. Топкія, непраходныя балоты і рэчкі, вялікія і дрымучыя лясы з'яўляюцца надзейным прытулкам для рэдкіх і каштоўных звяроў.

— Якія ж звяры тут вядуцца? — спытаў я.

— У нас тут шмат ласёў, мядзведзяў і дзікіх свіней. Ёсць і рысі, касулі, выдры, куніцы, барсукі, лісіцы, норкі, гарнастаі, ваўёркі, зайцы і процьма featurednай драбязы,— адказаў дырэктар,— усіх і не пералічыш.

— А птушкі?

— Птушак таксама хапае, асабліва вадзяных. Рака Бяроза з яе шырокімі паплавамі, звілістай плынню, шматлікімі прытокамі, рукавамі і старыцамі, паўнаводны Сергучоўскі канал і лясныя азёры вабяць сюды з году ў год вялікае мноства пералётных вадаплаўных птушак. Шмат гняздуе тут і баравой дзічыны. Нашы лясы багаты на цецерукоў, глушцоў, рабчыкаў, курапатак. Рэкі і азёры поўны рыбы. Але сапраўдным багаццем і гонарам запаведніка з'яўляюцца бабры. Для аховы і развядзення гэтага рэдкага, каштоўнага і цікавага звярка і быў, уласна кажучы, у першую чаргу створаны Бярэзінскі запаведнік.

— Ці многа было тут баброў,— пытаюся я,— і наколькі павялічыўся іх лік пасля стварэння запаведніка?

— Бабры захаваліся тут у натуральных умовах з незапомных часоў,— адказаў дырэктар. — Калісьці яны былі на Беларусі вельмі распаўсюджаны. Вялікія паселішчы баброў сустракаліся па ўсёй краіне.

У канцы XVIII стагоддзя бабры былі амаль зусім знішчаны. Занадта вялікі быў попыт на іх дарагое футра і на так званы «бабровы струмень», які ў той час шырока ўжывалі ў медыцыне. Футра бабра цэніцца і зараз вельмі высока. Гэта тлумачыцца не толькі рэдкасцю звярка, але і добрымі якасцямі футра — яго трываласцю, мяккасцю і прыгажосцю. У табліцы трываласці футраў бабёр займае другое месца. Першае месца належыць выдры, але шкурка яе не такая мяккая.

На Беларусі да 1917 года баброў больш за ўсё было ў нашай мясцовасці, у лясах па верхнім цячэнні Бярэзіны. Зрэдку сустракаліся бабры і ў пойме ракі Сож, на яго левых прытоках — Іпуці і Бесядзі. Трэба сказаць, што ад бярэзінскіх баброў паходзяць і бабры вядомага Варонежскага запаведніка. Справа у тым, што яшчэ ў 1886 годзе на раку Варонеж былі прывезены з Мінскай губерні і выпушчаны на волю пяць баброў. Патомства гэтых баброў рассялілася па рэчцы Варонеж і перабралася на раку Усманку. На тэрыторыі паміж гэтымі рэкамі і быў створаны ў далейшым Варонежскі бабровы запаведнік.

На тэрыторыі Бярэзінскага запаведніка, да яго арганізацыі ў 1925 годзе, бабровыя паселішчы захаваліся толькі па цячэнні глухіх забалочаных рэк Пясчанка і Гурбянка ды на возеры Асінка,— дырэктар паказаў на карту,— вось у гэтых недаступных мясцінах, куды нага чалавечая магла пранікнуць толькі лютай зімой, калі моцныя маразы скоўвалі балотную дрыгву. Зрэдку, хіба ў вялікую паводку, заплываў сюды часам рыбацкі прасмолены човен.

У той час налічвалася тут усяго толькі дзесяць бабровых хатак, а ў 1935 годзе іх было ўжо сто трыццаць дзевяць. У 1940 годзе колькасць баброў, па прыблізным падліку, дасягнула васьмісот шасцідзесяці галоў. Адсюль, пад аховай закону, бабры распаўсюдзіліся і па іншых сумежных вадаёмах, асабліва па верхнім цячэнні Бярэзіны. Цяпер бабровыя паселішчы пачалі з'яўляцца далёка за межамі запаведніка, у басейнах Дняпра, Нёмана і Заходняй Дзвіны.

...Бярэзінскі запаведнік з'яўляецца не толькі гадавальнікам баброў. Недатыкальнасць яго лясных масіваў вельмі дадатна ўплывае на захаванне нармальнага воднага рэжыму ракі Бярэзіны і яе прытокаў. Дзікія і глухія лясы ў гэтым раёне забяспечваюць сярэдняе і ніжняе

цячэнне Бярэзіны ад паніжэння ўзроўню вады і абмялення, а гэта мае вялікае значэнне як для земляробства, так і для сплаву, для суднаходства, для гідратэхнічных і меліярацыйных пабудоў. Калі б лясы запаведніка былі высечаны, рака Бяроза перасохла б, а навакольныя палеткі страцілі б сваю ўрадлівасць.

## БАБРАНЯ НА ДВАРЫ

З учарашняга вечара ўсю ноч і ўвесь дзень ідзе безупынку дождж. Таму азнаямленне з запаведнікам прыходзіцца сёння абмежаваць толькі тэрыторыяй сядзібы.

У пуні, каля дома дырэкцыі, жыве ў клетцы малое бабраня. Яму ўсяго паўтара месяца. Яно вельмі дабрадушнае і лагоднае. Калі да яго падыходзяць, яно падымаецца на заднія лапы і цягнецца насустрач, стогнучы пры гэтым, як дзіця.

Чорнымі пярэднімі лапкамі бабраня бярэ, нібы рукамі, лазінку і, спрытна яе паварочваючы, хутка абгрызае з усіх бакоў зялёную кару. Кормяць яго таксама малаком, хлебам і лісцямі іван-чаю.

Трапіла яно сюды выпадкова. Два тыдні назад яго злавілі на Бярэзіне. Ляснічы Церах плыў па рацэ ў чоўне міма адной з бабровых хатак. На паверхні вады, недалёка ад хаткі, з'явілася бабраня. Яно пераплывала раку, накіроўваючыся да супрацьлеглага берага. Убачыўшы лодку, бабраня змяніла напрамак і паплыло побач з чоўнам, з цікавасцю паглядаючы на Цераха сваімі чорнымі вочкамі.

Ляснічы апусціў руку за борт, схапіў бабраня за хвост і выцягнуў яго з вады ў човен. Бабраня па дзіцячым сваім неразуменні і даверлівасці не спрабавала ні ўцякаць, ні супраціўляцца. Яго прынеслі ў дырэкцыю запаведніка, і вось яно жыве цяпер у пуні.

Мы выпускаем бабраня з клеткі. Няхай крыху пагуляе. Па зямлі яно рухаецца не вельмі спрытна. Забаўна шлёпаючы сваімі вялікімі заднімі лапамі з шырокімі плавальнымі перапонкамі паміж пальцаў, згорбіўшыся і смешна перавальваючыся з боку на бок, яно нязграбна спяшаецца між градак агарода.

Апынуўшыся на двары і агледзеўшыся, бабраня адразу і беспамылкова вызначае правільны напрамак. Чуццё падказвае яму, што вада знаходзіцца параўнальна недалёка, і яно імкліва накіроўваецца ў бок канала, да якога адсюль будзе, мабыць, з паўкіламетра.

Даўшы бабраняці як след пагуляць, яго праз некаторы час зноў садзяць у клетку.

Гэта — першы пасля вайны адлоўлены ў рацэ бабёр, які знаходзіцца пад навуковым наглядам. Да 1941 года ў запаведніку праводзіліся доследы па развядзенні баброў у клетках і вальерах.

Ад мінулага абсталявання фермы захаваўся толькі цэментаваны басейн, у якім трымаліся паддоследныя бабры. На дне, засыпаным зямлёй і пяском, густа расце бур'ян і крапіва.

— Работы тут непачаты край,— гаворыць дырэктар,— але больш за ўсё прыходзіцца цяпер будаўніцтвам займацца. Да вайны запаведнік меў для навуковай работы дастатковую колькасць вытворчых, жылых і гаспадарчых памяшканняў. У Крайцах былі чатыры жылыя дамы, двухкватэрныя катэджы для супрацоўнікаў, добра абсталяваная лабараторыя, клуб, бібліятэка, заалагічны музей і вялікая падсобная гаспадарка. Ад усяго гэтага засталіся толькі абвугленыя руіны. Усё знішчана, спалена, разбурана. Усё трэба будаваць нанава, усім трэба абзаводзіцца з самага пачатку.

# АРЛАН-БЕЛАХВОСТ

На другі дзень праяснела.

Ад самай раніцы гучна кукуюць у лесе зязюлі. Меладычна свішча івалга. З-за сосен паказалася сонца.

Учора, недалёка ад пасёлка, егер Аляшкевіч застрэліў вялікага арла. Забітага драпежніка прынеслі сёння ў дырэкцыю.

Гэта — самка арлана-белахвоста.

З цікавасцю разглядаем мы вялізную і магутную птушку.

У яе вялікая, моцная і вострая, загнутая ўніз дзюба, такія ж светла-жоўтыя, магутныя лапы з доўгімі, бязлітаснымі кіпцюрамі і халодныя светла-жоўтыя вочы. Галава і шыя святлейшага колеру, хвост белы, а тулава і крылы цёмна-бурыя.

Спачатку мы вымяраем птаха. Даўжыня кожнага яго крыла ў размаху дасягае аднаго метра. Даўжыня тулава ад галавы да хваста — 90 сантыметраў.

Потым, тут жа на двары каля канторы, пад адкрытым небам, Леанід Васільевіч, намеснік дырэктара па навуковай частцы, і Антон Цярэнцевіч, прэпаратар, прыступаюць да ўскрыцця забітага арлана.

Вынікі ўскрыцця вельмі цікавыя. У валлі і страўніку птаха знаходзяцца неператраўленыя рэшткі дзікай качкі, голуба, бусла і шкарлупка качыных яек. Старая разбойніца з'ела, відавочна, качку, якая сядзела ў сваім гняздзе, разам з яйкамі.

Буслам, голубам і качкай самка арлана-белахвоста карміла, мабыць, сваіх птушанят і пры гэтым сама адрывала кавалкі здабычы, каштуючы ад кожнага.

Егер Аляшкевіч, які забіў арлана, прысутнічае пры ўскрыцці.

Ён кажа, што застрэліў гэтую грозную і пражэрлівую птушку недалёка ад яе гнязда. Вялізнае па сваіх памерах гняздо арлана знаходзіцца на верхавіне старога

двухсотгадовага дуба. Шырынёй яно, паводле слоў егера, каля двух метраў, а ў вышыню не менш аднаго метра.

Усё гэта з'явілася для мяне нечаканасцю. Я думаў, што арлан-белахвост, вялікі драпежны птах, характэрны для марскога ўзбярэжжа паўночных краін,— нездарма называюць яго часам марскім арлом,— быў тут забіты выпадкова, у час нейкага свайго далёкага падарожжа, а ён, выходзіць, гняздзіцца і ў нас, на Беларусі. У запаведніку ён жыве недалёка ад вады, у вялікіх лясах каля Бярэзіны і азёр.

Егер кажа, што яму даводзілася бачыць, як у пагоні за буйной рыбай арлан-белахвост кідаўся, склаўшы крылы, з лёту ў ваду і даваў нырца.

— Я некалькі разоў бачыў арлана на возеры,— гаворыць егер. — Ён кожны дзень прылятаў туды раніцой, ледзь толькі сонца ўзыдзе, на адно і тое ж месца, недалёка ад гнязда. Усе іншыя птушкі яго баяцца. Чайкі, качкі, кнігаўкі адразу знікаюць, як толькі арлан-белахвост з'явіцца на беразе ці над вадой. А ён не звяртае на іх ніякай увагі. Падляціць цяжкім павольным палётам да пясчанага плёсу і апусціцца проста ў ваду, на мелкім, зразумела, месцы. Любіць ён купацца цёплай летняй раніцай, не баіцца «штаны» замачыць. Ідзе па пясчаным дне, пакуль вада не падступіць яму пад самае бруха. Тады ён акунецца некалькі разоў з галавою, не зыходзячы з месца, страсянецца, натапырыўшы крылы, і выйдзе на бераг. А вакол даўно ўжо нікога няма — ні качак, ні чаек, ні кулікоў, ні варон,— усе адступіліся ад сваіх заняткаў, ад рыбнай лоўлі, пакінулі яму ўвесь бераг, пахаваліся ў чароце. А я сяджу сабе ціха ў кустах на ўзгорку ды назіраю за арланам з якую гадзіну ці, можа, болей. Па зямлі ён ходзіць марудна, цяжка, з намаганнем, шырока перастаўляючы магутныя лапы з вялізнымі кіпцюрамі

і нібы пераваľьваючыся з боку на бок. Пасядзіць на беразе, пачысціць пер'е і пачне лавіць рыбу. Потым узнімецца ў паветра і, узмахваючы крыламі, павольна ляціць над вадой. А як убачыць у возеры добрую рыбіну, дык каменем падае ўніз, толькі срэбныя пырскі ляцяць. Схопіць рыбу кіпцюрамі і ляціць з ёю да гнязда на старым адзінокім дубе. І гэтак робіць арлан некалькі разоў, пакуль не накорміць сваіх ненажэрных птушанят. Панацягае малым у гняздо ўсялякага корму ў запас, сам пад'есць і тады зноў сядзіць на беразе, п'е ваду і чысціць пер'е. Даўно я за ім сачыў, але падстрэліць удалося не яго, а самку.

Рыба для арлана-белахвоста з'яўляецца асноўным кормам. Аднак на поўначы гэты дужы і смелы птах палюе ў моры не толькі на рыбу, але і на маладых цюленяў.

У Бярэзінскім запаведніку не адмаўляецца ён і ад качак, а пры выпадку падбівае нават і такую буйную птушку, як бусел, у чым мы самі маглі пераканацца.

Зімой, калі рыбу здабыць нялёгка, арлан-белахвост ловіць варон, галак, зайцоў, лісіц і, паводле слоў егера, баброў. Часам, калі ўдаецца, ён не супроць таго, каб падхапіць і курыцу, і парася.

— Што ж цяпер будзе з птушанятамі арлана? — пытаюся я.— Загінуць, напэўна, без маткі?

— За іх можаце не турбавацца,— адказвае Леанід Васільевіч, працуючы пінцэтам і скальпелем.— Калі самка загінула, самец будзе іх даглядаць. Ён іх і выкарміць. Бацькі яны клапатлівыя. Калі нават каторае з птушанят вываліцца з гнязда на зямлю, бацька ўсё роўна будзе яму асобна прыносіць корм у больш чым дастатковай колькасці.

— Гэта правільна,— абазваўся егер,— корму ў іх столькі ў гняздо панацягана, што малым усяго і не з'есці...

Ускрыццё тым часам было закончана, і арлан-белахвост перайшоў у поўнае распараджэнне прэпаратара Антона Цярэнцевіча. Чучалам сваім арлан папоўніць калекцыі нанава створанага заалагічнага музея запаведніка.

## ПА ДАРОЗЕ Ў НЕШКАВА

У дзве гадзіны дня мы выехалі з дырэктарам у падсобную гаспадарку Нешкава, якая знаходзіцца за 18 кіламетраў ад пасёлка Крайцы, на ўсходняй ускраіне запаведніка. З намі едзе ветэрынарны фельчар, ляснік, егер Аляшкевіч і двое рабочых з падсобнай гаспадаркі.

Зноў цярушыць дробны дождж. Глеба тут вязкая і багністая. Што ні крок — ямы, калдобіны, глыбокія лужыны. Машына спыняецца кожную хвіліну. Колы буксуюць у гразі.

Прыходзіцца часта вылазіць і дружнымі намаганнямі штурхаць машыну наперад, падкладаючы галлё пад непаслухмяныя колы.

Часам і гэта не дапамагае. Тады ідуць у ход сякеры. Нашы спадарожнікі хутка і спрактыкавана сякуць бярозы, ялінкі і асіны, распілоўваюць іх на некалькі частак і кладуць пад колы ствaламі ўздоўж каляіны.

Абапал дарогі цягнецца вільготны і балоцісты лес.

Высяцца стройныя бярозы, вялізныя вольхі, цёмныя яліны.

Духмяная чаромха шырока раскінула свае цяністыя галіны.

Гнуткія маладыя ясені стромка ўзвышаюцца над грудамі буралому. Усюды прабіваюцца кусты арэшніку і каліны, павялічваючы яшчэ больш гушчыню і непраходнасць лесу. Чым далей на ўсход, у глыб запаведніка, тым усё часцей і гусцей, суцэльнай сцяной стаяць старыя дрэвы-волаты. Тут пануе вільгаць і змрок.

Зрэдку толькі прабяжыць у вяршалінах і зашуміць ненадоўга ветрык, і зноў пануе цішыня.

У Нешкаве, куды мы дабраліся праз некалькі гадзін пакутлівай язды, надакучліва звіняць над намі ваяўнічыя полчышчы камароў.

Пакуль ветфельчар правярае стан мясцовых кароў і коней, мы аглядаем палі і агароды гаспадаркі. Гэта — самыя нізкія і вільготныя мясціны ў запаведніку. Зямля тут тлустая, урадлівая.

## БАБРОВАЯ ХАТКА

На зваротным шляху, не даязджаючы вёскі Пастрэжжа, машына наша стала, не вытрымаўшы цяжкай дарогі.

Паабапал гаці, на якой стаіць машына, раскінулася балота. Да Крайцаў адсюль засталося яшчэ восем кіламетраў.

Стомлены, запырсканы гразёю шафёр вылез з кабінкі і, ссунуўшы шапку на патыліцу, безнадзейна махнуў рукой:

— Прыйдзецца пастаяць,— кажа ён.— Нічога не папішаш, паломка здарылася.

Дождж тым часам ідзе ды ідзе. Што рабіць?

Я парашыў выкарыстаць вымушаны прыпынак і наведаць бабровую хатку на канаве сярод балота. Усё роўна мокнуць!

Ляснік Сідар Аўтушка, які ехаў з намі, узяўся мяне праводзіць.

— Хатка адсюль недалёка,— сказаў ён,— з паўкіламетра, не болей, калі ісці наўпрост па балоце.

Мы сышлі з бярвенчатага насцілу гаці і адразу праваліліся ў ваду па калена.

Сідар Аўтушка, высокі і дужы дзядзька ў вайсковай гімнасцёрцы і скураных лапцях, шпарка і лёгка ідзе наперадзе. Я спяшаюся за ім, задыхаючыся, блытаюся

нагамі ў балотных раслінах, адстаю і часта правальваюся ў ваду.

Дождж цярушыць па-ранейшаму. На кожным кроку джаляць камары.

Мы ідзём уздоўж нешырокай, але паўнаводнай і глыбокай рэчкі ці, правільней, канавы з павольнай і непрыкметнай плынню. Яна губляецца сярод аднастайнай балотнай раўніны, якая дзе-нідзе парасла кустамі ніцых лоз.

Аб рэчышчы гэтай канавы можна меркаваць толькі па доўгім радзе маладых нізкарослых бярозак, якія растуць рэдкім ланцугом на абодвух яе топкіх, балоцістых берагах.

Высокі і хударлявы ляснік крочыць па дрыгве, нібы бусел. Спрытна і беспамылкова знаходзіць ён зыбкі пункт апоры для нагі, каб адразу пераскочыць на другі, гэткі ж часовы і ненадзейны.

Я ледзь паспяваю за ім. Мне горача, нягледзячы на халаднаваты вечар і дождж. Ногі ў вялізных, поўных халоднай вады, гумавых ботах, атрыманых мною ад дырэктара, вязнуць у дрыгве.

Мне здаецца, што на нагах у мяне не гумавыя боты, а цяжкія вёдры з вадой. Вадзяныя расліны чапляюцца за ногі і перашкаджаюць рухацца. Здрадніцкія купіны, ледзь толькі ступіш на іх, адразу пагружаюцца ў ваду і знікаюць кудысьці, выслізнуўшы з-пад нагі.

Некалькі разоў, шагнуўшы крыху ў бок ад следу, пакінутага лесніком, я правальваюся ў ваду да пояса і вылажу, хапаючыся рукамі за гнуткае голле маладых бярозак.

— Для нашых балот няма лепшага абутку, як лапці,— спачувальна кажа, аглядаючыся на мяне, Аўтушка.— Лёгка і зручна, і нага не вязне. Прыйдзецца вам тут імі абзавесціся, не іначай.

На кожным кроку відаць цяпер па краях рэчкі сляды дзейнасці баброў. Усюды сустракаюцца паваленыя бярозкі, зрэзаныя палкі, абгрызеныя і паламаныя галінкі лазняку.

Зверху нас усё яшчэ палівае дождж. Ад камароў не выратоўвае і цыратавая палатка, накінутая на галаву.

Прайшоўшы па балоце з паўкіламетра, мы спыняемся, нарэшце перад бабровай хаткай.

Знаходзіцца яна ў вадзе, бліжэй да супрацьлеглага берага. Па знадворным выглядзе — гэта вялікая куча ўсялякага, абы-як накіданага ламачча, якая ўзвышаецца над вадой амаль на два метры ў вышыню. У дыяметры, каля самай вады, хатка дасягае, мабыць, метраў чатырох.

Зверху ляжаць свежыя, нядаўна зрэзаныя палкі.

Ад супрацьлеглага берага хатку аддзяляе прарыты бабрамі абводны канал.

Аўтушка ўзлазіць на бабровую хатку і тупае па ёй нагамі.

— Хатка жылая,— гаворыць ён,— з гаспадарамі. Бачыце, якая трывалая?

Сапраўды, хатка пабудавана так моцна, што спакойна можа трымаць чалавека. Бабры — руплівыя гаспадары. Уважліва сочаць яны за станам свайго жылля, заўсёды ўмацоўваючы яго і рамантуючы. На хатку, пакінутую бабрамі, нагамі не станеш, яна адразу праваліцца.

— Гэта толькі збоку здаецца, што палкі накіданы абы-як,— гаворыць Аўтушка, злазячы з хаткі.

Знізу і знутры бабровыя хаткі моцна сцэментаваны глеем. Нялёгка прабрацца ў такую хатку. У ёй бабёр адчувае сябе ў поўнай бяспецы. Іншы раз воўк, пачуўшы бабра, спрабуе кіпцюрамі разбурыць яго хатку. Але ніколі яму гэта не ўдаецца, так моцна яна зроблена. Мядзведзь, а іх у запаведніку шмат, таксама не супроць таго, каб паласавацца тлустым бабровым мясам, асабліва ранняй вясной, калі ён галодны і худы пасля зімняй спячкі і калі яму прыходзіцца харчавацца ў асноўным толькі леташнімі журавінамі на балоце. Мядзведзь, зразумела, дужэйшы за ваўка, ён можа разбурыць бабровы дом, але да гаспадароў яму ніколі не дабрацца, таксама

як і ваўку. Пакуль ён будзе старацца над хаткай, бабёр заўсёды здолее своечасова выбрацца праз падводны ход і адплысці куды-небудзь далей.

Звычайна бабёр выбірае месца для пабудовы хаткі між карэнняў старой вольхі. На балоце вольха расце кустом. З густа пераплеценых карэнняў узнімаецца некалькі ствалоў і маладых парасткаў. Прамежкі паміж імі запоўнены леташнім лісцем, сухімі галінкамі і наноснай зямлёй, якая засталася тут пасля паводкі. Зверху ўсё гэта зарастае мохам. У такім вось месцы і будуе часцей за ўсё сваю хатку бабёр. Вырыўшы пасярод узгорка, між ствалоў вольхі, яму, ён стварае дно і сценкі логава, а зверху кладзе тоўстыя, ачышчаныя ад кары палкі, робячы над логавам скляпенне. На гэтыя бэлькі ён кладзе лягчэйшую насцілку з больш тонкіх і неачышчаных палак і галін. Калі столь над логавам узведзена, бабёр будуе вакол яго галерэю. Для гэтай мэты ён кладзе на верхнюю насцілку логава доўгія галіны, камлямі ўгору. Тонкія канцы гэтых галін упіраюцца ў зямлю. Вакол усёй пабудовы робіцца такім чынам галерэя, якую бабёр пакрывае зверху глеем і зямлёй. На галіны, якія ўтвараюць галерэю, ён кладзе наступныя рады галін і палак, таксама пакрываючы іх зверху глеем і зямлёй.

Будуе хатку галоўным чынам бабрыха. Гэта яна абкладвае логава палкамі, абмазвае іх глеем і глінай, кладзе зверху новыя рады палак. Бабёр тым часам рыхтуе будаўнічы матэрыял. Ёнваліць маладыя дрэўцы, ачышчае іх ад суччa, разгрызае ствалы на роўныя часткі і па вадзе дастаўляе іх да месца будоўлі. Бабрыха час ад часу нырае ў ваду, залазіць у хатку і там пярэднімі лапамі, як сапраўдны тынкоўшчык, абмазвае столь сваёй кватэры глеем. Унутры хаткі бывае часам некалькі пакояў і некалькі выхадаў пад ваду. Логава ці гняздо ў хатцы знаходзіцца заўсёды над узроўнем вады.

Хатка, ля якой мы стаім, была пабудавана, відаць, на беразе, на карнявішчы старога пня, а потым аддзелена

ад берага, нібы старадаўні замак, штучным каналам і цяпер знаходзіцца на астраўку.

Старыя бабровыя хаткі, у якіх бабры жывуць з пакалення ў пакаленне, штогод іх пашыраючы і павялічваючы, дасягаюць часам вялізных памераў.

— У адной такой хатцы,— кажа Аўтушка,— тры партызаны ад карнікаў хаваліся. Было гэта ў 1943 годзе, ва ўрочышчы Доўгае, у час блакады запаведніка. Трое партызан забраліся ў вялікую бабровую хатку, падкапаўшыся знізу, з-пад вады, і прабылі там усю ноч. А на беразе гітлераўцы размясціліся на начлег і сядзелі ля вогнішчаў, не падазраючы, што за дваццаць крокаў ад іх хаваюцца партызанскія разведчыкі.

Мы стаім пад дажджом і аглядаем хатку. Каля яе тырчыць з балота высокі слупок з папярочнай шыльдачкай, на якой густой чорнай фарбай напісана — 213.

— Мая работа,— усміхаецца Аўтушка.— Я знайшоў гэтую хатку вясной і паставіў кол з парадкавым нумарам. Пад гэтым нумарам хатка зарэгістравана ў канторы.

Для таго каб падлічыць, хаця б прыблізна, агульную колькасць баброў, якія засталіся пасля вайны, дырэкцыя дала заданне егерам і леснікам выявіць і зарэгістраваць усе хаткі і норы баброў на кожным участку.

Бабры жывуць сем'ямі. Кожная сям'я мае пэўны ўчастак, больш ці менш аддалены ад іншых сем'яў. Бабровае жыллё з усімі падсобнымі пабудовамі — норамі, каналамі і плацінамі, пабудаванымі адной сям'ёй, якая жыве асобна, называецца бабровым паселішчам.

Часам некалькі хатак знаходзяцца блізка адна ад адной, на адлегласці ад 10 да 15 метраў. Яны пабудаваны маладымі бабрамі, якія дасягнулі двухгадовага ўзросту і, аддзяліўшыся ад бацькоў, пасяліліся па суседству. Такія групы блізкіх паселішчаў называюцца бабровымі калоніямі.

Самка бабра прыносіць у год звычайна двух малых. Такім чынам, кожная сям'я можа складацца з двух

дарослых баброў, двух малых бабранят, якія нарадзіліся ў гэтым годзе, і двух маладых леташніх.

Работнікі запаведніка, дзе на лодцы, а дзе і пеша па балоце, добрасумленна абследавалі ўсе патаемныя куткі, усе аблюбаваныя бабрамі ўгоддзі. Жылыя хаткі і норы баброў былі зарэгістраваны і пад адпаведным нумарам занесены ў спіс бабровых паселішчаў, які заведзены дырэкцыяй у пачатку гэтага года.

Каля кожнай хаткі, на бліжэйшым дрэве ці на слупку, пастаўленым сярод балота, прымацавана шыльдачка з нумарам. Пад гэтым жа нумарам кожная хатка адзначана і на спецыяльнай карце, складзенай навуковымі супрацоўнікамі. У спіс і на карту трапіла і выяўленая Сідарам Аўтушкам хатка нумар 213 ва ўрочышчы Смолінка, каля якой мы стаім, мокрыя з галавы да ног.

## РАЧНЫЯ БУДАЎНІКІ

Агледзеўшы хатку, мы падышлі да нізкай земляной плаціны, якая напалову перагароджвае канаву недалёка ад бабровага жылля.

Аўтушка ставіцца да гэтай плаціны з яўнай знявагай.

— Хіба гэта плаціна? — кажа ён.— Аб майстэрстве баброў па гэтай плаціне меркаваць нельга. Бабры — надзвычайныя будаўнікі! Здаецца, невялікі звярок, а якія дзівосныя па сваёй велічыні і трываласці пабудовы ён можа ўзводзіць! Трэба яму падняць узровень вады ў вузкім і плыткім месцы, каб забяспечыць сваё жыллё ад ворагаў ці наблізіць харчовыя ўгоддзі. Калі ласка! Ён адразу бярэцца за працу і перагароджвае рэчышча плацінай. Ды працуе як мае быць, не горш за чалавека.

Я пачаў распытваць Аўтушку, якім чынам будуюць бабры плаціну. Ляснік ахвотна падзяліўся са мной сваімі ведамі.

— Спачатку,— сказаў ён,— бабёр валіць упоперак рэчкі дрэвы, утыкае ў дно колле, умацоўвае іх глеем ды глінай, кладзе зверху палкі, дзёран, зямлю, нагрувашчвае ўсё гэта і будуе вал. Узровень вады пачынае падымацца. Вада выходзіць з берагоў і затапляе прыбярэжныя кусты і дрэвы. Тады бабёр умацоўвае сваю пабудову глеем ды зямлёй, накладваючы іх і на вяршыню плаціны і на схіл. Потым ён падоўжвае канцы плаціны ў абодва бакі, пакуль яна не зробіцца дастаткова высокая, доўгая і моцная, каб трымаць ваду на патрэбным яму ўзроўні. Такую плаціну і чалавеку пабудаваць нялёгка. Вось гэта будаўнік дык будаўнік! — заканчвае Аўтушка сваю прамову, і ў голасе ў яго чуецца цяпер шчырая павага да будаўнічага майстэрства баброў.

Працуючы над складанымі пабудовамі і ўмела рэгулюючы ўзровень вады, бабёр кіруецца не розумам, а прыроджаным інстынктам. Маладыя бабры, якія выраслі ў няволі і потым былі выпушчаны ў раку, адразу пачынаюць будаваць сабе дом, рыць каналы і ўзводзіць плаціны з няменшым майстэрствам, чым старыя вопытныя бабры. Між тым выхаваныя ў няволі, яны ж не мелі магчымасці пераняць вопыт сваіх старэйшых сяброў. Ніхто іх не вучыў будаўнічаму майстэрству. Яно перайшло да бабра ў спадчыну ад незлічоных пакаленняў продкаў — нястомных рачных будаўнікоў.

Я кажу пра гэта лесніку, але ён, здаецца, не вельмі са мною згодзен.

— Усё-такі, ведаеце, надта ж разумны гэты звярок,— гаворыць ён з перакананнем.— Нашы людзі бабра паважаюць.

Скончыўшы агляд плаціны, мы тым жа спосабам прабіраемся па балоце назад.

Машыну мы не знаходзім на месцы і пад праліўным дажджом ідзём па дарозе ў вёску Пастрэжжа. Дождж нам цяпер, пасля купання ў балоце, зусім не страшны. На нас і так сухой ніткі няма.

Мы падыходзім да вёскі. Наперадзе, каля крайняй хаты, чарнее машына. Мы заходзім у хату Сідара Аўтушкі. Там ужо сядзяць і чакаюць нас астатнія падарожнікі.

Перад тым як увайсці ў дом, я разуваюся і выліваю ваду з гумавых ботаў, нібы з вёдраў.

Праз некалькі хвілін мы садзімся ў машыну і едзем у Крайцы. Дождж перастаў, але дзьме моцны вецер. Холадна ў мокрым адзенні і абутку.

У Крайцы мы дабіраемся ноччу, каля першай гадзіны.

## БАБРЫ Ў БЯРЭЗІНЕ

На другі дзень вечарам мы пайшлі з Леанідам Васільевічам, намеснікам дырэктара па навуковай частцы, па левым беразе Сергучоўскага канала ва ўрочышча Залазы.

Незадоўга перад Вялікай Айчыннай вайной Леанід Васільевіч скончыў адзіную ў свеце спецыяльную вышэйшую навучальную ўстанову — факультэт паляўнічай гаспадаркі Пушна-футравага інстытута ў Маскве. На вайне ён быў афіцэр, удзельнічаў ва ўзяцці Берліна, а пасля дэмабілізацыі вярнуўся да сваёй любімай справы.

Працуючы ў запаведніку, Леанід Васільевіч збірае матэрыялы аб жыцці і звычках выдры.

Мяне цікавяць галоўным чынам бабры, але паколькі бабёр і выдра жывуць у аднолькавых прыродных умовах, маршруты нашы заўсёды супадаюць.

Па абодвух баках канала ліставы лес. Асіны і вольхі, пераплеценыя знізу лазой, задумліва глядзяцца ў ціхую, цёмную ваду.

Па ўсім густа зарослым беразе часта сустракаюцца старыя, разбураныя норы баброў.

Там, дзе берагі сухія і высокія, бабёр не будуе сабе хаткі. Ён выкопвае глыбокую нару. Уваход у яе з-пад вады ідзе ўгору і заканчваецца недалёка ад паверхні пашырэннем, так званым гняздом, высланым травой і галінкамі.

У нізкіх і балоцістых мясцінах, якія пераважаюць у запаведніку, усюды сустракаюцца, як правіла, хаткі.

На ўзвышаным беразе канала трапляюцца часта бабровыя норы з некалькімі падземнымі разгаліненнямі і выхадамі на паверхню зямлі. Норы служаць бабрам толькі часовым прытулкам у тых месцах, дзе яны кормяцца. У час небяспекі бабёр, які корміцца на зямлі, можа схавацца ў адну з такіх нор і праз падводны ход уцячы ў ваду.

— У самім канале бабры не жывуць,— гаворыць Леанід Васільевіч,— тут для іх занадта неспакойна. Людзі ходзяць, на конях ездзяць, каровы пасуцца. Бабры заплываюць сюды па начах з Бярозы карміцца.

Па берагах канала відаць шматлікія месцы, дзе бабры вылазяць на зямлю. Вось перад намі на супрацьлеглым беразе «сталовая». Гэта — гладкая, слізкая земляная пляцоўка са схілам у ваду пад навіслай над вадою ракітай. На беразе каля пляцоўкі валяюцца аб'едзеныя карнявішчы жоўтых гарлачыкаў. Такія ж карнявішчы, падобныя на катахі кукурузы, плаваюць паблізу ў цёмнай вадзе.

Сюды бабёр вылазіць, каб адпачыць на зямлі, пад'есці і паляжаць пад старой ракітай.

Мы ідзём далей.

Чым бліжэй да Бярэзіны, тым усё радзейшы робіцца балоцісты лес па берагах канала, тым усё больш і гусцей

расце лазняк. Не відаць ужо ні ясеня, ні ліпы. Затое часцей сустракаюцца беластволыя бярозы. Лес пераходзіць у балота.

Прайшоўшы каля трох кіламетраў, мы падыходзім да месца, дзе Сергучоўскі канал злучаецца з Бярэзінай.

Адсюль Бярэзіна цячэ далей, значна пашырыўшыся і ўзбагаціўшыся за кошт ціхіх і цёмных вод канала.

Берагі яе нізкія, балоцістыя. Рака цячэ ў шырокіх лугавых поймах. Ля самай вады і ў вадзе расце малады лазняк і асіннік — любімы корм баброў.

Мы ідзём левым берагам Бярэзіны ўніз па плыні. На тарфяністай глебе балота выразна відаць сляды лісіцы, качак, дзікіх коз.

Над галавой пралятае чырок.

З супрацьлеглага берага даносіцца працяглы жаласны крык кнігаўкі.

Леанід Васільевіч, трапны стралец і нястомны хадок, ідзе далей па падсохлым балоце, уважліва разглядаючы сляды.

Я вяртаюся на месца, дзе канал злучаецца з Бярэзінай, і спыняюся на невялікім мыску, створаным ракой і каналам.

Нізкія берагі Бярэзіны дзе-нідзе акаймаваны кустамі лазы. За імі далёка навокал цягнецца балоцістая раўніна, якая густа зарасла рагозам, сітам і лотаццю.

На гарызонце віднеецца цёмная паласа лясоў.

У паветры ціха і ясна. Сонца блізіцца да небасхілу.

Ля левага берага Бярэзіны, крыху вышэй канала, нешта плюхнулася ў ваду. Пайшлі вялікія кругі.

Я гляджу ў той бок.

Ніжэй гэтага месца паказалася з вады круглая і цёмная галава бабра.

Я не зводжу з яго вачэй,— гэта першы бабёр, якога я бачу на волі.

Бабёр плыве ў спакойнай вадзе Бярозы, асветленай мяккімі праменнямі заходзячага сонца і злёгку кранутай серабрыстай рабізной.

Ветрык гоніць па бледным небе цёмныя хмаркі.

З майго ўзвышанага месца добра відаць кожны рух бабра.

Адштурхоўваючыся, як вёсламі, сваімі вялікімі заднімі лапамі, ён хутка і бясшумна плыве ўніз па Бярозе да вусця канала.

Усё тулава бабра схавана пад вадой. На паверхні відаць толькі круглая галава і цьмяны абрыс спіны. Шырокія кругі разыходзяцца ад яго па вадзе.

Вось, затрымліваючы паступова ход, ён падплывае да нізкага лугавога берага ў самым вусці насупраць мяне. Спыняецца на хвіліну, падняўшы галаву з вады, і, лёгка павярнуўшыся, аглядаецца на ўсе бакі і прыслухоўваецца. Нос у яго варушыцца, нібы ў пацука ці зайца.

Пераканаўшыся ў цішыні і бяспецы, бабёр, не спяшаючыся, асцярожна вылазіць з вады на бераг.

Павольна і нязграбна, цяжка перавальваючыся на кожным кроку, пасоўваецца бабёр па зямлі, прабіраецца скрозь узбярэжныя зараснікі рагозу. Шырокі і пляскаты хвост яго цягнецца па зямлі.

Вось ён набліжаецца да маладой асіны. Сеўшы на заднія лапы, выгнуўшы спіну і абапіраючыся на хвост, бабёр лёгка перагрызае асінавую галіну. Потым, узяўшы яе пярэднімі лапамі, хутка аб'ядае кару. Усімі рухамі сваімі, асабліва калі не відаць яго характэрны хвост, схаваны ў траве, ён нагадвае цяпер нейкага вялізнага пацука.

Праходзіць некаторы час. Падсілкаваўшыся, бабёр пачынае займацца сваім туалетам. Седзячы на задніх лапах, ён пярэднімі мыецца і прыгладжвае сабе морду. Потым зноў падыходзіць да берага і кідаецца ў канал. Спакойная гладзь соннай, нібы застылай, вады ўскалыхнулася.

Бабёр плыве ўздоўж берага, пакуль не знікае ў зарасніках рагозу.

Я гляджу на гадзіннік: 7 гадзін 15 мінут.

Да мяне падыходзіць Леанід Васільевіч, які скончыў свае доследы на балоце.

Я паказваю яму, дзе праплыў бабёр, дзе вылазіў на бераг і ў якім напрамку знік.

— Бабры ў нас не вельмі палахлівыя,— гаворыць ён.— Падпускаюць да сябе даволі блізка. Пад вечар іх часта можна бачыць.

— А днём? — пытаюся я.

— Амаль ніколі. Бабры не выносяць гарачыні і не любяць яркага сонца. Уся дзейнасць іх праходзіць пераважна ўначы. Бабёр, якога вы наглядалі, жыве, мабыць, у хатцы нумар 147, недалёка адсюль. Увесь дзень ён адпачываў, як і ўсе прыстойныя бабры, у сябе дома. Пад канец дня, перад захадам сонца, ён вынырнуў з хаткі, паплаваў некаторы час каля жылля, асвяжыўся ў халаднаватай вадзе, закусіў, прывёў у парадак свой туалет і цяпер паплыў у канал на працяглую начную жыроўку. Раніцай ён вернецца дамоў адпачываць.

— Хацелася б паглядзець, як валяць бабры дрэвы,— заўважыў я.

— Зараз яны гэтым не займаюцца,— адказаў Леанід Васільевіч.— Для таго каб убачыць баброў за работай, за будаўніцтвам хатак і плацін, за нарыхтоўкай харчовых запасаў, трэба вам прыехаць сюды ўвосень. Будаўнічы сезон пачынаецца ў іх у верасні. Улетку яны толькі жыруюць.

— Што ж,— кажу я,— нічога не зробіш. Прыйдзецца пачакаць восені і прыехаць сюды яшчэ раз.

Мы стаім некалькі хвілін на мыску.

Цёплы летні вечар павольна і непрыкметна апускаецца над ракой.

Мы вяртаемся тым жа шляхам, па левым беразе канала, у Крайцы і прыходзім дадому ў дзесяць гадзін вечара.

## УРОЧЫШЧА ЗАЛАЗЫ

Сёння ўвечары я зноў пайшоў ва ўрочышча Залазы, на гэты раз па правым беразе канала.

Дайшоўшы да трэцяга шлюза — шлюзы на канале называюцца тут «залазамі», адсюль і назва ўрочышча,— я павярнуў управа і апынуўся на паўкруглай градзе, ці касе, якая ў форме маладзіка ўзвышаецца над поймай Бярэзіны.

Града гэтая, ці, як тут кажуць, «грыўка», падобна да штучна зробленага сярод балота насыпу, але створана яна, хутчэй за ўсё, наносамі Бярэзіны ў час паводак. Уся яна густа зарасла высокай травой. На ёй узвышаюцца дубы, і адзінокія, і невялікімі групамі, прасціраючы над касой сваё вузлаватае, кучаравае голле.

З грэблі касы далёка відаць наваколле. На супрацьлеглым беразе звілістай Бярэзіны адзінока высіцца сярод балота стары сухі дуб з вялікім гняздом.

Тут, каля гэтага гнязда, і была падстрэлена егерам самка арлана-белахвоста.

Я спрабую прайсці да бобровай хаткі нумар 147 па беразе Бярэзіны, але прабрацца туды немагчыма. Дажджы, што ішлі некалькі дзён запар, ператварылі балоцісты луг, які цягнецца ад «грыўкі» да берага ракі, у непраходную дрыгву.

Я вяртаюся да канала і пераходжу па шлюзе на левы бераг, а адтуль іду на знаёмы мысок, дзе канал злучаецца з Бярэзінай.

Ледзь толькі заняў я пазіцыю на мыску, як у вадзе з'яўляецца бабёр і плыве ў мой бок.

На гадзінніку 7 гадзін 20 мінут.

Дзіўнае супадзенне! Мабыць, бабёр з хаткі нумар 147, калі гэта той самы, якога я бачыў раней, досыць сталы ў сваіх прывычках. Праўда, датычыцца гэта толькі часу, а не маршруту. На гэты раз бабёр змяніў напрамак сваёй прагулкі. Мінуўшы вусце канала, ён плыве ўніз па рацэ і хутка знікае за бліжэйшым паваротам.

## ПЕРАД АД'ЕЗДАМ

Заўтра мне трэба вяртацца дамоў. Перад ад'ездам я вырашыў паглядзець яшчэ раз на Бярэзіну.

Гадзіны ў дзве я выйшаў з канторы запаведніка і пайшоў у бок ракі праз сухі сасновы бор, які акружае сядзібу.

Дарога вядзе між пясчаных узгоркаў з рэдкімі, але высокімі соснамі і кустамі ядлоўцу.

Прайшоўшы кіламетры тры сасновым борам, я выходжу да ракі.

Лес тут раптоўна абрываецца, дарога ідзе ўніз. Сосны змяняюцца групай маладых бярозак, вольхай і лазняком.

Мінуўшы невялікі балоцісты луг, я дабіраюся да Бярэзіны. Яна тут значна вузей, чым Свіслач у Мінску, але гэткая ж, калі не больш, звілістая. Павольна цячэ яна сярод заліўных лугоў, утвараючы шырокія плёсы з жоўтымі і белымі гарлачыкамі і шматлікія затокі — прытулак дзікіх качак.

Ля самай вады растуць кустамі лаза і вольха.

На зялёных лугах цвіце жоўтымі плямамі курыная слепата. Дзе-нідзе чырванее конскае шчаўе.

На тым беразе ходзіць бусел.

З высокай травы ўзлятаюць дзікія качкі.

На гарызонце сінеюць лясы. Вясной, у часе паводкі, уся гэтая балоцістая раўніна зліваецца з Бярэзінай у адно суцэльнае мора.

З гэтага боку лесу бялеюць тонкія і стройныя бярозкі. Можа, ім абавязана Бярэзіна, ці, як кажуць заўсёды мясцовыя жыхары, Бяроза, сваім імем?

Ёсць у народзе паданне, быццам яна бярэ свой пачатак з маленькай крыніцы, якая выцякае з-пад карэнняў старой бярозы ў балоцістым бярэзніку. Таму рака і называецца — Бяроза, ці Бярэзіна.

Можа, гэта і сапраўды так?..

Ціхі, мірны пейзаж.

На супрацьлеглым беразе віднеецца вёска Брод. Злева тырчаць рэшткі вялікага, узарванага і разбуранага ў час вайны моста. На той бераг можна цяпер пераправіцца толькі на лодцы.

Над разбураным мостам ляціць у шэрым небе шуляк.

«Добра яму,— падумаў я,— маючы крылы». Калі б гэты мост быў цэлы, рушыў бы я адсюль адразу на мястэчка Мсціж — да яго ж усяго пятнаццаць кіламетраў ад Брода. А так прыходзіцца ехаць у абход цераз Бягомль, рабіць лішнія семдзесят кіламетраў.

Паглядзеўшы ўслед шуляку, які пераляцеў цераз Бярэзіну і знік за вёскай, я пайшоў назад у Крайцы.

На другі дзень, развітаўшыся з дырэктарам і работнікамі запаведніка, я выехаў цераз Бягомль, Мсціж і Зембін у Барысаў, а адтуль, цягніком, у Мінск, з цвёрдым намерам вярнуцца сюды восенню, каб паглядзець, як валяць бабры дрэвы, як будуюць яны сабе хаткі і як рыхтуюць харчовыя запасы на ўсю доўгую і суровую зіму.

## ЗНАЁМЫМ ШЛЯХАМ

Пабываць зноў у Бярэзінскім запаведніку мне давялося толькі праз год.

Неяк пад вечар, у пачатку верасня 1948 года, я выехаў на машыне знаёмым шляхам па Лагойскім тракце.

У вячэрнім змроку хвалямі разбягаюцца невысокія ўзгоркі, цьмяна пабліскваюць у нізінах шматлікія звілістыя рэчкі.

Хутка надыходзіць ноч, па-восеньску халодная і вільготная.

Між Плешчаніцамі і Бягомлем у яркім святле нашых фар апынуўся заяц. Замест таго каб кінуцца адразу ўбок,

ён імчыць па дарозе наперад. Заяц намагаецца ўцячы ад машыны па простай лініі. З неймавернай хуткасцю, як страла, ляціць ён па светлавой дарожцы, атуленай цемрай, нібы між дзвюх чорных сцен.

Некалькі хвілін цягнецца гэтая шалёная, але няроўная гонка. Дзе ж там вытрымаць заечаму сэрцу і доўгім нагам супроць машыны! Вось ён ужо амаль пад самымі коламі. Сабраўшы апошнія сілы, заяц высока падскоквае ўгору, робіць у паветры дугу і, апынуўшыся ў цемры, выратоўваецца ад немінучай пагібелі.

Недалёка ад Бягомля з'явіўся ў асветленай паласе перад машынай другі заяц. Гэты ўсё бяжыць і бяжыць па дарозе на ўсю моц, а скокнуць убок не здагадваецца.

Машына дагнала яго і падбіла шынай. Касавокі небарака застаўся ляжаць на дарозе, забіты на месцы, без якіх-небудзь знешніх пашкоджанняў.

Шафёр спыніў машыну, падняў зайца і паклаў яго ў кузаў.

— Заўтра нядзеля,— сказаў ён.— Добры абед будзе.

Узышоў месяц. У нізінах, над рэчкамі, над паплавамі, павольна ўзнімаецца туман. Абапал дарогі вырас цёмны лес.

— Чаму заяц бяжыць па асветленай паласе заўсёды толькі наперад? — пытае ў мяне шафёр.

Ён лічыць, відавочна, сваім абавязкам растлумачыць мне паводзіны зайца, бо сам адразу і адказвае:

— Яго асляпляе святло машыны. Ён бачыць перад сабой толькі светлую паласу дарогі, нібы калідор між дзвюх чорных сцен, і думае, што яму можна бегчы толькі ў адным напрамку — далей па калідоры, што ў гэтым яго адзіны ратунак. Вось і бяжыць ён усё наперад, пакуль сілы хопіць.

— А першы заяц? — спытаў я, каб падтрымаць размову.

— Першаму зайцу пашанцавала выпадкова,— адказаў шафёр.— Ён бег каля самага краю, перад правым

колам. Ратуючыся з-пад машыны, ён скокнуў, не гледзячы куды, і незнарок апынуўся па-за межамі светлай паласы. Тут да яго адразу вярнуліся і нармальны зрок, і ўсе пачуцці.

Ад месяца ўсё навакол пасвятлела. Мільгаюць па баках прыдарожныя слупы.

За Бягомлем на дарогу перад намі выйшаў воўк.

Характэрная постаць яго аддзялілася раптам ад цёмнай заслоны лесу і апынулася ў светлай паласе дарогі. Звер спыніўся і глянуў у наш бок. Вочы яго ўспыхнулі зялёным агнём. Ён павярнуўся ўсім тулавам і павольна перайшоў дарогу.

— Каб яго ваўкі! — вылаяўся шафёр.— Жыцця няма ад гэтых шэрых разбойнікаў. Надта яны шкодзяць. Каб не месяц, можа, і ён кінуўся б ад нас па дарозе? От каб яго дагнаць і падбіць, як таго зайца!

На 124-м кіламетры ад Мінска мы павярнулі з тракту ўправа.

Серабрыстае, халоднае святло месяца льецца над высокімі змрочнымі ялінамі. Ад цёмнай вады канала патыхае вільгаццю. Узнімаецца густы малочна-белы туман.

## АДНАЎЛЕННЕ ФЕРМЫ

Пераначаваўшы на канапе ў дырэктарскім кабінеце, я выходжу раніцай з канторы.

Сонца даўно ўжо разагнала туман і цяпер, пасля халоднай ночы, свеціць асабліва ярка і лагодна.

У сасновым бары стукаюць дзятлы.

Па гонтавым даху дырэктарскага дома жвава скачуць вясёлыя пліскі.

Зігзагамі прарэзваюць паветра стрыжы і ластаўкі.

Шмат чаго змянілася за гэты час у запаведніку. Выраслі новыя будынкі, багата папоўніўся экспанатамі адноўлены заалагічны музей.

Леанід Васільевіч паказвае мне гадавальнік, што будуецца для ласёў.

У сасновым бары, каля самай сядзібы запаведніка, выдзелены для гэтай мэты ўчастак зямлі памерам у адзін гектар. На ўчастку растуць і старыя высокія хвоі, і густы малады падлесак. Глеба тут сухая, пакрытая белым мохам, верасам і бруснічнікам.

Вакол участка, адзначанага слупамі, будуецца паркан з сасновых бярвенняў, дастаткова моцны і трывалы, каб ласі не маглі яго паваліць, і дастаткова высокі, каб яны не маглі цераз яго пераскочыць.

У цёплым сонечным паветры пахне верасам і жывіцай.

— У наступным годзе,— гаворыць Леанід Васільевіч,— ласіная ферма будзе ў нас цалкам адноўлена. Вясной мы адловім некалькі маладых ласёў і будзем іх трымаць у гэтым гадавальніку, хоць і за парканам, але ва ўмовах, вельмі блізкіх да прыродных. Доследы па прыручэнні ласёў, паспяхова распачатыя да вайны, будуць намі працягвацца. Пра гэтыя доследы вам можа расказаць шмат цікавага наш заатэхнік Вадзім Аляксандравіч. Ён займаецца вывучэннем парнакапытных жывёл і наглядае за пабудовай фермы.

Размаўляючы, мы абышлі амаль усю тэрыторыю будучага загона. На супрацьлеглым баку стаіць невялікая група людзей.

— Вадзім Аляксандравіч, хадзіце сюды! — паклікаў Леанід Васільевіч.

Да нас падышоў пажылы хударлявы чалавек у акулярах, які перад гэтым гаварыў аб нечым з рабочымі, аглядаючы прывезеныя бярвенні.

— Калі была створана ўпершыню ласіная ферма? — спытаў у яго Леанід Васільевіч.— Мяне ў той час тут не было.

Вадзім Аляксандравіч дакладна і падрабязна растлумачыў усё, што было яму вядома з практыкі яго работы.

— Доследы па прыручэнні ласёў,— сказаў ён,— пачаліся ў нашым запаведніку задоўга да вайны. У лютым 1936 года, у раёне Вялікай Ракі, былі злоўлены ў загон, памерам у дзесяць гектараў, два ласі ва ўзросце дзесяці месяцаў. Але першыя спробы прыручыць гэтых ласёў скончыліся няўдачай. На такім вялікім участку яны заставаліся дзікія, як і на волі. У маі 1937 года злавілі двух другіх ласянят, самца і самку, і ў ліпені яшчэ аднаго самца. Трымалі іх на спецыяльна для гэтага пабудаванай ферме, дзе яны ўвесь час знаходзіліся пад наглядам людзей. У красавіку і маі 1938 года да іх далучылі чатырох новых ласёў. У 1939 годзе адлавілі для фермы яшчэ двух, а ў 1940-м — шэсць ласянят. Некаторыя з іх былі яшчэ зусім малыя. Іх знайшлі ў лесе адразу пасля ацёлу, слабых, даверлівых і бездапаможных. Яны ледзь хадзілі, няўпэўнена, нібы на хадулях, перастаўляючы свае высокія ногі, калі іх падштурхвалі ззаду.

— Як знайшлі іх у лесе? — зацікавіўся я.— Гэта ж, напэўна, нялёгка?

— Але і не так ужо цяжка, як здаецца з першага погляду,— адказаў Вадзім Аляксандравіч.— Трэба толькі добра ведаць мясцовасць, дзе ходзяць ласі. Калі ласіха народзіць вясной, звычайна ў канцы красавіка ці ў пачатку мая, малога, яна пакідае яго аднаго дзе-небудзь у нізінцы, у густым асінніку, у высокай траве ці ў кустах, а сама адыходзіць убок, каб не прыцягваць да яго ўвагі ворагаў. Час ад часу ласіха падыходзіць да малога, корміць яго сваім малаком, а потым зноў пакідае аднаго. Яна трымаецца на некаторай адлегласці, абрываючы свежае зялёнае лісце і маладыя галінкі бярозы, асіны і ясеня, безупынна нюхаючы паветра і прыслухоўваючыся да кожнага шолаху. Егеру, які хоча знайсці ласяня, трэба падпільнаваць ласіху. Заўважыўшы чалавека, яна не будзе ўцякаць, як заўсёды, а, наадварот, выйдзе наперад, пакажацца яму на вочы і пастараецца адцягнуць

увагу ад таго месца, дзе яна схавала сваё дзіця. Для гэтага яна пабяжыць у супрацьлеглы ад ласяняці бок, але пабяжыць павольна, трымаючыся адкрытых месц і скоса паглядаючы назад, каб упэўніцца, што чалавек убачыў яе і ідзе за ёю следам. Час ад часу ласіха будзе спыняцца, каб падпусціць чалавека бліжэй і заахвоціць яго да далейшай пагоні. Такімі хітрыкамі яна стараецца адвесці чалавека далей ад свайго дзіцяці. Вопытны егер ведае, што ласяня трэба шукаць якраз там, дзе ласіха паказалася яму на вочы, у напрамку, супрацьлеглым таму, куды яна пабегла. Па слядах егер хутка знойдзе месца, дзе ляжыць ці стаіць ласяня. Цяпер трэба пачаставаць ласяня малаком з бутэлькі, якую егер павінен мець пры сабе. Пасмактаўшы соску, ласянятка само пойдзе за чалавекам.

— Хіба не спрабуе ласіха абараняць малога? — пытаюся я.

— Звычайна ўсё абыходзіцца добра,— гаворыць Вадзім Аляксандравіч.— Але быў у нас аднойчы выпадак, калі ласіха кінулася на егера. Яна ледзь не збіла яго з ног. Ён выратаваўся толькі тым, што паспеў стрэліць у паветра. Гэта спалохала і далёка адагнала ласіху, а егер узяў малога на рукі і выбраўся з лесу. Вострымі капытамі сваіх пярэдніх ног раззлаваны лось можа забіць чалавека насмерць.

— Чым вы кармілі такіх малых?

— На ферме ласянят паілі спачатку каровіным малаком і аўсяным пойлам з надрэзанай соскі, а потым пачалі даваць ім лісце і маладыя галінкі лазы, асіны і бярозы. Давалі яшчэ моркву, буракі, авёс. Ласяняты ў гадавальніку хутка зрабіліся зусім свойскія. Яны бегалі за агароджай, ганяліся адзін за другім, гулялі. Калі ж да іх набліжаўся знаёмы чалавек, ласяняты падбягалі да яго і тыцкаліся мордамі ў руку, патрабуючы пачастунку. Такім пачастункам з'яўляўся звычайна кавалак хлеба... Тым часам выраслі ласяняты, злоўленыя раней. За тры

гады яныператварыліся ў вялікіх і дужых дарослых ласёў. Кожны з іх быў вышэйшы і дужэйшы за каня. Усе яны прывыклі да людзей, самі падыходзілі да супрацоўнікаў і заўсёды беглі насустрач, калі іх клікалі. Кожны лось у гадавальніку меў сваё імя. Тут былі і Салавей, і Перапёлка, і Ветрык, і Хлопчык, і Сняжынка. У маі 1941 года ў нас адбылася радасная падзея — на ферме ўпершыню нарадзіліся ў няволі малыя ласяняткі. Яны былі свойскія з першых дзён з'яўлення на свет. Такім чынам у гадавальніку стварыўся цэлы статак ласёў розных узростаў, ад трох год і да нованароджаных.

— Ці не спрабавалі злоўленыя ласі ўцячы з гадавальніка?

— Такіх выпадкаў у нашай практыцы не было. Ласёў, якія выраслі на ферме, мы выпускалі пасвіцца на волю, у суседнія лясы, спачатку пад наглядам людзей, а потым адных і на ўвесь дзень. Нашы выхаванцы заўсёды самі прыходзілі пад вечар дамоў на ферму. Калі мы іх клікалі, яны прыбягалі з лесу і днём.

— А якую карысць можа даць развядзенне ласёў?

Вадзім Аляксандравіч ажывіўся. Вочы гэтага звычайна стрыманага чалавека заблішчалі. Мне здалося нават, што ён крыху зазлаваў. Відаць, тэма, якую мы закранулі ў размове, была для яго вельмі блізкая.

— Прыручылі ж людзі ў свой час і аленя ў паўночнай тундры, і доўгавалосага яка ў высакагорных раёнах Кіргізіі, і буйвала ў Закаўказзі,— адказаў Вадзім Аляксандравіч з запалам.— Вы ж ведаеце, якую вялікую карысць прыносіць на поўначы прыручаны алень? На ім ездзяць і ў санях, і верхам. Малако яго п'юць, мяса ядуць. Скура і футра паўночнага аленя ідзе на розныя прамысловыя вырабы, у першую чаргу на адзенне і абутак. Ёсць падставы меркаваць, што і прыручэнне лася, блізкага сваяка аленя, мае ў нашых умовах пэўныя перспектывы.

Лось па сваім характары даволі спакойная жывёліна і лёгка прывыкае да людзей. Вялікі па памерах і вельмі дужы, ён можа быць выкарыстаны не толькі для перавозкі грузаў, асабліва ў лясістых і балоцістых мясцовасцях, якіх так многа ў Беларусі, але і ў мяса-малочнай гаспадарцы. Малако ласіхі багата на тлушч. Мяса лася смачнае і дабраякаснае. Лось хутка расце і ў добрых умовах шпарка набывае вагу. Са шкуры лася вырабляюць падэшвы для абутку, а таксама замшу найлепшых гатункаў. Ласі здольны жыць не толькі на поўначы, але і ў розных кліматычных умовах. На корм яны вельмі непераборлівыя. На волі ласі харчуюцца лісцем і парасткамі асіны, лазы, рабіны, бярозы, ясеня, дуба, чаромхі, карою асіны і сасны, рознымі балотнымі хмызняковымі раслінамі, травой. На пасевы сельскагаспадарчых культур лось ніколі не выходзіць ні ў дзікім, ні ў прыручаным стане. У гаспадарцы шкоды ад яго няма ніякай. Шляхам далейшага адбору на працягу некалькіх пакаленняў карысныя якасці лася можна ўзмацніць, палепшыць і павялічыць.

— Няўжо гэтую дзікую лясную жывёліну сапраўды можна прывучыць да аглобляў і лейцаў? — пытаюся я.

— Можна,— сцвярджае Вадзім Аляксандравіч.— І з кожным новым пакаленнем ласёў, народжаных і выхаваных на ферме, рабіць гэта будзе ўсё лягчэй. Прывучаць маладых ласёў, злоўленых у лесе, да запрэжкі мы пачалі ў паўтарагадовым узросце. Спачатку надзявалі на іх толькі аброць з засцежкай, а потым, калі яны да яе прывыклі, хамут і іншую збрую. Вопыт паказаў, што ездзіць на ласях лепш за ўсё зімой. Лось, запрэжаны ў сані, бяжыць вельмі шпарка, роўным і шырокім ходам, хутчэй за самага добрага каня, але не на вялікую адлегласць, бо пасля 20—30 кіламетраў стамляецца. Летам на ласях ездзіць цяжка, бо яны не церпяць спякоты. У гарачую пару летняга дня з ласём не саўладаць, ён не слухаецца лейцаў, усюды шукае цяню і вільгаці. Калі ж

сустрэнецца па дарозе рэчка ці возера, лось можа кінуцца ў ваду разам з павозкай.

— Ці многа ласёў у запаведніку?

— У 1935 годзе на тэрыторыі запаведніка было дзвесце семнаццаць ласёў, а ў 1940 годзе пагалоўе іх вырасла да чатырохсот дваццаці двух. У час вайны шмат ласёў загінула. Прыручаныя ласі, выпушчаныя з гадавальніка на волю, кожны дзень з'яўляліся на двор спаленай фермы і смела падыходзілі да людзей, пакуль не былі ўсе да аднаго перабіты акупантамі. Цяпер ласёў налічваецца ў нас зноў каля двухсот галоў.

Пакуль мы размаўлялі, грузавік прывёз новую партыю бярвенняў для агароджы, і Вадзім Аляксандравіч, скончыўшы свае тлумачэнні, спяшаецца да машыны.

Вакол будучага ласятніка шуміць высокі зялёны бор.

Над грузавіком прарэзліва крычаць сойкі.

Верасы напаўняюць паветра мядовым пахам.

## СЕРГУЧОЎСКІ КАНАЛ

Халаднаваты, пахмурны ранак. Неба шэрае, паветра вільготнае.

Па беразе Сергучоўскага канала я іду да егера Аляшкевіча з запіскай ад Леаніда Васільевіча.

Высокія змрочныя яліны ўзвышаюцца па берагах канала над вольхамі і бярозамі.

Вада ў канале цёмная і глыбокая. Толькі на пясчаных мясцінах яна набывае чырванаваты колер. Гэта — адзнака таго, што ў вадзе ёсць жалезная руда.

Пракладзены яшчэ ў XVIII стагоддзі Сергучоўскі канал з'яўляецца часткай былой так званай Бярэзінскай воднай сістэмы.

Просты, як лінейка, ён праходзіць па тэрыторыі запаведніка на працягу каля дзевяці кіламетраў.

Праз Сергучоўскі канал Бярэзіна злучаецца з ракой Бузянкай, з ляснымі азёрамі Плаўе, Манец і Ольшыца, з каналам возера Бярэшта, з ракой Бярэштай, Вербскім каналам, ракой Эсай, возерам Проша, Лепельскім каналам, Лепельскім возерам, другім Лепельскім каналам, ракой Улай і Чашніцкім каналам. Апошні злучае раку Улу каля мястэчка Чашнікі з Заходняй Дзвіной.

Бярэзінская водная сістэма была створана падняволь-най працай беларускіх прыгонных сялян у 1798—1805 гадах. Па гэтым водным шляху лес з паўночнай лясістай часткі былой Мінскай губерні сплаўляўся ў Рыгу. Па Бярэзінскай сістэме перавозіліся ў баржах і лодках збожжа, соль, крупы.

Значэнне Бярэзінскага воднага шляху зменшылася пасля таго, як былі пракладзены чыгуначныя лініі. Догляд каналаў спыніўся, берагі іх пачалі абвальвацца, а потым зараслі лазой, вольхай і асінай.

Цяпер Сергучоўскі канал, самы вялікі з каналаў Бярэзінскай сістэмы, выкарыстоўваецца толькі для ўнутраных, мясцовых патрэб.

На фоне бледнага шэра-блакітнага неба вылучаюцца белыя ствалы бяроз. Жоўтых лісткоў на іх яшчэ мала.

З рэзкім стракатаннем пераляцела канал сарока. З лазняку ля самай вады з шумам выпырхнула другая.

На траве серабрыцца раса.

На суку, які навіс над вадой, сядзіць невялікая птушка дзіўнага выгляду з яркім, незвычайным апярэннем бліскучага зеленавата-сіняга колеру. Галава ў гэтай птушкі ледзь не з палову ўсяго тулава. Нос доўгі, прамы і востры, а хвост кароткі, як кажуць, куртаты. Яркая афарбоўка птушкі кідаецца адразу ў вочы. Яна здаецца нейкая чужародная на фоне сціплага, мяккага і спакойнага пейзажу.

Гэта — зімародак.

Сустракаецца ён у нас не так ужо часта.

Ціха, стараючыся не рабіць шуму, апусціўся я на зямлю і пачаў з-за кустоў наглядаць за птушкай.

Нерухома сядзіць зімародак на сваім месцы. Кароткія маленькія чырвоныя ножкі яго моцна ўчапіліся ў кару сука.

Жывуць зімародкі ля багатых рыбай вадаёмаў з густой расліннасцю. Трымаюцца яны адасобленымі парамі, на вялікай адлегласці адна ад другой. Кормяцца пераважна рыбай. Гнёздамі служаць ім норы ў берагавых абрывах над вадой.

Я доўга і цярпліва гляджу на цікавую птушку. Вочы стаміліся, і я ўжо збіраюся ўстаць.

Але вось зімародак выцягнуў шыю, перакуліўся галавой уніз і, як камень, ці, хутчэй, як страла, не раскрыўшы крылаў, упаў у ваду і знік з вачэй.

Праз момант ён з'явіўся зноў на паверхні і ўзляцеў на ранейшае сваё месца на суку.

У дзюбе зімародка зіхаціць срэбрам лускі і трапечацца невялікая рыбка. Зімародак стукнуў ёю аб сучок, падкінуў рыбку ўгору і, шырока раскрыўшы дзюбу, праглынуў. Потым страсянуў кроплі вады з пёркаў, пачысціў пер'е дзюбай і зноў нібы застыў у сваёй нерухомай паставе.

Я ўстаў і падышоў бліжэй.

Зімародак сарваўся з месца і паляцеў над каналам, шпарка махаючы сваімі кароткімі, закругленымі крыльцамі.

Яркі зеленавата-сіні шматок мільгануў над вадой і з тонкім, працяжным свістам знік у зялёных кустах на тым беразе канала.

# ЕГЕРАВА ЖОНКА

Егера я застаў дома.

Ён сядзеў на ложку, звесіўшы босыя ногі, і курыў самакрутку.

У хаце пахла печаным хлебам.

Аляшкевіч узяў ад мяне запіску і павольна прачытаў яе ўголас. Твар у яго ажывіўся, але, зірнуўшы на жонку, якая завіхалася каля печы, егер спахмурнеў і сказаў нібы нездаволена:

— Вось, бачыце, заўсёды так. Ніколі вольнай часіны не маеш. Толькі збярэшся каля хаты патупаць, зрабіць сёе-тое па гаспадарцы, аж тут якраз новае даручэнне. Наважыў я сёння нікуды не ісці, аж вы тут з гэтай пісулькай.

Ён змоўк і зноў скоса зірнуў на жонку.

Тая з ахвотай падхапіла гэтую тэму. Павярнуўшыся да нас расчырванелым тварам і ўпёршыся рукамі ў бокі, яна пачала выказваць сваё незадавальненне і мужам, і ягонай службай. Яна скардзілася на свой лёс у даволі энергічных выразах.

Я паспрабаваў закінуць слова, каб крыху суцішыць струмень разгневанага красамоўства егеравай жонкі ці накіраваць яго ў другі бок. Але нічога з гэтага не выйшла.

— Хіба гэта чалавек? — хвалявалася жанчына.— Яму абы стрэльбу за плечы ды ў лес. Хіба яму абыходзіць, што ў хаце робіцца? Як там хаця выдра ў балоце жыве, вось яго што турбуе! А як тут жонка з малымі дзецьмі, дык гэта ўжо быццам і не ягоная справа!.. Гэта ж проста казаць смешна, перад людзьмі сорамна,— другі месяц у новую хату перабрацца не можам. Каб не было, а то ж ёсць!..

Пакуль кабета давала волю сваім пачуццям, егер моўчкі сядзеў на ложку і спакойна курыў. Разумныя, хітраватыя вочы ў яго былі прыжмураны.

Я разумеў, што першыя ўступныя словы Аляшкевіча былі не больш як «дыпламатычны» манеўр, што яны

былі сказаны толькі дзеля жонкі, а сам ён зусім не супраць таго, каб пайсці ў лес і хоць на час пазбыцца жончыных даручэнняў.

Ледзь толькі гаспадыня скончыла свае скаргі і нараканні, выказаўшы ўсё, што было ў яе на душы, а можа, нават і трошкі болей, і павярнулася зноў тварам да печы, загрымеўшы дэманстратыўна чыгунамі, егер ціхенька ўстаў, узяў кепку, бясшумна зняў са сцяны стрэльбу і, не абуваючыся, моўчкі накіраваўся да дзвярэй, падміргнуўшы мне, каб я ішоў за ім.

Калі мы выйшлі з хаты, ён пачаў хваліць сваю жонку.

— Яна ў мяне кабета не благая,— запэўніў Аляшкевіч.— Вы не думайце! Усё чыста сама робіць, усюды ўпраўляецца. Такая працавітая ды ўвішная! Гэта ж таксама ўлічыць трэба. І ў партызанах яна ў мяне надзейны памочнік была. Вядома, ёй крыўдна. Ёй клопату хапае, нічога не скажаш, але ж і ў мяне служба. Яна думае, вось мужык здаровы, ды гультай. Замест таго, каб дома рабіць ці ў калгасе, ён сабе па лесе ходзіць ды каля начальства аціраецца. Нашай работы яна зразумець не хоча. Забывае, што я чалавек службовы. Але сваркі паміж нас ніколі не было, бо я заўсёды перапушчу. Яна часам хоць і лішняе скажа, а сама гэтак зусім і не думае. Абы сказаць. А калі што якое, то заўсёды паспагадае і дапаможа. Толькі слова ёй, канешне, насуперак не кажы. Тады ўсё добра. Такі, бачыце, характар.

Гаворачы пра жонку, Аляшкевіч заўзята шлёпае босымі нагамі па лужынах. На ім ватоўка і зялёныя суконныя штаны, завязаныя знізу.

— Не холадна босаму? — пытаюся я.

— Не,— кажа ён.— Прывык. У ботах ніколі па балоце не хаджу. Не магу. У ботах ногі ўвесь час мокрыя, сціснутыя, пацёртыя, ісці цяжка. А босы — ідзі ўсюды смела, босы толькі выйшаў з вады, ногі адразу і высахлі. У нашай мясцовасці ад ботаў карысці мала.

## РЭЧКА СЕРГУЧ

Мы падышлі да ўрочышча Прыстань.

Тут бярэ свой пачатак ад ракі Бузянкі не толькі канал, але і Сергуч, ці, як тут яшчэ кажуць часам,— Сергуць.

Гэта — звілістая, забалочаная рэчка з вялікай колькасцю глыбокіх віроў. Яна цячэ паралельна Сергучоўскаму каналу, з поўначы на поўдзень, і злучаецца, таксама як і канал, з Бярэзінай.

Нізкія, топкія берагі Сергуча густа зараслі лазняком і азёрным чаротам.

Плынь у гэтай рэчкі слабая, амаль непрыкметная, дно глеістае, але вада чыстая.

— Для выдры і бабра няма лепшага месца,— гаворыць Аляшкевіч.— Для выдры тут і рыбы шмат, і прытулак вельмі зручны, а для бабра раслінная база багатая.

За грэбляй, якая аддзяляе канал ад рэчкі, мы збочылі ўправа, каб ісці ўздоўж рэчышча Сергуча.

Спачатку мы ідзём па высокай мокрай траве, потым прабіраемся скрозь густы лазняк і трысцё, удыхаючы гаркаваты пах балотнага зелля.

Пад карэннямі старой бярозы, за тры метры ад старыцы, Аляшкевіч паказвае мне нару выдры.

— Гэта ў яе запасная нара,— тлумачыць ён,— а вось тут, глядзіце, асноўная.

Ён паказвае другую, шырэйшую адтуліну непадалёку ад першай.

Перад уваходам у нару вытаптана і выраўнена круглая пляцоўка каля аднаго метра ў дыяметры.

— Тут малыя выдраняты гуляюць,— расказвае егер.— Сёлета я іх на гэтай пляцоўцы бачыў. Падкраўся сюды непрыкметна і вось адсюль, з трох крокаў, убачыў двух малых. Яны ляжалі і грэліся на сонейку: вочкі прыжмурылі, а пярэднія лапкі выставілі насустрач цяплу,

растапырыўшы пальцы. Калі я пасунуўся бліжэй, яны мяне заўважылі і адразу назад перакуліліся, у нару.

— Дзе ж яны цяпер? — спытаў я.

— Цяпер яны выраслі і нару пакінулі. Пачалі жыць самастойна. Плаваюць па суседніх вадаёмах ды ловяць рыбу. А ці ведаеце, чым корміць выдра сваіх малых?

— Мусіць, дробнай рыбай?

— Не,— гаворыць Аляшкевіч.— Не рыбай, а малымі, бяспёрымі птушанятамі. Гэта, мабыць, таму, што ўвесну ёй няцяжка іх здабываць, асабліва малых качанят. Калі ж яны пакрыюцца пер'ем ды стануць на крыло, тады ёй малую качку ніколі не злавіць, хіба толькі знізу, паднырнуўшы з вады. Носіць выдра сваім малым таксама мышэй і жаб. Любіць яна вельмі ракаў. Я часта знаходжу каля гэтай нары ракавыя шкарлупіны.

— Ці многа выдраў у запаведніку? — пытаюся я.— І дзе можна яе часцей убачыць?

— Дзе многа рыбы, там і выдру можна заўсёды знайсці. Выдры ў нас жывуць па ўсіх вадаёмах, толькі ў Пастрэжскім возеры іх няма. А тут, на Сергучы і на Бузянцы, ім асабліва добра. Мясцовасць маладаступная, паляванне і рыбная лоўля забаронены. Рыбы, птушанят, ракаў ды жаб колькі хочаш. Чаму ж ёй тут не жыць? Выдраў у нас налічваецца больш за трыста галоў.

Пастаяўшы каля нары і пагаварыўшы пра выдру, мы пайшлі далей.

— Цяпер трэба і суседа наведаць,— жартуе Аляшкевіч.

## ДОБРЫЯ СУСЕДЗІ

Прадзіраючыся скрозь малады алешнік, рассоўваючы рукамі густыя зараснікі, мы падыходзім да бабровай хаткі № 106.

Яна знаходзіцца на правым беразе Сергуча, недалёка ад нары выдры і метраў за сто пяцьдзесят ад грэблі.

Пад нагамі хлюпае вада. Чарот узнімаецца вышэй чалавечага росту, шуміць сваімі мяцёлкамі. Перад вачыма, куды ні глянь, зялёна-жоўтая сцяна сцяблоў, над галавой — шэрае неба.

Чорны ствол сухой вольхі вытыркаецца з даху бабровай хаткі, як вялізны комін.

Навокал ляжаць абгрызеныя бабром сцяблы парыльніку і маліны. Гэтыя расліны ўваходзяць у летні рацыён бабра, таксама як і крапіва, і шчаўе.

Бабры пратапталі ад хаткі даволі шырокія сцежкі. Калі вада ў рэчцы ўзнімецца, гэтыя сцежкі ператворацца ў каналы.

Крокаў за пятнаццаць ад хаткі № 106 бабры распачалі пабудову другой хаткі. Яны падкапалі карэнні суседняй вольхі. Скляпенне логава ўжо зроблена. Застаецца ўзвесці вакол яго галерэю і абкласці яе з бакоў і зверху галлём.

Каля распачатай пабудовы нядаўна яшчэ расла высокая яліна. Цяпер яна ляжыць, паваленая бабром.

Відаць, яна нечым замінала бабру, і ён яе спілаваў.

Вакол незакончанай хаткі расце чарот, раза ў паўтара вышэй чалавечага росту.

— Адгэтуль уніз па Сергучу жылых бабровых хатак няма на працягу васьмі кіламетраў,— гаворыць Аляшкевіч.— А старых, пакінутых, шэсць. Бабры там усё навокал пагрызлі, паелі і перабраліся ў другую мясцовасць. Тут жа, каля вытокаў, корму ім хапае, вось яны і будуюць другую хатку.

— А як на гэта глядзіць выдра? — пытаюся я.— Ці не пашкодзіць ёй такое блізкае суседства з дзвюма сем'ямі баброў?

— Каму? Выдры? — здзівіўся егер.— Наадварот. Яна любіць жыць каля бабровых хатак. Бабёр і выдра добрыя суседзі. Крыўды паміж імі няма. Бывае часам, што выдра жыве ў бабровай хатцы разам з гаспадарамі як кватарантка. Я сам бачыў выдру, якая жыла сумесна з бабромі ў хатцы на Бярозе, насупраць вусця канала. Бабры жылі на ніжнім паверсе, а выдра на верхнім. Яна часта на бабровай хатцы ела рыбу і адпачывала. А на Бузянцы бачыў, як чацвёра малых выдранят ляжалі з маткай на бабровай хатцы. Потым яны пачалі гуляць. Слізгаюцца з даху на жыватах у ваду, як на санках, ды зноў наверх лезуць, нібы дзеці на ледзяной горцы. А матка глядзіць і любуецца. Тут яна адчувае сябе ў бяспецы, бо зверху, з даху бабровай хаткі, яна бачыць усё, што навокал робіцца, і ў выпадку трывогі заўсёды можа кінуцца з дзецьмі ў ваду.

— Можа, бабрам гэта не падабаецца?

— Бабры і ўвагі не звяртаюць. У іх з выдрай інтэрас розны. Баброў не цікавіць рыба, якую ловіць выдра, а выдру не цікавяць расліны, якімі кормяцца бабры. Для жылля выдра карыстаецца бабровай хаткай толькі пакуль дзяцей гадуе. Калі ж малыя выраступь, яна старое жыллё — бабровую хатку ці сваю ўласную нару — усё роўна пакіне ды пойдзе бадзяцца па наваколлі, шукаючы новых мясцін, багатых на рыбу.

Назад мы ідзём уздоўж канала, у бок пасёлка Крайцы міма сядзібы егера.

Недалёка ад яго зямлянкі высіцца новая хата, толькі вокны яшчэ не зашклёныя. Летась яе тут не было.

— Сусед бабёр новую хату ставіць, і я паставіў,— смяецца егер.— Уваходзіны будзем спраўляць разам.

Каля хаты старая купчастая вярба, невялікі агарод і сенажаць. З аднаго боку канал, а з другога высокая цёмная сцяна дрымучага лесу.

— Чаму ж вы не перабіраецеся? — спытаў я.— Яна ж зусім гатовая.

— Ды ўсё, ведаеце, часу няма. З хатай я, праўда, не спяшаўся, але ж затое і атрымалася яна добрая, нічога не скажаш. Не хата, бачыце, а лялька. Пабудавана як мае быць. І суседства ў мяне тут добрае,— пераходзіць ён зноў на жартаўлівы тон.— Да выдры рукой падаць, і ад бабра недалёка.

Ён задаволена паглядзеў на сцены свайго новага дома.

— Дырэкцыя мне дапамагла і калгас. Я калгасу, праўда, сёе-тое рабіў па кавальскай справе, вось і яны мне аддзякавалі, чым маглі. Шкло для акон у мяне ёсць, і завесы знойдуцца. Да зімы абавязкова перабяруся, інакш заесць мяне жонка. Ды ўжо і час. У нас цяпер наўкол усё новыя хаты.

## БЕЛАРУСКАЯ ТАЙГА

Прайшоўшы па канале з паўкіламетра, мы трапілі ў вільготны змешаны лес.

Высяцца вялізныя яліны з сівымі космамі, сустракаюцца часта і бярозы, і асіны, і вольхі.

Імжыць дробны дожджык.

Вакол нас беларуская тайга. Як усё тут дзіка і своеасабліва!

Над галовамі навісае зялёнае скляпенне. Святло ледзь прабіваецца скрозь густое галлё.

Адвечная цішыня. Не чуваць птушынага спеву.

Паўзмрок і вільгаць.

Пах сырой зямлі, прэлага лісця і цвілі.

Мокрыя галіны чапляюцца за адзенне, перашкаджаюць ісці.

З намаганнем прадзіраемся мы скрозь густыя зараснікі вольхі, асіны, ліпы, арэшніку і чаромхі.

На кожным кроку ляжаць старыя тоўстыя калоды, пакрытыя зверху зялёным аксамітам моху.

Пад нагамі чорная, тлустая і вязкая глеба, змешаная з перагноем леташняга лісця, высокая папараць.

Часта прыходзіцца пералазіць цераз ствалы паваленых навальніцаю дрэў, абыходзіць вялікія вывараткі. На адным з іх пакінула свае сляды куніца.

Некаторыя з паваленых ствалоў цвёрдыя і слізкія, другія даўно збуцвелі ад старасці. Ступіш нагой на зялёную, пакрытую мохам калоду — і нага, не знайшоўшы цвёрдай апоры, праваліваецца ў мяккую труху. Калода толькі звонку захавала сваю форму, а сярэдзіна ў яе даўно ўжо згніла і спарахнела.

## ЧОРНЫ БУСЕЛ

Мы падышлі да старога дуба пасярод невялікай палянкі.

Вакол дуба расце высокая ярка-зялёная трава, вільготная і мяккая.

— Гэтаму дубу больш за дзвесце пяцьдзесят гадоў,— гаворыць Аляшкевіч.

Дуб сапраўды стары. У вышыню — не менш трыццаці метраў. Шырынёй — тры-чатыры абхваты. Усе суседнія дрэвы ў параўнанні з гэтым волатам здаюцца нізкімі, малымі, нязначнымі.

Ніжняя частка магутнага ствала гладкая і зусім голая, без кары і сучча, нібы адпаліраваная.

Метраў за дванаццаць ад зямлі на засохлым суку знаходзіцца гняздо чорнага бусла. Яно складзена з сучча і палак, змацаваных зямлёй і глінай.

— Унутры яно неглыбокае і выслана трысцём, мохам, шэрсцю і пер'ем,— гаворыць Аляшкевіч.

З цікавасцю разглядаю я рэдкую знаходку.

Гняздо чорнага бусла знайсці не лёгка. Птушка гэтая дзікая і вельмі асцярожная.

Хто не ведае звычайнага белага бусла! Ён здаецца нам неад'емнай часткай беларускага сельскага пейзажу, нашых балот і лугоў. А чорнага бусла рэдка хто калі бачыў. Галава, шыя, спіна і крылы ў яго бліскучага чорнага колеру, з залаціста-зялёным і сінім адлівам, грудзі і жывот белыя, дзюба чырвоная.

Белы бусел не баіцца людзей і гняздзіцца звычайна каля чалавечага жылля, часта нават на даху вясковых будынкаў, а чорны бусел трымаецца глухіх, дзікіх лясоў і балоцістых нізін, якія густа зараслі хмызняком. Гняздзіцца ён на высокіх старых дрэвах, у такім непраходным гушчары, куды чалавеку цяжка дабрацца.

— Лясны птах, дзікун,— гаворыць Аляшкевіч.

Кожная пара чорных буслоў мае свой участак. У межы гэтага ўчастка яны не дапускаюць другіх буслоў. Гняздо іх знаходзіцца на вялікай адлегласці ад іншых гнёздаў. Гэта і зразумела, бо ўсе буслы вельмі пражэрлівыя. Калі б яны жылі блізка адзін ад аднаго, ім не хапіла б корму. Чорны бусел маўклівы, ён вельмі рэдка клякоча.

— Я знайшоў гэтае гняздо ў 1935 годзе,— хваліцца егер.— З таго часу чорны бусел штогод выводзіць у ім трох-чатырох буслянят. Перад гэтым кожную вясну ён рамантуе гняздо.

Малыя чорныя бусляняты пакідаюць гняздо ў першай палове ліпеня і да восені жывуць у сваім раёне разам з бацькамі. Чорныя буслы не збіраюцца ў вялікія чароды, як белыя. З надыходам восені яны трымаюцца асобнымі сем'ямі, не больш пяці-шасці птушак разам. З выраю чорны бусел прылятае на некалькі дзён пазней белага.

Вакол дуба з гняздом растуць яліны, вольхі, асіны і ясені. У падлеску — ляшчына, клён, лаза, чаромха і маліна. Зямля завалена бураломам. Глеба вязкая, балоцістая, пакрытая травой і зялёным мохам.

— Вясной і летам тут сустракаюцца дзікі і казулі,— гаворыць Аляшкевіч,— а ласі ходзяць увесь год.

Зялёны колер розных адценняў пануе тут над усім. Гэта проста нейкае зялёнае мора! Нават паветра ў прасветах між дрэў здаецца зеленаватым.

Пра гэтае цікавае месца яшчэ раней расказваў мне Леанід Васільевіч. Ён гаварыў, што бачыў тут чорнага бусла летам, у яркі сонечны дзень. Бусел стаяў пасярод гнязда. Бліскучая афарбоўка яго чорнага пер'я зіхацела і пералівалася ў сонечных праменнях, якія прабіваліся скрозь густую зеляніну лісця, рознымі адценнямі залацістага, бронзавага, сіняга, зялёнага і фіялетавага колераў.

— Уся абстаноўка,— казаў Леанід Васільевіч,— нагадвала трапічныя джунглі.

## СПАТКАННЕ З МЯДЗВЕДЗЕМ

Калі мы вярталіся ад гнязда чорнага бусла, Аляшкевіч, які ішоў наперадзе, раптам спыніўся.

Перад намі ў невялікім прасвеце між зараснікаў быў відаць бераг канала з пясчаным спускам да цёмнай, чырванаватай вады.

Дождж перастаў, праглянула сонца. Паветра было чыстае і свежае. Жоўты пясок ярка вылучаўся сярод зялёнага фону травы і хмызняку.

Справа, недалёка ад нас, затрашчала галлё. Нехта прадзіраўся скрозь зараснікі.

Аляшкевіч зрабіў знак, каб я маўчаў і не варушыўся. Вочы ў яго заблішчалі, на твары з'явілася ўсмешка.

У тую ж хвіліну на бераг канала выйшаў з лесу мядзведзь. Ён ішоў, прыпадаючы на ўсю ступню і перастаўляючы па чарзе то абедзве левыя, то абедзве правыя нагі разам. Цела яго перавальвалася з аднаго боку на другі.

Схіліўшы галаву ўніз, нібы разглядаючы нешта на зямлі сваімі маленькімі вочкамі, мядзведзь павольна

спусціўся па пясчаным схіле ўніз да вады. Там ён пастаяў крыху, потым увайшоў у ваду па бруха, зрабіў некалькі глыткоў і паплыў да супрацьлеглага берага. Плыў ён даволі шпарка, хоць і не рабіў у вадзе ніякіх рэзкіх рухаў. На паверхні была толькі яго вялікая галава з круглымі вушамі і верхняя частка спіны.

Калі ён выходзіў з канала на тым беразе, вада серабрыстымі кроплямі зіхацела на яго густой цёмна-бурай поўсці, струменьчыкамі збягала на пясок з жывата і бакоў. Выбраўшыся з вады, мядзведзь адразу накіраваўся ў лес і знік у кустах.

Пачакаўшы крыху, мы падышлі да таго месца, дзе ён увайшоў у ваду. Сляды мядзведзя выразна адбіліся на мокрым пяску каля берага.

Аляшкевіч выняў з кішэні складны сталёвы метр і змераў след.

— Даўжыня — дваццаць сантыметраў, шырыня — трынаццаць, пятка — восем,— абвясціў ён урачыста.— Той самы. Ён часта на другі бок перабіраецца. Ведае сваю сілу і нікога тут не баіцца. Чулі, як ён ішоў напралом, сапучы, з шумам, трэскам, не асцерагаючыся? А калі трэба, ён можа прайсці скрозь густы падлесак так ціха і непрыкметна, што ніхто яго не пачуе і не заўважыць. Гэты мядзведзь даўся нам у знакі. Пачаў ён з пасекі на падсобнай гаспадарцы вуллі красці. Ды гэтак спрытна: падбярэцца, як злодзей, уночы,— і няма вулея. Тады стары бухгалтар, што жыў на Вялікай Рацэ, прымацаваў вулей да хаты калючым дротам, аж і гэта не дапамагло. Ноччу мядзведзь падабраўся пад самую хату, адарваў дрот і занёс вулей у лес. Там ён яго разламаў і з'еў увесь мёд. А летась ён у мяне сабаку ледзь не задраў. Пёсік у мяне быў хоць і малы, але смелы. Мядзведзь падышоў ноччу пад агарод, а сабака на яго ззаду накінуўся. Пасля гэтай сустрэчы хварэў пёс тыдні з тры. Я яго пасля ў Барысаў аддаў, знаёмым. Дырэктар забараніў сабаку трымаць, каб дзічыну ў лесе не ганяў...

У лясах Бярэзінскага запаведніка мядзведзі трымаюцца вясной на балотах, дзе кормяцца журавінамі, і ў сасновых барах. Летам, калі выспяваюць чарніцы, суніцы, брусніцы і маліна, мядзведзь пераходзіць у мясціны, дзе многа ягад. Сляды яго дзейнасці можна ўбачыць і ў ельніку-чарнічніку, і ў змешаным лесе з густым малріннікам.

У канцы лета мядзведзь наведвае ноччу пасевы аўса. Пад восень ён, як і дзік, пераходзіць пераважна на жалуды і крушыну, якая расце ў вялікай колькасці па берагах лясных рэчак. Збіраючы жалуды, мядзведзь абламвае нярэдка тоўстыя дубовыя сукі.

Кусты крушыны, аб'едзеныя мядзведзем, асабліва часта сустракаюцца ў верасні месяцы на берагах лясной рэчкі Вялікай і яе прытокаў.

Пра ўсё гэта расказаў мне Аляшкевіч каля мядзведжай пераправы.

Мы развіталіся. Я накіраваўся ў Крайцы, а егер вярнуўся дадому.

Прайшоўшы з паўкіламетра, я ўбачыў з левага краю дарогі, ля кустоў, якія растуць уздоўж берага, вялікага зайца. Ён падпусціў мяне крокаў на трыццаць, потым адбег па дарозе крокаў дзесяць наперад, прысеў, падняўшы вушы, і павярнуў галаву ў мой бок. Калі я наблізіўся, зайчына зноў адбег крокаў на дзесяць і сеў у той жа позе. Гэтак ён рабіў некалькі разоў. Потым, не спяшаючыся, перайшоў дарогу і знік у зарасніках справа.

Дождж тым часам пачаў ліць з новаю сілай. У пасёлак я прыйшоў пад вечар, мокры з галавы да ног.

На дзвярах вісеў замок.

Вартаўніца, старая Семянкевічыха, замкнула дзверы і пайшла ў вёску да пляменніцы. Увайсці ў памяшканне і абсушыцца не было як.

Вось нібыта і «спраўдзілася» старая прыкмета: заяц дарогу перабег.

## НА БУЗЯНЦЫ

Каля першага шлюза спушчана на ваду новая лодка, зробленая Аляшкевічам. Жалезныя вілкі для вёслаў зрабіў таксама ён у сваёй кузні.

Леанід Васільевіч садзіцца за руль, Аляшкевіч бярэцца за вёслы.

Мы плывём па рацэ Бузянцы.

Дзень выдаўся ясны, сонечны. Цёпла, нават спякотна, нібы ўлетку.

У спакойнай вадзе адлюстроўваецца і блакітнае неба з белымі нерухомымі воблачкамі, і стагі сена на паплавах, і зялёны нізкі бераг з асакой, чаротам і лазою. Толькі бусла не хапае для паўнаты пейзажу.

— Буслы адсюль яшчэ ў канцы жніўня паляцелі на групоўку ў пойму Бярозы,— гаворыць Аляшкевіч, нібы адгадаўшы мае думкі,— а жоравы пачынаюць групавацца.

У чорным тарфяністым зрэзе берага мы ўбачылі на ўзроўні вады, пад зялёнай скошанай асакой, бабровыя норы.

У лодцы пачынаецца размова пра баброў.

— Бывае так,— кажа Аляшкевіч,— што жывуць бабры доўга ў адной мясцовасці, а потым раптам знікнуць усе разам, нібы па камандзе, кінуўшы свае хаткі ды норы, і з'явяцца нечакана ў другім месцы, дзе іх раней ніколі не было.

— Прычына тут у харчах,— адказвае Леанід Васільевіч.— Бабры пакідаюць свае паселішчы, калі вакол няма чаго есці, калі знішчана кармавая база. Тады яны перасяляюцца ў другія, некранутыя мясціны. Харчовая база аднаўляецца на працягу трох — пяці гадоў. Тым часам знішчаецца расліннасць там, куды яны перасяліліся, і бабры вяртаюцца з новага ўчастка на сваё старое месца, рамантуюць пакінутыя хаткі і жывуць, пакуль не адновіцца харчовая база ў толькі што спустошанай імі мясцовасці. Такі ў іх ідзе кругаварот.

— А чаму,— пытаецца Аляшкевіч,— калі проста скасіць ці высечы лазняк, ён аднаўляецца на другі год, а пасля баброў увесь чыста пасохне, счарнее і аднавіцца можа толькі праз некалькі гадоў?

І на гэта ў Леаніда Васільевіча знаходзіцца вычарпальны адказ.

— Косяць ці высякаюць адначасова ўсю плошчу,— гаворыць ён.— Адначасова яна ўся і аднаўляецца. А бабры знішчаюць расліннасць нераўнамерна, пастулова і не падрад. Летам яны адкрываюць доступ у разрэджаныя зараснікі сонечным праменням, а зімою — холаду. Лазняк больш сохне, мерзне і гіне, і таму патрэбна больш часу, каб ён мог аднавіцца.

Над рэчкай праляцела пяць качак.

Леанід Васільевіч, узяўшы стрэльбу, вылазіць з лодкі і па балоце ідзе да таго месца, дзе яны апусціліся.

Мы з Аляшкевічам плывём да бабровай хаткі № 101.

Хатка выглядае нібы нейкі звычайны ўзгорак сярод лугу, бо ўся яна густа зарасла зверху лазой і крапівой. Вузкі, але глыбокі канал без вады аддзяляе хатку ад берага. Навокал усюды расце лазняк і альхоўнік.

Ці даўно бачыў я першы раз у сваім жыцці бабровую хатку на Смолінцы!

Тады гэта была для мяне вялікая падзея.

Цяпер я наглядзеўся бабровых хатак як мае быць і на Сергучы, і на Бярэзіне, і на Бузянцы. Цяпер мне хочацца ўбачыць бабра за работай, паглядзець, як ён пілуе і валіць дрэвы, як рамантуе сваё жыллё ці будуе грэблю. Дзеля гэтага, уласна кажучы, я і прыехаў сюды.

Некалькі разоў раней звяртаўся я з гэтым да Леаніда Васільевіча і Аляшкевіча. Але кожны раз яны адказвалі, што яшчэ не час, што трэба пачакаць.

Для таго каб убачыць бабра за працай, неабходна выбраць ноч ціхую, бязветраную і светлую.

Нічога не зробіш, прыходзіцца набрацца цярплівасці.

## УРОЧЫШЧА «ВОКНЫ»

Каля хаткі на тарфяністай зямлі відаць выразныя сляды выдры.

— Раней гэтая хатка была пустая,— гаворыць Аляшкевіч.— У сакавіку 1946 года тут загінуў шасцігадовы дзік. Узлез на хатку, пачаў раскопваць лычам ды і праваліўся ўніз. Назад вылезці не змог і задушыўся. Вядома, цяжкі ды непаваротлівы.

Пачынае прыпякаць. Сонца ззяе і ў небе, і ў гладкім люстры вады.

Каля берага плавае пер'е і пух.

— Качкі лiняюць,— гаворыць егер.

Прыстаўшы да берага, ён паказвае мне нару выдры.

— І тут, бачыце, выдра жыве па суседству з бабром. Мусіць, тая самая, сляды якой засталіся каля хаткі.

Мы вылазім на бераг.

Сярод густых зараснікаў лазняку і чароту перад намі так званае «акно». Гэта — круглы і вельмі глыбокі вадаём з халоднай як лёд крынічнай вадой, чыстай і празрыстай.

На дне «акна» можна ўбачыць невялікую цёмную адтуліну. Там бурліць, кіпіць і серабрыцца паветра, нібы нарзан у каптажы.

Выліваючыся з круглага «акна» на паўвостраве, крынічная вада струменіць вузкім, звілістым раўчуком між кустоў нізкарослага лазняку і збягае ў раку, пабліскваючы ў траве. Адсюль папаўняецца вадой Бузянка. Гэтае месца так і называецца — урочышча «Вокны». Непадалёку ёсць яшчэ адно такое «акно».

Леанід Васільевіч далучаецца да нас. Мы садзімся ў лодку і плывём далей.

## «ЛЕЙЗАРАВА ПІПКА»

За ўрочышчам «Вокны» рака Бузянка робіць вялікую, амаль закончаную пятлю.

Праплыўшы больш кіламетра, мы апынуліся раптам амаль ля таго самага месца, адкуль адплылі.

Каб прайсці гэтую адлегласць па зямлі, па простай лініі, трэба зрабіць не больш сотні крокаў, але перашкаджае топкае балота.

— Ведаеце, як гэтае месца завецца? — пытаецца Аляшкевіч.— «Лейзарава піпка», вось як. Было гэта даўно, яшчэ да Першай сусветнай вайны. Жыў тут купец Лейзар, лесам гандляваў. Хацеў быў Лейзар шырокую канаву пракапаць у гэтым месцы, каб выправіць рэчышча і скараціць водны шлях для ляснога сплаву, але ж нічога з гэтага не выйшла. Пахадзіў ён тут з нейкімі людзьмі па балоце, паглядзеў на рэчку, на пятлю гэтую, папыхкаў сваёй піпкай, ды так нічога і не вырашыў. Выдаткаў, мабыць, пашкадаваў, ні з чым і вярнуўся, толькі піпку сваю ў балоце згубіў. Вось з таго часу ўрочышча гэтае і называецца «Лейзарава піпка». Шмат тады людзі з гэтай прыгоды смяяліся. Як цяпер паглядзець, то тут асабліва і думаць не было чаго. Колькі тае справы! Цяпер, часам, каб была такая патрэба, абмеркавалі б на сходзе, склалі б план, выйшлі б усёй грамадой і адразу ўсё на свой лад перарабілі б.

Аляшкевіч паглядзеў яшчэ раз на пятлю, якую робіць у гэтым месцы рака, і, узяўшыся за вёслы, дадаў:

— Зрабіць гэта было б зусім і няцяжка. Толькі што патрэбы такой няма. Рэчка запаведная, лес не сплаўляецца, рыбу лавіць забаронена, дык няхай яна сабе цячэ, як хоча, як гэта ёй ад прыроды прызначана.

На сухой адзінокай бярозе сярод лазняку сядзіць нерухома падорлік.

— Ён і качку бярэ і зайца,— гаворыць Аляшкевіч.

— Ад цецерукоў таксама не адмаўляецца,— дадае Леанід Васільевіч.— Качкамі ён выкормлівае сваіх малых,

гэта для яго найбольш лёгкая здабыча. Падорліка мы часта бачым не толькі тут, каля рэк і азёр, але і ў ліставых, змешаных лясах, і ў сасновых барах, і ў дубровах. Знішчае ён і варон, і гракоў, і галак, і розных дробных птушак, ловіць і рыбу, і мышэй, і жаб. Карысці ад яго мала. Мы лічым яго шкодным драпежнікам, хаця гэтае пытанне яшчэ не вырашана канчаткова.

## ДОМЖАРЫЦКАЕ ВОЗЕРА

Рака Бузянка робіцца ўсё шырэй і паўнаводней.

Мы выплываем на шырокі прастор Домжарыцкага возера.

Па сіняй вадзе ходзяць невялікія хвалі, б'юцца аб борт нашай лодкі.

Домжарыцкае возера мае дзевяць кіламетраў у акружнасці. Супрацьлеглы бераг густа акаймаваны лесам.

Мы падплываем да старой бабровай хаткі. Яна пуставала з 1945 года. Цяпер бабры ўзяліся з вясны за капітальны рамонт. Хатка пакрыта новымі, зрэзанымі нядаўна палкамі. Проста дзіўна, якія вялікія і цяжкія ствалы ўсцягвае бабёр з вады на вяршыню сваёй хаткі.

Нястомны Леанід Васільевіч зноў вылазіць з лодкі і ідзе па балоцістым беразе. Мы з Аляшкевічам плывём на сярэдзіну возера.

Вецер суцішыўся. Вада ў возеры спакойная і гладкая, перламутравага колеру.

Цёмна-сіняя сцяна лясоў адбіваецца ў люстранай паверхні возера. Некалькі пазалочаных воблачкаў бронзавага колеру нерухома вісяць у бяздонным светла-блакітным, нібы акварэльным небе.

Цішыня.

Вада ледзь чутна плюскоча аб лодку, ціха цурчыць каля носа.

Рассякаючы вадзяную люстраную гладзь, лодка пакідае за сабою след, які доўга не разыходзіцца.

Па возеры, далёка ад нас, плывуць дзве качкі.

Сонца хіліцца да захаду, афарбоўваючы нерухомую ваду ружовым адценнем.

Мы набліжаемся да сцяны чароту.

З-пад самага носа лодкі з рэзкім кракannem узнялася ў паветра чарада маладых качак.

На паверхню вады выскачыў у серабрыстых пырсках шчупачок.

З чароту ўзнімаецца з дзесятак качак, потым яшчэ каля дваццаці, яшчэ пяць, яшчэ сем.

У чароце чуецца пляск і чвяканне.

— Увесь бераг шапоча,— гаворыць Аляшкевіч.— Іх тут процьма.

Сапраўды, у зарасніках трысця, чароту і асакі гняздзіцца па берагах возера і ў навакольных балотах незлічонае мноства дзікіх качак. Тут можна ўбачыць і звычайную крыжанку, ад якой паходзіць наша хатняя качка, і шэрую качку, і шматлікія віды чыркоў і ныркоў. Восенню яны збіраюцца на Домжарыцкім возеры вялікімі чародамі, да тысячы галоў у кожнай, і трымаюцца так да адлёту, пакуль вада не пачне замярзаць.

Мы выходзім з лодкі на бераг і раскладаем вогнішча. Чакаем Леаніда Васільевіча.

Праз некалькі хвілін з'яўляецца і ён. Моўчкі садзіцца ля агню, разуваецца і сушыць мокры абутак.

З возера даносіцца аднастайны прарэзлівы крык:

— Каў... Каў...

Гэта крычыць шэрая чапля.

Леаніду Васільевічу не сядзіцца. Пакуль сохнуць шкарпэткі, ён нацягвае мокрыя боты на босыя ногі і знікае ў чароце.

Над возерам згушчаецца змрок.

У вячэрняй цішыні з таго боку, куды пайшоў Леанід Васільевіч, адзін за адным грымнулі два стрэлы.

Рэха разнеслася над соннай вадой, над трысцём і грукоча цяпер далёка, недзе на тым беразе.

У цёмным небе засвяціліся першыя зоркі.

Аляшкевіч расказвае мне пра сваё жыццё.

— Сам я родам з-пад Плешчаніц. Бацька мой адтуль і дзед. Арандавалі мы там зямлю ў пана Жаброўскага. Быў гэты пан немец.

— Немец? — перапытаў я.— У яго ж прозвішча не нямецкае.

— Не з роду немец, а веры нямецкай,— растлумачыў егер.— Ні каталік, ні праваслаўны. Таму яго і звалі немцам. Ён не прызнаваў ні святых, ні абразоў. Ад яго і дзед мой набраўся, любіў часам з святых пакпіць, хоць і меў ад іх прыбытак.

— Які ж гэта быў прыбытак?

— Дзед мой выразаў з дрэва розныя рэчы, лыжкі, міскі. Ну і «езусаў» для прыдарожных крыжоў, капліц і могілак, святых для касцёлаў. Сам выразаў, найбольш з бярозы, сам і фарбаваў. Усе яго ведалі і хвалілі. Святыя былі ў яго, як жывыя, на суседзяў падобныя. Зарабляў ён добра, вясёлы быў стары, а падпіўшы, любіў часам спяваць:

Божа, Божа,
Ты мяне стварыў,
Я цябе зрабіў;
Прадаць цябе мушу,
Каб пажывіць душу.

Бабка мая вельмі за гэта гневалася на дзеда і крычала: «Ах ты, пэцкаль! Што ты пяеш? Як гэта можна? Ці ж табе не сорамна? Змоўкні!» А ён толькі смяецца... Каб жыў мой дзед у цяперашні час, то, можа, з яго сапраўды які разьбяр ці мастак атрымаўся б.

Аляшкевіч змоўк і задумаўся.

— Даўно вы тут егерам?

— З таго часу, як створаны запаведнік, з 1925 года. Раней я кавалём працаваў і слесарам. Пасля ў армію

пайшоў. У дваццатым годзе ваяваў з панамі. Служыў у кавалерыйскай часці ў Барысаве. Там быў таксама кавалём. А як дэмабілізаваўся, то ажаніўся, узяў дзяўчыну тутэйшую ды і застаўся ля Кветчы назаўсёды. Не шкадую.

Аляшкевіч разварушыў вогнішча і падкінуў галля. Моўчкі сядзім мы ля агню, які ўспыхнуў з новаю сілай, разганяючы навакольны змрок.

Выпала начная раса.

Недзе справа пачуўся моцны ўсплёск, затым — хрыплыя стогны, шумная і працяглая тузаніна, нібы два вялікія звяры кінуліся адзін за адным праз трысцё ў ваду і ўзнялі там валтузню.

— Гэта бабры выйшлі на жыроўку,— гаворыць Аляшкевіч.— Мабыць, нешта не падзялілі. Адзін пагнаўся за другім. Б'юцца яны страшэнна. Сядуць адзін супроць другога ў мелкай вадзе на задніх лапах і спачатку толькі штурхаюцца пярэднімі, а потым як схопяцца ў абдымку! Кожны стараецца ўчапіцца за шыю другога і паваліць яго. Тады слабейшы кідаецца наўцёкі, у ваду, дзе глыбей, а другі гоніцца за ім. А стогнуць пры гэтым як жаласна! Пацеха!

Слаба ўспыхвае полымя. Вогнішча дагарае.

Вакол нас згушчаецца цемра, нічога не відаць.

З цемры з'яўляецца постаць Леаніда Васільевіча. У руках у яго дзве чаплі. Адну ён забіў, другая — жывая, параненая.

— Гэта для музея,— тлумачыць Леанід Васільевіч.— У нас чучала чаплі няма.

Параненая чапля ачуняла. Яна стаіць, натапырыўшыся, увабраўшы галаву ў плечы, і глядзіць у вогнішча невідушчым позіркам сваіх залаціста-жоўтых вачэй.

Вясной чаплі з'яўляюцца ў лясах верхняга цячэння Бярэзіны ў канцы сакавіка. Гняздзяцца яны на высокіх дрэвах ці ў зарасніках чароту на зламаных сцяблах. Кормяцца чаплі галоўным чынам рыбай, але ловяць

часам і мышэй. Цэлымі гадзінамі стаіць чапля ў вадзе каля берага на адной назе, падкурчыўшы другую. Рыбу яна ловіць моцным, шпаркім і трапным ударам вострай дзюбы. Калі чапля ляціць, яна не выцягвае шыю, як бусел ці жораў, а трымае яе выгнутай, адкінуўшы галаву да спіны. Па гэтай адзнацы яе лёгка адрозніць у палёце.

Леанід Васільевіч падстрэліў чаплю, калі яна села на старую хвою. Ён думаў, што яна забіта, але ў яго руках чапля ажыла.

Цяпер яна стаіць каля нас у зябкай, хваравітай паставе, безудзельная да ўсяго, і не варушыцца.

Вогнішча тым часам пагасла. Мы садзімся ў лодку, узяўшы з сабой і жывую і забітую чаплю.

Над возерам узняўся туман. Амаль вобмацкам знаходзім мы месца, дзе рака Бузянка бярэ свой пачатак з возера.

Холадна і вільготна.

Я змяняю на вёслах Аляшкевіча.

Дзесьці далёка над ракой відаць чырванаваты водбліск. Ён з'яўляецца то злева, то справа ад нас.

— Гэта смалякі паляць,— заўважае Аляшкевіч.— Нехта восцямі рыбу б'е.

Становіцца ўсё святлей. Чуюцца ўдары вёслаў па вадзе.

Перад намі вырысоўваецца ў чырвоным святле чорны абрыс лодкі.

На носе ярка гарыць на падвешанай жалезнай рашотцы смалякі. Яны асвятляюць начную цемру і разганяюць туман.

У лодцы два пажылыя дзядзькі. Адзін стаіць з восцямі напагатове, другі трымае вясло і кіруе лодкай.

Рыбак, які стаіць наперадзе, углядаецца ў ваду.

Чырвонае святло смалякоў асвятляе цёмную раку аж да самага дна. У гэтым святле можна ўбачыць, як спіць, трымаючыся на адным месцы, буйная рыбіна.

Тут застыў каля карча ля берага вялізны шчупак, там — лінь, яшчэ далей — галавень, а ў глыбокім віры ляжыць, як калода, тлусты вусаты сом.

Павольна і ціха плыве лодка.

Леанід Васільевіч аклікнуў рыбакоў. Лодка спыняецца.

Начная цішыня парушана.

Пачынаецца сварка. Леанід Васільевіч злуе, бо лавіць рыбу ў рацэ забаронена.

Голасна дакарае ён рыбакоў. Тыя заўзята пярэчаць.

Пасля кароткай, але энергічнай спрэчкі з парушальнікамі запаведнасці Леанід Васільевіч забірае ў іх восці і запісвае прозвішчы.

— Заўтра з'явіцеся ў кантору,— гаворыць ён сярдзіта.

Мы плывём далей.

Леанід Васільевіч доўга не можа супакоіцца. Яго абурае «несвядомасць» дзядзькоў.

## БАБРЫ ЗА РАБОТАЙ

Сёння я нарэшце убачыў баброў за работай.

Яшчэ раніцай мы з Аляшкевічам дамовіліся, што паплывём увечары на лодцы па Бярэзіне, уніз ад Сергучоўскага канала да возера Палік, паглядзець, як працуюць бабры. У падарожжа мы выбраліся каля дзевятай гадзіны вечара.

Дзейнасць баброў пачынаецца, як вядома, пасля заходу сонца. У верасні найбольшую актыўнасць яны праяўляюць з дзевяці гадзін вечара да другой гадзіны ночы.

У свае хаткі бабры вяртаюцца пасля кармёжкі і будаўнічай працы адзін за адным, прыблізна ў пяць-шэсць гадзін раніцы.

Ноч абяцала быць ціхая і светлая.

Спачатку мы карысталіся вёсламі. Веславалі мерна і спакойна, па адным вяслу з кожнага боку. Потым, каб не рабіць лішняга шуму і не палохаць баброў, зусім перасталі веславаць.

Ветру няма. Ля самага берага растуць вольхі і вербы.

Наша лёгкая лодка павольна, ледзь прыкметна пасоўваецца ўніз па плыні ракі. Яна нібы слізгае па чорнай, глыбокай вадзе. Вёслы ляжаць на дне, мы іх не чапаем. Сядзім моўчкі і не варушымся, плывём уздоўж берага.

З левага борта густы лазняк. Справа — шырокая балоцістая пойма. Звілістая рака робіць тут паварот.

Аляшкевіч асцярожна схапіўся за чорную галіну, якая вытыркаецца з берага, і бясшумна падцягвае лодку ў невялікую затоку, амаль з усіх бакоў замаскіраваную кустамі лазняку.

Лодка спынілася. Тонкія гнуткія галінкі скрыжоўваюцца над нашымі галовамі.

З-за тоўстага ствала старой вярбы, якая схілілася над вадой, добра відаць даволі шырокі плёс, асветлены месяцам. Плёс знаходзіцца ад нас метраў за пяць-шэсць.

Адсюль будзе зручна наглядаць за бабрамі.

Вакол чарнеюць сілуэты дрэў і кустоў.

У пасярэбранай святлом месяца вадзе многа гарлачыкаў.

З боку плёса даносіцца аднастайны характэрны гук, нібы нехта шпарка і моцна скрабе нечым вострым па дрэве. Уражанне такое, быццам штосьці грызе вялікі пацук.

У вільготным начным паветры гэты гук, шоргат ці скрыгат, не ведаю, як яго лепей назваць, далёка разносіцца над ракой. Мы пачулі яго задоўга да таго, як ціха падплылі да свайго сховішча. Цяпер ён на момант спыніўся, каб праз некалькі хвілін аднавіцца з новаю сілай.

Якім чароўным і прывабным здаваўся мне гэты дзіўны гук!

Вочы мае паступова прывыклі да рэзкага кантрасту паміж халодным серабрыстым святлом месяца і густымі, чорнымі ценямі. Я пачаў выразней разбірацца ў навакольных прадметах, адрозніваць іх, заўважаць асобныя дэталі.

Напружана ўглядаюся ў асветленую месяцам паверхню плёса, у абрысы супрацьлеглага невысокага берага.

Нарэшце я заўважыў цёмную постаць бабра.

«Вось ён!..» — ледзь не крыкнуў я, але стрымаўся.

Кульгаючы з боку на бок, бабёр капошыцца каля дрэва. Пляскаты хвост яго валочыцца па траве, паварочваецца ў розныя бакі.

Бабёр узняўся на заднія лапы, абапіраючыся на хвост. Кароткімі пярэднімі лапкамі ён ухапіўся за ствол маладой асіны. І адразу зноў пачуўся характэрны гук пілавання разцамі па дрэве.

Толькі цяпер я заўважыў, што бабёр не адзін. Каля яго заварушылася постаць другога бабра. Ён узяўся за ствол з другога боку.

Прайшло некалькі хвілін.

У начным паветры пачуўся гучны трэск. Дрэва пачало хіліцца ў бок ракі.

Бабры спынілі работу. Прыслухаліся. Трэск паўтарыўся. Абодва бабры адсунуліся ад ствала.

Яшчэ праз хвіліну дрэва захісталася, зашумела галлём і, падмінаючы лазняк і маленькія бярозкі на беразе, рухнула ў ваду.

Сонная рака ўскалыхнулася. Пырскі ляцяць ва ўсе бакі.

Увесь гэты шум нібы спалохаў баброў. А можа, яны пачулі Аляшкевіча, які кашлянуў у гэты момант.

Першы з баброў цяжка і нязграбна заскакаў у бок берага. Ля самай вады ён азірнуўся па баках, засіпеў і кінуўся ў раку галавою ўніз. Хвост яго мільгануў над

берагам і з сілай пляснуў па вадзе. Гук ад удару разнёсся далёка па наваколлі.

Бабёр знік пад вадой. І адразу на паверхні ракі з'явілася і хутка разышлася серабрыстая дарожка дробных бурбалак. Гэта было паветра, якое бабёр выдыхнуў з лёгкіх, плывучы пад вадой.

Дзе падзеўся другі бабёр, я заўважыць не паспеў, але і яго на беразе ўжо не было. Мне здалося, што ён знік у траве каля самай вады.

Хавацца нам цяпер не было патрэбы.

— Яны вылезуць на бераг не так яшчэ скора,— голасна сказаў Аляшкевіч.

Пень асіны бялее ўначы сваёй завостранай, абламанай і расшчэпленай верхавінай.

Мы выходзім з лодкі і аглядаем спілаванае бабрамі дрэва.

У ствале асіны бабры выгрызлі кальцо ў выглядзе кліна, накіраванага ўнутр дрэва.

— Чыстая работка! — смяецца Аляшкевіч.

Ён бярэцца за свой стальны метр і, прыклаўшы яго да зрэзу, абвяшчае:

— Дваццаць тры сантыметры ў папярочніку!.. Але гэта што! Глупства! На Жартайцы бабры спілавалі некалькі дрэў, якія мелі па пяцьдзесят—шэсцьдзесят сантыметраў. Быў нават выпадак, калі яны звалілі старую вярбу крыху больш метра ў дыяметры. А з гэтай асінай яны справіліся, мусіць, за адзін прыём. Хаця, можа, і ўчора яшчэ пачалі, хто іх ведае! Бывае часам, што яны пачнуць грызці дрэва і кінуць, а потым, праз колькі дзён, зноў возьмуцца і паваляць. Цяпер, калі мы ад'едзем і ўсё вакол супакоіцца, бабры вылезуць з вады і перш за ўсё ачысцяць ствол ад галля і сучча. Лісце і кару з маладых галінак тут жа і з'ядуць, пакуль яны свежыя. Усё астатняе пойдзе ў кладоўку, у запас, на зіму.

Мы вывелі лодку з затокі і паплылі назад. Яркі месяц па-ранейшаму асвятляе раку.

У лодцы я распытваю Аляшкевіча аб тым, як робяць бабры свае харчовыя запасы на зімовы час і дзе яны іх хаваюць.

Пакуль мы даплылі ўверх па рацэ да вусця Сергуча, егер мне ўсё як след растлумачыў.

— Рыхтаваць сабе корм на зіму,— гаворыць ён,— бабры пачынаюць у канцы верасня ці ў пачатку кастрычніка і займаюцца нарыхтоўкамі на працягу ўсяго лістапада. Запасы гэтыя складаюцца з асіны, лазы, бярозы і часам чаромхі. Але больш за ўсё любіць бабёр асіну. Калі няма асіны, ён корміцца лазой. Калі ж і лазы не хапае, бярэцца за бярозу.

— Дзе ж ён робіць сабе кладоўку?

— Нарыхтаванае і ачышчанае вецце бабры апускаюць у ваду, недалёка ад хатак, у глыбокім месцы, дзе няма плыні. Зрэзаныя палкі і галінкі яны ўтыкаюць завостраным канцом у зямлю пад берагам. Калі вада замерзне, бабёр выплывае па падводным ходзе са сваёй хаткі і корміцца гэтым запасам пад лёдам, не вылазячы на паверхню.

Сказанае Аляшкевічам пацвердзіў пасля і Леанід Васільевіч, якому я расказаў аб выніках нашай экспедыцыі.

— Трэба яшчэ дадаць,— сказаў ён,— што перад лістападам пажыўныя рэчывы з лісця пераходзяць у ствол і галлё асін і адкладваюцца ў кары і драўніне. Дрэвы, зрэзаныя бабрамі ўвосень, больш пажыўныя.

## ЛАСІНЫЯ ЯМЫ

На другі дзень да мяне падышоў заатэхнік Вадзім Аляксандравіч.

— Заўтра я іду па месцах ласінага рэву,— сказаў ён мне.— Калі хочаце, пойдзем разам.

Я, зразумела, згадзіўся.

Раніцай, абуўшы гумавыя боты, мы пайшлі спачатку на Пастрэжжа, а потым, перабраўшыся цераз Чорны ручай, рушылі на ўрочышча Ласіныя Ямы.

Надвор'е яснае і сонечнае. Паветра чыстае і празрыстае, але халоднае. Адчуваецца восень.

Высокае неба зіхаціць яркаю сінню.

Бярозы красуюцца ў пазалоце, асіны — у чырвані.

У лесе мы бачым зямлю, парытую дзікам.

Пакрытая мохам, яна ўсюды ўзарана пластамі. Дзік рые неглыбока. Сваім лычам ён узрывае толькі верхні пласт моху, шукаючы пад ім лічынкі жукоў і дажджавых чарвякоў.

Дзікі былі тут нядаўна.

Вадзім Аляксандравіч рукамі прыўзнімае мох, не крануты свіннямі.

— Дзік,— гаворыць ён,— чуе носам, дзе знаходзіцца пад зямлёй многа чарвякоў. Таму ён і рые не падрад, а паасобнымі ўчасткамі.

Сапраўды, пад не кранутымі дзікам пластамі моху чарвей і лічынак не відаць.

Мы пайшлі далей.

Лес хутка скончыўся. Перад намі тарфяное балота.

Мы ідзём вадзяною сцежкай, пратаптанай дзікімі свіннямі.

— А вось і ванна дзіка,— гаворыць Вадзім Аляксандравіч і паказвае на паглыбленне ў баку ад сцежкі.— У такіх ваннах шчацілісты ягамосць з доўгім лычам любіць песціцца ўлетку. Ляжыць сабе ў цёплай вадзе ды рохкае ад асалоды.

Чорная вада даходзіць нам да каленяў. Шлях па вадзяной сцежцы цераз балота доўгі і цяжкі.

Нарэшце мы выбіраемся на ўзвышша, якое густа зарасло лесам. Такія лясныя ўзвышшы сярод балот называюцца тут астравамі.

Вясной на гэтых астравах з яловым і змешаным шыракалістовым лесам, у якім пераважаюць сярод ін-

шых дрэў дуб, ясень і клён, заўсёды сустракаюцца дзікія свінні. Летам яны кормяцца галоўным чынам белакрыльнікам, ці, як тут яго называюць, бабоўнікам, што расце ў поймах лясных рэчак, і таму пераходзяць з лясістых узвышшаў у балоцістыя нізіны.

З надыходам восені дзікі перабіраюцца зноў у лясы, адкуль робяць часам начныя налёты на вясковыя палеткі. Калі выспяваюць жалуды, дзікія свінні трымаюцца каля дубоў, асобныя групы якіх сустракаюцца ўсюды ў пойме Бярэзіны. Многа дубоў і ў цэнтральнай частцы запаведніка.

Схілы ўзвышша, на якое мы выйшлі з балота, пакрыты верасам. Знізу, каля вады, расце багун. Сярод зялёнага моху ўсюды чырванеюць буйныя спелыя брусніцы. На нізкарослых бярозах залаціцца жоўтае лісце.

Адпачыўшы крыху на востраве, мы ідзём далей па сцежцы, пратаптанай дзікамі. Ісці ўсё цяжэй і цяжэй.

Высокі балотны мох-сфагнум перашкаджае ісці па вадзе. На балоце растуць дробныя, чэзлыя сасонкі і карлікавыя бярозкі.

Вось перад намі новы востраў, на гэты раз значна большы.

Мы выбіраемся на сухую, цвёрдую зямлю.

Пасярэдзіне вострава расце некалькі вялізных старых ялін. Пад адной з іх нара барсука з запаснымі адноркамі.

Непадалёку ад барсуковай нары стаіць стары будан з яловых бярвенняў, жэрдак, сучча і кары.

— Тут,— гаворыць Вадзім Аляксандравіч,— хаваліся нашы супрацоўнікі з сем'ямі ў час блакады.

Мы распалілі вогнішча і адпачываем пасля цяжкага пераходу цераз балота. Сушым на агні мокрае адзенне і абутак.

Набраўшыся сілы, робім яшчэ адзін пераход, прадзіраемся на гэты раз скрозь дробны, але густы асіннік.

Уваходзім у вільготны яловы бор, завалены бураломам. Вакол ляжаць сукаватыя голыя ствалы.

Перад намі — лёжка дзіка. Недалёка ад яе мы натрапілі на адбіткі раздвоеных капытоў, па форме і памеры яны падобныя на сляды каровы.

Гэта — лось.

Мы ідзём па следзе, і ён прыводзіць нас да «забою».

Так называюць у навакольных вёсках месца, дзе лось стаіць у час гону і, ярасна тупаючы пярэднімі нагамі, выклікае на бой праціўнікаў.

Вострымі капытамі лось выбіў тут даволі глыбокую яміну.

Гон у ласёў адбываецца з канца жніўня і да канца верасня. Ласі збіраюцца на «рэў» пасля захаду сонца, у гадзін дзевяць-дзесяць вечара. Заканчваецца «рэў» у дзесяць-адзінаццаць гадзін. Равуць ласі на працягу не больш адной гадзіны. У гэты час каля месца «забою» збіраецца ад двух да чатырох ласёў. Паміж імі адбываюцца часам паядынкі. На «рэў» ласі ходзяць з году ў год заўсёды на адно і тое ж месца.

Перад намі адна з такіх аблюбаваных ласямі мясцін.

— Гэта і ёсць урочышча Ласіныя Ямы,— гаворыць Вадзім Аляксандравіч.— А ўвесь востраў называецца Бацянова.

Мы аглядаем месца, дзе любяць збірацца ласі ўвосень. Гэта — узвышаная мясцовасць з даволі роўным рэльефам. Сярод высокіх ялін часта сустракаюцца дубы, ліпы, асіны, рабіны.

Вясною лось трымаецца звычайна нізін з густым асіннікам і бярэзнікам. Ён скубе лісце асіны, бярозы, лазы, вольхі. Тоўстай верхняй губой лось зрывае вецце. Маладыя дрэўцы ён нагінае да зямлі, наступаючы на іх грудзьмі, каб дабрацца да вершаліны. У маі — чэрвені ў ласіх нараджаюцца малыя.

Летам ласі пераходзяць у поймы рэк, у забалочаныя альховыя лясы, у балоты, дзе многа травы і кустоў, а восенню перабіраюцца на астравы.

Зімой яны кормяцца карой і галінкамі дрэў. Часта ласі абдзіраюць кару з асін, спілаваных бабрамі ўвосень.

У студзені — лютым ласі скідваюць старыя рогі. Новыя, буйнейшыя, вырастаюць у іх да ліпеня.

У маладога лася рогі пачынаюць расці пасля першага года жыцця. Яны маюць выгляд гладкай і вострай спіцы. У наступным годзе спіцы гэтыя скідваюцца, і замест іх вырастаюць новыя рогі, раздвоеныя на канцах. На трэцім і чацвёртым гадах жыцця рогі лася маюць тры адгаліненні. З кожным годам яны робяцца ўсё больш вялікія і важкія. Аснова адгаліненняў — паляўнічыя называюць яе «лапатай» — становіцца ўсё шырэйшая. Рогі растуць нармальна і развіваюцца як след ва ўмовах добрага харчавання, спакойнага і прывольнага жыцця. Калі лася часта непакояць і палохаюць, калі ён харчуецца недастаткова, рогі ў яго растуць слаба і замаруджана. Ласіха рагоў не мае.

Ідучы па слядах лася, мы прыходзім да яго лёжкі. Прымятая трава захавала адбітак цела вялікай жывёліны.

Сляды лася вядуць нас далей. Справа — яшчэ адна нара барсука. Затым зноў ванна дзіка з чорнай граззю. Каля ванны сляды лісіцы. Яна частавалася тут чарніцамі.

З шумам сарваўся з высокай асіны глушэц і, лопаючы цяжкімі крыламі, праляцеў над нашымі галовамі.

## ЛЯСНАЯ ТРАГЕДЫЯ

Мы выходзім на амаль чатырохкутную паляну. Прыблізныя памеры паляны — пяцьдзесят квадратных метраў.

Дарогу пераляцеў рабчык. Рэзка крычыць чорны дзяцел. Над намі кружаць і жаласна пераклікаюцца два маладыя канюкі.

Трава на краі паляны прымята лёжкамі трох буйных жывёл.

Хто тут ляжаў? Ласі? Так, напэўна, яны, бо памеры лёжак адпавядаюць велічыні цела ляся.

Недалёка ад лёжак сляды ваўка і шматкі ласінай шэрсці. Далей трава прымята ў розных мясцінах.

Вадзім Аляксандравіч захваляваўся.

Што ж тут такое здарылася?

У супрацьлеглым канцы паляны мы знаходзім чэрап ляся з хрыбтом і абгрызеную лапатку.

Чэрап — бязрогі. Значыць, гэта была ласіха.

На касцях захавалася засохлая кроў — яе не паспелі яшчэ аб'есці жукі і мурашкі.

На траве паляны ўсюды сляды ўпартага змагання буйных жывёл.

Тут адбылася заключная сцэна лясной трагедыі — апошні бой ласіхі за сваё жыццё.

Але з кім жа яна змагалася? Хто яе загубіў?

— Ваўкі? — пытаюся я.

— Мабыць, яны,— адказвае Вадзім Аляксандравіч.— Але трэба ў гэтым разабрацца дакладней.

Мяркуючы па чэрапе, ласіха была маладая. Ваўкі, калі гэта яны, часткова з'елі сваю здабычу на месцы, а часткова парасцягалі па логавах.

Мы перасеклі паляну і паглыбіліся ў лес.

Крыху воддаль ад паляны, пад старымі змрочнымі ялінамі, уся зямля ўскапана. У мяккую глебу ўтаптана вялікімі шматкамі ласіная шэрсць. Тут жа ляжыць другая лапатка ласіхі і два рабры.

Ратуючыся ад ворагаў, ласіха кінулася ў гушчар. Пад гэтымі ялінамі яна змаглася і загінула. І тут жа, на месцы забойства, пачалося баляванне.

Галаву і хрыбет нехта са звяроў адцягнуў на паляну. Ад гэтага месца ідуць сляды аднаго з ваўкоў у кусты. Тут ён адпачываў наеўшыся.

Побач сляды лісіцы. Яна, мусіць, паласавалася тым, што засталося пасля ваўкоў.

Уважліва агледзеўшы сляды на паляне, мы вярнуліся да старых ялін.

Вадзім Аляксандравіч некуды адышоў.

Я стаю адзін пад высокімі дрэвамі.

Раптам перада мною вырасла постаць Аляшкевіча. Ён, як і заўсёды, босы, у сваёй нязменнай ватоўцы і шэрай кепцы. За плячом у яго стрэльба.

— Я вас яшчэ адтуль заўважыў,— гаворыць ён, паказваючы рукою за маю спіну,— але знарок выйшаў з гэтага боку. У лесе нельга да чалавека падыходзіць неспадзявана.

Да нас вярнуўся Вадзім Аляксандравіч, і егер паведаміў яму, што робіць абход свайго ўчастка.

На яго думку, ласіха была зарэзана тыдні тры назад. Ёй было, мяркуючы па касцях, гады два.

Вадзім Аляксандравіч выказаў свае меркаванні аб тым, што ласіху зарэзалі ваўкі, і паказаў сляды на паляне.

Аляшкевіч спачатку памаўчаў, падумаў, потым пайшоў аглядаць кусты і падлесак вакол паляны. Па твары яго было відаць, што ён мае наконт гэтага сваю думку, але пакуль што не лічыць патрэбным яе выказваць.

Мы пайшлі за ім.

— Гэтая мясцовасць называецца Валяваты Дуб,— сказаў Аляшкевіч.— Тут быў калісьці лясны хутар. Пасля ссялення хутароў у вёскі пляц гэты зарос травой. І тут, і каля Бацяновага — добрыя мясціны!

Недалёка ад старых ялін я знаходжу капыт лася і паказваю егеру. Той моўчкі ківае галавой. Вадзім Аляксандравіч бярэ капыт і кладзе ў сваю змястоўную сумку. Там ляжаць у яго здохлы крот, памёт лісіцы, шматкі моху, нейкія карэньчыкі і іншыя рэчы, цікавыя толькі для заолага.

Аляшкевіч ідзе наперадзе, рассоўваючы кусты. Зрабіўшы крокаў пятнаццаць, ён спыняецца і паказвае рукой на зямлю.

— Бачыце?..

У голасе ў Аляшкевіча гучаць урачыстыя, пераможныя ноткі.

Перад намі сляды мядзведзя.

Егер шматзначна зірнуў на Вадзіма Аляксандравіча і ўпэўнена рушыў далей.

Вадзім Аляксандравіч кашлянуў, зняў акуляры, працёр іх, зноў надзеў і моўчкі падаўся за егерам.

Прайшоўшы метраў дзвесце ад паляны, мы падышлі да лёжкі мядзведзя. Побач ляжыць абгрызены таз ласіхі.

— Я так і думаў,— гаворыць Аляшкевіч.— Мядзведзь спаў на гэтым месцы не адну ноч.

І, звярнуўшыся да мяне, дадае:

— Гэта наш стары знаёмы. Той, якога мы бачылі на канале. Памятаеце?

Лёжка мядзведзя знаходзіцца ў вільготным яловым лесе-чарнічніку, на вялікай мохавай купіне пад ялінай. Яна якраз адпавядае сваёй формай і велічынёй памерам тулава мядзведзя.

Кусты чарніц вакол лёжкі аб'едзены.

— Пад'еў мяса залішне, а пасля мусіў падлячыцца,— усміхаецца егер.— Гэта з ім часам здараецца.

Аляшкевіч і Вадзім Аляксандравіч пайшлі далей, а я вярнуўся на паляну і распаліў вогнішча.

Праз паўгадзіны вярнуліся і яны.

Папярэднюю версію Вадзіма Аляксандравіча наконт гібелі ласіхі ад ваўкоў Аляшкевіч рашуча адхіліў. У святле довадаў, прыведзеных і растлумачаных ім, вельмі лагічна ўзнікла новая версія, больш верагодная.

На думку Аляшкевіча, сапраўдны забойца ласіхі быў мядзведзь, а не ваўкі. Падзеі на паляне адбыліся, паводле расказу егера, у наступнай паслядоўнасці.

Трое ласёў ляжала ў высокай траве на краі паляны, недалёка ад старых ялін. Мядзведзь падкраўся да іх, выскачыў з-за кустоў і ўдарыў лапай бліжэйшую да яго маладую ласіху. Зваліць яе адразу, з першага ўдару, яму не ўдалося. Ласіха вырвалася і пабегла, але адбегчы далёка не здолела. Астатнія ласі, спалоханыя нападам, уцяклі. Мядзведзь дагнаў параненую ласіху пад ялінамі і зламаў ёй хрыбет. Тут жа адразу і пачаў есці, а насыціўшыся, лёг адпачыць. Пакуль мядзведзь распраўляўся з ласіхай, падышлі ваўкі. Яны селі недалёка ад яго і пачалі чакаць, пакуль гаспадар пад'есць. Але ваўкі, як вядома, прагныя і цярплівасці ў іх ніколі не хапае. Яны пачалі дакучаць мядзведзю. Тады ён перацягнуў заднюю частку тулава пад дрэва, далей ад ваўкоў. Тыя накінуліся на ўсё, што ён ім пакінуў. На змену ваўкам прыйшла лісіца і пачала чакаць сваёй чаргі, сваёй долі. Ваўкі, калі дарвуцца да такой буйной здабычы, як лось, жаруць спачатку ўсё, што трапіць на зуб, агулам, не разбіраючыся. Наеўшыся, яны адышлі, каб адпачыць. Адзін малады воўк закапаў костку з кавалкам мяса ў пясок пад кустамі пра запас. Пакуль ваўкі спалі, за рэшткі ласіхі ўзялася лісіца. Калі ваўкі выгаладаліся, яны падышлі да здабычы зноў, але цяпер ужо выбіралі з таго, што засталося, толькі лепшыя кавалкі. На другі ж дзень, калі ўжо не было чаго есці, яны з'елі скуру і разгрызлі буйныя косці. Вось і засталіся ад ласіхі толькі чэрап, хрыбет і лапаткі. Іх паабчысцілі напаследак птушкі, жукі і мурашкі. У лесе нішто не прападзе.

Разважыўшы як след, Вадзім Аляксандравіч згадзіўся з Аляшкевічам і далучыўся да думкі егера. На другі дзень, у канторы, ён склаў аб прычынах гібелі ласіхі акт, у якім усё гэта было даведзена, і даў нам яго падпісаць.

Пасядзеўшы каля вогнішча, мы пайшлі ўсе разам назад у Крайцы.

Зноў пакутлівы пераход па глыбокім і вязкім балоце, скрозь высокія зараснікі трысця. Ногі адмаўляюцца

служыць. І не дзіва — мы прайшлі сёння па лесе і балоце каля дваццаці кіламетраў.

З балота мы выйшлі да бабровай хаткі № 201 на рацэ Сергуч. Гэта — вялікая старая хатка, самая большая з тых, якія я бачыў. Вышыня яе — два метры шэсцьдзесят сантыметраў; шырыня — пяць метраў сорак сантыметраў. Зверху хатка густа зарасла крапівой і мятай і здалёку выглядае, як звычайны зялёны ўзгорак над рэчкай.

Каля хаткі растуць чарот, бярозы і вольхі. Недалёка ад хаткі высіцца бяроза, з усіх бакоў падгрызеная бабрамі, але яшчэ не паваленая.

Пасядзеўшы на хатцы і адпачыўшы, мы прабіраемся далей праз балоцістую пойму Сергуча.

Два разы пераходзім мы звілісты Сергуч і выбіраемся з топкай дрыгвы на ўзвышанае сухое месца па падводнай кладцы.

Як прыемна апынуцца зноў на цвёрдай зямлі, сярод сосен і верасу! Якое чыстае, сухое і духмянае паветра сасновага бору!

Адсюль мы выходзім на бераг канала каля трэцяга шлюза.

Ледзь толькі мы перайшлі на правы бок, як па лістах арэшніку застукалі першыя буйныя кроплі дажджу. Але мы ўжо недалёка ад дому!

Каля самых Крайцаў з яліны сарвалася сава.

Аляшкевіч ускінуў стрэльбу з пляча і стрэліў, але ў надыходзячым змроку не трапіў.

— Шкада,— гаворыць ён нездаволена,— у музеі няма яшчэ гэтай птушкі.

# ВАЎКІ

Сонечнае, яснае ранне. Над палямі разыходзіцца туман. Сёння ноччу былі першыя замаразкі.

На досвітку ў сасновым бары каля пасёлка Крайцы вылі ваўкі. Сярод высокіх галасоў маладых вылучаўся хрыплаваты бас старога, мацёрага ваўка.

Воўчая зграя з'яўляецца адной сям'ёй. Яна складаецца з самца і самкі, з ваўчанят, якія нарадзіліся сёлета, і з ваўчанят-пераяркаў, якія нарадзіліся ў мінулым годзе.

Пад восень пераяркі, што жылі і палявалі ў летні час паасобку, далучаюцца да сям'і сваіх бацькоў.

Гэта і ёсць зграя.

Кожная ваўчыная сям'я мае свой уласны паляўнічы ўчастак, радыусам у пятнаццаць і больш кіламетраў ад логава. У межы гэтага ўчастка яны не дапускаюць чужых ваўкоў.

Воўк становіцца дарослы на трэцім годзе жыцця. Ён абзаводзіцца ў гэты час сваёй сям'ёй і сваім участкам для палявання.

Самец і самка жывуць разам на працягу ўсяго жыцця. Калі самка гіне, самец бярэ сабе новую з пераяркаў. У сям'і-зграі бывае часам да чатырнаццаці ваўкоў — бацька, матка, шэсць ваўчанят сёлетніх і шэсць леташніх. Але найчасцей сустракаюцца зграі з шасці — васьмі галоў.

На тэрыторыі запаведніка воўк бязлітасна знішчаецца, як і ўсюды. Яго можна забіваць у любы час года. Адстрэл ваўка з'яўляецца службовым абавязкам егераў, і яны гэта робяць пры кожным зручным выпадку.

Мы паехалі з Леанідам Васільевічам агледзець садок для ваўка, пастаўлены ў лесе каля вёскі Слабада, на паўночнай ускраіне запаведніка.

Мінуўшы знаёмае ўжо сяло Домжарыцы, мы едзем сасняком па дарозе, якая перасякае тракт Бягомль — Лепель.

Каля вёскі Ствольная ўзвышаецца сярод поля даволі вялікая група старадаўніх курганоў. У гэтай мясцовасці хлапчукі часта знаходзяць чалавечыя косці, стрэлы, нажы і сякеры з каменя.

Праехалі вёскі Слабаду і Федаркі. У дзесяці кіламетрах ад Федаркоў знаходзяцца Пуцілкавічы, радзіма паэта Петруся Броўкі.

За вёскай Бедзін пачынаецца ўзвышаная мясцовасць. Вакол маляўнічыя ўзгоркі.

Вёска Асецішча размясцілася на беразе возера з той жа назвай. На супрацьлеглым беразе цямнее на даляглядзе лес. Там ужо тэрыторыя Лепельскага раёна Віцебскай вобласці. З гэтага боку паміж вёскай і возерам шырокі балоцісты луг. Адсюль дваццаць два кіламетры да Лепеля.

Леанід Васільевіч пайшоў у Асецішча. У яго там нейкая справа да лесніка Агапонькі.

Я чакаю яго на беразе.

З высокай травы ўзлятаюць качкі.

Над вёскай плыве ў небе ястраб.

Адсюль мы едзем у вёску Слабаду. Садок для ваўка пастаўлены ў сасновым лесе, за паўтара кіламетра ад вёскі.

Леанід Васільевіч хоча праверыць, ці правільна зроблены садок.

Мы ідзём у лес.

Паветра напоена водарам жывіцы.

Злёгку шумяць вершаліны высокіх хвой.

Садок мы ўбачылі яшчэ здалёку. Гэта — два кругі з высокіх завостраных і шчыльна пастаўленых адзін да аднаго калоў. Адзін круг, меншы па памерах, знаходзіцца ў другім, большым крузе. З аднаго круга ў другі трапіць немагчыма.

Уваход у садок зроблены так, каб звер мог увайсці, але выйсці не мог. Увайшоўшы ў калідор паміж каламі, ён будзе бясконца хадзіць па крузе і не знойдзе ніколі

выхаду, бо дзверы зроблены так, што кожны раз самі зачыняюцца, калі воўк падыходзіць да гэтага месца. Ён сам іх закрывае сваім тулавам, а назад павярнуцца не можа.

На ноч, каб прывабіць ваўка, садзяць ва ўнутраны круг казляня ці сабаку. Дабрацца да гэтай прынады воўк усё роўна не зможа.

Леанід Васільевіч аглядае садок і гаворыць, што ён зроблены правільна.

— Ці апраўдваюць сябе такія садкі? — пытаюся я.

— Мы пачынаем карыстацца імі ўпершыню,— адказвае Леанід Васільевіч.— Гэты садок — першы. Ёсць і больш эфектыўныя сродкі, але супроць ваўка трэба змагацца ўсімі спосабамі.

Адным з найбольш дзейсных сродкаў барацьбы з ваўкамі, асабліва ў мясцовасці з узгоркамі і пералескамі, Леанід Васільевіч лічыць масавыя аблавы. Такія аблавы егеры запаведніка праводзяць у зімовы час пры дапамозе насельніцтва.

Зімой галодныя ваўкі за адну ноч праходзяць у пошуках здабычы некалькі дзесяткаў кіламетраў, але на днёўку часта вяртаюцца ў аблюбаваны імі пералесак.

Для таго каб паспяхова падрыхтаваць аблаву, трэба перш за ўсё даведацца, дзе адпачываюць ваўкі пасля сваёй начной вандроўкі. Гэта можна дакладна ўстанавіць па слядах.

— Уявіце сабе марозны зімовы дзень,— гаворыць Леанід Васільевіч.— Паляўнічыя спыніліся ў бліжэйшым населеным пункце. Адзін з егераў ідзе на лыжах па воўчым следзе. На снезе выразна відаць адбіткі магутных лап ваўка. Па сваім рысунку яны падобны на след сабакі, толькі значна шырэйшыя, а наперадзе больш завостраны, бо кіпцюры ў ваўка даўжэйшыя. Сляды цягнуцца ланцужком, таму што ваўкі ідуць па снезе адзін за адным, нага ў нагу, след у след.

Гэты ланцужок вядзе ў пералесак. Цяпер трэба праверыць, ці няма следу з пералеску. Егер на лыжах асцярожна робіць вакол пералеску круг. След з пералеску не выходзіць. Значыць, звяры знаходзяцца тут. Яны днююць у кустах. Егер адразу паведамляе пра гэта астатнім.

Паляўнічыя абцягваюць участак, дзе знаходзяцца ваўкі, вяроўкай з чырвонымі флажкамі па крузе. Толькі ў адным месцы пакідаецца выхад, «вароты», з акружанай прасторы.

Каля выхаду становяцца стральцы. Яны становяцца так, каб вецер дзьмуў на іх, бо інакш ваўкі пачуюць небяспеку, не выйдуць з пералеску і будуць хавацца ў гушчары.

Кожны паляўнічы ведае сваё месца. Яны хаваюцца ў белых халатах за кустамі, за дрэвамі. Стрэльбы ў іх напагатове, бо воўк можа з'явіцца кожную хвіліну. Цяпер трэба стаяць ціха, не курыць, не кашляць, не варушыцца.

Загоншчыкі ідуць тым часам на супрацьлеглы край пералеску і ўваходзяць з таго боку на ўчастак, абцягнуты вяроўкай з флажкамі. Яны пачынаюць шумець, крычаць, стукаюць палкамі па дрэвах, голасна пераклікаюцца.

Устрывожаныя і занепакоеныя шумам і крыкамі загоншчыкаў, ваўкі кідаюцца наўцёкі. Але ўсюды яны натыкаюцца на вяроўку з яркімі, чырвонымі флажкамі. Хутка яны знаходзяць адзіны выхад з акружанай плошчы. Тут няма ні вяроўкі, ні страшных флажкоў. Усюды шум і крыкі, а тут ціха і спакойна.

Адзін за адным, крадучыся, выскакваюць ваўкі праз адкрытыя «вароты» і падаюць на снег пад трапнымі стрэламі паляўнічых.

— Такая аблава, старанна падрыхтаваная і правільна праведзеная, заўсёды дае добрыя вынікі,— заканчвае свой расказ Леанід Васільевіч.

# РАЗВІТАННЕ

Нядаўна раптам зніклі стрыжы, якія дагэтуль цэлымі днямі з вясёлым і рэзкім шчэбетам нястомна насіліся каля страхі канторы і над каналам.

Стрыжы прылятаюць сюды вясной толькі ў другой палове мая, пазней за ўсіх іншых птушак, пазней нават за ластавак, а восенню адлятаюць першыя.

Праз дзень-другі зніклі і ластаўкі. За імі паляцяць і ўсе іншыя птушкі, якія кормяцца насякомымі. Але пліскі пакуль што яшчэ тут.

Стрыжы адлятаюць першыя таму, што кормяцца толькі тымі насякомымі, якіх яны могуць схапіць сваім шырокім ротам у паветры, у час палёту. Стрыжы нібы створаны для таго, каб жыць у паветры. Яны не лятаюць, толькі калі спяць. Хадзіць па зямлі яны не могуць, затое добра лазяць па каменных сценах.

Я выйшаў неяк раніцай з пакоя, і адразу мне ў вочы кінулася адсутнасць гэтых птушак.

Перад тым як пайсці ў лес, я вырашыў наведаць музей, паглядзець на новыя экспанаты. За апошні час калекцыі музея значна папоўніліся.

Прэпаратар, ён жа і загадчык музея, Антон Цярэнцевіч, маўклівы энтузіяст сваёй справы, працуе, як і заўсёды, у майстэрні. Ён зняў шкурку з забітай чаплі, потым зрабіў з дроту каркас, абкруціў яго ватай і цяпер нацягвае на каркас шкурку.

У новым, пабудаваным нядаўна доміку музея размешчаны зробленыя раней чучалы бабра, выдры, зайца, лісы, вавёркі, дзікіх парасят,ваўчанят, глушца, канюка, падорліка і іншых звяроў і птушак, характэрных для гэтай мясцовасці.

Сярод іх стаіць з раскінутымі крыламі стары наш знаёмы, арлан-белахвост, застрэлены егерам Аляшкевічам у мінулым годзе.

Мінут праз дваццаць, калі я выйшаў з музея, мне давялося пабачыць, нібы знарок, і жывога арлана. Ён

сядзеў на старой бярозе, недалёка ад Крайцаў, у спакойнай, велічнай позе і быў вельмі падобны да свайго родзіча ў музеі.

Галава магутнага птаха была горда прыўзнята. Арлан глядзеў, не адрываючыся, насустрач сонцу. Ён нібы ўпіваўся ясным, чыстым, бліскучым паветрам.

Я падышоў бліжэй і гэтым парушыў яго велічны спакой. Арлан расправіў спачатку адно крыло, потым другое і цяжка, быццам неахвотна, узняўся з дрэва. Рэдка ўзмахваючы магутнымі крыламі, ён паляцеў да ракі, набіраючы пастулова вышыню. Чым вышэй ён узнімаўся, тым усё шырэйшыя рабіліся кругі, якія ён вырысоўваў у паветры. Які прыгожы быў яго палёт, поўны сілы і невыказнай велічы! Ён не рабіў ніводнага лішняга руху.

Узняўшыся на патрэбную вышыню, арлан перастаў узмахваць крыламі. Ён плыў высока над зямлёй, у сінім бяздонным небе, плануючы ў паветры, як сапраўдны майстар вышэйшага пілатажу.

Праводзіўшы арлана позіркам, я пайшоў на паўночны захад, ва ўрочышча Хімлівае.

У восеньскім лесе спакойна.

Бясконца паўтарае сваю кароткую песеньку сініца. Чуецца часам рэзкі крык сойкі. У свежым паветры даносіцца нават сюды галасісты спеў пеўня ў пасёлку.

Птушкі рыхтуюцца ў вырай. Усюды адбываюцца іх развітальныя зборышчы. Чародкамі перапырхваюць з дрэва на дрэва, з куста на куст берасцянкі, вясёлыя, бадзёрыя, ажыўленыя. Па галінках скачуць чубатыя сініцы-грэнадзёркі. Вось праляцела з шумам над зямлёй чародка драздоў. Франтаватыя сойкі ў блакітна-сінім убранні сварацца і спрачаюцца між сабой заўзята, з запалам і, як заўсёды, без пэўнай, сур'ёзнай прычыны.

Пералятаючы з лесу ў лес, з лугавінкі на лугавінку, затрымліваючыся на кароткі час то ў адной, то ў другой мясцовасці, шматлікія чародкі берасцянак і драздоў па-

соўваюцца паступова, але няўхільна ў адным напрамку — на поўдзень. Тыя, якіх я тут бачу сёння, можа, зусім і не мясцовыя жыхары. Птушкі, што ўлетку гнездавалі ў гэтых лясах, падаліся, напэўна, ужо значна далей, а гэтыя прыляцелі сюды ім на змену аднекуль з больш паўночных мясцін. Яны трымаюцца тут часова, як госці. Гэта адзін з прыпынкаў у іх далёкім штогадовым падарожжы.

Сасновы бор пераходзіць у змешаны, з бярозавым падлескам. Такія мясціны любяць рабчыкі. І, сапраўды, яны тут часта бываюць. Толькі ўбачыць іх нялёгка. Для рабчыкаў абавязкова патрэбен ельнік. Сярод ялін яны хаваюцца і ад ястраба, і ад куніцы — сваіх лютых ворагаў. Рабчыкі — вялікія майстры маскіроўкі, і гэта іх выратоўвае. Ім вельмі дапамагае хавацца ад варожага вока ахоўная афарбоўка.

Глушцоў тут цяпер няма. Яны кормяцца ў гэты час амаль выключна асінавым лісцем. Пад канец восені глушцы пяройдуць да больш грубых кармоў, а зімой будуць карміцца аднымі шыпулькамі.

На пясчанай сцежцы, якая вядзе ў вёску Пераходцы, свежыя сляды ваўка. Па іх прабегла і знікла ў сухой траве маленькая, спрытная яшчарка.

На галінках маладых сосен сядзяць вялікія сініцы, сініцы-маскоўкі і даўгахвостыя сініцы-апалонаўкі, ці, як іх тут яшчэ называюць, пухлякі.

Калі я падыходжу бліжэй да гэтай зборнай кампаніі, вялікія сініцы і сініцы-маскоўкі адразу знікаюць, а даўгахвостыя апалонаўкі застаюцца. Гэта — вельмі цікаўныя птушкі. Хіба могуць яны адляцець, не разглядзеўшы як след незнаёмага чалавека?

Адна з апалонавак пераляцела на нізкую асіну мне насустрач. Забаўная птушка! Яна ўважліва аглядае мяне і круціцца на галінцы, пазіраючы сваімі чорнымі, бліскучымі вочкамі-пацеркамі на круглай белай, нібы пуховы шар, галоўцы.

Стараючыся прыцягнуць маю ўвагу, апалонаўка паказвае ўсялякія акрабатычныя фокусы на галінцы. Яна прымае самыя дзівосныя і недарэчныя позы. То, як папугай, куляецца ўніз галавой, узняўшы ўгору свой доўгі, прамы і вузкі хвост, то, трымаючы яго гарызантальна, скача з мітуслівай паспешнасцю на верхні сучок, каб адразу зноў саскочыць адтуль уніз і пагайдацца на самай ніжняй, тонкай галінцы, нібы на спружыне. Нарэшце, досыць накуляўшыся і накруціўшыся, апалонаўка піснула і паляцела прэч.

Пакуль рухавая птушка, такая непадобная на іншых сваіх родзічаў-сініц, кулялася і рабіла цыркавыя фокусы, я добра яе разгледзеў. Галава і большая частка тулава ў апалонаўкі белага колеру, толькі бакі і доўгае пер'е хваста — ружова-жоўтыя. Крылы ў яе чорныя, са светлымі палоскамі.

Над верасам гудуць познія пчолы. Ногі мае нячутна ступаюць па сухім, белым імху. Сонца прасвечвае між ствалоў сосен, ад гэтага яны здаюцца цёплымі. Вакол узгоркі, пакрытыя белым імхом, ліловым верасам і зялёным сасняком. Усюды суха, светла і радасна.

Сцежка звіваецца, бяжыць з узгорка на ўзгорак, і перад вачыма адкрываюцца ўсё новыя і новыя прыгожыя пейзажы. Зямля нібы выслана мяккім, пушыстым, шматкаляровым дыванам.

Якое тут цудоўнае спалучэнне фарбаў! Колькі разнастайных адценняў у гэтым ружова-ліловым верасе, белым імху, жоўтай папараці, зялёнай, меднастволай сасне і сінім высокім небе!

Празрыстае паветра пахне духмяным восеньскім водарам, сухім настоем верасу, бляклай травы, жоўтых лісцяў, чабору і хвоі.

З неба даносяцца трубныя гукі. Я ўзнімаю галаву. Над Крайцамі ляцяць, курлыкаючы, жоравы. Яны кружаць над пасёлкам і трубяць, нібы развітваючыся з роднымі мясцінамі перад доўгім і небяспечным пада-

рожжам. Потым кладуцца на курс і няроўным клінам знікаюць на даляглядзе. Бывайце, слаўныя трубачы! У добры шлях, падарожнікі! Да новай, шчаслівай сустрэчы!

Стрыжы і жоравы напомнілі аб тым, што тэрмін маёй паездкі скончыўся, трэба і мне збірацца дадому.

У думках я развітваюся з блізкімі сэрцу мясцінамі. Я адчуваю, колькі радаснай сілы, бадзёрасці і ўпэўненасці далі мне вандроўкі па гэтых лясістых узгорках, балотах і рэчках, назіранні за дзікімі звярамі і птушкамі. Яны ўзбагацілі мяне новымі ведамі аб роднай прыродзе, новымі ўражаннямі.

Шкада расставацца з прывольным лясным жыццём, з чыстым і свежым паветрам, але мяне чакае мая штодзённая праца, прывычныя заняткі, любімыя кнігі.

Наперадзе жыццё ў вялікім горадзе, і мне ўжо не цярпіцца вярнуцца ў Мінск і ўзяцца хутчэй за работу.

Бывайце, звяры і птушкі! Бывайце, бабровыя хаткі! Бывайце, лясы над Бярозай!

У наступным годзе я пастараюся ўбачыцца з вамі зноў!

*1947—1948*

# *Чайкі над Нараччу*

## ХУТЧЭЙ НА НАРАЧ!

Паехаў я на возера Нарач дзеля чаек.

Справа ў тым, што з некаторага часу яны пачалі з'яўляцца над Свіслаччу амаль у самым цэнтры горада, каля плошчы Перамогі.

Я зацікавіўся чайкамі.

Адкуль яны прылятаюць да нас, у горад, кожную вясну і кожную восень? Дзе гняздзяцца гэтыя прыгожыя белакрылыя птушкі? Якія ў іх звычкі? Ці яны шкодныя, ці карысныя?

Мне захацелася пазнаёміцца з імі бліжэй.

І тут паўстала пытанне: дзе можна наглядаць за жыццём чаек у найбольш спрыяльных і характэрных умовах?

Адзін мой знаёмы сказаў:

— Вам трэба паехаць на возера Нарач. Там многа чаек.

Другі пацвердзіў гэта і дадаў:

— Калі не на Нарач, то на Мядзель. Нарэшце вы можаце пабываць і на Мястры. Гэта азёры-суседзі. Ад аднаго да другога рукой падаць. На Мядзелі не так прыгожа, як на Нарачы, але затое чаек больш. Ды і наогул птушыны свет на ўсіх азёрах Нарачанскай групы вельмі багаты.

— Нарач — цудоўнае возера,— стаяў на сваім першы.— Прыгажэйшага вы не знойдзеце. Там ёсць на

што паглядзець і акрамя чаек. Пажывіце там некалькі месяцаў. Вы будзеце задаволены.

Я паслухаў аднаго, паслухаў другога і цвёрда вырашыў — паеду на возера Нарач. Пазнаёмлюся не толькі з чайкамі, але і наогул з птушыным светам, рыбнымі багаццямі і прыроднымі асаблівасцямі славутага возера, якое дагэтуль было мне вядома толькі па расказах сяброў і па вершах Максіма Танка.

Хутчэй на Нарач! На паляванне без стрэльбы. Буду там наглядаць за жыццём дзікіх птушак.

Сказана — зроблена.

І вось я стаю на высокім беразе Нарачы і гляджу на бязмежны блакітны прастор, які зліваецца на даляглядзе з небам.

## ЗАЛАТЫ БЕРАГ

Я стаю на самым высокім месцы паўночнага берага Нарачы, на ўзгорку каля вёскі Купа. Адсюль добра відаць усю гэтую частку возера.

З левага боку цямнее невялікі нізкі востраў. Насупраць мяне, кіламетраў за дзесяць па прамой лініі, на вузкай пясчанай касе — рыбацкая вёска Наносы. Справа, крыху далей за Купай, вёска Сцепянёва. Паміж Купай і Сцяпянёва на высокім беразе возера знаходзіцца біялагічная станцыя Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Пад нагамі сухая глеба, пакрытая кустамі ядлоўцу, верасам і чаборам. Крыху далей высокі бераг з сасновым лесам пераходзіць у шырокі пясчаны пляж.

Вада каля берага зеленавата-блакітная, чыстая і празрыстая, падобная па колеры на марскую. Далей ад берага, там, дзе глыбей, яна здаецца сіняй.

Уражанне такое, быццам знаходзішся недзе пад Рыгай, на ўзбярэжжы Балтыйскага мора. Той жа колер

вады, той жа бязмежны прастор, той жа залаціста-белы пясок на пляжы і тыя ж высокія сосны на ўзгорках. Залаты, бурштынавы бераг!

Мядовы пах чабору і верасу змешваецца з густым настоем нагрэтай сонцам хвоі. У паветры ніводнай пылінкі. Яно проста ап'яняе гарадскога чалавека сваёй чысцінёю і свежасцю. Нідзе яшчэ не даводзілася мне дыхаць такім чыстым паветрам. Грудзі шырацца, лёгкія глыбока ўдыхаюць смалісты водар.

Ніколі мне не забыць уражанняў ад гэтай першай паездкі на Нарач. За ёю была і другая, і трэцяя. Кожны раз я жыў на возеры не менш двух месяцаў і кожны раз заўсёды бачыў і наглядаў тут нешта новае, цікавае. Але першыя ўражанні былі асабліва яркія, асабліва моцныя. Яны запомніліся мне на ўсё жыццё.

Схіл узвышша сінее чаборам. На вяршыні растуць кусты шыпшыны. Кветкі дзікай ружы чырванеюць між дробных зялёных лістоў і калючак.

Белакрылыя чайкі лятаюць над Нараччу, то прыпадаючы да сіняй паверхні вады, то зноў узнімаючыся ўвысь.

Я не магу наглядзецца на гэтую паэтычную карціну. Я думаю: які цудоўны свет і якая прыгожая наша краіна!

Каля самага берага б'е з-пад зямлі крыніца з серабрыстай сцюдзёнай вадою. Вясёлым ручайком струменіць яна ўніз, зліваючыся з вадою возера.

Такіх крыніц тут многа. Вада ў іх гаючая, карысная для здароўя. Піць яе — асалода!

## БЕЛАРУСКАЕ МОРА

«Беларускае мора»...

Мне прыходзяць на памяць гэтыя словы. Так нярэдка называюць Нарач.

І сапраўды, гэта — самае вялікае возера Беларусі.

Плошча яго — восемдзесят квадратных кіламетраў. Найбольшая глыбіня — пяцьдзесят метраў. Знаходзіцца яно на паўночным захадзе Мінскай вобласці.

Нарач адносіцца да азёр, якія не зарастаюць раслінамі. Вада ў гэтых азёрах чыстая, багатая на кісларод. Такія вялікія і глыбокія азёры называюцца алігатрофнымі. У іх адбываецца безупынны рух вады ад ветру і ад глыбінных плыняў. Дзякуючы гэтаму прыбярэжная паласа не ператвараецца ў балота і возера застаецца чыстае і адкрытае. Над Нараччу амаль заўсёды дзьмуць вятры.

Паўночныя і паўночна-ўсходнія берагі Нарачы ўзвышаныя, паўднёвыя і заходнія — нізкія.

На паўднёвым усходзе з возера выцякае рэчка Нарач, якую мясцовыя жыхары называюць Нарачанкай. Звілістай стужкай прабіраецца яна сярод топкага балота, якое зарасло хмызняком і чаротам, у раку Вілію, прыток Нёмана.

На поўначы бераг возера закругляецца, набываючы правільную форму чашы, да краёў напоўненай вадою. З усходняга боку віецца паўз возера дарога, абапал якой высяцца сосны, расце ядловец. Справа — цягнецца цудоўны сухі і вясёлы сасновы бор. Злева — наступаюць на бераг хвалі.

На паўднёвым беразе лясоў няма. Да вады спускаюцца спадзістыя ўзгоркі. На іх расце толькі трава. Бераг нізкі, з зараснікамі трысця і чароту.

На ўсходзе возера Нарач злучаецца вузкім пралівам між пясчаных кос з возерам Мястра, плошча якога — трынаццаць квадратных кіламетраў. Непадалёку знаходзіцца возера Мядзель і маленькае возера Баторын.

З вяршыні кургана каля вёскі Мікольцы можна ўбачыць усе гэтыя азёры Нарачанскай групы.

Паўночную частку Беларусі нездарма называюць краем блакітных азёр. На поўнач ад Нарачы іх налічваецца некалькі тысяч, і малых, і вялікіх. Усе яны ўзніклі дваццаць — дваццаць пяць тысяч гадоў назад.

Вучоныя лічаць, што магутны ледавік, насунуўшыся ў чацвёрты раз з гор Скандынаўскага паўвострава, пакрыў усю гэтую мясцовасць пластом лёду таўшчынёю ў сотні метраў. Рухаючыся з поўначы на поўдзень, вялікія масы лёду драбнілі цвёрдыя пароды, цягнулі іх з сабою і пакідалі на сваім шляху буйныя валуны, дробныя каменні, гліну і пясок. З матэрыялаў, прыцягнутых ледавіком, утварыліся марэны — высокія грады абломкаў горных парод. Пры гэтым узгоркі чаргаваліся з глыбокімі лагчынамі.

Калі ледавік пачаў раставаць, частка вады затрымалася ў лагчынах і нізінах, утварыўшы азёры. У спадчыну ад ледавіка засталіся не толькі гэтыя блакітныя азёры, не толькі шматлікія каменні на палях, але і прыгожы, хвалісты рэльеф мясцовасці.

Марэнныя грады былі прыроднымі плацінамі, якія затрымалі расталую ваду ледавіка. Яны ўтварылі найбольш буйныя азёры, у тым ліку і Нарач — «Беларускае мора».

## НА ПЛЯЖЫ

Знаёмства з Нараччу я вырашыў распачаць з наведвання біялагічнай станцыі.

Паміж тым месцам, дзе я стаю на ўзгорку, і будынкамі станцыі — шырокая паласа пляжа.

Зверху ўражанне такое, быццам на залацістым пяску расцвілі нейкія вялікія, незвычайна яркія кветкі — блакітныя, белыя, сінія, чырвоныя, жоўтыя.

Я спускаюся ўніз.

Дык вось якія гэта кветкі! Тут поўна людзей: жанчыны ў яркіх халатах і сарафанах, мужчыны ў стракатых піжамах і саламяных капелюшах, з махнатымі ручнікамі цераз плячо.

Загарэлыя бронзавыя хлапчукі і дзяўчынкі плюхаюцца ў зеленаватай вадзе, пырскаюцца, пускаюць па вадзе караблікі з сасновай кары, будуюць на беразе крэпасці і гавані з вільготнага пяску. Стройныя юнакі і дзяўчаты ў трусах і купальніках гуляюць у валейбол.

Асобнымі групкамі, сагнуўшыся і самаадданa падставіўшы голыя спіны пад бязлітасныя прамені сонца, сядзяць на пяску аматары «забіць казла».

Тут адпачываюць мінскія друкары з жонкамі і дзецьмі. Кожны праводзіць свой вольны час як хоча і як умее.

У 1955 годзе на ўзгорках пад соснамі выраслі ўтульныя блакітныя домікі пад чырвонымі чарапічнымі дахамі. Дырэкцыя мінскай друкарні пабудавала тут дачы для летняга адпачынку сваіх рабочых і служачых.

З гэтага часу цудоўная мясцовасць паміж вёскаю Купа і пасёлкам рыбгаса пачала набываць курортны характар.

Цяпер гэта самая людная і ажыўленая частка возера. З першымі зменамі дачнікаў пагалоска пра казачную прыгажосць возера абляцела ўвесь Мінск. Распаўсюдзілася яна і далёка за межамі Беларусі. Кожны год праводзіць тут свой летні адпачынак многа працоўных не толькі з Мінска, але і з Вільнюса, Масквы і Ленінграда.

На беразе Нарачы можна сустрэць і асобных турыстаў, і групы ўдзельнікаў турысцкіх паходаў і падарожжаў. Яны жывуць у палатках. Але густа населена ў летні час толькі невялікая паласа паўночнага берага з пясчаным пляжам між рыбгасам і біялагічнай станцыяй. Ва ўсіх іншых месцах ціха і спакойна. Ніхто не трывожыць шматлікіх і разнастайных птушак. Ніхто не парушае велічнай задумлівасці прыроды.

Хвалі раўнамерна набягаюць на бераг, пакідаючы на пяску пушыстыя шматкі белай пены. Імкліва праносіцца, высунуўшыся напалавіну з вады і ўзнімаючы

каскады серабрыстага вадзянога пылу, маторная лодка. Асляпляльна белая, з чырвоным днішчам, яна зіхаціць у яркіх праменнях сонца.

— Але ж і матор здаровы! — з выглядам знаўцы гаворыць якісьці мужчына на пляжы і, прыўзняўшыся на локці, сочыць з-пад рукі за шпаркім ходам лодкі.

— Цудоўная лодка! — падтрымлівае яго сусед.— Нічога не скажаш!.. Які ход!.. Як шпарка ляціць, і амаль бясшумна.

Асцярожна абмінаючы пажылых дзядзькоў і цётак, што ляжаць на пяску, як цюлені, выцягнутыя з вады, я іду далей.

Пясчаны пляж змяніўся абрывістым берагам. Купальшчыкаў тут няма.

Наперадзе, на зялёным узгорку, відаць між сосен двухпавярховыя дамы.

Гэта — будынкі біялагічнай станцыі.

## НА БІЯЛАГІЧНАЙ СТАНЦЫІ

Сюды прыйшла група піянераў з Маладзечна. Хлапчукі і дзяўчынкі знаёмяцца з экспанатамі невялікага заалагічнага музея.

У шкляных шафах захоўваюцца чучалы амаль усіх відаў птушак, якія жывуць на берагах возера і ў яго аколіцах. У слоіках заспіртаваны ўсе віды рыб, што вядуцца ў Нарачы.

Гасцям дае тлумачэнні студэнт Лёня, які праходзіць на станцыі летнюю практыку.

— Біялагічная станцыя на возеры Нарач,— гаворыць Лёня,— створана Беларускім дзяржаўным універсітэтам для летняй практыкі студэнтаў-біёлагаў у прыродных умовах. Кожнае лета на станцыі праходзяць практыку студэнты першага курса. Студэнты-выпускнікі працуюць

тут над сваімі дыпломнымі работамі, звязанымі з гідрабіялогіяй, навуковай асновай рыбнай гаспадаркі. На станцыі вывучаюцца рыбы і птушкі, вадзяныя расліны, планктон — жывёльны свет тоўшчы вады, і бентас — жывёльны свет дна. Назіранні вядуцца на ўсіх азёрах Нарачанскай групы... А цяпер паглядзіце на гэтых прыгожых птушак,— закончыў Лёня свой уступ.

Ён падышоў да першай шафы і паказаў рукой на экспанаты пад шклом:

— Тут вы бачыце чаек, якія жывуць на возеры. Вось гэта — звычайная рачная чайка. Такіх чаек на азёрах Нарачанскай групы многа. Яны тут гняздзяцца і таму сустракаюцца часта. Гэта — малая чайка, гэта — шызая чайка, а вось гэта — клуша. Абедзве апошнія чайкі, і шызая, і клуша, прылятаюць на возера Нарач як госці. Яны — марскія чайкі, жывуць і гняздзяцца на берагах Балтыйскага мора.

Лёня перайшоў да другой шафы.

— Далей ідуць крачкі. Яны значна меншыя за чаек, а канцамі сваіх крылаў і хвастом нагадваюць ластавак. Вось перад вамі чорная крачка, а гэтая, светлая,— рачная крачка.

Піянеры цiснуцца бліжэй да вітрыны. Яны з захапленнем слухаюць студэнта, а ён захоплены не менш сваіх слухачоў. Пра птушак Лёня можа гаварыць і гаварыць без канца.

Ён падыходзіць да чарговай шафы — з каршунамі, сокаламі, падорлікамі, канюкамі. Піянеры спяшаюцца за ім. Кожны імкнецца заняць месца бліжэй да экспанатаў.

Лёню я ведаю даўно. Пра яго мне расказваў у Мінску Віктар Фёдаравіч, кіраўнік заалагічнага гуртка Цэнтральнай станцыі юных натуралістаў. Яшчэ вучнем сярэдняй школы Лёня на працягу васьмі гадоў наведваў станцыю юннатаў. Маці яго выкладала прыродазнаўства ў сярэдняй школе. Хлапчук з маленства

цікавіўся птушкамі і ўвесь свой вольны час прысвячаў назіранням за крылатымі сябрамі. Ён рабіў і развешваў шпакоўні, зімою трымаў дома чыжоў, берасцянак і шчыглоў, а вясною выпускаў іх на волю. Пасля заканчэння сярэдняй школы Лёня паступіў на біялагічны факультэт універсітэта і пачаў спецыялізавацца ў сваёй любімай навуцы пра птушак — арніталогіі. З Цэнтральнай станцыяй юных натуралістаў ён падтрымлівае сувязь і цяпер.

Расказаўшы піянерам пра птушак, Лёня павёў гасцей у пакой, дзе вядуцца лабараторныя заняткі.

## ВАРАНКІ

Я выйшаў на ганак.

Адсюль, з гары, на якой знаходзіцца станцыя, відаць увесь бясконцы сіні прастор возера. Паветра чыстае, свежае, яснае.

Між будынкаў станцыі безупынна снавалі, шчабечучы, гарадскія ластаўкі-варанкі. Пад гонтавымі дахамі было многа іх шэрых круглаватых гнёздаў, па-майстэрску злепленых з зямлі і гліны і склееных уласнаю слінаю.

Варанкі гадавалі малых і ўвесь час нястомна прыносілі ім насякомых, якіх лавілі тут жа, над возерам.

Як прыгожа і спрытна лятаюць над вадой гэтыя лю́быя птушкі! Яны то ўзлятаюць угору, то апускаюцца ўніз, робячы шпаркія і нечаканыя павароты, нібы куляючыся ў паветры, то стралою імкліва праносяцца над самай вадою, дакранаючыся вострымі крыламі да яе роўнай паверхні. Ластаўкі і ядуць, і п’юць «на хаду», у час палёту.

Пакуль я сядзеў на ганку і любаваўся варанкамі, шумная чарада піянераў выбегла з дому і ланцужком

пачала спускацца па вузкай сцежцы ўніз да возера. Там, на прычале ля масткоў, стаялі лодкі, на якіх экскурсанты прыплылі сюды са свайго лагера ў Га́тавічах.

Звонкія галасы змоўклі пад гарой. Стала адразу ціха.

## ЧАЙКІ НАД НАРАЧЧУ

Над возерам ляціць чайка. Вострыя шызыя крылы, падобныя на сярпы, рассякаюць паветра. Кароткі хвост распушчаны веерам, як у голуба.

У небе з'явіўся падорлік. Чайка апусцілася на ваду і трымаецца на паверхні, пагойдваючыся на хвалях, як белы папяровы караблік.

Падорлік знік за цёмнай сцяною лесу, і чайка зноў узнялася ў паветра.

Другая чайка села на невялікую дошку, што плыве па вадзе.

Аднекуль з'явілася трэцяя чайка. Раскінуўшы крылы, яна планіруе ў паветры, выглядаючы ў вадзе здабычу. З рэзкім крыкам слізгае над вадою то адным, то другім бокам.

Над блакітным прасторам пануе мяккае, перадвячэрняе сонца.

«Усё гэта вельмі добра і надзвычай прыгожа,— падумаў я.— Але чаму так мала чаек над Нараччу? Колькі іх тут зараз над вадою? Адна, дзве, тры, вось ляціць чацвёртая. Больш не відаць... Мне здавалася, што я ўбачу на возеры сотні, калі не тысячы, гэтых белых птушак, а яны лятаюць адзінкамі, і то не заўсёды. Няўжо гэтым і абмяжуецца маё знаёмства з імі?»

Тым часам з музея выйшаў Лёня і спыніўся на ганку.

Я падзяліўся з ім сваімі сумненнямі.

— Ля Купы чаек заўсёды мала,— адказаў Лёня.— Яны трымаюцца больш на тым баку, ля вытокаў Нарачанкі, і на касе. І, наогул, яшчэ не час. Яны жывуць цяпер на сваіх гняздоўях, гадуюць малых. Найбольш гняздзяцца чайкі на азёрах Швакшты і Свір, на маладаступных прыбярэжных балотах. Гэтыя азёры зарастаюць, з цягам часу яныператворацца ў суцэльныя балоты. Над возерам Нарач чайкі з'явяцца адтуль, разам з маладымі, у пачатку жніўня, калі тыя навучацца лятаць і самастойна здабываць сабе корм. Асабліва многа іх будзе вунь на той касе.

— Шкада,— сказаў я.— Доўга чакаць.

— Хіба вам абавязкова патрэбны толькі чайкі? — запярэчыў малады арнітолаг.— Птушыны свет Нарачы багаты. Тут знойдзецца нямала птушак, і малых, і вялікіх, якімі таксама варта пацікавіцца.

Я згадзіўся з Лёнем.

— У мінулым і пазамінулым годзе,— дадаў ён,— на касе былі сотні чаек і крачак. Сёлета іх значна менш. Чайкі, як і іншыя птушкі, мелі ў апошнія гады вялікія страты ў час зімоўкі ў Паўднёвай Еўропе і Афрыцы ад вялікіх маразоў, бур і бяскорміцы. Шмат іх загінула. Амаль зусім няма сёлета на Нарачы дзікіх качак. Значна зменшылася і колькасць насякомаедных птушак, бо вёсны былі познія, халодныя, цяжкія для ўсіх крылатых. Таму сёлета і было забаронена веснавое паляванне на ўсе віды птушак.

## ЛУНЬ

На другі дзень я пайшоў берагам возера ў вёску Сцепянёва.

Якая пахмурная раніца! Шэрае неба вісіць над шэраю гладдзю вады. Нізка, над самай вадою, лётаюць

ластаўкі. У траве каля берага скачуць і перапырхваюць з месца на месца дразды.

Пясчаны пляж змяніўся абрывам. Хвалі падмываюць высокі бераг, і ён паступова абвальваецца ў возера. Каржакаватыя сосны вісяць над вадою, чапляючыся карэннямі за ненадзейную пясчаную глебу. Далей каля вёскі бераг становіцца нізкі і топкі. Тут многа вольхі. З правага боку цямнее на ўзвышшы зялёная сцяна лесу.

Сцепянёва — вёска маленькая, адзінаццаць хат. Яны выцягнуліся ўздоўж затокі, якую ўтварае тут возера.

Агароды падступаюць да самай вады. Адразу за градкамі пачынаюцца зараснікі трысця, чароту, аеру. На нізкіх плятнях развешаны рыбацкія сеці. Тут жа плешчуцца ў вадзе качкі.

Калі я падышоў да вёскі, пачаўся дождж.

Я зайшоў у двор крайняй хаты і стаў пад страху.

Па двары хадзілі гусі. Яны дзелавіта шлёпалі па лужынах перапончатымі лапамі і весела гагаталі, падстаўляючы пад струмені вады доўгія шыі. На паверхні лужын узнікалі і адразу лопаліся вялікія бурбалкі.

Дождж не сунімаўся.

На парозе хаты з'явілася старая жанчына.

— Чаго ж вам тут стаяць аднаму? — звярнулася яна да мяне, запрашаючы ў хату.— Пасядзіце з намі. Дождж, відаць, скончыцца не хутка.

Я падзякаваў і пайшоў за ёю. У хаце было чыста. На вокнах віселі фіранкі, стаялі вазоны з кветкамі. За сталом, засланым саматканым абрусам, сядзеў гаспадар. У яго ясныя, светла-шэрыя вочы пад густымі бровамі. Галава з шырокім ілбом акаймавана з бакоў і ззаду кучаравымі пасярэбранымі валасамі.

Сёння нядзеля, і гаспадар адпачывае.

У Сцепянёве ўсе жыхары маюць адно прозвішча. Усе яны — Радзевічы, за выключэннем адной сям'і, што жыве наводшыбе. Яна перасялілася сюды аднекуль з другой мясцовасці.

Мой гаспадар таксама Радзевіч.

Франц Антонавіч, так завуць старога, быў раней рыбак. Цяпер ён займаецца толькі прысядзібнай гаспадаркай. Яму ўжо семдзесят два гады, але з выгляду можна даць не больш як пяцьдзесят пяць. Ён ходзіць яшчэ часам у рыбгас, дае парады маладым рыбакам, але сам ужо не ловіць.

— Раматус адольвае,— тлумачыць Франц Антонавіч.— Рукі і ногі баляць. Асабліва, калі такое надвор'е, як сёння.

Да сцяны ў хаце прыбіты светла-шэрыя, амаль белыя крылы палявога луня. Мяне гэта здзівіла, бо палявы лунь — птушка карысная, і стары рыбак напэўна ведае, што забіваць яго не варта.

— Якім чынам трапілі яны сюды? — звярнуўся я да гаспадара, паказваючы на крылы.

— А гэта майго пляменніка Міхалкі, што служыць шафёрам у Паставах,— адказаў Франц Антонавіч.— Ехаў ён нядаўна на сваёй машыне да нас з Кабыльніка і ўбачыў, як нехта падстрэліў гэтую птушку. На яго вачах паранены лунь праляцеў трошкі і апусціўся на зямлю. Тады ён пад'ехаў, падабраў луня і прывёз яго мне. «Трэба,— кажа,— занесці на біястанцыю. Можа, яго там студэнты вылечаць. Няхай,— кажа, потым аддадуць, куды самі ведаюць. Можа, птушка спатрэбіцца для якога музея». Толькі, на жаль, рана была цяжкая, і лунь у той жа дзень загінуў. Дык я і павесіў гэтыя крылы на сцяну для цікавасці. Няхай вісяць, пакуль пляменнік не забярэ. Днямі, мусіць, прыедзе. Ён нас часта наведвае... Шкада, вядома, што падстрэлілі. Палявы лунь — птушка карысная, а вось балотны, той лічыцца ў нас шкодным. На таго забароны няма, таго страляць можна. Ды чалавек, што страляў, мабыць, не разабраўся,— закончыў гаспадар.

— А якая паміж імі розніца? — спытаў я.— І той лунь, і гэты. Чаму адзін карысны, а другі шкодны?

— Розніца вялікая,— адказаў стары.— А шкода і карысць залежаць, як вядома, ад спосабу жыцця. Палявы лунь любіць сухую зямлю і трымаецца на палетках між драбналесся, лётае над палямі і лугамі. Ён гняздзіцца сярод збажыны і ў высокай траве. Корміцца мышамі-палёўкамі і гэтым прыносіць карысць. А балотны лунь знішчае птушак, разбурае гнёзды, губіць птушанят і таму шкодны. Яго часцей можна ўбачыць над трысцём, чаротам і асакою. Балотны лунь, як і шэрая варона, робіць нямала злачынстваў. Сядзіць, скажам, качка ў сваім гняздзе на яйках, а ён наляціць ды заб'е. Качыныя яйкі і прападуць на зямлі без догляду, іх пазносяць зладзейкі-вароны. Ці, скажам, падаб'е балотны лунь качку з малымі качанятамі, з'есць, колькі здолее, пусціць пух па ветры і паляціць сабе прэч, а качаняты застануцца без маткі. Добра, калі натрапіць на іх выпадкова, па суседству, другая качка са сваім вывадкам. Тады качаняты-сіроткі далучацца да гэтага вывадка і пойдуць за прыёмнай маткай. Тая будзе іх даглядаць, як сваіх уласных. А калі застануцца адны, то загубяць іх тыя ж вароны, ці лісіца, ці тхор, ці вадзяныя пацукі.

— Як жа адрозніць шкоднага балотнага луня ад карыснага палявога?

— Адрозніваюцца яны з выгляду,— растлумачыў Франц Антонавіч.— У палявога луня пер'е зверху светла-шэрае, а знізу амаль белае. Нездарма ў народзе гавораць — сівы як лунь. Гэтак і пра мяне можна сказаць.

Гаспадар усміхнуўся і правёў рукою па сваіх сівых кучаравых валасах.

— Балотны лунь,— тлумачыў ён далей,— крыху буйнейшы за палявога, і апярэнне ў яго не светла-шэрае, а бурага колеру. Жыве ён каля рэк і азёр, на купінах, сярод балоцістага лугу. Вось якая паміж імі розніца, а ва ўсім астатнім яны маюць шмат агульнага. Вочы і ў палявога, і ў балотнага луня ярка-жоўтыя. Дзюба

цёмная, з блакітным адлівам, ногі жоўтыя, доўгія ды тонкія. Лётаюць і палявы, і балотны луні вельмі добра. Але здабычу сваю бяруць толькі з зямлі.

— А лугавога луня ведаеце? — спытаў я.— Ёсць яшчэ і такі.

— А як жа, ведаю,— адказаў гаспадар.— Ён блізкі да балотнага і жыве ў вільготных нізінах. Корміцца і мышамі, і жабамі. Лётае нізка над лугамі, шукаючы здабычу.

Франц Антонавіч змоўк і зірнуў на крылы.

— Любіць Міхалка птушак,— дадаў ён.— Выкінуць гэтыя крылы няможна, барані бог! Для яго такія рэчы — найлепшая аздоба.

Я паглядзеў яшчэ раз на светлыя крылы і пашкадаваў разам з гаспадаром, што загінуў не балотны лунь, а палявы.

Дождж тым часам скончыўся. Я развітаўся і выйшаў з хаты.

## КАРШУН І ШЧУПАК

Ясная сонечная раніца.

Я плыву на байдарцы ўздоўж паўночнага берага затокі. Вада чыстая, празрыстая, і з байдаркі добра відаць, як цэлыя касякі маленькіх рыбак жвава і весела мітусяцца над пясчаным дном.

У вадзе каля берага расце чарот і аер. Далей кусты вольхі, а ўжо за імі сінеюць чаборам спадзістыя схілы ўзгоркаў з высокімі соснамі.

Падплыўшы да зараснікаў трысця, я спыняю байдарку. Адсюль мне відаць усё возера, а сам я добра замаскіраваны з трох бакоў зялёнай сцяною.

Над возерам свеціць сонца. Па сінім небе плывуць белыя воблачкі.

Ціха вакол і спакойна. Чуваць толькі, як у зарасніках трысця, паміж байдаркай і берагам, чвякаюць і плёскаюцца качкі.

У свежым паветры прагучала раптам:

— К'ю-к'ю-к'ю-к'ю...

З-пад высокіх сосен на ўзгорку вылецеў каршун. Вось ён ляціць па-над возерам. Я пазнаў яго адразу па крыху раздвоеным на канцы хвасце і доўгіх шырокіх крылах.

Драпежны птах павольна кружыць над вадою. Крылы яго нерухома раскінуты.

Мінае хвілін пятнаццаць, і за ўвесь гэты час ён не зрабіў ніводнага ўзмаху. Плаўна плануе каршун у сінім небе, карыстаючыся нябачнымі струменямі паветра. І раптам, як страла, ляціць уніз і знікае ў серабрыстых пырсках вады.

У кіпцюрах каршуна шалёна б'ецца і зіхаціць бліскучым жоўта-зялёным бокам нешта вялікае. Яно то паказваецца з вады, то зноў знікае ў кіпучай пене. Я чакаю, што драпежная птушка ўзнімецца зараз у паветра, але каршун чамусьці марудзіць. Ён шпарка махае крыламі і... застаецца на месцы.

Я чую шум моцных удараў, чую плюскат вады, а каршун усё ніяк не можа адарвацца ад паверхні. Наадварот, мне здаецца, што ён нават апусціўся яшчэ ніжэй. Цяпер ужо зусім не відаць таго, што ён трымае ў кіпцюрах. Каршун апусціўся ў ваду аж па самае бруха.

Няроўнымі рыўкамі пасоўваецца драпежнік то ў адзін, то ў другі бок, нібы слізгаючыся па вадзе. Вось ён ужо даволі далёка ад берага. З ім, мусіць, здарылася нешта няладнае! Нешта трымае яго ў вадзе, не дае ўзляцець.

Я бяруся за вясло і хутка плыву да месца, дзе марна махае крыламі каршун. І тут я пераконваюся, што справы каршуна сапраўды безнадзейныя. Усё слабейшыя і слабейшыя робяцца рухі зняможанага драпежніка. З кожным

узмахам ён апускаецца ўсё ніжэй і ніжэй. Вось ужо толькі канцы яго крылаў тырчаць над вадою, як рожкі.

Ці не ўдасца мне вылавіць яго і забраць у лодку?

Я мацней налягаю на вясло, але ўсё роўна спазняюся. Калі байдарка даплыла да месца здарэння, на паверхні нічога не было. Каршун знік пад вадою. Ціхамірная гладзь самкнулася над ім назаўсёды. А над возерам па-ранейшаму ззяе сонца, сіняе неба дыхае мірам і непарушным спакоем.

Што здарылася з каршуном? Хто яго пацягнуў у ваду?

У думках я аднаўляю карціну таго, што тут адбылося, ва ўсёй паслядоўнасці.

...Вялікі зубасты шчупак стаяў у вадзе нерухома, як затопленае палена, падпільноўваючы на мелкім месцы верхаводак, плотак і сяляў. Убачыўшы яго сваім зоркім вокам, каршун кінуўся на рыбіну з вышыні. Разбойнік паветра напаў на разбойніка вады. Вострыя кіпцюры ўчапіліся ў шырокую цёмную спіну шчупака. Моцна трымаючы здабычу, каршун ірвануўся ўгору. Але шчупак быў для яго занадта вялікі і цяжкі. Узняцца з ім у паветра каршун не змог, а выцягнуць доўгія і крывыя кіпцюры з цела рыбы не здолеў.

Шчупак разявіў сваю пашчу з вострымі, як у пілы, зубамі. Ён біў хвастом і кідаўся ва ўсе бакі, залiваючы каршуна вадою. Рыба цягнула птушку ў ваду, а птушка рыбу — у паветра.

Хто каго?

Крылы каршуна намоклі, а дужы шчупак усё цягнуў і цягнуў яго ўніз, пакуль не ўтапіў на глыбіні.

Драпежнік загубіў драпежніка.

На другі дзень я пайшоў у рыбгас і расказаў пра здарэнне з каршуном Францу Радзевічу. Ён быў якраз у пасёлку.

Старога рыбака гэтая гісторыя зусім не здзівіла. Слухаў ён мяне моўчкі і, здавалася, абыякава, толькі на

абветраным загарэлым твары з'явілася нейкая хітраватая ўсмешка. Яна не знікала ўвесь час, пакуль я расказваў.

Калі я скончыў, рыбак адклаў сець, якую ён папраўляў, падняўся і сказаў:

— А цяпер я вам штосьці пакажу. Хадзем.

Франц Антонавіч павёў мяне ў пуню, дзе захоўваліся розныя рыбацкія прылады і вагі, на якіх узважваюць злоўленую рыбу. Там ён паказаў мне нешта цёмнае, што ляжала ў кутку на падлозе.

— Ці не гэты самы? — спытаў ён, задаволена прыжмурыўшы вока.

У пуні ляжаў мёртвы каршун.

Рыбак падняў птушку з зямлі. Цёмна-бурае пер'е каршуна яшчэ не абсохла. Жоўтыя вочы памутнелі. Невялікая дзюба з тонкім, рэзка загнутым уніз кручком была моцна сцята.

— Хацелі на сметнік выкінуць, ды я не даў. Спачатку, думаю, вам пакажу. Збіраўся па вас хлапчука паслаць, аж вы і самі прыйшлі.

— Дзе яго знайшлі? — пацікавіўся я.

— Сам да нас трапіў,— адказаў Радзевіч.— Выцягнулі хлопцы сець, глядзяць, а там жывы шчупак разам з мёртвым каршуном як адно цэлае. Так бедны шчупачына і плаваў больш за суткі з крылатым «коннікам» на спіне.

Мы выйшлі з пуні на бераг і прыселі на край прасмоленай лодкі, напалову выцягнутай з вады.

— Ці часта такое здараецца з каршунамі? — спытаў я.

— Не,— адказаў стары.— Гэта рэдкі выпадак. Рыбак з каршуна няважны, бо ён не ўмее ныраць. І наогул, каршун — птах гультаяваты. Рыбу ён бярэ часцей за ўсё здохлую. Дзеля гэтага і трымаецца часта там, дзе гняздзяцца на соснах чаплі. Захопіць пустое гняздо і жыве сярод чапляў. Падбірае рэшткі рыбы на зямлі пад іхнімі гнёздамі. Чаплі носяць і носяць сваім малым рыбу з возера, а што тыя не з'ядуць, што з гнязда ўпала, дастаецца каршуну. Так ён і корміцца каля іх. А птушанят сваіх

выводзіць нават і ў гнёздах варон. Любіць гняздзіцца на гатовым. Мы на яго не крыўдзімся, для нас каршун не шкодны. Хутчэй нават карысны, бо ачышчае берагі ад розных адкідаў.

— Чаму ж ён учора кінуўся на жывога шчупака, ды яшчэ такога вялікага?

Франц Антонавіч пагладзіў свае сівыя вусы.

— Не ўтрымаўся,— сказаў ён, падумаўшы.— Убачыў шчупака на мелкім месцы, рыбіна стаіць нерухома — можа, хворая. Адкуль яму ведаць? Каршун жа не думае, як чалавек, не разважае. Кінуўся, а шчупак, на яго бяду, трапіўся здаровы. Каршун і загінуў.

Рыбак устаў і яшчэ раз зірнуў на мёртвую птушку.

— Цяпер яго можна свінням выкінуць,— сказаў ён, трымаючы каршуна за крыло.— А шчупака прыёмшчыку здалі. Каля шасці кіло заважыў!

Стары пайшоў у двор рыбгаса. Крыло каршуна, якога трымаў рыбак, звісала ўніз і валаклося па зямлі.

## У РЫБГАСЕ

У цэнтры пасёлка стаіць даволі прасторны атынкаваны дом з драўлянымі калонамі перад уваходам. Каля дзвярэй вісіць дошка з паказчыкамі выканання плана рыбнай лоўлі.

Тут знаходзіцца дырэкцыя рыбнай гаспадаркі.

На адной лініі з гэтым домам выцягнуліся між брукаванай дарогай і берагам возера яшчэ некалькі дамоў. Усе яны новыя, яшчэ непафарбаваныя, з бліскучымі цынкавымі дахамі. У гэтых дамах жывуць працаўнікі рыбгаса. Вакол дамоў агароды.

Крыху далей, на другім баку пасёлка, на ўзгорку пад соснамі, знаходзіцца рыбакансервавы завод. Побач з ім высіцца белы будынак халадзільніка.

Забрукаваная роўнымі каменнямі дарога абсаджана, нібы алея, высокімі тапалямі. З аднаго боку дарогі — нізкі бераг возера, з другога — сасновы лес на пясчаных узгорках.

Таполі надаюць дарозе паэтычную задумлівасць. Сонца свеціць скрозь густое лісце, пакрываючы брук трапяткою сеткай залацістых плямак.

Я наведаў завод. Тут працуюць цэхі халоднага і гарачага вэнджання, кансервавы і вязальны. У апошнім вяжуць рыбацкія сеці.

Гарачым спосабам вэндзяць вугра і сяляву, якая пад назвай усім вядомых «капчушак» ідзе ў плоскіх фанерных скрынках у рыбныя магазіны. З цэха халоднага вэнджання і вялення выходзіць не менш папулярная «вобла», ці «таранка»,— вэнджаная і сухая плотка. Кансервавы цэх выпускае ў бляшанках рыбныя кансервы ў тамаце пад назвай «Дробны часцік», якія вырабляюцца з верхаводак, плотак і маленькіх акунькоў.

## РЫБАЦКІ СТАН

З кансервавага завода я пайшоў на бераг возера за дом дырэкцыі.

На зялёнай лугавіне ўваткнуты ў зямлю доўгімі радамі сасновыя калы з развілкамі наверсе. На іх сушацца сеці.

Каля самай вады невялікая пуня. Ад лугавіны да вады пракладзены па пяску драўляны насціл, каб, забіраючы рыбу, можна было пад'ехаць да лодак.

На беразе чакаюць рыбакоў з лову хлапчукі. Яны кідаюць у возера пляскатыя гладкія каменьчыкі. Кожны стараецца кінуць так, каб каменьчык адскочыў ад паверхні вады і рыкашэтам праскакаў па ёй як мага больш

разоў. Час ад часу хто-небудзь з хлапчукоў падымаецца на пагорак і глядзіць з-пад рукі ўдалячынь.

Недалёка ад пуні сядзяць каля вогнішча некалькі рыбакоў. Яны паедуць на начны лоў і чакаюць тут сваёй змены. Сярод іх і Франц Антонавіч.

Я падыходжу да рыбакоў.

Ля вогнішча ідзе гутарка аб перспектывах развіцця рыбнай гаспадаркі на возеры.

— Хутка ў рыбнай гаспадарцы будзе наведзены парадак,— казаў галоўны інжынер рыбгаса, высокі мужчына ў сінім кіцелі, зялёных вайсковых штанах і скураных ботах.— Галоўнае, трэба сачыць, каб правільна, у планавым парадку рэгуляваўся вылаў рыбы і яе ўзнаўленне. Тады і меры па развядзенні рыб, па засяленні нашых азёр новымі відамі, якія мы праводзім, будуць сапраўды эфектыўныя.

— Якія рыбы найбольш характэрны для Нарачы? — пацікавіўся я.

— У Нарачы мы ловім сяляву, вугра, акуня, шчупака, ярша, ляшча, язя, плотку,— адказаў інжынер.— Усе гэтыя рыбы маюць для нас промыславае значэнне. Калісьці, даўно ўжо, была выпушчана ў возера сея, але сустракаецца яна рэдка.

— А што гэта за сея? — спытаў я.— Ніколі не чуў пра такую рыбу.

— Сея падобна на сяляву, калі маленькая,— сказаў Франц Антонавіч.— Толькі ў сялявы плаўнікі беленькія, а ў сеі — чырвоныя.

— Сея — мясцовая назва сіга,— растлумачыў інжынер.— Радзіма гэтай рыбы — Чудское возера. Лічынкі сіга былі прывезены на Нарач упершыню ў 1948 годзе з Волхаўскага рыбаразводнага завода, але промыславага значэння сіг у нас пакуль што яшчэ не набыў. У сеці сіг трапляе адзінкамі. Найбольш характэрная для Нарачы рыба — рапушка, па народнаму — сялява,— гаварыў далей інжынер.— Яна таксама завезена ў Нарач і вель-

мі добра прыжылася ў возеры, размножылася і стала мясцовай рыбай. Належыць гэтая рыба да сямейства ласосевых. Жыве яна не больш дзесяці гадоў. Калі яе завезлі сюды — невядома. Відавочна, умовы для яе тут вельмі спрыяльныя. І для росту вугра ўмовы ў нас таксама вельмі добрыя, бо нідзе няма такіх вялікіх вугроў, як у Нарачы. Яны дасягаюць тут вагі ў чатыры кілаграмы. Вугор у нас вёўся здаўна, але потым пачаў знікаць. Сёлета прывезлі на самалёце паўтара мільёна лічынак і выпусцілі ў Нарач. Выключна многа ў нашым возеры яршоў.

— Мы з гэтымі калючымі разбойнікамі ваюем, як яны ні яршацца,— засмяяўся Ясюня, малады рыбак.

— Ёрш, трэба сказаць, шкодны для рыбнай гаспадаркі. Ён паядае ў вялікай колькасці ікру каштоўных відаў рыбы,— зноў растлумачыў інжынер.— Мы ловім ярша любых памераў, бо на яго ніякіх абмежаванняў няма. Для ярша ў нас ёсць спецыяльныя сеці — мутнікі, бо лавіць яго трэба ў мутнай вадзе. Такія сеці якраз і каламуцяць ваду.

— Нездарма гавораць, што мы любім у мутнай вадзе рыбку лавіць,— зноў засмяяўся Ясюня.

Радзевіч нездаволена зірнуў на яго і зрабіў заўвагу:

— Не перапыняй старэйшых, шалапут. Кінь такую моду.

Пакуль мы размаўлялі ля вогнішча, хлапчукі на беразе кінулі свае гульні і падбеглі да самай вады.

— Едуць, едуць!..— пачуліся ўзбуджаныя галасы.

Сапраўды, да берага набліжаўся маторны баркас «Чайка». Ён цягнуў за сабою караван з трох рыбацкіх лодак першай змены.

## ВЯРНУЛІСЯ З ЛОВУ

У вячэрнім паветры запахла свежай рыбай.

— Вярнуліся!.. Вярнуліся!..— крычалі хлапчукі, акружаючы чорныя прасмоленыя лодкі.

Рыбакі выйшлі з лодак на бераг.

Усе яны ў кепках і ватоўках. На нагах высокія гумавыя боты вышэй каленяў і чорныя цыратовыя фартухі. На некаторых цыратовыя курткі з капюшонамі.

Па драўляным насціле да лодак пад'ехала фурманка, і рыбакі пачалі выгружаць улоў.

Спачатку яны паставілі на фурманку вялізны кораб са шчупакамі, потым такі ж кораб з акунямі і яшчэ адзін — з сялявай.

— Рыбакі разбіраюць рыбу па гатунках адразу пасля лову і здаюць прыёмшчыку на вагу,— сказаў мне галоўны інжынер.

Баркас, які вярнуўся зноў на сярэдзіну возера, прывёў тым часам яшчэ тры лодкі.

Адзін з рыбакоў, дужы і прысадзісты мужчына ў куртцы з капюшонам, стаў перад лодкай, на якой зложаны сеці.

Фартух ён павесіў ззаду, а сам, павярнуўшыся тварам да берага, схіліў галаву і падставіў сагнутую спіну.

Астатнія рыбакі выцягваюць з лодкі і кладуць яму на спіну сеці. Яны робяць гэта павольна і акуратна.

Калі сеці былі выцягнуты, рыбак з мокрым і цяжкім грузам на спіне павольна пайшоў па лугавіне між двух радоў колляў. Два другія рыбакі асцярожна, метр за метрам, знімаюць з яго спіны сеці. Распраўляючы іх і разблытваючы, яны рассцілаюць сеці па зямлі.

У сецях дзе-нідзе пабліскваюць серабрыстыя рыбкі.

За рыбакамі, як гракі за аратым, спяшаюцца басаногія хлапчукі. Яны ўважліва аглядаюць разасланыя сеці.

У кожнага з хлапчукоў палатняная торбачка.

Стараючыся апярэдзіць адзін аднаго, яны спрытнымі пальцамі выбіраюць з ячэек дробную рыбу, якая там завязла, і кідаюць у свае торбачкі.

Гэта іх законная здабыча.

Дайшоўшы да канца першага рада, рыбакі прывязваюць канцы сеці да двух крайніх калоў і, вяртаючыся назад, расцягваюць сець між абодвума радамі.

Рыбак, які нёс сеці, выпрастаў нарэшце спіну і паварушыў плячыма. З яго цыратовай курткі і фартуха струменьчыкамі сцякае вада.

Рыбакі з другой змены моўчкі наглядаюць за ім.

— Здаровы дзядзька! — кажу я.

— Былі калісьці і мы здаровыя,— уздыхнуў стары Радзевіч.— Усяму свой час. Вось толькі невядома, хто нас падменіць.

— Як хто? — здзівіўся я.— Моладзь!

— Нешта не відаць яе ў нас,— запярэчыў Франц Антонавіч.— Самі бачыце, амаль усе нашы рыбакі людзі старыя ды пажылыя, маладых сярод нас няма.

— А я? — высунуўся наперад Ясюня.

— Ты не ў лік, бо адзін.

Стары рыбак павярнуўся да мяне і растлумачыў:

— Адзін толькі ён і пайшоў з нашай вёскі ў рыбакі. Больш ахвотнікаў не знайшлося.

— Вы, дзядзька Пранук, сёння, мусіць, з левай нагі ўсталі ці з цёткай пасварыліся, бо ўсё вам нешта не падабаецца, усім вы нездаволены,— пасмейваўся Ясюня.

— Не любіць моладзь нашу справу,— стаяў на сваім Радзевіч, не звяртаючы ўвагі на словы Ясюні.— Мусіць, не падабаецца ёй рыбацкае жыццё. Усе на працу ў горад імкнуцца, ніхто заставацца дома не хоча. Мы, старыя, век дажываем, а маладыя мала цікавяцца. Няма каго вучыць, няма каму вопыт перадаць, які нам ад бацькоў і дзядоў дастаўся.

Франц Антонавіч змоўк і задумаўся.

— Крыўдуе стары, што пляменнік яго не захацеў быць рыбаком. Працуе пасля арміі ў Паставах шафёрам,— ціха шапнуў мне Ясюня і падняўся з месца.

Рыбакі другой змены ўсталі і, развітаўшыся са мною, пайшлі да сваіх лодак.

Рыбу адвезлі ў халадзільнік. Хлапчукі даўно ўжо зніклі. Лугавіна каля пуні апусцела.

На возеры было ціха і спакойна.

У бледным небе з'явіўся месяц і адлюстраваўся ў такой жа бледнай і нерухомай вадзе.

Запасныя рыбацкія лодкі чарнелі каля светлай паласы пясчанага берага.

## НА БАРКАСЕ

На другі дзень, у восем гадзін раніцы, я пайшоў у пасёлак рыбнай гаспадаркі, каб адтуль на маторным баркасе паехаць у вёску Наносы.

Неба пахмурнае. З возера дзьме вецер, імжыць дробны дожджык. Баркас на якары спакойна пагойдваецца на шэрых хвалях недалёка ад берага.

Неўзабаве з'явіўся матарыст з вёскі Купы.

Да баркаса трэба дабірацца на лодцы. Матарыст узяўся за вёслы, і праз некалькі хвілін лодка стукнулася ў борт баркаса, на якім чорнымі літарамі выведзен надпіс: «Нарач». Мы пералазім на баркас, а пустую лодку бяром на буксір.

Матарыст падымае якар.

З намі едзе мастак з Мінска і пяцёра дзяўчат. Мастак, чалавек ужо немалады, невысокі і лысы, вязе з сабою вялізнае палатно, нацягнутае на раму, мальберт і эцюднік з пэндзлямі і фарбамі. Ён хоча намаляваць з натуры партрэт старога знатнага рыбака Міхала Ролiча, які жыве ў Наносах.

Дзяўчат, работніц з рыбгаса, матарысту трэба пераправіць на супрацьлеглы бераг возера на ўборку сена. Вяртаючыся назад, матарыст заедзе па нас у Наносы.

Баркас хутка аддаляецца ад берага. Хаты пасёлка пад соснамі робяцца ўсё меншыя.

Раўнамерна стукае матор. Хвалі плёскаюцца аб борт, і халодныя пыркі ляцяць нам у твар.

Вада ў возеры цёмная, змрочная, а над цёмнай вадою куляюцца ў шэрым небе белыя чайкі.

Не зважаючы на халодны вецер і пахмурнае надвор'е, дзяўчаты спяваюць, прытуліўшыся адна да адной і хаваючы твары ад ветру. Усе яны цёпла апрануты, у высокіх гумавых ботах.

Вецер нясе над возерам вясёлыя словы прыпевак, а баркас шпарка ляціць па высокіх хвалях, пакідаючы на цёмнай вадзе бурлівую баразну белай пены.

Гадзіны праз дзве мы набліжаемся да вузкай і доўгай пясчанай касы. Яна цягнецца з поўначы амаль да сярэдзіны возера, утвараючы дзве глыбокія затокі.

Усё вышэйшыя робяцца дрэвы на касе, усё больш выразна і ясна вырысоўваецца бераг.

## ВЁСКА НАНОСЫ

Баркас абмінае край мыса. Перад мысам рэдкія зараснікі чароту.

З высокага берага ля Купы, з боку біялагічнай станцыі, каса выглядае вузкай і нізкай. Цяпер я пераконваюся ў тым, што сярэдняя частка касы не такая ўжо вузкая і зусім не нізкая. Гэта — выцягнуты ўзгорак, пакрыты соснамі.

Абмінуўшы мыс, мы бачым невялікую затоку з пясчаным берагам. Тут размясцілася рыбацкая вёска Наносы. Яе рэдкія хаткі раскіданы даволі далёка адна ад

адной сярод пясчаных узгоркаў, між высокіх сосен і кустоў ядлоўцу. Вакол хатак сады і агароды.

Баркас набліжаецца да берага.

Цёмныя хмары шпарка бягуць па небе. Парывісты вецер гоніць іх бясконцымі чародамі.

На пяску ля вады чарнеюць рыбацкія лодкі. Мы адвязваем сваю лодку, бо тут мелка і баркас не можа падысці да берага, і бяромся за вёслы.

Высадзіўшы нас, баркас зноў застукаў маторам. Ён плыве далей, каб адвезці дзяўчат на той бок возера.

Перад вёскай Наносы цягнецца даволі шырокі пляж з амаль белым пяском. Дзе-нідзе растуць крывыя ракіты. На зялёных узгорках высяцца сосны.

Мы шукаем хату знатнага рыбака Міхала Рыгоравіча Роліча.

— Ён жыве на тым канцы, у свайго сына Сымона,— гаворыць нам старая жанчына, якую мы сустрэлі на беразе, і паказвае на адну з хат.

## У ЗНАТНАГА РЫБАКА

Роліча мы засталі дома.

Ён сядзіць у сенцах і вяжа сець. У сенцах цемнавата, але ён, нягледзячы на свае восемдзесят тры гады, працуе без акуляраў.

Ролiч устае з лаўкі, і мы бачым, што гэта — чалавек высокага росту, хударлявы і жылісты. У яго невялікая сівая барада, але валасы на галаве цёмныя. Зоркія і разумныя светла-карыя вочы глядзяць спакойна і ясна.

Рыбачыць Міхал Рыгоравіч з маленства.

— Бацька памёр, калі мне было адзінаццаць гадоў,— гаворыць Роліч.— Да таго часу я дапамагаў яму, а пасля смерці бацькі пачаў працаваць самастойна. Бацька, дзед мой і прадзед таксама былі з маленства рыбакі.

— Вы, мусіць, добра плаваеце? — пытаюся я з павагай.

— Як тапор,— смяецца Роліч.— Пражыў усё жыццё на возеры, а плаваць не навучыўся. Часу не было.

У 1937 годзе, у часы панскай улады, Міхал Роліч быў завадатарам забастоўкі рыбакоў на возеры Нарач. Яго арыштавалі і пасадзілі ў турму як небяспечнага бунтаўшчыка, але пад уздзеяннем народнага руху і пратэсту суд у Паставах вымушаны быў апраўдаць старога рыбака, і Роліч зноў вярнуўся да сваёй любімай справы. У гады гітлераўскай акупацыі Роліч дапамагаў партызанам. Да апошняга часу ён быў брыгадзірам у рыбгасе. Цяпер на яго месцы працуе сын Антон, які заўсёды раіцца з бацькам.

— Сам я не надта пісьменны,— тлумачыць стары рыбак,— а брыгадзіру трэба мець справу з рознымі паперкамі.

Нядаўна стары майстар рыбнай лоўлі пайшоў на пенсію, але па-ранейшаму дапамагае рыбакам сваімі парадамі.

Міхал Роліч жыве то ў аднаго сына, то ў другога. Другі яго сын — Сымон — працуе ў калгасе. Раней бацька жыў у Антона, а цяпер у Сымона, у хаце якога яго і засталі.

Мы выйшлі з хаты. Надвор'е тым часам палепшылася.

Мастак выбраў зручнае месца каля пуні, устанавіў свой мальберт, разлажыў на мокрай траве раскрыты эцюднік з фарбамі і пэндзлямі.

Роліч стаіць на фоне возера ў гумавых ботах і ў жоўтай цыратовай куртцы, у позе, вызначанай мастаком.

На галаве ў яго традыцыйны рыбацкі капялюш-зюйдвестка. У адной руцэ ён трымае сець, у другую мастак сунуў яму люльку.

— Я ж не куру,— мякка ўсміхаецца Роліч.

— Няважна,— гаворыць мастак аўтарытэтным тонам, які не дапускае пярэчанняў.— Люлька патрэбна для каларыту.

## «ГРАЧУНЫ» ЦІ «КАГАРКІ»

Пакуль мастак піша партрэт Роліча, я размаўляю са старым рыбаком.

Мастак даў на гэта згоду. Ён сказаў, што гутарка яму не перашкаджае. Наадварот, чалавек не будзе сумаваць, і твар яго захавае ажыўлены выраз.

— Толькі позы змяняць нельга,— заклапочана папярэдзіў мастак.

Рыбак добрасумленна стараецца не парушаць гэтай умовы і не варушыцца.

— Ці многа ў вас тут птушак? — пытаю я.

— Ёсць у нас і касачы, і глушцы, і розныя качкі,— ахвотна адказвае стары.— Але найбольш на возеры чаек. Раней яны гняздзіліся ў самым канцы касы. Зробяць ямку-копачку ў пяску і кладуць стракаценькія яйкі. Часам у буру вада залівае пясок і змывае яйкі ў возера, а яны ўсё роўна кладуць на тым жа месцы новыя. Чаек у нас называюць «грачунамі».

Мне ўспомнілася, што ў вершах, прысвечаных Нарачы, нярэдка ўжываецца слова «кагарка», як мясцовая назва чайкі.

— Гэта, мабыць, толькі ў вашай вёсцы так называюць чаек? — пытаюся я.

— Не,— пярэчыць Роліч.— «Грачунамі» называюць іх не толькі ў Наносах, але і ўсюды навокал.

— А што гэта — «кагарка»?

— Не ведаю. Ніколі не чуў такой назвы.

— Хіба чаек не называюць «кагаркамі»?

— Не. Чайкі, і малыя, і вялікія, называюцца ў нас «грачунамі»,— настойліва паўтарае рыбак.

Падумаўшы трохі, ён дадае:

— Можа, гэта на Мядзелі так гавораць? Я дапускаю і такую магчымасць.

— Ёсць яшчэ ў нас і кнігаўка. Маленькая, з чубікам на галоўцы,— гаворыць ён далей.— Яйкі яна кладзе таксама ў копцы, але не ў пяску, а на лузе, на балоце. Шмат у нас і чапляў, асабліва ля Нарачанкі. Лятаюць яны ўсюды, але гняздзяцца там, на рэчцы. Стаіць чапля ў вадзе, звычайна на глыбіні з паўметра, і пільнуе рыбу цэлымі гадзінамі.

Павольна, не спяшаючыся, расказвае Роліч пра птушак на возеры, а мастак тым часам працуе над партрэтам.

Іншы раз і ён устаўляе сваё слова ў нашу гутарку і пры гэтым уважліва ўглядаецца ў твар рыбака, крытычна параўноўваючы яго жывыя рысы з тым, што ўзнікае з-пад пэндзля на палатне.

## ШКОДНАЯ ЦІ КАРЫСНАЯ ЧАЙКА?

З такім пытаннем звярнуўся я да Міхала Роліча.

Рыбак падумаў і сказаў:

— Чайкі не шкодныя. Рыбу яны бяруць мала. Бяруць больш хворую, якая трымаецца на паверхні, ці здохлую. Адной, дзвюх маленькіх рыбак чайцы хапае на цэлы дзень.

— А як яна ловіць рыбу?

Рыбак растлумачыў і гэта.

— Чайка бярэ рыбу дзюбай,— гаворыць ён,— і таму толькі дробную. Буйнейшую яна не можа схапіць, як гэта робяць арланы і каршуны, бо тыя бяруць рыбу не дзюбай, а кіпцюрамі сваіх дужых лап. Нам, рыбакам, чайка не шкодзіць. Наадварот, яна працуе як санітар.

Чайка не ныpae i таму не можа ганяцца за рыбай пад вадою. Яна можа ўзяць з налёту, з паветра толькі тое, што плавае на паверхні. Злавіць здаровую рыбіну пад вадою ці перашкодзіць ходу рыбных касякоў чайкі не могуць. Чайкі і крачкі нам, рыбакам, нават дапамагаюць, бо паказваюць ход сялявы пад вадою. Яны звычайна ляцяць за касяком сялявы. Па паводзінах чаек мы мяркуем аб надвор'і. Калі чайкі адлятаюць ад нас за Кабыльнік, на возера Швакшты, то будзе надвор'е дрэннае, вецер будзе і дождж. Калі ж чайкі прылятаюць сюды, на Нарач, то, значыць, будзе добрая пагода. Чайкі прылятаюць да нас у добры час. Чаму яны так робяць, не ведаю, толькі ведаю, што гэта так.

Гняздзяцца чайкі і тут, і там, але больш на возеры Швакшты. Знаходзіцца гэтае возера кіламетраў за сем ад Купы, за Кабыльнікам. Ісці трэба на Глыбокі ручай.

— Гэта, я чуў, былы хутар?

— Так, раней гэта быў хутар. Там, за панскай уладай, жыў карчмар. Прадаваў гарэлку, скупляў рыбу. Цяпер гэтае месца разбудавалася.

— Як трэба правільна гаварыць: Швакшты ці Швакшта? — пытаюся я, бо чуў, як адна дзяўчына ў Кабыльніку казала: «На Швакшце».

— Трэба казаць — Швакшты,— удакладніў Роліч.— У нас гавораць: «Паехаў на Швакшты» ці «Вярнуўся з Швакштаў». Яшчэ кажуць: «Швакшцянскае возера», але найбольш проста — Швакшты. Вось як.

— Адкуль жа ўзялася такая назва? Што яна азначае?

— Не ведаю. Мусіць, ад вёскі. Там, між Кабыльнікам і Глыбокім ручаём, ёсць вёска Швакшты. То, мусіць, ад яе. Ёсць непадалёку другое возера, называецца Папоўцы. Мусіць, ад вёскі Папоўцы і возера так называецца. Возера Мядзель называюць часам Слуцкое возера, бо там ёсць вёска Слукі. Так і кажуць: «Паехалі на Слуцкое», гэта значыць, на возера Мядзель.

Пасля гэтага невялікага філалагічнага адступлення мы вярнуліся зноў да пытання аб чайках.

— А некаторыя лічаць, быццам чайкі знішчаюць многа рыбы,— сказаў я.

— Гэта няпраўда.— Роліч памаўчаў.— Не,— пераканана паўтарыў ён.— Чайкі не шкодныя. Яны карысныя і для рыбнай лоўлі, і для сельскай гаспадаркі.

З тым жа пытаннем я звярнуўся потым і да Лёні. Студэнт пацвердзіў думку старога рыбака.

— Даследаванне,— сказаў ён,— паказвае, што чайка знішчае шмат насякомых, шкодных для сельскай гаспадаркі, а таксама і мышэй. Чайка любіць разнастайны корм. Сваіх птушанят яна выкормлівае такімі насякомымі, як майскія жукі, конікі, мядзведкі, хлебныя жужаліцы, чарапашкі, соўкі, якіх яна знаходзіць на палях. Пры гэтым чайка раскопвае часам зямлю. На гняздоўі чаек знаходзілі часта ў вялікай колькасці хіцінавыя абалонкі майскіх жукоў. З вадзяных насякомых чайка знішчае плывунцоў, вадалюбаў і вадамераў.

Праз некаторы час пасля гутаркі з Ролічам і Лёнем мне давялося пазнаёміцца з навуковымі матэрыяламі Чарнаморскага запаведніка на Украіне, у вусці Дняпра, з якіх відаць, што чайкі сапраўды знішчаюць у вялікай колькасці насякомых, шкодных для сельскай і лясной гаспадаркі. Назіранні ў запаведніку, дзе чайкі і крачкі складаюць каля паловы ўсіх птушак, паказалі, што яны выкормліваюць сваіх малых амаль выключна гэтымі насякомымі. За чатыры месяцы чайкі і крачкі знішчаюць на ўзбярэжжы, плошчаю каля чатырох тысяч квадратных кіламетраў, да тысячы чатырохсот тон насякомых.

Ёсць адзін вельмі шкодны жук са смешнай назвай — кузька. На працягу двух тыдняў у перыяд малочнай і васковай спеласці жыта кожны такі жук з'ядае да васьмі грамаў збожжа. Але якраз у гэты час чайкі знішчаюць да васьмісот мільёнаў штук гэтых небяспечных для сельскай гаспадаркі жукоў. З прыведзеных лічбаў

відаць, якую вялікую карысць прыносяць чайкі ў справе аховы ўраджаю.

На чайку, праслаўленую паэтамі белакрылую птушку блакітных водных прастораў, я пачаў цяпер глядзець зусім другімі вачыма — як на памочніка чалавека.

## ЗІМНІ ЛОЎ

Неўзабаве неба зноў пацямнела, пайшоў дождж.

Мастак неахвотна адклаў пэндзлі. Пачухаўшы патыліцу і паглядзеўшы на хмары, ён перанёс свае прылады ў пуню. За ім пайшлі і мы, каб пераседзець там дождж.

— Хіба гэта лета? — бурчыць мастак.— Кожны дзень холад, кожны дзень вецер і дождж. І адкуль толькі бярэцца столькі вады?

Сапраўды, лета надзвычай халоднае і дажджлівае. Гэтак жа было і ў мінулым годзе.

— Па радыё зноў перадавалі дрэнны прагноз,— безнадзейным тонам сказаў мастак.

Ён зірнуў на неба, уздыхнуў, падняў каўнер і ніжэй насунуў на лоб свой высокі зліняльі капялюш.

Роліч усміхнуўся:

— Прагноз дрэнны, дык ліха з ім, абы пагода добрая!

— Калі ж будзе пагода? — пацікавіўся я.

— Яшчэ дзён шэсць будзе дождж,— упэўнена адказаў стары.— Потым установіцца сухое, яснае надвор'е.

— Адкуль вы ведаеце?

— Па зіме можна меркаваць. Колькі было снежных дзён зімою, столькі ж будзе дажджлівых дзён улетку. Колькі было сухіх марозных дзён зімою, столькі будзе ўлетку сухіх гарачых дзён. Нам трэба ведаць надвор'е і ўлетку, і ўзімку.

— Хіба вы зімою таксама ловіце?

— А як жа? І не толькі на Нарачы. Мы рыбачым на усіх навакольных азёрах. Я і на Свіры лавіў, і на Глыбокім. На Свіры цяпер два гады ўжо як не ловім. Там цяпер у нас перадышка, каб рыба не перавялася, а тады зноў нападзём, як тыя «грачуны».

Расказвае Роліч не спяшаючыся, і я, седзячы на берване ў пуні, запісваю тое, што ён кажа, амаль даслоўна.

— На Глыбокім сёлета зіма была для нас вельмі цяжкая. Многа выпала снегу. Калі снег растаў, лёд апынуўся пад вадою. Я там з брыгадай лавіў рыбу. Без коней проста не было сілы цягнуць тоню. Прыехаў з нашага рыбгаса прыёмшчык, а рыбы няма. Тады прыёмшчык пайшоў у радзільны дом, ён тут паблізу, прасіць коней, там іх два было. Загадчыца яму адмовіла, бо ён неяк раней машыны ёй не даў. Што рабіць? Думаю, пайду сам. Пайшоў да дакторкі. «Прыйшоў,— кажу,— па ратунак». А яна гаворыць: «Вы мне машыны не далі, я вам коней не дам». Я кажу: «Я — рыбак нарачанскі. Да прыёмшчыка і да яго з вамі спраў я дачынення не маю». Яна сваё: «Чаго вам, Роліч, трэба? У мяне коней няма». Тады я пытаюся: «Вам трэба для хворых рыбкі?» Даў ёй дзесяць кіло ляшчоў. «Калі лоў скончым,— кажу,— яшчэ дам». Яна мне коней дала. Я наняў яшчэ дзесяць чалавек. Нас, нарачанцаў, чацвёра і нанятых дзесяць. Узяліся за тоню. А тут як даў халодны дождж і снег! Нас усіх да апошняй ніткі прамачыла. Мала мы не кончылі абсякаць, знаеш, як распагодзілася пад вечар, калі сонца заходзіла. Мы цягнем ды цягнем, але ж нічога няма. Няма рыбы. Стаў я смутны. Коней узяў, людзей наняў, і ўсё, выходзіць, дарма... Засталося ў вадзе якіх дзесяць сажняў невада, не болей. Тут і пайшла рыба. Выцягнулі мы тон шэсць. Гэта з адной тоні, ляшчоў! Аплаціў я і коней, і людзей. Тут якраз і дырэктар прыехаў. «Добра,— кажа,— зрабіў!» Добра, думаю, што вылавіў!

— А чаму спачатку рыбы не было? — спытаў я.

— Там быў камень,— адказаў Роліч.— Камень невад і парваў. Ляшчы, што былі зверху, уцяклі. Каб не гэты камень, узялі б мы яшчэ тоны тры.

Рыбак задумаўся.

— Вельмі цяжка нам было,— казаў ён далей.— Лёд грубы, зверху вада, трэба нам плюхацца ў халоднай вадзе. Рукі і ногі нямеюць.

— Нялёгкая справа рыбацкая,— паспачуваў я.

— Нялёгкая,— пацвердзіў рыбак,— але я не прамяняю яе ні на якую іншую!

Ён усміхнуўся і дадаў:

— Ды і наогул лёгкіх спраў, сам знаеш, няма. Калі справа сур'ёзная ды патрэбная, ды калі ты яе любіш, то яна здаецца табе не такая ўжо і цяжкая.

Пакуль Роліч расказваў пра зімні лоў на возеры Глыбокім, дождж перастаў. Мы выйшлі з пуні.

З'явілася сонца.

— У Глыбокім найбольш ляшчы,— закончыў Роліч.— Лешч тлусты, але васцяваты. Часта бываюць ляшчы па пяць-шэсць кіло.

Мастак хацеў узяцца зноў за свае пэндзлі і фарбы, але тут прыйшоў баркас.

Мы развіталіся з Міхалам Рыгоравічам і селі ў лодку.

На возеры была моцная гайданка.

Вялікія хвалі з шумам біліся ў барты баркаса.

Калі з'яўлялася на хвіліну сонца, вада рабілася сіняя. Неўзабаве сонца знікла зусім, і вада стала цёмнасвінцовая, нібы густая і непранікальная.

Шэрае неба нізка вісела над змрочным і пеністым возерам.

Нам усё ж такі пашанцавала.

Пакуль мы плылі на баркасе, неба хоць і хмурылася, але дажджу не было.

Калі ж мы прыплылі ў пасёлак і былі ўжо каля самага дому, пайшоў моцны дождж.

Бура разбушавалася, калі мы былі ўжо дома.

## ДЗІЎНАЯ РЫБА

Сёння я ўпершыню пазнаёміўся з дзіўнай і цікавай рыбай — рачным вугром.

Малады рыбак Ясюня паказаў мне злоўленага ім вялікага вугра. Ён выцягнуў гэтую рыбіну з палатнянага мяшка і паклаў на зямлю.

— На змяю падобны,— сказаў Ясюня.

Сапраўды, вугор амаль нічым не нагадваў рыбу.

Я схіліўся над дзіўнай рыбінай і пачаў аглядаць яе з усіх бакоў. Зверху вугор быў сінявата-цёмнага, амаль чорнага колеру, а з бакоў і знізу жаўтавата-белы. У яго даволі вялікія мутныя цёмна-сіняватыя вочы. Рот поўны маленькіх, вострых зубоў. Вузкія, невялікія шчыліны жабраў знаходзяцца каля грудных плаўнікоў. Яны могуць доўга захоўваць вільгаць, і гэта дае магчымасць вугру вылазіць з вады на бераг і прапаўзаць па зямлі даволі значныя адлегласці. Плаўнікі ў вугра кароткія, адзін вузкі плаўнік аблямоўвае ўсю заднюю частку цела, зліваючыся ў адно цэлае з хвастом. Даўжынёю гэты вугор быў каля двух метраў, а таўшчынёю з руку.

— Больш трох кіло заважыць,— задаволена сказаў малады рыбак.

Ясюня — здаровы бялявы хлопец з тоўстымі губамі, з прастадушным і адначасова хітраватым румяным тварам. На галаве ў яго маленькая кепачка, на пакатых плячах чорны цыратовы плашч. Рыбацкай справай Ясюня займаецца чацвёрты год.

Вугор заварушыўся і, тыцкаючыся галавою ў зямлю, шпарка папоўз па траве ў напрамку да возера. Рухаўся ён звіваючыся, як змяя.

— Бачылі, які спрытны? — засмяяўся Ясюня.

З дзіцячай усмешкай ён паказвае мне на рухі вугра, як вопытны ўтаймавальнік у цырку на фокусы свайго любімага выхаванца.

Калі вугор адпоўз ад нас крокаў на пяць-шэсць, Ясюня схапіў яго пальцамі за шыю і схаваў у мокры мяшок.

— Скура ў яго надта моцная,— гаворыць Ясюня, выціраючы рукі аб траву.— Мне мой дзед казаў, што даўней сяляне рабілі з яе рамяні, ды яшчэ якія трывалыя! Імі нават прывязвалі бічы да цапільна. Такімі цапамі смела можна было малаціць.

Я ведаў, што рачны вугор жыве ў вадаёмах, якія звязаны з Атлантычным акіянам. На Беларусі ён вядзецца ў Нёмане і Дзвіне з прытокамі і ў азёрах, якія маюць сувязь з Балтыйскім морам, у тым ліку і ў возеры Нарач.

Большую частку свайго жыцця вугры праводзяць у прэснай вадзе, у рэках і азёрах, а для нерасту плывуць у Атлантычны акіян.

З возера Нарач яны плывуць па рацэ Нарачанцы ў раку Вілію, адтуль у Нёман, па Нёману ў Балтыйскае мора і — у акіян. Так яны дабіраюцца да Саргасава мора, якое знаходзіцца каля берагоў Амерыкі, між Бермудскімі і Багамскімі астравамі. Гэта — самае цёплае месца ў Атлантычным акіяне. Тут, на глыбіні каля тысячы метраў, вугры нерастуюць і пасля гэтага гінуць. З ікры развіваюцца плоскія, празрыстыя лічынкі, падобныя на вузкі, выцягнуты лісток вярбы. Тое, што яны празрыстыя, а значыць, і непрыкметныя, дапамагае лічынкам хавацца ад ворагаў. Лічынкі трапляюць у цёплае марское цячэнне Гальфстрым, якое нясе іх на паўночны ўсход, да берагоў Еўропы. Гэтае падарожжа працягваецца тры гады. Па дарозе лічынкі трацяць паступова сваю плоскую форму, пачынаюць выцягвацца, акругляцца і ператвараюцца нарэшце ў маленькіх маладых вугроў, пакуль што ўсё яшчэ празрыстых.

Вясной, на чацвёрты год свайго існавання, маладыя вугры ідуць з мора ў рэкі. Самцы застаюцца ў вусцях рэк, а самкі падымаюцца ўверх па плыні. У Нарачы самцоў вугра няма, адны толькі самкі. Самцы трымаюцца ў вусці Нёмана.

У рэках і азёрах вугры жывуць, пакуль не дасягнуць дзесяці гадоў. Пасля гэтага яны ідуць на нераст у акіян.

— Быў такі выпадак,— сказаў Ясюня,— калі на рацэ Нарачанцы млын спыніўся. Не мог працаваць, столькі вугроў ішло. Усю ваду ў рацэ запрудзілі.

Перад сваім вялікім падарожжам у Атлантычны акіян вугор перастае есці. Спіна ў яго цямнее, а ніжняя частка цела святлее, вочы павялічваюцца ў памерах.

Відаць, вугор, якога злавіў Ясюня, збіраўся ў сваё далёкае і апошняе падарожжа.

З адной рэчкі ў другую вугры перабіраюцца часам і па зямлі, па мокрай траве, па раўчуках і канавах.

— Куды яны толькі не запаўзаюць,— гаворыць Ясюня.— Неяк, пасля дажджу ўночы, мы знайшлі вугра на пакрытай мохам страсе нашага хлеўчука. Я тады яшчэ быў малы, але добра гэта памятаю. Мы яго забілі палкай і засмажылі. Надта ж быў тлусты.

Даўней вугроў лавілі на росным лузе і ў канавах дзесяткамі і нават сотнямі, калі яны перабіраліся па зямлі з рэчкі ў рэчку.

Я расказваю маладому рыбаку пра далёкія міграцыі вугра, пра асаблівасці жыццёвага цыкла гэтай незвычайнай рыбы, пра яе дзіўныя паводзіны, але Ясюню больш цікавіць чыста практычны бок справы — усё, што непасрэдна звязана з працэсам лоўлі.

— Калі вы яго злавілі? — спытаў я.— Уночы?

Ясюня прамаўчаў. Ён зрабіў выгляд, быццам не пачуў майго пытання.

Мне ўспомнілася, што расказваў пра лоўлю вугра Міхал Роліч.

— Вугроў,— казаў ён,— трэба лавіць уночы. Асабліва, калі бура добрая, калі бліскавіца шугае і пярун грыміць, тады і трэба лавіць. У навальніцу вугор моцна гуляе, паверсе ходзіць. Я ў такую ноч, здаралася, па трыста кіло вугроў здабываў, а ў добрую пагоду зловіш аднаго, двух, трох. Удзень яны ляжаць на дне, закапаўшыся

ў глей ці ў пясок, а ўночы дзейнічаюць. Абавязкова трэба ў буру на вугроў ехаць, і толькі ўночы.

Я пачаў распытваць Ясюню, дзе і як здабыў ён такога вялікага вугра: удзень ці ўночы, у добрую пагоду ці ў буру? Але малады рыбак зноў ухіліўся ад адказу.

Ясюня наогул не любіць расказваць пра свае рыбацкія справы. Гэта — не Роліч, які не робіць з іх ніякага сакрэту і ахвотна тлумачыць кожнаму ўсё, чым той цікавіцца. Стары любіць перадаваць людзям невычэрпны запас сваіх ведаў і жыццёвага вопыту.

Замест адказу Ясюня паказаў рукою на востраў, які знаходзіцца недалёка ад берага:

— На гэты востраў прылятаюць чаплі, але гняздзяцца яны не тут, а на тым баку возера, каля рэчкі Нарачанкі.

Востраў доўгі, выцягнуты. На ім растуць сярод густога хмызняку некалькі сосен. Вакол вострава зараснікі трысця і чароту.

— Чулі, што калісьці здарылася на гэтым востраве? — пытае Ясюня.

— Не.

— Тады паслухайце.

І малады рыбак расказаў мне пра здарэнне, якое адбылося на востраве.

## ЗДАРЭННЕ НА ВОСТРАВЕ

— Гэта было яшчэ пры панскай уладзе,— пачаў Ясюня.— Я тады быў зусім малы. Надумаў неяк адзін пан з маёнтка каля Нарачы трымаць на востраве цялят і авечак без дагляду, без пастуха. Вады хапае, трава тут добрая, сакавітая, цяляты і авечкі нікуды ўцячы не могуць, дык няхай сабе пасвяцца круглыя суткі ўсё лета аж да восені... Вось і пераправілі на плыце цялят

ды авечак па загаду пана на востраў. Ходзяць яны сабе па востраве ды скубуць траву, а пан задаволена рукі пацірае, выхваляецца: «Вось,— кажа,— якую я штуку прыдумаў. Няхай усе гаспадары з мяне прыклад бяруць». Праз тыдні два ці тры выпрашыў пан паехаць на востраў, паглядзець, як там цяляты ды авечкі без пастухоў на волі, пад адкрытым небам, гадуюцца. Сеў ён у лодку і паехаў. Прыехаў на востраў, бачыць — нікога няма. Што такое! Не знайшоў пан ніводнага цяляці, ніводнай авечкі. Адны толькі косці бялеюць у траве, а на пяску ўсюды воўчыя сляды. Схапіўся пан за галаву— столькі жывёлы загубіў нізашто! Ваўкі, значыць, пранюхалі, што на востраве цяляты ды авечкі, ці, можа, пачулі, як яны мыкаюць і бляюць, пераплылі на востраў ды ўсіх і зарэзалі... Так таму пану і трэба! Толькі шкада бедных авечак ды цялят, што загінулі марна, без карысці для людзей,— закончыў Ясюня.

Ён зірнуў на востраў, які выразна вырысоўваўся на фоне светлай вады і яснага неба, і растлумачыў:

— Ваўкі, бачыце, добра плаваюць. Ад берага да вострава з кіламетр будзе, калі не болей. Вада для ваўкоў не перашкода, а пан пра гэта не падумаў. Раней тут ваўкоў многа было, цяпер паменшала.

Ясюня змоўк і падышоў да веласіпеда, што стаяў каля дрэва. Узяўшы мяшок з вугром, ён сеў на свой «ровар» і паехаў у Купу.

## ПА ДАРОЗЕ НА ФЭСТ

— У нядзелю будзе вялікі фэст,— сказаў мне неяк Франц Радзевіч.

— Які гэта фэст? — здзіўлена спытаў я.— У касцёле?

Твар старога рыбака расплыўся ў вясёлай, задаволенай усмешцы.

— Які там касцёл! Свята песні, вось які фэст! Мы адзначаем яго штогод у гэты час. Народу будзе многа, адусюль папрыязджаюць! Трэба і вам пабываць.

Пра свята песні на Нарачы я чуў яшчэ ў Мінску.

Яно праводзіцца па мясцовай традыцыі, якая ўстанавілася пасля вайны, у першую нядзелю пасля першага ліпеня і прысвечана вызваленню Беларусі ад гітлераўскіх акупантаў.

У 1956 годзе гэты дзень прыпаў на восьмае ліпеня. Да свята заставалася яшчэ тры дні.

Нарэшце жаданая нядзеля надышла.

На фэст я паехаў разам з Францам Антонавічам і Ясюнем на грузавіку рыбгаса.

Па дарозе ўздоўж берага Нарачы з усіх канцоў ехалі на свята калгаснікі з навакольных вёсак — з Купы, Сцепянёва, Урлікаў, Варанцоў, Антонісберга, Пасынкаў.

Адна за адной ішлі па гладкім бруку машыны, поўныя людзей.

Усе былі ў добрым настроі. З машын чуліся вясёлыя песні, гукі гармоніка.

На шматлікіх фурманках сядзелі пажылыя жанчыны і дзеці, прыбраныя па-святочнаму.

Па краях дарогі чародкамі спяшалася на веласіпедах моладзь. Хлопцы былі ў новых касцюмах, дзяўчаты ў прыгожых сукенках з дарагіх матэрыялаў, пашытых па апошняй модзе.

— Тавараў розных панавезлі туды нямала,— сказаў Радзевіч.— Будзе што людзям купляць.

Ясюня засмяяўся.

— Ты чаго? — скоса зірнуў на яго стары.

— Так, нешта ўспомніў,— адказаў Ясюня, шырока ўхмыляючыся.

— Вы яго толькі слухайце, гэтага манюку,— сказаў Радзевіч.— І адкуль толькі ў яго бяруцца ўсякія байкі ды плёткі.

Ясюня і сапраўды, як я ўжо не раз пераканаўся, вельмі любіць апавядаць розныя гісторыі. Іх у яго заўсёды багата ў запасе.

Павярнуўшыся да мяне, хлопец пачаў расказваць, ледзь стрымліваючы смех:

— Летась, напярэдадні свята, прыслалі сюды з Маладзечна машыну з яйкамі для крамы і сталовай. Ды, відаць, шафёр, як кажуць, на корак наступіў, бо машына заехала ўбок і перакулілася, а яйкі валіліся ў канаву. Ой, што там было! Добрая яечня атрымалася! Поўная канава свежых яек пабітых. А па той дарозе мала хто ездзіць. Шафёр пакруціўся каля машыны, бачыць, што сам нічога не зробіць, і пайшоў у вёску па дапамогу, ды і застаўся там да раніцы. А да канавы тым часам збегліся адусюль сабакі, накінуліся на пачастунак, а за імі — кошкі. Бабы прыйшлі з вёдрамі чэрпаць бясплатную «яечню» для свіней. Нават вароны пазляталіся пакаштаваць. Пад вечар, калі добра сцямнела, адкуль толькі ўзяліся — і вожыкі, і лісіцы, і барсукі, і ўсякае іншае лясное звяр'ё збеглася. Усе на «яечню» накінуліся. Да раніцы нічога ад яе не засталося, усё падчысцілі.

Ясюня засмяяўся:

— Набраўся той шафёр бяды! Плакалі яго грошыкі! Васемнаццаць соцень яек пабітых — не жарты!

Радзевіч спахмурнеў.

— Чорт яго бяры! — прабурчаў ён сярдзіта.— Хай скажа дзякуй, што шыю не зламаў і пад суд не трапіў. І нічога тут смешнага няма. Такіх шафёраў да руля і падпускаць нельга...

— Годзе ўжо вам,— усё яшчэ смеючыся, лагодна перапыніў старога Ясюня.— Не ўсе шафёры такія.

— Вядома, не ўсе,— пацвердзіў усё яшчэ нездаволена Франц Антонавіч.— Наш Міхалка і ў рот не бярэ.

Радзевіч хацеў сказаць яшчэ нешта, але машына мінула вёску Мікольцы і пад'ехала да таго месца, дзе заўсёды адбываецца свята песні.

Мы саскочылі з грузавіка.

На беразе возера было поўна народу. Сюды прыехала шмат гасцей з суседніх раёнаў, з Маладзечна, з Мінска і нават з Літвы.

## СВЯТА ПЕСНІ

На высокім зялёным кургане, які пануе над бязмежным прасторам Нарачы і над усім наваколлем, высіцца помнік-абеліск.

На помніку надпіс:

1941—1945
СЛАВА НАШАМУ ВЯЛІКАМУ НАРОДУ,
НАРОДУ-ПЕРАМОЖЦУ!
ВЕЧНАЯ СЛАВА
ПАРТЫЗАНАМ І ПАРТЫЗАНКАМ,
ЯКІЯ АДДАЛІ СВАЁ ЖЫЦЦЁ ЗА СВАБОДУ
І НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ НАШАЙ РАДЗІМЫ

Перад абеліскам на шырокай пляцоўцы — сцэна з памостам-эстрадай. Да абеліска вядуць з абодвух бакоў па схілах кургана каменныя лесвіцы. Крыху ніжэй — рады лавак для гледачоў. Тут размясціліся дзеці. За імі стаіць вялікі натоўп. На лугавіне каля кургана цэлае мора галоў.

Каля шматлікіх часовых ларкоў, пабудаваных напярэдадні свята, ідзе бойкі гандаль рознымі рэчамі і прадуктамі. З Маладзечна і Мінска сюды прывезлі шмат усялякіх тавараў.

Тут прадаюцца і некаторыя мясцовыя вырабы — пернікі з яркай глазураванай афарбоўкай, з белымі, ружовымі і зялёнымі ўзорамі. Пернікі маюць форму рыбы, мядзведзя, каня.

За ларкамі стаяць калёсы з узнятымі ўгору аглоблямі, грузавыя машыны, ляжаць складзеныя ў кучу веласі-

педы. Яны ў гэтай мясцовасці асабліва распаўсюджаны. На іх ездзяць часта і старыя кабеты з кашолкамі, у якіх ляжаць яйкі ці сядзяць гарластыя пеўні са звязанымі крыламі і нагамі.

Свята пачалося ў адзінаццаць гадзін.

— На гэтым месцы быў вялікі бой партызанаў з фашыстамі,— сказаў мне Радзевіч.— Тут пахаваны партызаны, якія загінулі ў тым баі.

Хлопцы і дзяўчаты ў нацыянальным адзенні ўскладаюць да падножжа абеліска вянкі і кветкі. Гучыць поўная смутку і жалобы мелодыя «Рэквіема» Шапэна.

Вялікі шматтысячны натоўп некалькі хвілін стаіць моўчкі, зняўшы шапкі.

Потым пачынаюцца выступленні калектываў мастацкай самадзейнасці. Адзін за адным выходзяць на сцэну хоры, аркестры, танцоры і спевакі.

У яркім, шматкаляровым адзенні ўдзельнікі канцэрта складаюць адно прыгожае, маляўнічае цэлае, цудоўнае відовішча пад сінім небам у натуральным амфітэатры на зялёным схіле кургана.

Звонка і весела гучаць над Нараччу народныя інструменты — гармонікі і скрыпкі, жалейкі і цымбалы. Круцяцца, як віхор, рознакаляровыя спадніцы дзяўчат, віюцца ў паветры светлыя косы з яркімі стужкамі.

Лунаюць над возерам песні пра мір, пра дружбу і каханне, пра шчаслівае жыццё і вольную працу.

Высока ў небе, над абеліскам, над вялікім і шумным натоўпам людзей, праляцеў, шырока раскінуўшы магутныя крылы, арлан-белахвост.

Мы праводзім яго вачыма.

— Гэта — добрая адзнака,— задаволена шапнуў Франц Антонавіч.— Гэта — на шчасце, на дабро!

Да позняга вечара зацягнулася народнае гулянне на беразе возера. І да самага вечара кружылі над сінімі водамі Нарачы белакрылыя чайкі, нібы падзяляючы святочную радасць людзей.

## НАВАЛЬНІЦА

Надвор'е на возеры няўстойлівае. Яно часта змяняецца.

То цёпла, то холадна. То свеціць сонца, то пахмурна. То ціха, то рэзкі вецер.

І ў адпаведнасці з надвор'ем, гэтак жа часта, змяняе свой колер і возера.

То яно блакітнае, то цёмна-сіняе, то зялёнае, то шэрае, сярдзітае і непрыглядная.

Сёння з раніцы свяціла сонца. Усё, здавалася, прадказвала добрую, устойлівую пагоду да самага вечара, і я вырашыў паплыць да вялікага абрыву за Сцепянёва.

Байдарка ціха пагойдваецца на блакітнай спакойнай вадзе.

Раптам у ясным небе з'явіліся белыя воблачкі. Іх становіцца ўсё больш.

Сярод белых воблачкаў можна цяпер заўважыць і цёмна-шэрыя.

Сонца схавалася.

Дзесьці ўдалечыні пачуліся глухія раскаты грому. Неўзабаве яны наблізіліся, зрабіліся больш гучныя і працяглыя.

Птушкі недзе пахаваліся. Няма над возерам ні ластавак, ні чаек.

Аб тым, каб плыць куды-небудзь, не варта і думаць. Я выцягнуў байдарку на бераг і схаваў яе ў пуні.

Неба тым часам зусім пацямнела, завалаклося цяжкімі і змрочнымі хмарамі. Яны праглынулі апошні невялікі прасвет і цяпер непадзельна пануюць над возерам.

У паветры павеяў аднекуль лёгкі струменьчык холаду.

Дрэвы зашамацелі.

Наляцеў нечакана шалёны парыў ветру.

Сосны пахіснуліся і застагналі. Па зямлі імкліва пакаціліся, абганяючы адна адну, сасновыя шышкі.

Суціхнуўшы на хвіліну, вецер накідваецца на дрэвы з новаю сілай, яшчэ больш злосна і непрымірыма.

Пайшоў дождж, спачатку быццам неахвотна, невялікі і рэдкі, асобнымі кроплямі. Потым усё часцей і мацней.

І раптам страшэнны ўдар скалануў неба і зямлю.

Змрок згусціўся.

Цёмнае неба над возерам прарэзала ад краю да краю доўгая і няроўная агністая лінія маланкі. За ёю бліснула другая, трэцяя.

Гром грымеў амаль безупынна, не змаўкаючы ні на хвіліну.

Дождж перайшоў у лівень.

Нядаўна яшчэ лагоднае, блакітнае возера зрабілася змрочным, цёмна-шызым, пакрылася высокімі, сярдзітымі хвалямі, якія бясконцымі радамі, з шумам і грукатам кідалі і кідалі на бераг свае белыя пеністыя грабяні.

Шумелі патокі вады, якія ліліся цяпер з неба суцэльнай заслонай. Шумеў лес, шумела возера. Хісталіся, гнуліся і скрыпелі сосны.

Парывы ветру, адзін аднаго мацней, зрывалі лісце з кустоў і дрэў, то ярасна падкідаючы яго высока ўгору, то гонячы між ствалоў па мокрай зямлі. Уся дарога ўздоўж берага была ўсыпана зламаным голлем.

Над хвалямі змагалася з ветрам адзінокая чайка, але вось і яна знікла кудысьці.

З жудасным трэскам і грукатам грымнула на пясок вялікая разгалістая сасна, што расла на самым беразе. Навальніца вырвала яе з карэннем, і вось ужо цераз вершаліну паваленага старога дрэва перакочваюцца хвалі.

«Якраз у такую буру з навальніцай і ловяць вугроў,— падумаў я,— ды не днём, а ноччу. Нялёгкая гэта справа!»

Тым часам ярасць ветру пачала слабець.

Праз гадзіну вецер суціх, гром змоўк, маланкі перасталі разрываць цёмнае неба.

З правага боку выступілі з-пад шэрай заслоны дажджу абрысы касы. Потым заслона перамясцілася на сярэдзіну возера, пасунулася ўлева. І адразу сталі відаць узгоркі за рыбгасам.

Цяпер і сярэдзіна возера вызвалілася ад заслоны, і вада зазіхацела серабрыстай рабізной.

Выглянула сонца, неба ачысцілася ад хмар.

Над возерам перакінула сваё каляровае каромысла радуга, але вясёлы, бліскучы грыбны дожджык усё яшчэ ішоў.

Нарэшце і ён спыніўся.

Возера зноў зрабілася ціхае і спакойнае, а вада чыстая і празрыстая.

Пацяплела, хоць у паветры ўсё яшчэ крыху адчуваўся халадок. Улагодненыя берагі дыхалі свежасцю.

Вечар непрыкметна перайшоў у ноч.

На цёмна-сінім, амаль чорным небе ярка свяціў поўны месяц. На такой жа цёмна-сіняй, як і неба, вадзе струменіла серабрыстая дарожка халоднага святла. Над возерам панавала цішыня.

## НА КАСЕ

На змену ночы прыйшоў ясны і спакойны сонечны дзень.

Сонца свеціць у шырока расчыненае акно. На сасне перад хатай звонка і бадзёра заспявала берасцянка.

Я рашуча адсунуў ад сябе сшытак, паклаў пяро і ўстаў з-за стала.

«Трэба наведаць касу,— сказаў я сам сабе,— паглядзець на чаек. У такую добрую пагоду, як сёння, можна туды дабрацца на байдарцы».

Ад нашага берага да пясчанай касы па прамой лініі каля шасці кіламетраў. Байдарка шпарка ляціць па гладкай паверхні возера, падпарадкоўваючыся раўнамерным, рытмічным узмахам вясла з дзвюма лопасцямі.

Байдарку я прывёз з сабою на возера з Мінска. Яна зроблена з алюмінію, разлічана на аднаго чалавека, разбіраецца на тры часткі, лёгкая ў руху, вельмі зручная для назірання за птушкамі на вадзе.

Праплыўшы палову адлегласці, я спыняю байдарку і гляджу навокал.

Пад яркім сонцам у сінім небе радасна іскрыцца возера.

Якая прыгажосць!

Ва ўсе канцы раскінуўся блакітна-сіні прастор. Сіняя чаша возера пад сінім купалам неба. Я не магу адвесці вачэй ад гэтага чароўнага царства блакіту. Уражанне такое, быццам купал дакладна адпавядае па сваёй велічыні памерам чашы і вышыня неба адпавядае глыбіні возера.

Я не заўважаю руху лодкі. Мне здаецца, што яна стаіць на месцы, усё навокал нерухома і я знаходжуся ў самым цэнтры нейкага вялізнага шара, утворанага вадою і небам, у цэнтры нейкага дзівоснага, ціхамірнага, адвечна блакітнага свету, па-за межамі якога ніхто і нішто не існуе.

Вакол пануюць цішыня і непарушны велічны спакой. Паветра асляпляе сваёй празрыстасцю.

Да касы я падплываю а чацвёртай гадзіне дня.

Узвышша, пакрытае соснамі, ядлоўцам і верасам, якое цягнецца ад сярэдзіны касы да канца мыса, паступова зніжаецца і звужаецца. Нарэшце яно пераходзіць у доўгую і вострую пясчаную водмель, якая выцягнулася даволі далёка ў возера.

Вада ледзь прыкрывае пясок водмелі, пакідаючы на ім лёгкія барозны. Хвалі ціха плёскаюцца аб бераг.

На самым носе касы тырчыць між некалькіх вялікіх каменняў нізкая каржакаватая сасна. Недалёка ад яе — маладая засохлая вольха, рэдкія кусты лазы.

На каменнях пасярод вады і на пяску — каля трыццаці чаек.

Я выцягнуў байдарку на бераг ля кустоў і іду ўздоўж касы.

Чайкі белакрылай хмарай узняліся ў паветра. Я парушыў іх дзённы адпачынак, і вось яны лятаюць з рэзкім, нездаволеным крыкам, падзяліўшыся ў паветры на невялікія чародкі.

На такіх пясчаных косах з водмелямі, кустамі лазы і каменнямі чайкі любяць збірацца пасля поўдня. Тут яны адпачываюць гадзіны дзве-тры пасля ранішняй кармёжкі.

Неўзабаве чайкі зноў паляцяць, цяпер ужо на вячэрнюю кармёжку. Перад захадам сонца яны будуць шукаць сабе месца для начлегу. Можа, тут, на касе, а можа, і гэта нават хутчэй, на сваім гняздоўі сярод балота, дзе яны начуюць вялікімі кампаніямі.

Гняздо ў чайкі вельмі простае. Гэта невялікае паглыбленне ў пяску, высланае сухімі сцяблінкамі травы, а часам і нічым не высланае.

Гняздзяцца чайкі вялікімі калоніямі. Ад гнязда да гнязда бывае часам не больш аднаго-двух метраў. Яйкі яны кладуць у пачатку красавіка. У кожным гняздзе звычайна тры яйкі. Выседжваюць птушанят па чарзе і самка і самец.

Раніцою чайкі шукаюць сабе здабычу на паверхні вады і на зямлі. На пясчаных водмелях яны падбіраюць малюскаў і рыбу, выкінутую хвалямі на пясок, а на палях ловяць мышэй і насякомых.

Даўней, калі сяляне аралі коньмі, чайкі хадзілі следам па раллі, як гэта робяць гракі, і падбіралі лічынкі розных шкодных насякомых. Цяпер яны ходзяць і за трактарам, але на больш далёкай адлегласці.

Я падыходжу да самага краю касы.

Тут толькі што сядзелі чайкі. Вільготны пясок увесь спярэшчаны іх слядамі. Усюды адбіткі іх лапак, нібы нейкі складаны, адмысловы ўзор.

З-пад кустоў лазы да вады вядуць сляды тхара. Чайкі нямала церпяць ад гэтага невялікага, але вельмі лютага драпежніка. І ўсё-такі самым небяспечным ворагам чаек на гняздоўі з'яўляецца лісіца. Яна дабіраецца да іх нават цераз балота і па мелкай вадзе і знішчае яйкі і малых птушанят. Часам лісе ўдаецца схапіць і чайку-маці, што сядзіць на яйках. Шэрая варона і балотны лунь таксама вельмі ласыя да яек і птушанят чайкі.

Ад усіх гэтых і іншых ворагаў чайкі бароняцца сумесна. Таму яны і жывуць вялікаю грамадою. Як толькі вораг заўважаны ў паветры ці на зямлі, чайкі-суседкі накідваюцца на яго з усіх бакоў, нібы белая хмара, і праганяюць ці забіваюць на месцы.

Я гляджу на чаек, што лятаюць над маёй галавою. Іх доўгія, завостраныя крылы коса рассякаюць паветра. З такімі моцнымі і надзейнымі крыламі ім няцяжка доўга трымацца над вадою, змагацца з непагаддзю, ляцець супраць ветру.

То тая, то гэтая з чаек падае нечакана ўніз, перасякаючы другой дарогу, а потым гэтак жа хутка ўзнімаецца ў неба. Некаторыя чайкі пралятаюць адна за адной невялікую адлегласць над самай вадой, апускаюцца на паверхню возера і ціха пагойдваюцца на хвалях. Яны могуць добра плаваць і лёгка трымаюцца на вадзе.

Толькі адна чайка не ўзляцела. Яна ходзіць па пясчаным беразе недалёка ад мяне.

Калі я набліжаюся, яна адыходзіць, але ў паветра не ўзлятае. Я спыніўся і прыглядаюся да чайкі. Чаму яна не ляціць? Ага, вось у чым справа!

У чайкі зламана правае крыло. Яно вісіць бездапаможна, і таму птушка не можа ляцець. Чайка ходзіць па

беразе і ловіць насякомых ля самай вады. Час ад часу яна п'е ваду.

У параненай чайкі, як і ва ўсіх астатніх, нібы цёмна-карычневая маска на твары. Такую маску нашы азёрныя ці, як іх яшчэ называюць, рачныя, чайкі носяць у той час, калі выводзяць патомства. З надыходам восені цёмна-карычневыя маскі знікнуць і ў самцоў, і ў самак. Ад іх застанецца толькі па адной, зусім невялічкай, цёмнай плямцы з абодвух бакоў белай галоўкі. У чайкі чырвоная дзюба і чырвоныя ногі, белыя спіна, шыя і ніз, светла-шэрыя крылы.

Паглядзеўшы на знявечаную чайку, я адсунуўся за кусты, каб не турбаваць яе дарэмна, і перайшоў на другі бок касы.

І тут нада мною з крыкам лятаюць чайкі. Я купаюся ля самага краю касы. Вада вельмі цёплая, добра нагрэтая сонцам.

Сіняе неба, сіняя вада, белыя чайкі — якое цудоўнае спалучэнне колераў!

Чайкі, што кружаць над водмеллю, пралятаюць над маёй галавой зусім нізка. Здаецца, калі не адна, дык другая вось-вось закране мяне сваім выгнутым крылом.

У паветры гучыць іх працяжны крык:

— Кіяў... кіяў... кіяў...

Якія спрытныя, паваротлівыя птушкі!

Як умела і непрыкметна кіруюць яны сваімі крыламі, нібы ветразямі, робячы кругі і нечаканыя павароты над возерам.

Можна бясконца любавацца іх лёгкім, майстэрскім палётам.

Сярод белых чаек з цёмнымі галоўкамі я бачу дзве-тры рабыя, з цёмнымі плямкамі па ўсім целе. Гэта маладыя чайкі леташняга вывадка. Яны самастойна здабываюць сабе корм разам з дарослымі, але адрозніваюцца ад іх сваёй афарбоўкай. Чайкі змяняюць

афарбоўку ў залежнасці ад узросту і ад сезону. Колер дарослых птушак маладыя чайкі набудуць на трэцім годзе жыцця.

На працягу апошніх дзён трымалася яснае надвор'е, і я змог пасля гутарак з рыбаком Ролічам і студэнтам Лёнем падоўгу назіраць за чайкамі на возеры. Іх не так ужо многа на Нарачы, як мне казалі і як я сам думаў. Але ўсё ж назіранні далі мне шмат цікавага, і жыццё на возеры ўзбагаціла мяне новымі ведамі і ўражаннямі.

За гэты час я даведаўся, што на азёрах Нарачанскай групы пераважае адзін асноўны від чаек — звычайная азёрная, ці рачная, чайка. Па-вучонаму яе называюць двума лацінскімі словамі — «лярус рыдыбундус». Усе чайкі, якіх я зараз бачу тут, на касе, належаць да гэтага віду. Я навучыўся адрозніваць іх па выгляду і на вадзе, і ў палёце.

Пакуль я купаўся, чайкі ў паветры зніклі, паляцелі кудысьці далей. Адна толькі бедная чайка са зламаным крылом па-ранейшаму ўсё ходзіць і ходзіць па мокрым пяску ля самай вады.

## СТАРЫЯ АКОПЫ

Я падымаюся на вяршыню ўзвышша.

Цёплае, ласкавае паветра, ледзь чутны шэпт хваль, што ляніва і пяшчотна набягаюць на пясок.

У мяккім перадвячэрнім асвятленні від на ўзгоркі з сасновым лесам і на азёрную гладзь здаецца асабліва прыгожы, чароўны ў сваёй прывабнасці.

На высокім абрывістым беразе з паўднёвага боку захаваліся старыя акопы часоў 1915 года. Тут абаранялі, мабыць, подступы да гэтага берага зімой, калі возера замерзла і вораг мог падысці па лёдзе.

Цяпер акопы абваліліся, густа зараслі ядлоўцам, соснамі і бярозкамі. Расколатыя прыступкі, у няроўных шчылінах якіх растуць рамонкі і лясныя званочкі, вядуць у бетаніраваны бліндаж, засыпаны ігліцай і сасновымі шышкамі. На адной з прыступак грэецца на сонцы зялёная яшчарка.

Калі я падышоў да былога бліндажа, адтуль выскачыў спалоханы заяц.

На сасне спявае берасцянка.

Прыемна глядзець, як жывая прырода пераадольвае сляды вайны і разбурэння, пануе над імі, сцірае іх з твару зямлі!

Празрыстае паветра напоена пахам сасны, верасу, чабору, палявога бяссмертніку і азёрнай вады.

Адсюль добра відаць усё наваколле.

У бінокль бачны на тым беразе, у яснай далечыні, помнік-абеліск на гары, дзе адбывалася свята песні, і царква ў Мядзелі, і вёска Занарач з другога боку.

Сярод мясцовых людзей існуе паданне, быццам мястэчка Мядзель знаходзілася калісьці не тут, а на беразе возера Мядзель.

Пасля вялікай пошасці, якая лютавала ў мястэчку, амаль усё насельніцтва яго вымерла. Тыя нямногія жыхары Мядзеля, якія засталіся жывыя, пакінулі старое месца і перасяліліся на бераг Мястра. Вось чаму мястэчка з назвай Мядзель знаходзіцца на возеры Мястра, а не на возеры Мядзель.

Ад ранейшага мястэчка засталіся толькі руіны.

Яшчэ кажуць у народзе, быццам на адным з мядзельскіх астравоў, які дагэтуль называецца Замкавым, быў у сярэднія вякі старадаўні замак. Яго разбурылі ў пачатку XVII стагоддзя шведы, а ўладарка замка нібыта кінулася ў ваду і ўтапілася. У 1910 годзе памешчык Казёл пабудаваў на месцы замка дом і царкву, якія былі разбураны ў час вайны 1914—1918 гадоў.

Мне прыгадалася ўсё гэта, калі я глядзеў з касы на супрацьлеглы бераг.

Аднак час ужо і дахаты. Трэба спяшацца, каб паспець дабрацца да цямна.

Я вярнуўся з узвышша на пясчаны бераг, выцягнуў байдарку з кустоў, спусціў яе на ваду і паплыў.

Нарач нібы засынала.

Ледзь прыкметна, пяшчотна краналася бартоў байдаркі вада — яна здавалася масленая. Возера было такое ціхае і безмяцежнае, быццам яго спакойную гладзь ніколі не хвалявалі суровыя вятры, буры і навальніцы. Агніста-мядзяны заход сонца шырока расплываўся па яго роўнай і ціхай паверхні.

Чаек нідзе не было відаць, яны даўно паляцелі на начлег і цяпер спяць на сваіх гняздоўях.

Прайшло каля гадзіны.

Возера заставалася па-ранейшаму гладкае і бліскучае, як люстра. Мяккае святло летняга вечара змешвалася паступова з начным змрокам. Толькі на захадзе край неба ўсё яшчэ заставаўся ясны. Сонца, схаваўшыся за даляглядам, залаціла яго сваім цудоўным залаціста-ружовым водбліскам, і возера здавалася ў гэты час асабліва прывабнае, задумлівае і лагоднае.

Калі я падплыў да пасёлка, над усім вадзяным прасторам Нарачы апусцілася цёмная заслона.

Возера заснула.

## СІНЯЯ ПТУШКА

На провадзе электралініі сярод лугавіны, за якой пачынаецца сасняк, сядзіць прыгожая птушка.

Галава, шыя і ўвесь ніз у гэтай птушкі блакітна-сіняга колеру з зеленаватым адценнем. Спіна — карычневая, крылы — цёмна-сінія. Велічынёю яна з галку.

Я падыходжу бліжэй.

Сіняя птушка выразна вырысоўваецца на фоне светлага неба.

Гэта — сіваграк. Яго называюць часам сівавaронкай.

Маляўнічая афарбоўка сіваграка надае яму незвычайны, нетутэйшы выгляд. Здаецца, што ён прыляцеў сюды як выпадковы госць з далёкіх паўднёвых краін,— так не адпавядае пейзажу наднарачанскіх узгоркаў яркі колер яго апярэння.

І гэта зусім не дзіўна, бо сіваграк, таксама як і ўдод, івалга, зімародак і залацістая шчурка, ці пчалаед, якія вылучаюцца ў нашых лясах і палях сваім бліскучым убраннем, з'яўляецца далёкім патомкам трапічных птушак.

Нерухома сядзіць сіваграк на провадзе, выставіўшы наперад моцную, цёмную, крыху загнутую дзюбу. Яго шчыльнае, бліскучае, нібы з металу, апярэнне зіхаціць на сонцы.

У траве красуюцца чырвоныя галоўкі канюшыны, жоўтыя адуванчыкі, белыя рамонкі, сінее чабор. Над кветкамі пырхаюць матылькі. У небе звініць жаваранак.

Цярпліва пільнуе сіваграк здабычу, каб кінуцца раптам з вышыні свайго назіральнага пункта і схапіць у траве коніка, саранчу ці мядзведку.

У нашых лясах сіваграк жыве адасобленымі парамі, на даволі вялікай адлегласці адна ад другой. Трымаецца ён звычайна там, дзе лес мяжуе з полем. Больш характэрны гэты птах для Украіны, для паўднёвых абласцей, дзе пераважае стэп, але і ў нас ён сустракаецца нярэдка.

Жыву я недалёка ад таго месца, дзе першы раз убачыў сіваграка.

Невялікую нашу хатку абступіў з усіх бакоў стары лес.

Перад вокнамі высяцца сосны.

Вось ужо некалькі разоў будзіць мяне на світанні нейкі рэзкі, адрывісты і хрыплы крык, якога я раней

ніколі не чуў. Мне здавалася, што гэта крычыць вялізны птах.

Кожны раз я ўставаў і выходзіў з дому, каб дазнацца, каму належыць такі моцны голас, але варта было мне адчыніць дзверы, як крык адразу змаўкаў і я нікога не бачыў.

Праз некалькі дзён незнаёмы крык, на гэты раз асабліва гучны, пачуўся каля самага дома. Ён напоўніў сабою ўвесь пакой.

— Рэк... рэк... рэк... рэк...— гучала ў лясным паветры, парушаючы ранішнюю цішыню.

Я высунуўся ў акно.

Крык часова спыніўся, потым пачуўся з новаю сілай. У тую ж хвіліну з бліжэйшай ад дома сасны пераляцела на далёкую яліну блакітна-сіняя птушка.

Вось яно што! Ды гэта ж сіваграк! Можа, той самы, якога я бачыў на провадзе. Гэта ён крычыць так моцна! І адкуль толькі бярэцца ў параўнальна невялікай птушкі такі рэзкі голас?

Крыкнуўшы яшчэ раз, сіваграк узняўся ў паветра. Ён кружыў высока ў небе, а потым, робячы складаныя піруэты, кідаўся штопарам уніз. Ён нібы купаўся ў ясным прасторы.

З-пад кроны высокай сасны вылецеў насустрач яму другі сіваграк і далучыўся да паветраных практыкаванняў.

Абедзве птушкі пачалі ганяцца адна за адной, куляючыся ў паветры. Яны знікалі часам у зяляніне дрэў і вылятаді зноў на адкрытую пляцоўку перад домам.

Цяпер можна было заўважыць, што сіне-зялёныя крылы птушкі маюць знізу яшчэ і белы колер.

З цікавасцю сачыў я за гульнямі сівагракаў.

З гэтага дня я вырашыў больш уважліва прыглядацца да іх палётаў. Мне хацелася даведацца, дзе выводзяць яны сваіх птушанят.

Знайсці гняздо сівагракa нялёгка.

Сіняя птушка — вельмі асцярожная. Яна гадуе сваіх дзяцей у глухіх і маладаступных месцах і паводзіць сябе так, каб нікому не знайсці яе дом.

Я ведаў, што сівагракі гняздзяцца ў дуплах старых дрэў. Яйкі з'яўляюцца ў гняздзе сівагракa ў пачатку чэрвеня. Птушаняты вырастаюць і пакідаюць гняздо праз дваццаць шэсць — дваццаць восем дзён.

Быў канец чэрвеня. Значыць, птушаняты ўжо даволі вялікія. Неўзабаве яны пачнуць лятаць.

Трэба спяшацца!

Між тым надышоў ліпень, а пошукі гнязда ўсё яшчэ не давалі вынікаў.

Выпадак дапамог мне.

За вёскай Урлікі я ўбачыў на ўзлессі падорліка. Ён лунаў над высокімі ялінамі.

Раптам аднекуль збоку вылецеў з рэзкім крыкам сіваграк.

Сіняя птушка наляцела на падорліка і ўдарыла яго, як таран. Не даўшы падорліку апамятацца, сіваграк узняўся вышэй і кінуўся на драпежніка зверху, збіваючы яго з курсу і адганяючы ад ялін.

Дзіўна, што падорлік нават і не спрабаваў абараняцца. А сіваграк не спыняў сваіх заўзятых атак. Ён нападаў на падорліка то зверху, то збоку, кожны раз адлятаючы для разгону.

Падорлік рабіў шырокія кругі, узнімаючыся ўсё вышэй і вышэй у сіняе бяздоннае неба, пакуль сіваграк не адступіўся ад яго.

Падорлік знік удалечыні, а ўсхваляваны сіваграк абляцеў яшчэ раз усю лугавінку перад лесам і з крыкам сеў на вершаліну сасны. У той жа момант побач з ім апынуўся другі сіваграк.

«Недзе тут і трэба шукаць іх гняздо»,— падумаў я і расказаў пра сутычку сіваграка з падорлікам студэнтуарнітолагу Лёню.

І тут высветлілася, што Лёня ведае, дзе знаходзіцца гняздо сіваграка.

— Я вам яго пакажу, калі здолею патрапіць да таго дрэва,— паабяцаў Лёня.

## ГНЯЗДО СІВАГРАКА

На другі дзень мы пайшлі разам у лес за Урлікамі.

Жыта за вёскай стаяла сцяной, вышэй чалавечага росту. Адразу за нівай, пасля лугавінкі, пачынаецца вільготны лес.

— Нам трэба ісці вунь на тыя яліны,— гаворыць Лёня, паказваючы на ўскрай лесу, дзе злева ад нас з цёмна-зялёнай зубчастай сцяны ўзвышаюцца вострыя пікі вялізных ялін.

Мы прабіраемся скрозь густы падлесак ад адной калматай яліны да другой.

Лёня ідзе наперадзе, я — за ім.

На зялёным фоне ляснога гушчару яркай каляровай плямай вылучаюцца яго чырвоная клятчастая каўбойка і сінія штаны.

— Вось тут,— упэўнена гаворыць Лёня, спыніўшыся пад адным з лясных волатаў.

Перад намі высокая яліна з магутным стромкім ствалом, з шырокімі сівымі лапамі.

Мы глядзім угору.

На вышыні чатырох метраў ад зямлі чарнее ў ствале пад адным з сукоў адтуліна авальнай формы, дастаткова вялікая, каб у яе свабодна мог пралезці дарослы сівагрindustrial.

Вакол яліны, сярод маладых бярозак і елачак густа растуць буякі. Пад старым дрэвам цёмна і вільготна. Ноччу быў дождж, і на лісточках буякоў зіхацяць буйныя дажджавыя кроплі.

— Паглядзім, ці сядзяць яшчэ ў дупле птушанyты,— гаворыць Лёня.

Абхапіўшы ствол рукамі, ён спрытна лезе на дрэва, ставячы ногі ў мяккіх кедах на сучкі. Вось ён дабраўся да першых вялікіх галін.

Саламяны брыль зляцеў з галавы ў студэнта. Цёмна-каштанавыя валасы рассыпаліся.

Лёня схіляецца з верхняга сука над дуплом і запускае туды руку.

— Ёсць,— гаворыць ён урачыста. — Яшчэ не вылецелі!..

Лёня выцягвае з дупла птушаня сіваграка і паказвае мне. Велічынёю яно з дарослую птушку, але лятаць яшчэ не ўмее, хоць і пакрыта пер'ем.

Лёня адварочвае галаву.

— Прыгожая птушка, а якая неахайная. Гадуе сваіх дзяцей у такім брудзе і смуродзе!

Разгледзеўшы птушаня, Лёня асцярожна кладзе яго зноў у дупло.

— Там яшчэ двое,— тлумачыць ён, злазячы з дрэва. — Але гэты большы. Ён сядзіць наперадзе, каля самага краю дупла, і таму расце шпарчэй за іншых, бо яму перападае больш корму.

Дзесьці паблізу з'явіўся сіваграк.

З трывожным крыкам лётае ён вакол нас недзе па-за дрэвамі, але на вочы не паказваецца.

— Дупло выдзеўб, мусіць, чорны дзяцел,— мяркуе Лёня. — Ён на гэта майстар. А потым гатовым памяшканнем завалодаў сіваграк.

— Як вы яго знайшлі? — пытаюся я.

— Знайшоў не я,— адказвае Лёня. — Мне паказаў гэтае гняздо Антон Канстанцінавіч, наш прэпаратар з універсітэта. Ён гаворыць, што знайшоў яго яшчэ ў 1946 годзе. З таго часу сівагракі штогод выводзяць у ім сваё патомства. Магчыма нават, што адна і тая ж пара гняздзіцца тут на працягу ўсіх гэтых гадоў.

Мы выбіраемся з лесу.

Пачаўся дождж. Высокая трава адразу намокла. Мы выходзім на дарогу.

У лесе за вёскай Урлікі ўсё яшчэ гучыць рэзкі крык сівагракa.

Дождж неўзабаве скончыўся. З'явілася сонца, і, пакуль мы дайшлі да біястанцыі, адзенне наша высахла.

Па дарозе я ўспомніў пра сівагракa, якога бачыў у верасні над Чорным морам, і расказаў пра гэта Лёню.

Мне давялося ў той час жыць каля Адэсы.

Пахмурнай раніцай я ішоў паўз бераг мора. Пад нагамі была сухая гліністая глеба з норкамі суслікаў сярод рэдкіх кустоў палыну.

Унізе сярдзіта шумеў прыбой.

З аднаго боку — бясконцы марскі прастор, з другога — не менш бясконцы прастор украінскага стэпу.

З высокай кручы я заўважыў знаёмую птушку. Яна лятала над морам, даволі далёка ад берага.

Сіваграк куляўся ў паветры, змагаючыся з парывамі ветру. Трапечучы крыламі, ён узнімаўся высока ўгору, каб потым імкліва спікіраваць уніз, ледзь не да самай вады, і зноў узлятаў у вышыню. Такія самыя фокусы паветранай эквілібрыстыкі рабіў і сіваграк, за якім я назіраў на Нарачы.

Неба было шэрае, і мора шэрае, надвор'е пахмурнае. Ні чаек не было над морам, ні ныркоў.

Адна толькі сіняя птушка з захапленнем аддавалася гульні са стыхіяй.

## ПУСТАЛЬГА

Раніца сёння цёплая, вільготная і пахмурная.

На досвітку над возерам прайшла навальніца, але свежасці пасля сябе не пакінула.

У памяшканні на біялагічнай станцыі, дзе займаюцца практыканты, парна і душна, хаця ўсе вокны расчынены насцеж.

— Я знайшоў учора гняздо сокала-пустальгі,— сказаў мне Лёня. — Жадаеце паглядзець?

— Вядома.

Ён паставіў на акно чучала крачкі, над якім працаваў, і ўзяў свой саламяны капялюш.

Мы выйшлі на ганак.

Парнае паветра пахла навальніцай.

Хвілін праз дзесяць Лёня прывёў мяне ў пералесак недалёка ад берага.

— Вось тут,— сказаў ён,— на гэтай яліне.

З цікавасцю гляджу я на гняздо пустальгі. Яно вельмі прымітыўнае, зроблена абы-як. На шырокую лапу старой яліны проста пакладзена некалькі тонкіх пруткоў, вось і ўсё. Верхняя галіна служыць жыхарам страхой. Яна ахоўвае птушанят ад дажджу і прамых сонечных праменняў. Гняздо плоскае, у ім няма паглыблення. З гнязда чуваць рэзкі піск малых сакалянят.

— Іх тут трое,— ціха гаворыць Лёня.

Мы падыходзім яшчэ бліжэй.

Усе сакалянят пакрыты белым пухам, але яны не аднолькавыя па росту. Дарослых птушак каля гнязда няма.

Мы хаваемся за суседняй каржакаватай сасной і адтуль цярпліва наглядаем за гняздом.

У вышыні, пад кронамі дрэў, меладычна свішчуць івалгі. Спеў іх складаецца з двух ці трох тактаў: «фі-у» ці «фі-лі-у».

— Так свішчуць старыя самцы,— ціха гаворыць Лёня.

Раптам прыемныя гукі, падобныя на флейту, змяняюцца крыкам раззлаванай кошкі. Значыць, нешта напалохала ці ўстрывожыла івалгу.

Але навокал усё спакойна, нішто не парушаеляснога жыцця.

Недзе непадалёку пастуквае дзяцел. Стогне дзікі лясны голуб. Радасна гучыць бадзёры спеў берасцянкі. Над травою гудзе гаспадарлівы чмель. Па ствале сасны поўзаюць мурашкі.

Хрыплы піск у гняздзе ўзмацніўся.

Вось падляцела да гнязда пустальга-маці, прыгожая птушка, зграбная і лёгкая, як і ўсе сокалы. У яе рыжавата-карычневая спіна і шырокая цёмная паласа на канцы шэрага хваста.

Сакаляняты сустрэлі маці рэзкім і дружным піскам. У кіпцюрах пустальга трымае мыш-палёўку. Наблізіўшыся да гнязда, птушка ў паветры дзюбай узяла палёўку з кіпцюроў, кінула яе малым і зноў паляцела на здабыткі.

З нашага сховішча добра відаць, як прагна накінуліся птушаняты на пачастунак. Яны злосна штурхаюцца, стараючыся завалодаць большым і лепшым кавалкам. Схапіўшы сваю долю, кожны з іх адразу паварочваецца спінай да астатніх, каб бесперашкодна праглынуць здабычу.

Адно з сакалянят сядзіць бліжэй да краю гнязда. Яно большае за ўсіх, самае спрытнае і рухавае. Таму і корму дастаецца яму заўсёды больш.

Ледзь толькі сакаляняты расправіліся з першай палёўкай, як маці прыляцела зноў і кінула ім новага грызуна. На гэты раз самае вялікае з сакалянят цалкам завалодала здабычай. Яно выхапіла палёўку з матчынай дзюбы так хутка, што астатнія і агледзецца не паспелі.

— Мышы — асноўны корм сокала-пустальгі,— сказаў Лёня. — Знішчае ён і буйных насякомых. Гэтая драпежная птушка вельмі карысная для сельскай гаспадаркі.

Тым часам пустальга-маці ўзляцела на вяршаліну суседняй елкі і некалькі хвілін сядзела нерухома.

Але адпачынак яе быў кароткі. Вось яна ўжо зноў у паветры.

Недалёка ад нас зелянее адкрытая паляна. Пустальга ўзнялася ўгору і павісла над палянай. Распусціўшы хвост веерам і трапечучы крыламі, яна трымаецца ў паветры на адным месцы. Потым, угледзеўшы з вышыні нешта ў траве, птушка раптам каменем упала ўніз.

Рэзкі ўзмах крыламі над самай зямлёй — і ў тую ж хвіліну яна ўзнялася зноў, а ў кіпцюрах у яе — новая палёўка. За кароткі час сакаляняты ў гняздзе з'елі чатырох мышэй.

У паветры пачулася частае і тонкае:

— Клі-клі-клі-клі-клі...

Галасна клічучы, з'явілася аднекуль яшчэ адна пустальга. Гэта быў бацька. Ён прыляцеў таксама з палёўкай у кіпцюрах, але сам яе птушанятам не даў. Недалёка ад гнязда яго сустрэла маці. Вось яна падляцела да бацькі.

Што гэта?.. Раз! — і пустальга-маці раптам перакулілася ў паветры, нібы акрабатка. Яна знізу кіпцюрамі выхапіла здабычу з кіпцюроў у бацькі. Той адразу паляцеў прэч, а маці кінула палёўку сакалянятам. Так паўтаралася некалькі разоў.

Пакуль мы наглядалі за гняздом, з-за хмар паказалася сонца. Пачало моцна прыпякаць. Апаўдні, у самую спякоту, і бацькі і дзеці зрабілі перапынак. Птушаняты адпачывалі ў гняздзе, а дарослыя — на суседніх дрэвах, пад галінамі.

Пад вечар, калі сонца апусцілася, малыя зноў ажылі, заварушыліся. З гнязда пачуўся рэзкі піск, сакаляняты патрабавалі есці. Пасля адпачынку бацька і маці з новай энергіяй пачалі прыносіць ім здабычу.

Панаглядаўшы за гняздом на працягу двух дзён, Лёня ўлучыў хвіліну, калі не было паблізу бацькоў, узяў адно сакаляня і аднёс яго на біялагічную станцыю.

У гняздзе замест трох сакалянят засталося двое. Але бацькі нават не заўважылі страты. Па-ранейшаму спакойна падляталі яны да гнязда, і пустальга-маці замест трох карміла цяпер двух птушанят. Калі б Лёня пакінуў у гняздзе нават толькі адно сакаляня, для бацькоў таксама нічога не змянілася б. Яны і тады б не здагадаліся, што сям'я іх паменшала. Пустальгам здавалася, што ў іх доме поўны парадак.

— У гняздзе я заўважыў пер'е чыжа і дразда,— паведаміў мне Лёня. — Дзіўная рэч! Відаць, сёлета мышэй малавата, вось бацькі і прыносяць сваім сакалянятам, што могуць. Наогул жа гэта з'ява вельмі рэдкая, бо птушкі для пустальгі — корм непрывычны.

На біялагічнай станцыі сакаляня жыве ў драўлянай скрынцы, пастаўленай пад кустом бэзу. Яно ўсё яшчэ пакрыта белым пухам, нібы ватай. Толькі на хвасце і на крылах расце пер'е бура-пясчанага колеру.

Вочы ў сакаляняці чорныя, злосныя. Загнутая ўніз дзюба жоўтая, а на канцы чорная. Ногі ў яго таксама жоўтыя, з вострымі чорнымі кіпцюрамі.

Калі я схіляюся над ім, сакаляня раскрывае дзюбу.

— Пад языком у яго знаходзіцца зубец — характэрная адзнака ўсіх сокалаў,— гаворыць Лёня.

Выраз вачэй у сакаляняці непрыемны, нібы ў старога скнары. Я гляджу на яго і смяюся: вельмі ўжо яно нагадвае нейкага банкіра, ліхвяра з карыкатурнага плаката — і лысая галава з рэдкім белым пухам, і худая маршчыністая шыя, і дзюба, падобная на кручкаваты нос,— усё, як у знаёмых шаржыраваных вобразаў фінансавых драпежнікаў капіталістычнага свету. Хіба толькі традыцыйнага чорнага цыліндра не хапае для поўнага ўражання.

Калі я працягваю руку, сакаляня кладзецца на спіну і выстаўляе свае вострыя кіпцюры.

— Гэта самае большае з іх і самае спрытнае,— гаворыць Лёня.

Ён корміць сакаляня мяснымі адкідамі са студэнцкай сталовай.

— Што вы з ім будзеце рабіць? — пытаюся я.

— Вазьму з сабою ў Мінск і аддам на станцыю юных натуралістаў,— гаворыць Лёня.— Я ім даўно абяцаў дастаць пустальгу. Будзе там гадавацца ў вальеры і служыць для вучняў жывым наглядным дапаможнікам. Няхай ведаюць, як выглядае гэтая карысная і патрэбная птушка.

Але план Лёні, як я потым даведаўся, быў здзейснены далёка не поўнасцю.

Вярнуўшыся праз некалькі дзён у Мінск, Лёня разам з іншымі студэнтамі паехаў на цаліну ў Казахстан. Сакаляня ён аддаў свайму прыяцелю, які таксама любіў птушак і цікавіўся імі.

Прыяцель Лёні жыў у маленькім доміку на двары Акадэміі навук. Ён змясціў сакаляня ў клетцы на даху сваёй хаты і карміў яго мышамі, жабамі і кавалкамі мяса.

Неўзабаве сакаляня падрасло, пакрылася пер'ем і з брыдкага, няўклюднага птушаняці ператварылася ў прыгожага і зграбнага маладога сокала-пустальгу, з такой жа спінай пясчанага колеру і цёмнай паласой на хвасце, якія былі ў яго маці. Рухі яго зрабіліся спрытныя, лёгкія. Ён пачаў лятаць і мог ужо сам лавіць здабычу.

Дзверцы клеткі на даху заўсёды былі адчынены. Спачатку сакаляня лятала толькі каля хаты, але з кожным днём падарожжы яго рабіліся ўсё больш далёкія і працяглыя. З двара Акадэміі яно часта пералятала ў Батанічны сад.

Аднойчы ў ясную, сонечную раніцу сокал узняўся асабліва высока і знік у блакітным небе. Цэлы дзень не было маладога сокала, але пад вечар ён вярнуўся ў сваю клетку.

Нарэшце сокал аблюбаваў сабе ў якасці сталага назіральнага пункта будынак Інстытута фізкультуры на плошчы Якуба Коласа. Унізе кіпела гарадское жыццё,

звінеў трамвай, гулі машыны, аўтобусы і тралейбусы, ішлі пешаходы, жанчыны спяшаліся на Камароўскі рынак, а на самым верхнім радку светлавой рэкламы над дахам інстытута адзінока сядзела маленькая драпежная птушка і сваім зоркім сакаліным вокам выглядала здабычу. Яна палявала тут на вераб'ёў, а ўвечары вярталася дадому, у сваю клетку на двары Акадэміі. Вераб'і былі для пустальгі непрывычным кормам, але яна знаходзілася ў незвычайных умовах і асабліва перабіраць ёй не выпадала.

Аднаго разу над інстытутам пралятала вялікая чарада галак. З хуткасцю маланкі сарваўся сокал з вяршыні будынка і моўчкі дагнаў гаманлівых птушак. Непрыкметна далучыўся ён да чарады, як гэта робяць часам яго родзічы, і паляцеў разам з галкамі за горад.

Гэта было ў канцы ліпеня. Назад ён ужо не вярнуўся. Далейшы яго лёс невядомы.

Можа, ён паляцеў туды, дзе нарадзіўся, на бераг Нарачы. А можа, назаўсёды застаўся жыць у аколіцах Мінска і гаспадарыць цяпер на прыгарадных землях, палюе там на мышэй.

## ЛЁС САКАЛЯНЯТ

Сёння ўвесь дзень горача і парна.

Сонца свеціць млява, стомлена, скрозь нейкую бялявую смугу, быццам скрозь кісяю.

Возера выглядае нібы перламутравае, яно сёння надзіва ціхае і нерухомае, а вада ў ім нібы сонная.

Паветра насычана цёплай вільгаццю.

У такі дзень ісці нікуды не хочацца.

Я ляжу пад сасной, недалёка ад хаты, і прыводжу ў парадак свае ранейшыя запісы.

Раптам каля хаты пачуліся шум і мітусня.

Гучаць звонкія і ўзбуджаныя галасы дзяцей. Аб нечым спрачаюцца дарослыя.

Што там такое?

Я ўстаю і падыходжу да ганка.

Тут сабралася група людзей.

У цэнтры ўвагі вусаты лысы дзядзька. У яго каля ног ляжаць на зямлі трое сакалянят. Белы пух пачаў замяняцца ў іх на крылах і на хвасце пер'ем. Сакалянята бездапаможна раскрываюць дзюбы, паварочваючы галовы на ўсе бакі.

Я пытаюся, у чым справа.

Мне расказваюць, што лысы вусаты дзядзька, які служыць загадчыкам гаспадаркі ў нейкай установе, і малады чалавек, яго сын, знайшлі за рыбгасам гняздо сокала-пустальгі і прынеслі сюды, каб паказаць знаёмым трох сакалянят.

Цяпер абмяркоўваецца пытанне, што з сакалянятамі рабіць далей.

Сярод людзей, якія абступілі птушанят, узніклі «прынцыповыя» разыходжанні. Калі я падышоў, вырашаўся лёс палонных сакалянят.

— Трэба спачатку разабрацца, хто яны такія,— усхвалявана, але няўпэўнена заступалася за іх дзяўчына, якая працавала ў друкарні.

— А чаго тут высвятляць? Знішчыць — і ўсё! І прытым неадкладна! — катэгарычна заявіў вусаты дзядзька. Ён з самага пачатку ўзяў на сябе ролю «абвінаваўцы».

— Чаму? — спытаў я. — З якой прычыны?

— Як гэта «чаму»?— павярнуўся да мяне вусаты. — Хіба не бачыце, якія ў іх дзюбы ды лапы з кіпцюрамі? Во!.. Гэта ж драпежнікі! Вось вам і прычына, калі вы самі не разумееце.

Малады чалавек падтрымаў бацьку.

— Чаго тут думаць,— сказаў ён.— Утапіць, і ўсё.

— Правільна,— аўтарытэтна пацвердзіў яшчэ нехта. — Кінуць у возера, каб не было памылкі!

Пакуль вусаты дзядзька выносіў прысуд сакалянятам, малады чалавек пайшоў у хату і неўзабаве вярнуўся з маленькім чамаданчыкам у руках. Ён хуценька адчыніў чамаданчык, каб пакласці туды сакалянят і аднесці іх на возера. Яму хацелася самому выканаць бязлітасны прысуд.

— Ну,— сказаў ён, адсоўваючы бліжэйшых гледачоў,— паглядзелі — і досыць.

Прыйшлося мне выступіць у абарону бедных птушанят, якім пагражала хуткая і немінучая пагібель. Я расказаў прысутным пра тую вялікую карысць, якую прыносіць сокал-пустальга, і ўгаварыў не чапаць сакалянят, пакінуць іх у спакоі.

Большасць прысутных мяне падтрымала. Людзі паступова разышліся, дзеці пабеглі гуляць.

Толькі вусаты дзядзька і яго сынок засталіся вельмі нездаволены. Абодва шкадавалі, што ім не далі ўтапіць птушанят.

На жаль, такія дзядзькі, і вусатыя, і без вусоў, сустракаюцца даволі часта. Сярод многіх людзей яшчэ можна пачуць няправільную думку, быццам усе драпежныя птушкі — шкодныя, і таму нібыта іх трэба знішчаць без разбору.

Гэта — вялікая памылка, бо ў сапраўднасці амаль усе драпежныя птушкі — карысныя.

Перш за ўсё гэта неабходна сказаць пра канюка і пустальгу, якія кормяцца галоўным чынам мышамі і шкоднымі насякомымі. Там, дзе шмат канюкоў і пустальгоў, значна павышаецца ўраджай збожжавых культур.

Шкоднымі з драпежных птушак можна лічыць з упэўненасцю толькі ястраба-перапёлачніка і цецярушніка, сокала-сапсана ды балотнага луня, бо яны знішчаюць розных каштоўных і карысных птушак. Але нават і так званыя шкодныя драпежнікі маюць пэўнае значэнне ў агульным ланцугу заканамернасцей прыроды.

Я падрабязна растлумачыў гэта вусатаму дзядзьку, але ён усё роўна нешта бурчаў наконт нікому не патрэбнай жаласлівасці, а малады чалавек пазіраў на мяне скоса і хмурыўся. Тады я перастаў звяртаць на іх увагу.

Гэта было пад вечар, і сакаляняты засталіся ў нас начаваць. Яны з прагнасцю паелі парэзанае на кавалкі мяса, што прынеслі ім са сталовай. Хлапчукі далі ім дробных рыбак, злоўленых у возеры. Сакаляняты з'елі і рыбак, з'елі нават некалькі кавалкаў сыру. Корм яны бралі з зямлі, прагна выхоплівалі адно ў аднаго.

На другі дзень раніцою сакалянят занеслі на тое месца, адкуль яны былі ўзяты, і паклалі ў гняздо, над якім усё яшчэ з трывожным крыкам ляталі іх бацькі.

## «ДЗІКАЕ МЕСЦА»

Пасля гутаркі з Лёнем я вырашыў наведаць і чапляў на іх гняздоўі. Для гэтага мне трэба было пераплыць Нарач і высадзіцца на паўднёвым беразе.

Там, у балоцістай мясцовасці, дзе з возера выцякае рэчка Нарачанка, і знаходзіцца іх калонія.

У канцы чэрвеня птушаняты чаплі пакідаюць гнёзды і пачынаюць лятаць. Самы час ехаць, а то будзе позна, бо чаплі пакінуць гняздоўе.

Але як туды дабрацца?

Ад нашага берага да супрацьлеглага больш за дванаццаць кіламетраў.

На лёгкай, але няўстойлівай байдарцы туды, цераз усё возера, з яго высокімі хвалямі на сярэдзіне, не даплывеш.

Я звярнуўся на біялагічную станцыю.

Група з пяці студэнтаў на чале са сваім навуковым кіраўніком павінна была наведаць для вучэбнай практы-

кі рыбаразводныя сажалкі, якія знаходзяцца недалёка ад гняздоўя чапляў.

Мне далі дазвол паехаць разам з практыкантамі на катэры. Паездка была прызначана на заўтра.

Раніцою, дакладна ў вызначаны час, я быў на станцыі.

Пасля пагрузкі прыбораў і рознага навуковага абсталявання мы пераправіліся на лодцы да катэра.

Сонца свеціць ярка, але дзьме заходні вецер, і па сіняй вадзе возера ходзяць белыя хвалі, а па сінім небе бягуць такія ж белыя воблакі.

У дзевяць гадзін катэр адчаліў.

На ім даволі ўтульна. У каюце прыгожыя бліскучыя лаўкі ўздоўж сцен, зручны столік, прышрубаваны да падлогі, блакітныя фіранкі на круглых ілюмінатарах. Усё новае, усё аж зіхаціць. Станцыя набыла гэты катэр толькі сёлета.

Я выходжу на палубу.

Вецер мацнее, хвалі робяцца ўсё большыя, б'юць у барты, заліваюць ілюмінатары.

Гайданка павялічваецца, але катэрок, хоць яго і моцна кідае на хвалях, настойліва імчыцца наперад.

Праз дзве гадзіны мы набліжаемся да паўднёвага берага.

Не даплываючы метраў васемсот, катэр спыніўся. Далей ён не можа плыць, бо тут занадта мелка.

На лодцы мы перапраўляемся з катэра на нізкую пясчаную водмель. Ад самага берага пачынаецца шырокае балота.

Каля возера балота падзелена на вялікія правільныя чатырохкутнікі, якія густа зараслі асакой.

Гэта — рыбныя гадавальнікі.

У такіх штучных сажалках, створаных на балоце, выводзяцца малякі промыславых парод рыбы. Калі малякі дасягнуць пэўнага ўзросту, іх выпусцяць у возера.

Сажалкі аддзелены адна ад адной землянымі дамбамі, на якіх расце высокая трава. Належаць гэтыя сажалкі Нарачанскаму рыбгасу.

Да бліжэйшай вёскі Занарач адсюль, калі ісці берагам, тры кіламетры, а да сяла Гатавічы, у другі бок, пяць кіламетраў.

На гэтым пустынным, бязлюдным беразе, у адзінокай хатцы ля самай вады, жыве з сям'ёю наглядчык рыбаразводных сажалак Міхал Ліпніцкі.

Мы падышлі да хаты. Насустрач нам выходзіць гаспадар.

Ліпніцкі — чалавек невысокага росту, хударлявы, з голеным тварам. Рэдкія, мяккія валасы пачынаюць сівець на скронях. На ім цёмна-карычневая аксамітная куртка з засцёжкай «маланка» і гумавыя боты.

У Ліпніцкага ёсць хата ў Гатавічах, але жыве ён з жонкай тут, у доме, які належыць рыбгасу.

— Ён жа «прудавік»,— гаворыць гаспадыня. — Прывык да гэтай службы. Не можа без сажалак. Вось мы і жывём на гэтым дзікім месцы.

Мэтаю гадавальніка з'яўляецца папаўненне рыбных запасаў Нарачы і суседніх азёраў шляхам акліматызацыі новых відаў промыславых рыб. Тут выводзяцца інкубацыйным спосабам з прывезенай аплодненай ікры маляўкі чудскога сіга, пра якога мне расказваў у пасёлку галоўны інжынер рыбгаса.

— Маляўкі сіга,— гаворыць Ліпніцкі,— выходзяць з ікры ўвесну і гадуюцца ў сажалках да восені. Увосень мы іх выпускаем у Нарач. У гэты час сяголетні сіг важыць пятнаццаць — дваццаць грамаў.

— Якіх рыб вы яшчэ гадуеце? — пытаюся я.

— Яшчэ мы вырошчваем амурскага сазана. Нераст сазана адбываецца ў сажалках гадавальніка ў натуральных умовах. Калі вырастаюць маляўкі-сяголеткі, мы іх таксама выпускаем у Нарач. Толькі што мы ўпершыню пачалі вырошчваць у нашым гадавальніку пелядзь.

— Пелядзь?

— Так, пелядзь.

Для мяне гэтая назва такая ж незнаёмая, якой нядаўна яшчэ была і сея. Я пачаў распытваць наглядчыка пра гэтую рыбу, і Ліпніцкі расказаў мне, што пелядзь належыць да сямейства сігавых. Гэта адна з асноўных промыславых рыб у вадаёмах Поўначы. Яна вядзецца ў нізоўях Обі, Енісея, Лены, Калымы і ў азёрах на ўзбярэжжы Паўночнага Ледавітага акіяна. Усе сігавыя рыбы любяць халодную празрыстую ваду, багатую на кісларод. Пелядзь сярод іх найбольш вынослівая і найменш патрабавальная да ўмоў існавання. Яна можа жыць і ў вадзе з параўнальна высокай тэмпературай. Нездарма яе называюць «карасём» сярод сігавых рыб. Корміцца яна планктонам, матылём, малюскамі. Жыве пелядзь да трынаццаці-чатырнаццаці гадоў. Кожная самка прыносіць да ста тысяч ікрынак у адзін нераст. Ікру пелядзі прывезлі ў Нарачанскі рыбны гадавальнік з Сібіры. Калі пелядзь прыжывецца ў Нарачы, рыбная гаспадарка Беларусі ўзбагаціцца яшчэ адным каштоўным відам промыславай рыбы.

Шмат трэба мець цярплівасці і зацікаўленасці, каб гадаваць малявак у адзіноце, у гэтым бязлюдным месцы. У Мінску, у Інстытуце рыбнай гаспадаркі, мне гаварылі пра Ліпніцкага як пра дбайнага энтузіяста-працаўніка, адданага сваёй справе.

Над сажалкамі пралятае чайка.

Я паказваю на яе Ліпніцкаму і пытаю:

— Міхал Антонавіч, як у вас называюць гэтую птушку?

Ён здзіўлена глядзіць на мяне:

— Чайка.

— А кагаркай не называюць?

— Не.

— А грачуном?

— Называюць. Але больш чайкай. Яшчэ кажуць — белюгі. «Вунь,— кажуць,— белюгі лётаюць». Гэта, мусіць, таму, што яны белыя.

Гаспадар гаворыць мне, што чайкі тут, у гэтых балотах, не гняздзяцца. Яны гняздзяцца больш на возеры Мястра і асабліва на востраве Бярозаўка.

Я пахваліў хату з высокім падмуркам, у якой жывуць гаспадары. Сапраўды, хата ладная, чыстая, прыбраная, усё вакол дагледжана. На двары таксама парадак. Усюды адчуваецца руплівае гаспадарскае вока і дастатак.

Наглядчык сажалак і яго жонка жывуць на «дзікім месцы», як відаць, няблага.

— Ай, што вы!..— пярэчыць гаспадыня і пачынае скардзіцца.— Надта ж тут дзіка ды бязлюдна, асабліва зімою. Усё замецена снегам. Нікога не ўбачыш, ніхто не прыйдзе. Летам хоць з рыбгасу людзі прыплываюць, студэнты з біястанцыі. Вось і вы завіталі. А зімою — не дай бог! Снег, мароз, мяцеліца вочы слепіць. Возера замярзае, але хадзіць па ім небяспечна, асабліва, калі завея. О, тады сцеражыся! Вецер можа збіць з ног, снегам замесці. У мінулым годзе, у сакавіку, жанчына адна недалёка ад нашага дома загінула. Быў тады моцны вецер, мароз. Жанчына ішла цераз возера па лёдзе, збілася з дарогі, а тым часам ужо сцямнела. Яна і не бачыла, што дом недалёка. Мала да яго не дайшла, стамілася, прылягла адпачыць, метраў за сто ад нашай хаты, ды болей ужо і не ўстала. Снегам яе засыпала, а мы нічога і не ведалі. Потым, калі вясна пачалася, знайшлі яе рыбакі...

## НА ГНЯЗДОЎІ ЧАПЛЯЎ

Я распытваю Ліпніцкага пра чапляў.

Наглядчык гаворыць, што калонія іх знаходзіцца ў чатырох кіламетрах адсюль, за ракой Нарачанкай.

Ісці туды трэба паўз бераг возера.

— Да моста ля вытокаў Нарачанкі дабрацца вельмі цяжка,— тлумачыць гаспадар.— Давядзецца вам ісці па

вадзе, па палках, бо іначай не прайсці. Потым яшчэ тры кіламетры па сухой зямлі.

— А ці многа іх там, чапляў? — пытаюся я.

— Вельмі многа,— адказвае Ліпніцкі.— Больш за сотню гнёздаў будзе. Калі іх патрывожыць, яны страшэнны гвалт узнімаюць. Лётаюць, як апантаныя, цэлай хмарай.

— А ў вас тут яны бываюць?

— Не так ужо часта. Яны кормяцца больш па берагах Нарачанкі ды па навакольных балотах. Прылятаюць часам і сюды, на сажалкі, але вельмі рэдка, бо я іх тут страляю. Палохаю, каб малявак не бралі.

Гаспадыня папярэджвае мяне, што цераз Нарачанку без староннняй дапамогі не перабрацца.

— Зіма была снежная,— гаворыць яна,— а вясна дажджлівая. Вада ў рацэ высокая, і гаць, што да моста цераз Нарачанку, затоплена.

Я ўсё ж такі вырашыў ісці адзін.

— Ці можна пераправіцца, зняўшы абутак?

— Босым ісці нельга,— гаворыць гаспадыня.— Можна ногі пакалечыць, бо палкі пад вадой слізкія і сукаватыя. Упасці можна. Трэба ісці ў гумавых ботах. Ногі ўсё роўна будуць мокрыя, бо вада вышэй ботаў, але ж затое непакалечаныя.

Ліпніцкі даў мне свае рыбацкія гумавыя боты вышэй каленяў.

— Свой абутак вазьміце з сабой,— раіць ён мне.— Калі пяройдзеце Нарачанку, пакіньце боты ў кустах ля пераправы. Ніхто іх тут не возьме. Мы заўсёды гэтак робім. Далей ідзіце ў чаравіках, бо ісці тры кіламетры па сухой зямлі ў мокрых гумавых ботах будзе вельмі цяжка.

Я ўзяў боты гаспадара пад паху, узброіўся бярозавым кіем і рушыў у дарогу.

— Ідзіце па дамбе ўздоўж берага да самай гаці!— крыкнуў мне Ліпніцкі наўздагон.

Па зялёнай земляной дамбе між сажалкамі і берагам возера жвава скачуць шэрыя пліскі.

Дамба абсаджана тоўстымі разгалістымі вербамі.

Над сажалкамі лятаюць ластаўкі, кнігаўкі і чайкі.

З возера дзьме рэзкі вецер.

Хвалі з белымі грабянямі з шумам наступаюць на пясчаны бераг. Уражанне такое, быццам па цёмна-зеленаватай вадзе плывуць адна за адной белыя крыгі. Усё возера пакрыта такімі крыгамі. Сонца часта знікае за белымі воблакамі, якія шпарка плывуць па небе.

Вось і канец дамбе. Я нацягваю рыбацкія боты і лезу ў ваду. Цяпер я іду па нешырокай вадзяной дарозе. Абапал балотная дрыгва з густой і высокай расліннасцю. Над балотам жаласна крычаць кнігаўкі.

Вада спачатку даходзіць мне да каленяў, потым падымаецца вышэй. Подводная гаць з жэрдак і палак спружыніць пад нагамі. На кожным кроку палкі пад цяжарам нагі апускаюцца глыбока ўніз. Ногі слізгаюцца па жэрдках, якія абраслі пад вадой зялёнай тваннню.

Трэба ісці павольна, асцярожна ставячы нагу на няпэўную апору, балансуючы і намацваючы дарогу кіем.

Ісці можна толькі па адкрытай вадзе. Па баках, у зарасніках асакі, яшчэ глыбей. Там непралазная дрыгва, з якой не выберашся.

Становіцца ўсё глыбей і глыбей.

Наперадзе відаць высокі драўляны мост без парэнчаў. На ім сядзяць тры чалавекі ў розных позах і ловяць рыбу. Побач з імі ляжыць сабака.

Калі я, намацваючы дарогу, сам таго не заўважыўшы, занадта наблізіўся да левага краю, адзін з рыбакоў устаў, замахаў рукою і крыкнуў:

— Толькі прама! Трымайцеся сярэдзіны! Туды нельга, там утапіцца мо-о-жна-а-а!..

Я паслухаўся парады і трымаюся сярэдзіны.

Чым далей, тым глыбей. Каля самага моста гаць апусцілася так глыбока, што я зачарпнуў вады спачатку

левым ботам, а потым, стараючыся знайсці раўнавагу, і правым.

Вылажу на мост, перакінуты цераз Нарачанку.

Разуваюся, выліваю ваду з ботаў. Сушуся на ветры і на сонцы, якое раз-пораз хаваецца за воблакамі.

Рыбаловы на мосце мерзнуць. Твары ў іх пасінелі ад холаду, але яны стойка церпяць усе нягоды дзеля любімага занятку.

Пачынаецца гутарка наконт надвор'я і рыбнай лоўлі.

І тут высвятляецца, што рыбаловы — масквічы. Яны праводзяць свой летні адпачынак у вёсцы Занарач, дзе жыве нейкі сваяк аднаго з трох сяброў.

«Ажно вунь куды забраліся! — падумаў я.— Дзе толькі не сустрэнеш масквіча ці ленінградца!»

Вакол цікавы, своеасаблівы пейзаж.

Нарачанка тут паўнаводная, з шырокай балоцістай поймай і зусім непрыкметнай плынню.

Адпачыўшы, я спускаюся ў ваду з другога боку моста.

Тут не так глыбока. Крокаў праз дваццаць я выходжу на сухую зямлю.

Скідаю боты і хаваю іх у кустах, як раіў мне Ліпніцкі. Далей іду ўздоўж берага возера ў трусах і чаравіках.

З правага боку раскінулася балоцістая роўнядзь, злева — пясчаны бераг Нарачы.

Прайшоўшы з кіламетр, спыняюся.

Сярод балотнай расліннасці я ўбачыў знаёмую зграбную постаць шэрай чаплі.

Яна стаіць недалёка ад мяне на аднойназе. Другая нага падкурчана пад жывот. Шыя чаплі ўцягнута ў плечы. Вострая жоўтая дзюба нацэлена ўніз.

Я выразна бачу яе светла-шэрае тулава, белую галаву з чорнай палоскай, якая пераходзіць на патыліцы ў прыгожы чорны султан.

Чапля стаіць нерухома. Здаецца, што гэта не жывая птушка, а добра зробленае чучала.

Раптам яна імкліва ўдарае дзюбай у ваду. Выхапіўшы рыбку, якая бліснула срэбрам на сонцы, чапля цяжка ўзлятае, боўтаючы жоўтымі нагамі над балотам. Некалькі моцных узмахаў крыламі — і вось яна ляціць са сваёй здабычай туды, дзе відаць на пагорку сосны. Яна нібы паказвае мне дарогу да гняздоўя.

Я іду далей у тым жа напрамку, у якім паляцела чапля. Бераг возера становіцца ўсё вышэйшы.

Над пясчаным абрывам растуць сосны. Зямля пакрыта мохам, кусцікамі чарніц.

Над берагам тры кнігаўкі з крыкам гоняць варону.

Сцежка звярнула ў лес. Сюды ўжо не далятае вецер. Сонца пачынае прыпякаць.

Я выходжу на зялёную палянку недалёка ад возера.

З аднаго боку — балоцістая лугавіна, з другога — старыя сосны на сухім узвышшы. Адтуль чуваць крык маладых чапляў.

Вось дзе знаходзіцца іх гняздоўе!

Саміх гнёздаў я адразу і не заўважыў. Яны схаваны высока сярод зялёнай хвоі сосен. Толькі нецярплівы хрыплы крык птушанят сведчыць аб тым, што калонія чапляў іменна тут.

Вось да адной з высокіх старых сосен падляцела чапля. Цяпер я разгледзеў і гняздо. Яно зроблена даволі нядбайна.

Чапля апусцілася на вялікі сук каля гнязда. Птушаняты сустрэлі яе частым і ўсхваляваным:

— Ке-ке-ке-ке-ке...

Чапля сунула ім нешта ў гняздо, і яны змоўклі. Тады яна паляцела прэч.

Чаплі сядзяць на яйках амаль месяц. Малыя птушаняты бяруць корм спачатку з дзюбы бацькоў, а потым з гнязда, куды бацькі кідаюць прынесеную здабычу. Праз шэсць-сем тыдняў маладыя чаплі пачынаюць лятаць.

Я саджуся на пень і аглядаюся.

На соснах сапраўды, як казаў Ліпніцкі, больш за сотню гнёздаў, але ўсе яны схаваны ў зяляніне і здалёку амаль непрыкметны. Гнёзды вялікія, плоскія, зробленыя з галля і сцяблоў чароту.

На зямлі пад соснамі гніюць рэшткі няз’едзеных рыб. Над імі віюцца і гудуць мухі. Пахне тут нядобра. Зямля навокал забруджана.

Між іншым, чапля корміцца не толькі рыбай, але і мышамі, жабамі, слімакамі, рознымі насякомымі.

Мне казалі, што за дзень яна з’ядае каля пяцісот грамаў featурознага корму.

З гнёздаў чуюцца хрыплыя крыкі. Малыя чаплі неспакойна варушацца, чакаючы корму. Некаторыя гнёзды пустыя. Маладыя чаплі ранніх вывадкаў пакінулі іх нядаўна. Яны яшчэ не навучыліся добра лятаць і трымаюцца ля гняздоўя.

На суку невысокай разгалістай сасны сядзіць недалёка ад мяне маладая чапля.

Я ўстаю і падыходжу бліжэй, павольна і асцярожна, з вялікімі перапынкамі.

Чапля, не адрываючыся, глядзіць на мяне сваім неспакойным жоўтым вокам, але ўцячы не спрабуе. Яна яшчэ не набыла поўнасцю аблічча дарослай чаплі. Галава ў яе нейкая ўскудлачаная, дзюба шырокая і караткаватая. Выгляд, трэба сказаць, не вельмі прывабны.

Я пасоўваюся яшчэ бліжэй.

Чапля глядзіць на мяне падазрона, але не адлятае. Спачатку гэта мяне здзівіла, але хутка я здагадаўся, у чым справа.

Чапля яшчэ не ўмее лятаць. Яна, мабыць, толькі што пакінула гняздо і адчувае сябе вельмі няўпэўнена. Гэта яе першы выхад у свет. Палёту яна баіцца больш, чым незнаёмай істоты, якую бачыць, магчыма, першы раз у жыцці, тым больш, што чалавек, які стаіць перад ёю, не робіць рэзкіх рухаў і не выяўляе варожых намераў.

Вось яна і сядзіць нерухома на сваім сасновым суку, не зводзячы з мяне вострага, насцярожанага позірку.

Я не захацеў яе больш непакоіць і, ціха абмінуўшы, пайшоў далей.

Усюды адзін і той жа малюнак — на соснах гнёзды, на зямлі пад соснамі бруд і смецце.

Вось я нарэшце і пабываў на гняздоўі чапляў!

На жаль, я не магу тут доўга затрымлівацца, бо абяцаў вярнуцца ў дом ля сажалак не пазней пятай гадзіны.

Па дарозе назад я знаходжу ў кустах каля пераправы свае гумавыя боты. Штаны і шкарпэткі, развешаныя на галінах вярбы, за гэты час добра высахлі, але зараз ім зноў давядзецца мокнуць.

Я пераходжу мост, на якім па-ранейшаму сядзяць і цярпліва мерзнуць на халодным ветры масквічы-рыбаловы, і зноў іду па глыбокай вадзяной дарозе сярод балота. Назад ісці крыху лягчэй, бо траса як-ніяк ужо асвоена.

Студэнты вярнуліся тым часам з сажалак, але ехаць на катэры навуковы кіраўнік яшчэ не дазваляе. Трэба чакаць, пакуль сунімецца бура, якая бушуе зараз на возеры.

Гадзіны праз дзве возера крыху супакоілася. Але назад катэр плыве ўсё-такі не наўпрост, а ўздоўж берага, робячы круг.

— Тут, у затоцы, зацішней,— гаворыць наш кіраўнік.

Абмінуўшы касу, катэр выраўноўвае курс, і далей плывём па прамой лініі.

Вярнуліся мы на станцыю каля дзевяці гадзін вечара.

Калі высадзіліся на бераг, на возеры панаваў спакой. Неба ачысцілася ад хмар, вецер сціх, і вялізная сіняя чаша Нарачы іскрылася і зіхацела ў залаціста-ружовых праменнях вячэрняга сонца.

# РЫЖАЯ ГОСЦЕЙКА

З’явілася ў мяне нядаўна вясёлая суседка.

Вось і сёння сядзіць на сасне недалёка ад хаты, дзе я жыву. Рыжае футра гарыць, як жар, сярод зялёнай ігліцы. Чорныя вочкі, бліскучыя, як пацеркі, пазіраюць з цікаўнасцю.

Я падышоў бліжэй, асцярожна ступаючы па верасе.

Вавёрка і не думае ўцякаць!

Яна яшчэ вельмі маладзенькая. Ніхто яе не палохаў, і яна не баіцца людзей. Мітуслівa круціцца на суку, каб прыцягнуць маю ўвагу, і даверліва схіляе галаву з цёмнымі кутасікамі на вушках то на адзін бок, то на другі.

Я зрабіў яшчэ два-тры крокі і спыніўся.

Вавёрка зацокала, замармытала нешта сабе пад нос і забарабаніла пярэднімі лапкамі, а сама прыглядаецца, якое ўражанне зрабілі на мяне гэтыя фокусы.

Калі я апынуўся ля самага дрэва, яна спрытна паднялася, робячы кругі вакол ствала, на самы верх, пераскочыла на старую яліну і схавалася ў густых цёмназялёных лапках.

«Трэба гэтую вясёлую суседачку прывабіць,— падумаў я.— Няхай прыходзіць да мяне ў госці».

У той жа вечар я панатыкаў кавалачкі белага хлеба на вострыя сучкі высокай сасны, што расце насупраць маёй хаты. Адзін кавалачак я паклаў на стары пень між сасной і хатай. Некалькі кавалачкаў пакінуў на ганку. І сасна, і пень, і прыступкі ганка добра відаць з майго акна.

На другі дзень увесь хлеб застаўся, як і быў. Ніхто да яго не дакрануўся. Яшчэ праз дзень хлеб на сасне знік, а на пні і на ганку застаўся.

Нехта частаваўся. Цікава, хто? Вавёрка ці, можа, птушкі?

Наступнай раніцай я адразу, як заўсёды, зірнуў у акно. Як жа я ўзрадаваўся, калі ўбачыў на сасне супроць хаты рыжанькага звярка!

Хлеба на сучках зноў не было.

Жвава і спрытна пераскаквала вавёрка з галінкі на галінку, аглядаючы дрэва. Яна абабегла вакол ствала, паднялася вышэй і села на сук. Пушысты хвост звесіўся ўніз. Вось вавёрка зірнула на пень. І раптам шпарка пачала спускацца па ствале, чапляючыся за кару шырока расстаўленымі лапкамі. Залацістыя лускавінкі кары пасыпаліся на зямлю. Вавёрка саскочыла з сасны і ў адну хвіліну апынулася на пні.

Кавалачак хлеба быў малы, і яна хутка з ім управілася. Затым прабегла па траве да прыступак.

Вось яна сядзіць ужо на ганку перад самым акном і трымае скарынку хлеба пярэднімі лапкамі. Хвосцік яе выцягнуўся ўздоўж спіны, як пушысты пытальнік, носік безупынна рухаецца. Яна паспешліва грызе сухі хлеб.

Цяпер я пераканаўся, што не птушкі ласаваліся пачастункам, а маладзенькая вавёрачка, мая рыжая гасцейка.

Я выйшаў з хаты.

Вавёрка вярнулася на сасну. Яна перабегла па галінцы на самы край, скокнула і, раскінуўшы ў паветры лапкі і хвост, пераляцела на суседняе дрэва, а з яго — на другое, на трэцяе...

Раніца была ціхая, бязветраная, і там, дзе пераскаквала вавёрка, доўга яшчэ пагойдваліся галінкі, паказваючы шлях рыжага звярка.

## КАНЮКІ І ЛЯЛЯК

Возера было нейкага малочнага колеру і, як і ўчора, зусім нерухомае. Гладкае і спакойнае, яно злівалася на даляглядзе з такім жа малочным небам.

На гэтым бледным фоне выразна і адначасова вельмі мякка вырысоўваўся чорны сілуэт рыбацкай лодкі

з дзвюма нерухомымі постацямі людзей. Лодка нібы застыла ў вадзе. Адлюстраванне яе ў возеры нічым не адрознівалася ад рэальнай лодкі на паверхні. Яно такое ж цёмнае і мяккае. Нічога рэзкага, ніякіх кантрастаў. Паветра насычана выпарэннямі, якія асядалі на кустах і дрэвах найдрабнейшым вадзяным пылам.

На станцыі мяне сустрэў Лёня.

— Магу вам паказаць новых нашых гадаванцаў,— сказаў ён.— Глядзіце.

У скрынцы пад кустом бэзу сядзелі два маладыя канюкі. Памерам яны крыху большыя за варону, прысадзістыя, з гладкім апярэннем цёмна-карычневага колеру, з кароткай загнутай дзюбай і вялікімі цёмнымі вачыма.

Выглядалі маладыя канюкі зусім як дарослыя, толькі аснова дзюбы была ў іх яшчэ жоўтая.

— Дзе вы іх узялі? — спытаў я.

— У лесе за Малінаўкай,— адказаў Лёня.— На высокай сасне было гняздо з сухога галля, высланае ўнутры травой і свежымі галінкамі з лісцем... Яны ў нас ужо некалькі дзён.

Канюкі трымаюць сябе мірна і спакойна. Яны нават дазваляюць гладзіць сябе па галаве.

Студэнты кормяць іх сырым мясам і адкідамі з кухні.

— Што вы будзеце з імі рабіць? — пытаюся я ў Лёні.

— Падгадуюцца трошкі, тады акальцуем і выпусцім на волю.

Канюкі адсунуліся ў цёмны куток скрынкі-клеткі.

— Учора і сёння надвор'е вельмі парнае, душнае,— кажа Лёня.— Вось я і трымаю іх пад кустом, у цяньку. Ім тут лепш у халадку.

Сапраўды, паветра душнае і нерухомае. Сонца прадралася нарэшце скрозь бялявую заслону, але свеціць цьмяна, заімглёна.

— Чым вы яшчэ можаце пахваліцца? — пытаю я.

— Больш пакуль што нічым,— адказвае Лёня. Потым, крыху ажывіўшыся, гаворыць: — У лесе каля сфагнавага балота, усё за той жа Малінаўкай, я знайшоў гняздо леляка. Хаця, якое ж гэта гняздо? Проста падсцілка з моху на кучы галля. У гняздзе былі два птушаняткі. Калі леляка патрывожыць у той час, як ён сядзіць на яйках, ён пераносіць яйкі ў дзюбе на другое месца. Праз дзень я прыйшоў туды зноў, але птушанят ужо не было. Вясковыя хлапчукі, якія пасвілі непадалёку кароў, знайшлі гняздо і разбурылі, а птушанят забралі з сабой.— Студэнт змоўк.— Шкада,— дадаў ён праз хвіліну,— бо ляляк — птушка карысная.

— Відаць, у некаторых школах на ўроках прыродазнаўства кепска растлумачваюць вучням, што птушак трэба шанаваць і ахоўваць...

— А ведаеце, чаму леляка называюць яшчэ казадоем і чаму ўзнікла недарэчная байка, быццам ён доіць коз? — спытаў Лёня.

— Раскажыце,— папрасіў я.

— Справа ў тым,— пачаў малады арнітолаг,— што людзі часта бачаць леляка ўвечары каля коз і кароў. Часам ён бясшумна і нечакана ўзнімаецца ў паветра ледзь не з-пад самых ног у жывёлы. Леляка, зразумела, зусім не цікавіць малако. Пад нагамі ў кароў і ў коз ён ловіць насякомых, якія злятаюцца туды, дзе знаходзіцца жывёла. Людзям жа здавалася, што гэты начны птах корміцца малаком і што вялікі рот у яго іменна для таго, каб зручней было смактаць. Між тым, сваім шырокім ротам ляляк ловіць у вячэрнім паветры шкодных начных матылькоў і жукоў. Ён ловіць іх да самай раніцы, калі ўсе іншыя насякомаедныя птушкі спяць.

Лёня скончыў свой расказ пра леляка і зірнуў на гадзіннік. У гэты час да нас падышоў другі студэнт і паклікаў майго субяседніка на заняткі. Лёня развітаўся і заспяшаў разам са сваім сябрам, а я накіраваўся ў цэнтральны будынак станцыі, дзе знаходзіўся музей.

# САРОКА

На прыступках ганка да мяне падскочыла маладая сарока і шырока разявіла дзюбу.

Я нахіліўся і пагладзіў яе па спіне. Сарока не пярэчыла. Калі ж я хацеў узяць яе ў рукі, сарока спрытна адскочыла ўбок.

З дзвярэй выйшла студэнтка са слоікам у руцэ.

— Піка, Піка,— паклікала дзяўчына, і сарока адразу ўскочыла ёй на плячо.

Студэнтка паклала птушцы ў дзюбу пінцэтам нейкага чарвяка.

Сарока праглынула яго і адразу зноў шырока разявіла рот.

— Ах ты, ненасытная,— засмяялася дзяўчына і дала птушцы яшчэ аднаго чарвяка.

Я з цікавасцю сачу за гэтай сцэнкай.

— Яна зусім свойская,— звярнулася да мяне студэнтка,— і падскаквае да кожнага чалавека, знаёмага ці незнаёмага, патрабуючы есці. Мы назвалі яе Піка, бо па-латыні гэта і ёсць сарока.

Сарока праводзіць увесь дзень на ганку. Спіць яна на спінцы лаўкі ці на кусце бэзу. На вокнах яна ловіць мух. Лятаць сарока яшчэ не ўмее, толькі перапырхвае з лаўкі на куст і з куста на лаўку...

Кожны раз, калі я прыходзіў на станцыю, сарока сустракала мяне на прыступках, патрабуючы выкупу. Я заўсёды даваў ёй то хлеба, то кавалачак сыру.

Прайшло некалькі дзён.

Сарока пачала адлятаць усё далей і далей ад станцыі.

Неяк я ўбачыў яе на плоце каля вёскі Урлікі. Я падышоў і пагладзіў яе, як звычайна, па спіне. Убачыўшы, што ў мяне з сабою нічога няма, сарока пераляцела на дрэва.

У другой палове ліпеня студэнты раз'ехаліся. На станцыі стала ціха і бязлюдна. Сарока за гэты час навучылася лятаць і самастойна знаходзіла сабе корм. Яна адлятала цяпер ад станцыі, якую лічыла сваім домам, на досвітку і вярталася на ганак толькі позна вечарам. Начавала яна па-ранейшаму заўсёды на лаўцы ганка ці на суседнім кусце бэзу.

Пад канец месяца яна зусім перастала наведваць станцыю і хутка адвыкла ад яе, але людзей, як і раней, не баялася.

Вяртаючыся з лесу за Урлікамі, я неяк зноў сустрэў знаёмую сароку на беразе возера. Яна зляцела раптам з сасны і апусцілася перада мною на сцежку, нібы перагарадзіўшы дарогу і патрабуючы выкупу за праход.

Калі я працягнуў да яе руку, яна адскочыла ўбок, але не адляцела. Я пашкадаваў, што не ўзяў з сабою хлеба і нічым не мог яе пачаставаць.

Пераканаўшыся, што ў мяне нічога для яе няма, сарока адышлася ўбок і, не звяртаючы на мяне ўвагі, пачала нешта дзяўбці на сцежцы.

Нейкі час я падазраваў сароку ў тым, што яна з'ядае на досвітку кавалкі хлеба, якія я пакідаў на сасне перад хатай для вавёркі, маёй рыжай госцейкі, але потым пераканаўся, што падазрэнні не маюць падставы.

Пасля ад'езду студэнтаў сарока ўсё часцей пачала бываць у вёсцы, дзе кармілася каля дачнікаў.

Перад сваім ад'ездам з Нарачы я апошні раз убачыў сароку на падаконніку расчыненага акна адной з хат у вёсцы Урлікі.

Выхаванка біялагічнай станцыі сядзела на акне і пазірала на вуліцу.

Да акна падышла пажылая жанчына і пакарміла сароку з рукі.

— Яна прылятае да нас па некалькі разоў на дзень,— сказала жанчына.— Заляціць часам праз акно ў хату і сядзе на шафу. Корм бярэ ахвотна, але ў рукі не даец-

ца. Як і ўсе сарокі, яна вялікая зладзейка і шкодніца. Украла ў мяне нядаўна ведаеце што? Маток чырвоных нітак,— смеючыся закончыла гаспадыня.

Сарока пераляцела тым часам з падаконніка на шафу і пазірала адтуль сваім хітрым бліскучым вокам так, быццам разумела, што гутарка ідзе пра яе.

— Зусім свойская,— заўважыла жанчына.— Праз некалькі дзён мы вернемся ў горад. Не ведаю, што яна будзе рабіць? Раней трымалася каля студэнтаў, цяпер каля нас. Хто ж яе потым будзе карміць?

— Нічога,— сказаў я.— За сароку можаце не турбавацца. Адвыкне ад людзей, адвыкне і ад пачастункаў, ад лёгкага, дармовага хлеба. Будзе жыць, як і ўсе сарокі жывуць. А яны, як і сёстры іхнія, вароны, ядуць усё, што могуць знайсці ці здабыць. Не прападзе.

## САРАКУШ

Над возерам, на плоскай і роўнай вяршыні ўзгорка, густа расце шыпшына. Крыху далей — кусты глогу і некалькі высокіх акацый.

Я падыходжу да зараснікаў. Як цудоўна пахнуць кветкі дзікай ружы! Які прыемны куток!

Але што гэта?

На калючку наколаты майскі жук. Востры шып працінае яго наскрозь. Крыху далей гэтак жа праткнуты жук-караед, за ім — буйны конік.

А вось і зялёны рагаты вусень. Ён яшчэ курчыцца і звіваецца, працяты бязлітаснай іголкай.

На суседнім глогу тое самае. На вялікі шып насаджана палёўка, а галавы ў яе няма.

І гэта ў такім паэтычным месцы, побач з прыгожымі кветкамі шыпшыны!

Хто ж гэта мог зрабіць? Каму гэта спатрэбілася? Навошта такая жорсткасць?

Я аглядаюся навакол.

А, вось ён дзе, разбойнік!

Спакойна сядзіць злачынца на акацыі. У яго прысадзістае моцнае тулава. Галава і шыя шэрыя, лоб і шчокі чорныя, спіна і плечы карычневыя, горла, грудка і брушка белыя, крылы і хвост чорна-бурыя. Велічынёю ён большы за вераб'я, але меншы за шпака.

Гэта — саракуш, ці, як яго яшчэ называюць, жулан.

Тут, на шыпшыне і глогу, ён захоўвае свае харчовыя запасы. Гэта яго кладоўкі.

Сёння, відаць, было многа здабычы, усяго з'есці саракуш не здолеў, вось і накалоў на шыпы. Няхай падсушыцца і праветрыцца. Вечарам ці заўтра ўранку ён з'есць гэтыя запасы разам са сваёй сяброўкай ці скорміць сваім птушанятам.

Мабыць, і гняздо недзе тут, бо саракуш любіць жыць у густых і калючых зарасніках, а нарыхтоўкі свае робіць заўсёды недалёка ад гнязда.

Я сеў на камень і сачу за саракушам.

Заняўшыназіральны пункт на самай вяршаліне акацыі, саракуш доўга сядзіць, паторгваючы хвастом, і аглядае мясцовасць, паварочвае галаву то ў адзін, то ў другі бок.

Праходзіць некалькі хвілін.

Раптам ён скокнуў уніз на кучу ссечанага нядаўна сучча сасны, злавіў і з'еў караеда. Пасля гэтага патачыў дзюбу з абодвух бакоў аб сучок, на якім сядзеў, натапырыўся, страсянуўся, пачысціў дзюбай пер'е. Праз хвіліну ён паляцеў спачатку нізка над зямлёй, а потым рэзка ўзняўся і з разгону сеў на самую верхнюю галіну акацыі, на тое самае месца, дзе сядзеў, калі я яго заўважыў.

Недзе зусім блізка пачулася стракатанне сарокі:

— Чы-чы-чы-чы-чы-чы...

Я міжвольна азірнуўся, але сарокі не ўбачыў. Стракатанне паўтарылася, яшчэ больш рэзкае, частае, узбуджанае.

Нікога навокал не было. Толькі на сучку белай акацыі сядзеў па-ранейшаму саракуш.

Стракатаў, як сарока, ён.

Я ўспомніў: шмат якія пеўчыя птушкі пераймаюць гукі, што чуюць ад іншых птушак. Гэта ўласціва і жулану. У яго спеве можна пачуць і стракатанне сарокі, і цвырыканне вераб'я, і шчабятанне ластаўкі, і меладычны свіст івалгі, і хрыплае карканне вароны, і яшчэ нейкія, зусім не знаёмыя гукі, якіх у нашых лясах, палях і садах ні ад каго і не пачуеш.

Адкуль у жулана такія дзіўныя і незвычайныя трэлі? Яны не падобны на спеў ні адной з нашых птушак.

Магчыма, саракуш запазычыў гэтыя гукі ў час сваіх зімовых падарожжаў па лясах далёкай і спякотнай Афрыкі ад невядомай трапічнай птушкі ў яркім, каляровым убранні. А можа, ён пераняў іх ад свайго бацькі ці ад жуланаў-суседзяў.

Саракуш хоць і пеўчая птушка, але звычкамі і паводзінамі сваімі нагадвае драпежніка. Дзюба ў яго, загнутая ўніз, як кручок, падобна на дзюбу драпежных птушак. Яна прыстасавана для таго, каб разрываць здабычу.

Жулан знішчае конікаў, хрушчоў, караедаў і іншых буйных насякомых, ловіць мышэй, яшчарак і малых птушанят. Лішнюю здабычу саракуш наколвае не толькі на шыпы цярністых раслін, але нават і на калючы дрот.

Пасля першай сустрэчы я часта прыходзіў сюды на працягу ўсяго лета, каб паглядзець на жулана і яго сям'ю.

Гняздо ў яго было сплецена невысока над зямлёю, у самай гушчы кустоў глогу, а суседняя акацыя служыла яму вартаўнічай вежай.

У канцы жніўня я ўбачыў на ўзгорку каля акацыі ўсё сямейства жулана. Іх было чацвёра — бацькі і двое малых.

Птушаняты, якія толькі што пакінулі гняздо, былі мала меншыя за дарослага саракуша. Яны перапырхвалі з галінкі на галінку, з куста на куст. Каля дзюбы ў іх яшчэ была жаўцізна. Афарбоўка ў малых не такая яркая, як у бацькоў, але зверху выразна пераважае карычневы колер, а знізу — шэры. Хвост у іх яшчэ караткаваты.

Я падышоў да маладых саракушаў бліжэй.

Яны даверлівыя, падпускаюць блізка да сябе, не адлятаюць і глядзяць на мяне, не выказваючы страху.

Бацькі кружацца ў паветры і трывожна крычаць:

— Чэк... чэк... чэк...

Пасля таго як птушаняты навучыліся лятаць і самастойна здабываць корм, саракушы пачалі трымацца паасобку. Цяпер кожны з іх жыў сам па сабе. Яны не збіраюцца ў чароды і гэтым таксама нагадваюць драпежных птушак.

У пачатку верасня саракушы зніклі з берагоў Нарачы. Яны паляцелі на зімоўку ў Афрыку, адкуль вернуцца сюды ў сярэдзіне мая.

За саракушам я назіраў на тым жа самым месцы і ў наступным годзе. Ён трымаўся па-ранейшаму ля той жа акацыі, пільнуючыся свайго ўчастка з кустамі шыпшыны і глогу на вяршыні ўзгорка над возерам.

## ЧОРНЫ ДЗЯЦЕЛ

У лясах каля Нарачы многа дзятлаў.

Я часта бачу тут і малога пярэстага, і вялікага пярэстага дзятла, і палахлівага чорнага дзятла — жаўну, якая трымаецца ў лясным гушчары і не любіць паказвацца чалавеку на вочы.

У лесе за Купаю, на ўзвышшы каля самага возера, на кожным кроку відаць сляды дзейнасці дзятлаў.

Вось на адной з сосен уваткнута ў шчыліну між кары вылушчаная сасновая шышка. Недалёка ад яе, у развілцы паміж ствалом і суком, другая шышка. На зямлі пад соснамі ляжыць цэлая куча такіх вылушчаных і растрыбушаных шышак.

Гэта — работа дзятла.

Толькі я падышоў да гэтага месца, як недалёка ад мяне пачулася лёгкае пастукванне.

Я павярнуў асцярожна галаву, стараючыся не варушыцца, і зірнуў у той бок, адкуль пачуўся гук.

Крыху вышэй аднаго метра ад зямлі вялікі пярэсты дзяцел дзяўбаў шышку, заціснутую ў шчыліне ў ствале маладой сасны. Адкідваючы галаву назад і ўчапіўшыся кіпцюрамі ў кару, ён з размаху, метадычна стукаў дзюбай па шышцы, вылушчваючы з яе насенне. Скончыўшы «апрацоўку» шышкі, дзяцел пачаў падымацца па ствале, рухаючыся вакол яго па спіралі.

Калі ён адляцеў з рэзкім і энергічным «кік-кік», скінуўшы мне на памяць сваё цёмнае з зеленаватым адценнем і белай авальнай плямай на канцы пяро, я падышоў да сасны і агледзеў яго «рабочае месца».

Напалову вытрыбушаная шышка была даволі моцна заціснута ў паглыбленні ствала. Пад ёю ляжала між карэнняў дрэва вялікая горка раней вылушчаных шышак.

Гэта — «сталовая» дзятла, ці, як часцей кажуць, яго «кузня», такая ж, як і дзве другія па суседству, якія я толькі што аглядаў. Усе яны належаць, відаць, аднаму і таму ж дзятлу, бо гэтая птушка любіць адзіноту і не церпіць блізка ад сябе суседзяў.

Дзяцел тым часам вярнуўся і цяпер выстукваў над маёй галавою другую высокую сасну, аддзіраючы цэлыя кавалкі кары, якія з шумам падалі ўніз.

Нібы акрабат, лазіць ён па ствале не толькі знізу ўверх, але і вакол ствала, паралельна зямлі. З якой

надзвычайнай добрасумленнасцю аглядае дрэва гэтая сур'ёзная птушка! Дзяцел абследуе ствол знізу ўверх па ўсёй яго паверхні. Рухі дзятла шпаркія і рэзкія, але часам ён надоўга затрымліваецца на адным месцы, упарта і настойліва выганяючы з-пад кары і з самой драўніны шкоднікаў, якія хаваюцца ў глыбокіх хадах.

Вось ён з шумам перапырхнуў на суседняе дрэва. Скрозь зяляніну відаць яго чырвоная шапачка і пярэстае, белае з чорным, апярэнне.

Я спусціўся па схіле ўзгорка і падаўся далей.

Характар мясцовасці паступова змяніўся. Малады сасняк перайшоў у густы і вільготны змешаны лес. Тут растуць не толькі сосны, але і высокія, старыя яліны, бярозы і дубы, таполі і асіны. Пад нагамі шмат буралому.

Праменні летняга сонца прабіваюцца скрозь густое лісце, кладучы вакол светлыя няроўныя плямкі.

Гэтыя плямкі ціха рухаюцца па зямлі, нібы жывыя карункі,— адзнака таго, што недзе ўверсе пагойдвае вершаліны лёгкі ветрык, які непрыкметна дзьме з возера. А тут, унізе, пад высокім зялёным скляпеннем, ціха і спакойна.

— Кі-кі-кі-кі-і-і-й...— пачулася раптам у вільготным лясным паветры.

А потым і яшчэ нейкія дзіўныя гукі:

— Пр... пр... пр... пр...

Гэты прарэзлівы, жаласны крык прагучаў як скарга. Так крычыць толькі жаўна, вялікі чорны дзяцел. Гэта ён лямантуе ў лясным гушчары, скардзіцца аб нечым сваёй сяброўцы.

Крык жаўны можна пачуць не толькі ў такі ясны і прыгожы летні дзень, як сёння, але і восеньскім дажджлівым змрокам, і зімою, калі ўсё навокал засыпана снегам, і вясной, калі пачынаюць раскрывацца пупышкі на дрэвах і кустах.

Жаўна — самы буйны з усіх дзятлаў. Трымаецца ён звычайна ў глухіх кутках няходжанага лесу. Убачыць чорнага дзятла можна не так ужо часта.

Усё сваё жыццё жаўна праводзіць на ствалах дрэў і ў дупле, дзе спіць і выводзіць патомства. На зямлю чорны дзяцел спускаецца хіба толькі для таго, каб паласавацца мурашкамі. Ён выпускае з дзюбы свой доўгі і ліпучы язык, тонкі, як шнурок. Калі ўстрывожаныя мурашкі аблепяць яго з усіх бакоў, жаўна ўцягвае язык у дзюбу і глытае мурашак. Так робіць чорны дзяцел некалькі разоў, пакуль не насыціцца.

Рухавы і востры на канцы язык жаўны высоўваецца з дзюбы сантыметраў на восем, і жаўна, як і ўсе іншыя дзятлы, лёгка прасоўвае яго ў шчыліны кары, у хады, прасвідраваныя ў дрэве жучкамі, і выцягвае лічынкі караедаў, пільшчыкаў, даўганосікаў з іх патаемных схованак.

Сваёй вострай і моцнай дзюбаю чорны дзяцел прабівае кару, свідруе драўніну, растрыбушвае шышкі.

У пачатку красавіка самка жаўны робіць сабе гняздо. Яна выбірае старое дрэва, звычайна яліну, і выдзёўбвае дупло, у якое кладзе тры-чатыры бліскучыя яйкі.

Але ж чаго раскрычалася гэтая чорная птушка? Чым яна так устрывожана?

Вось зноў паўтарыўся яе жаласны крык.

Уверсе пачуўся шум, неспакойная мітусня.

Я ўзняў галаву і зірнуў на кроны высокіх дрэў.

Раптам адтуль ні то звалілася, ні то спусцілася на зямлю, чапляючыся за галіны, птушаня чорнага дзятла і апынулася каля маіх ног.

Я накрыў яго шапкай, перш чым яно паспела схавацца ў зарасніках падлеску.

Гэта была, відавочна, яго першая спроба палёту. Лятаць птушаня яшчэ не ўмела, але з выгляду амаль нічым ужо не адрознівалася ад бацькоў.

Я ўзяў маладую жаўну на рукі.

Ростам яна была крыху большая за галку. Апярэнне ў птушаняці такое ж чорнае, цьмянае, як і ў дарослай жаўны. Ярка-чырвоная шапачка на патыліцы сведчыць

аб тым, што гэта — самачка, бо ў самца жаўны не толькі патыліца, але і цемя чырвонае. Шыя ў жаўны вельмі рухавая. Чорны дзяцел можа адкінуць галаву далёка назад, каб з усёй сілы, з размаху стукнуць дзюбай па дрэве. Пры гэтым ён моцна трымаецца вострымі і ўчэпістымі кіпцюрамі за кару, абапіраючыся на цвёрды хвост.

Птушаня ўчапілася кіпцюрамі ў мае пальцы. Яно пазірала на мяне светлымі, малочна-блакітнымі вачыма і безупынна раскрывала дзюбу, паварочваючы галаву ва ўсе бакі.

Недзе ўверсе хваляваліся бацькі, але паказацца на вочы не адважваліся.

Добра разгледзеўшы птушаня, я пасадзіў яго на ствол старой яліны. Яно ўчапілася кіпцюрамі за кару і вельмі шпарка пачало ўзбірацца ўгору па процілеглым ад мяне баку дрэва. Хутка яно знікла з вачэй.

Старыя жаўны ўверсе супакоіліся. У лесе зноў запанавала цішыня.

## НА ПАЛЯНЦЫ

Нядаўна адзін хлопец з Варанцоў сказаў мне, што на палянцы за дарогаю на Кабыльнік часта бываюць удоды. Хлопец, праўда, не ведаў, як называюцца гэтыя, як ён казаў, «жоўтыя птушкі з грэбенем на галаве», але ён апісаў іх мне даволі дакладна. З яго слоў я зразумеў, што ён мае на ўвазе іменна ўдодаў.

Мне захацелася іх паглядзець.

Пад вечар аднаго дня ў канцы ліпеня я пайшоў у сасновы лес між пасёлкам рыбгаса і вёскаю Варанцы.

Перайшоўшы дарогу на Кабыльнік, я спыніўся ля куста ядлоўцу, каб зірнуць на гняздо берасцянкі, якое знайшоў тут аднойчы, якраз тады, калі вылупіліся з яек чацвёра птушанят. Яны былі ў той час яшчэ вельмі

маленькія, зусім голыя, бездапаможныя. Нават пішчаць яшчэ не ўмелі, але ўжо дружна раскрывалі свае шырокія ярка-ружовыя роцікі і моўчкі патрабавалі есці.

Я наведаў іх потым праз тры дні. Птушаняты значна падраслі. Яны голасна пішчалі і па-ранейшаму шырока разяўлялі насустрач дзюбкі, настойліва вымагаючы пачастунку.

Гняздо знаходзілася на адной з калючых галінак ядлоўцу, блізка ля ствала, і заўважыць яго было нялёгка.

Я прыўзняўся на дыбкі і зазірнуў між галінак. Гняздо на месцы. Яно круглае, чысценькае, акуратна сплеценае з травы, конскіх валасоў і моху, але птушанят у ім ужо няма.

Птушаняты берасцянкі растуць вельмі хутка.

Сёння — трынаццаты дзень, як яны з'явіліся на свет. Значыць, птушаняты пакінулі гняздо ці ўчора вечарам, ці сёння раніцай і трымаюцца яшчэ недзе паблізу.

Я азірнуўся.

На сасновым суку сядзіць самец берасцянкі.

Я збіраўся ўжо ісці далей, калі ён раптам шпарка зляцеў уніз і схапіў на зямлі, крокі за тры ад мяне, вялікага і тлустага зялёнага вусеня.

Я адразу спыніўся, каб не спалохаць птушку.

Не звяртаючы на мяне ўвагі, але час ад часу пазіраючы навакол сваімі чорнымі вочкамі, берасцянка пачала дзяўбці вусеня. Той ярасна выкручваецца, а берасцянка метадычна б'е яго дзюбай.

Я цярпліва стаю і не варушуся.

Вусень аслабеў і рухаецца ўсё павольней. Берасцянка адшчыпвае кавалкі вусеня і глытае іх. Вось ужо добрая палова вусеня з'едзена, затым знікае і астатняя частка. Берасцянка ўзляцела на сасну. Уся расправа заняла мінут пяць-шэсць.

Можа, гэтая птушка, што цяпер зноў спакойна сядзіць на дрэве, належыць да той сям'і, якая пакінула

гняздо да суседнім кусце ядлоўцу? Можа, яна з'яўляецца бацькам тых птушанят?

Я ведаў непадалёку яшчэ адно гняздо. Яно знаходзілася на сасне каля самага ствала, высока ад зямлі.

Гэта — гняздо дразда-дзярабы.

У ім было шэсць зеленаватых яек, на якіх сядзела самка. Гэта, відаць, было другое выседжванне, таксама, як і ў берасцянкі, бо птушаняты дзярабы пакідаюць гняздо звычайна ў пачатку чэрвеня, а я знайшоў у ім яйкі ў самым канцы чэрвеня.

Самец трымаўся ўвесь час непадалёку. Амаль заўсёды ён сядзеў на суседняй галіне таго ж дрэва. Калі хто-небудзь падыходзіў да сасны, ён папярэджваў самку кароткім і трывожным «крэк... крэк» і адразу з шумам ляцеў прэч, нібы стараючыся адцягнуць увагу ад гнязда.

Дрозд-дзяраба — даволі буйная птушка шаравата-бурага колеру. Яна значна большая за шпака. Цёмныя плямкі пакрываюць светлае горлачка, грудку, брушка і бакі.

Калі дрозд-дзяраба ляціць, знізу відаць белы падбой яго крылаў.

Я іду далей.

На ўскраінах лесу тут часта сустракаюцца невялікія, з вераб'я, зеленавата-жоўтыя птушкі. Вось і зараз адна з іх перапырхнула з ялінкі на сасну.

Гэта — зелянушка.

У яе прысадзістае тулава, караткаватая, шырокая і моцная дзюба. Гэтая спакойная птушка часам застаецца ў нас і на зіму. Яна адлятае на поўдзень, толькі калі зіма занадта суровая. Гняздзіцца зелянушка, як і берасцянка, на хвойных дрэвах і ў кустах, невысока ад зямлі.

А вось і тая палянка, пра якую мне казаў хлопец. З аднаго боку яна аблямавана ялінамі, а з другога, крыху ўзвышанага,— сасняком. На палянцы дзе-нідзе растуць кусты ядлоўцу, рэдкія малыя сасонкі, асобныя купы папараці. Тут часта пасуцца каровы.

Дайшоўшы да краю паляны, я спыняюся і займаю пазіцыю за кустом ядлоўцу. Адсюль мне відаць уся паляна, а сам я амаль непрыкметны.

Хлопец не памыліўся.

Агледзеўшы паляну, я ўбачыў на зямлі трох удодаў.

Самае галоўнае, калі хочаш наглядаць за птушкамі,— не варушыцца і не ісці да іх па прамой лініі. Да прадмета, які не варушыцца, птушкі хутка прывыкаюць і перастаюць яго баяцца.

Я сяджу нерухома за кустом ядлоўцу і ўважліва сачу за паводзінамі ўдодаў.

Берасцянкі, дразды, зелянушкі — усё гэта нашы звычайныя птушкі. Іх ведае кожны. А вось удод сустракаецца ў нас даволі рэдка. Мне цікава было глядзець на гэтых прыгожых птушак з дзіўным галаўным уборам.

Вячэрняе сонца лагодна асвятляе паляну, і мне выразна відаць амаль кожнае пёрка птушак. Грудка і галава ўдода светла-карычневыя, амаль жоўтыя. На чорных крылах белыя папярочныя палоскі. На галаве вялікі чуб з асобных пер’яў у выглядзе веера, з чорнымі плямкамі наверсе. Памерам удод з добрага дразда.

Удоды паважна хадзілі па траве, усюды засоўвалі свае доўгія і тонкія, нібы шыла, крыху загнутыя ўніз дзюбы, вышукваючы жукоў і лічынак мух. Кормяцца яны таксама і конікамі, майскімі жукамі, жужалямі і рознымі вусенямі.

Стаміўшыся сядзець нерухома, я ўстаў і падышоў бліжэй.

Адзін з удодаў узляцеў з глухім і адрывістым крыкам «уп-уп-уп». Следам за ім паляцелі і астатнія. Яны зніклі сярод ялін на тым баку палянкі. Іх крык нагадваў крыху кукаванне зязюлі.

Удод больш характэрны для стэпу, але, як я мог цяпер і сам пераканацца, птушка гэтая жыве і ў лясах каля берагоў Нарачы.

Гняздзяцца ўдоды ў дуплах дрэў. На зіму яны адлятаюць ад нас у Індыю і Афрыку, адкуль вяртаюцца на радзіму ранняй вясной.

На другі дзень я зноў, таксама пад вечар, пайшоў на паляну.

На гэты раз тут было пяць удодаў. Палахлівыя і недаверлівыя, яны, як і ўчора, блізка да сябе не падпускалі.

Калі я набліжаўся, яны адляталі ўбок і перапырхвалі з сасны на сасну, спрытна маскіруючыся. Жоўтае апярэнне рабіла іх непрыкметнымі на фоне сасновых ствалоў і суччa.

## КАРОВЫ І ЗАЯЦ

І на трэці дзень я пайшоў на паляну, дзе бачыў учора і пазаўчора ўдодаў. Але сёння тут гэтых птушак не было.

На паляне пасвіліся каровы. Яны павольна пасоўваліся між кустоў ядлоўцу і рэдкімі малымі сасонкамі, падоўгу затрымліваючыся то на адным, то на другім месцы. У ціхім паветры было чуваць, як хрумстаюць рагулі траву.

Я пайшоў наўпрост цераз паляну.

Прама перада мною каля маладой сасны, падобнай на куст, ляніва абмахваючыся хвастом, скубла траву чорная карова з белымі плямамі.

Я хацеў абмінуць яе, але ў гэты момант заўважыў пад сасною, амаль каля самай пысы каровы, нешта жывое, шаравата-бурае. Я спыніўся і пачаў углядацца ў гэтае «нешта».

Мой позірк сустрэўся з нечымі вачыма. З хвіліну гэтыя вочы, ясныя, карычневыя, глядзелі на мяне ва ўпор.

Яны быццам застылі, быццам не маглі ад мяне адарвацца. Я бачыў іх з-за рагоў каровы і не варушыўся.

Карова тым часам адсунулася крыху ўбок.

Не паспеў я нахіліцца, каб паглядзець, каму належаць гэтыя вочы, як з-пад сасны раптам выскачыў заяц.

Стралою праляцеў ён пад нагамі ў каровы, зрабіў некалькі вялікіх скачкоў, перасёк паляну і знік у лесе.

Карову раптоўнае з'яўленне зайца ніколькі не напалохала. Яна толькі шумна ўздыхнула і зноў спакойна пачала скубці траву каля маладой сасны.

Заяц, як вядома, не мае ўласнага логава. Ён спіць, нібы беспрытульны бадзяга, дзе давядзецца. І спіць вельмі чуйна, не заплюшчваючы вачэй. Нездарма гавораць пра чалавека, у якога лёгкі, чуткі сон: «Спіць як заяц».

Але ж чаму ён спаў гэтак бестурботна сярод кароў? І чаму каровы так спакойна хадзілі каля самага зайца?

Вельмі проста.

Заяц — не воўк. Каровы яго не баяцца. І заяц кароў таксама не баіцца. Ён ведае, што каровы яго не з'ядуць, што між рагатых жывёл ён у поўнай бяспецы. Тут да яго ніхто не падбярэцца і не схопіць — ні ліса, ні воўк, бо каровы не падпусцяць драпежніка.

Вось чаму заяц і спаў так бесклапотна, а каровы хадзілі вакол яго і скублі сабе мірна траву, не звяртаючы на шарака ніякай увагі.

Іншая справа — чалавек. Яго зайцу трэба баяцца, хаця ён і ў людзях разбіраецца. Заяц добра ведае, што чалавек без стрэльбы не такі небяспечны, як са стрэльбай.

Калі я падышоў да сасны, заяц сядзеў ціха, спадзеючыся, што яго не заўважу. Калі ж карова адышлася, заяц спахапіўся і ўцёк.

## ГАДЗЮКА, ЖАБА І ВОЖЫК

Сёння — спякотны, па-сапраўднаму летні дзень. З самага рання горача свеціць сонца.

Возера іскрыцца і зіхаціць, нібы нейкі вялізны каштоўны камень з незлічонымі дробнымі гранямі на паверхні. У цёмна-зялёнай аправе лясоў яно нібы ўсміхаецца бліскучай, асляпляльнай усмешкаю.

Пад канец дня я пайшоў па вузкай сцежцы ў лес.

Тут таксама спякотна і душна.

У нагрэтым сонцам паветры несціхана звініць і гудзе разнагалосы хор насякомых.

У такі дзень увесь бязмежны свет найдрабнейшых жыхароў лесу жыве асабліва кіпучым і дзейсным жыццём. Усюды актыўны рух, барацьба, пагоня за здабычай, напад і абарона, радасць існавання.

Па ўсіх напрамках пырхаюць, нібы крылатыя кветкі, рознакаляровыя матылі, звіняць і «таўкуць мак» камары, басавіта гудуць чмялі, пчолы, мухі. Высока лятаюць вялікія блакітна-зялёныя стракозы.

На адным з паваротаў я спыніўся.

Перад маімі вачамі разгортваўся адзін з эпізодаў жыцця ляснога «малога свету».

Вялікая светла-шэрая гадзюка з выразным чорным узорам на спіне гналася па сцежцы за травяной жабай. Змяя разагрэлася на сонцы і была поўная сілы і энергіі. Яна рухалася па зямлі спрытна і імкліва.

Ратуючы сваё жыццё, жаба ўцякала з апошніх сіл, робячы вялікія скачкі. Але гадзюка ўсюды паспявала за ёю. Яна слізгала па сцежцы шпаркімі, звілістымі рухамі. Яна праследавала жабу настойліва, як сама немінучасць, як непазбежная смерць.

Я не захацеў умешвацца.

Няхай падзеі развіваюцца сваім натуральным парадкам.

Мне было цікава паглядзець на паляўнічыя прыёмы гадзюкі, і я моўчкі стаяў на месцы, абапіраючыся на свой кій з ядлоўцу, і не варушыўся. Я ведаў, што змеі бачаць толькі з блізкай адлегласці. Апрача таго, гадзюка была захоплена паляваннем.

Нарэшце сілы пакінулі жабу.

Яна застагнала і залезла пад тоўстую сасновую галіну, што ляжала ўпоперак сцежкі.

У той жа момант змяя апынулася каля жабы. Шпаркі, як маланка, выпад галавой уперад — і жаба перастала рухацца, паралізаваная змяіным ядам.

Гадзюка падпаўзла да яе з другога боку, схапіла жабу за галаву і пачала выцягваць сваю здабычу з-пад галіны. Спачатку ёй гэта не ўдавалася. Звілістымі рухамі змяя падавалася назад, але жаба моцна засела пад галінай.

Нарэшце, рэзкім рыўком гадзюка выцягнула жабу і тут жа пачала глынаць яе з галавы. Хвіліна, другая, і жаба, якая была ў некалькі разоў большая за галаву гадзюкі, знікла ў разяўленай да пачварных памераў пашчы змяі. Проста дзіўна, як шырока можа расцягваць свой рот змяя, якія эластычныя і рухомыя ў яе сківіцы.

Рухі змяі зрабіліся вялыя і павольныя. Ад сытасці яна ледзь варушылася, і цяпер адзінае яе жаданне было адпаўзці куды-небудзь у зацішны куток і заснуць.

Я падышоў бліжэй.

Гадзюка заўважыла мяне і на імгненне застыла ў нерашучасці. Потым пасунулася, адступаючы назад. Зноў спынілася, прыўзняўшы галаву і паглядаючы на мяне сваімі бязлітаснымі, халоднымі жоўтымі і нібыта соннымі вачыма.

Я не рухаўся.

Тады змяя павярнулася і папаўзла прэч. Яшчэ хвіліна, і яна знікла б з маіх вачэй. Але ў той жа момант нешта зашамацела ў сухой траве і на сцежку з-за сасны, вакол якой ляжала шмат галля, выкаціўся, пыхкаючы і

шоргаючы сваімі іголкамі, маленькі вожык. Мордачка яго была апушчана да зямлі.

Не звяртаючы на мяне ўвагі, вожык падбег лёгкім трушком да гадзюкі і адразу, з ходу, ухапіў яе за хвост.

Вядома, што вожык лічыць сваёй здабычай усё, што рухаецца і што ён можа злавіць, перамагчы і з'есці, пачынаючы ад жукоў, вусеняў і слімакоў і канчаючы мышамі, жабамі і змеямі. Гадзюк ён не баіцца і заўзята распраўляецца з імі, бо змяіны яд дзейнічае на яго слаба.

Гадзюка засіпела і кінулася на вожыка. Яе раздвоены язычок высунуўся з рота і затрапятаўся. Вожык засоп і скруціўся ў калючы клубок.

Наткнуўшыся на вострыя іголкі, змяя адразу змяніла напрамак. Тады вожык выпрастаўся і пабег побач з ёю. Пры гэтым ён пыхкаў і фукаў, як маленькі паравоз.

Раптам вожык схапіў гадзюку каля галавы. Гадзюка пачала звівацца, але вожык яе не выпускаў. Сваімі вострымі зубкамі калючы звярок адгрыз ёй галаву.

Маленькая трагедыя ў двух актах, якая так нечакана разыгралася на маіх вачах, скончылася.

Вакол панавалі ўрачыстая цішыня і спакой.

На змену цудоўнаму летняму дню, з яго кіпучай мітуснёй, яркім святлом і фарбамі, непрыкметна надышоў мяккі, ясны і цёплы вечар. Залаты дыск сонца на ружовым небе схаваўся за цёмнай сцяною лесу.

Калі я вярнуўся дамоў, было ўжо зусім цёмна.

На зямлі, сярод травы і кустоў, запаліліся бледна-зеленаватыя, казачныя ліхтарыкі шматлікіх светлячкоў.

## НАД АБРЫВАМ

Раніца сёння халаднаватая.

Над зямлёю вісіць туман.

Між галінамі дрэў з'явіліся за ноч шматлікія серабрыстыя ажурна-тонкія цянёты — адна з першых адзнак недалёкай восені. У лесе, на высокіх сцяблінках травы, на папараці, на кустах ядлоўцу, усё зацягнута белымі ад расінак ветразямі павуціння, усюды зіхацяць яго бліскучыя карункі.

На возеры вада, туман і неба зліліся ў адну суцэльную бледна-шэрую заслону.

А дванаццатай гадзіне неба нарэшце праяснілася, выглянула нясмела сонца, у паветры пацяплела, і я паплыў на байдарцы да кручы за рыбгасам, туды, дзе высокі лясісты бераг абрываецца стромкай сцяною ў возера.

На возеры ціха і цёпла. Сонца свеціць скрозь шараватую імглу. Сцяблы чароту шаргаюць аб алюмініевыя барты байдаркі. На вадзе цьмяная серабрыстая рабізна.

Вось і абрыў.

Я прычаліў да пясчанага берага.

У глiністай чырвона-жоўтай сцяне абрыву чарнеюць адтуліны многіх дзесяткаў пячор-гнёздаў берагавых ластавак.

Гэта — сапраўдны пячорны гарадок.

Некаторыя з пячорак вельмі глыбокія. Я сунуў кій у адну з іх. Калідор цягнецца ад увахода ўглыб больш як на метр.

Такія глыбокія хады і пячоры выкопваюць у гліняннай сцяне абрыву сваімі маленькімі дзюбкамі і лапкамі гэтыя мілыя, прывабныя птушкі.

Адтуліны часам размешчаны амаль роўнымі радамі, як паверхі нейкага будынка. Усе яны знаходзяцца ў верхняй частцы сцяны абрыву, пад навіслым краем берага. У канцы кожнага калідора — пячорка, у якой самка берагавой ластаўкі выседжвае яйкі і гадуе малых.

Перад некаторымі пячоркамі збоку, каля ўваходнай адтуліны, зроблены невялікія нішы з подсцілкамі з сухой травы. У такіх нішах ластаўкі адпачываюць.

Я падлічыў гнёзды. У трох калоніях, якія знаходзяцца недалёка адна ад адной, іх было сто трыццаць шэсць.

Мне прыгадаліся злепленыя з гліны гнёзды гарадскіх ластавак — варанкоў. Як адрозніваюцца па форме гнёзды ў такіх вельмі блізкіх і падобных адна на адну птушак!

У палёце іх нялёгка распазнаць, а гнёзды і прыёмы будаўніцтва зусім не падобныя!

Як жа адрозніць па выгляду беражанку ад варанка і касаткі?

У берагавой ластаўкі хвост кароткі, раздвоены і мае форму невялікіх тупых вілачак. Грудка і брушка ў беражанкі белыя, а на шыйцы карычняваты каўнерык. Зверху яна ўся цёмна-карычневая.

У гарадской ластаўкі, варанка, хвост такой жа формы, як і ў беражанкі, а грудка, брушка і шыя зусім белыя. Спінка ў варанка бліскуча-чорная, а ззаду, над хвастом, белая.

У вясковай ластаўкі, касаткі, хвост мае форму доўгіх вілачак з вострымі канцамі. Верх у яе бліскучы, сінявата-чорны, а ніз белы, горлачка — іржава-чырвонага колеру.

Касатка — самая прыгожая з нашых ластавак. У яе нават і песенька свая ёсць, шчабятанне з невялікай трэллю, якую можна пачуць у маі. Варанок і беражанка не спяваюць, яны толькі адрывіста шчабечуць, лятаючы.

Шкада, што я раней не быў тут ніколі.

На берагах возера не відаць цяпер ні берагавых ластавак, ні варанкоў, ні касатак.

Пячоркі-гнёзды пустыя. Ластаўкі вывелі сваіх птушанят і разам з імі паляцелі ў вырай, пакінуўшы гнёзды да наступнай вясны.

Над сцяною кручы звісаюць карэнні сосен, утвараючы над гнёздамі беражанак навісь. Па гэтых карэннях я і падняўся наверх.

Над абрывам расце сасновы лес. Тут шмат грыбоў і арэхаў.

Унізе плёскаюць хвалі. Каля самай вады скачуць па мокрай бліскучай гальцы шэрыя пліскі. Над соснамі лятае сокал-пустальга.

З вяршыні абрыву адкрываецца цудоўны від на возера. Перад вачыма ясны і мяккі пейзаж, нібы на карціне старога фламандскага майстра.

Раптам зноў спахмурнела. Падняўся паўночна-ўсходні вецер. Возера набыло змрочны выгляд.

Трэба вяртацца, пакуль не позна.

Я спусціўся з абрыву ўніз і сеў у байдарку.

Звычайна лёгкая і паслухмяная вяслу байдарка стала непаваротлівая, цяжкая. Яна нібы не хоча адплываць ад берага. Веславаць куды цяжэй, чым было раніцой.

Ветрам байдарку ўвесь час адносіць убок. Сцяблы чароту хіляцца сваімі мяцёлкамі ледзь не да самай вады.

Байдарка выплывае ў адкрытае возера, і яе ўсё далей адносіць ад берага.

Я паглядаю на неба.

Удалечыні, недзе за Кабыльнікам, пачуліся першыя грымоты. З таго боку насоўваецца вялікая цёмная хмара.

Зноў навальніца!

Увесь апошні тыдзень гром грыміць ледзь не кожны дзень.

Не, з такім ветрам я дабрацца дадому, відаць, не паспею!

Трэба кіраваць да берага.

Калі я, вяслуючы супроць ветру, падплыў да берага, пайшоў буйны дождж.

Я выцягнуў байдарку з вады і перакуліў дагары дном.

Адзенне і абутак зняў і схаваў пад сасной, а сам распаліў вогнішча і сеў ля агню.

Гром грымеў усё бліжэй і мацней. Над возерам бліскалі маланкі.

Скончылася навальніца праз гадзіну. Я патушыў вогнішча і раскідаў вуголле па мокрым пяску.

У байдарку я сеў амаль сухі. Але радавацца было рана. Не паспеў ад'ехаць і сотні метраў, як дождж пачаў ліць з новаю сілай. За некалькі хвілін я быў мокры з галавы да ног.

Калі падплыў да масткоў каля дому, пачало цямнець.

У вячэрнім паветры пачуўся стук матора. Баркас вёў за сабою на буксіры чараду рыбацкіх лодак.

Рыбакі вярталіся з лову.

## ЛІСА І ГУСАК

Калі я выцягнуў байдарку з вады і перанёс у пуню, дзе яна ў мяне заўсёды захоўвалася ўночы, на двор прыйшлі з возера гусі.

Гаманлівая чарада на чале з самаўпэўненым гусаком важна і самаздаволена тупае ўверх па сцежцы.

Перад дзвярыма ў хату гусі збіліся ў кучу і загагаталі. Гаспадыня ўзяла дубец і загнала іх у хлеў.

Замкнуўшы дзверы на засаўку, яна расказала, як у мінулую восень лісіца схапіла ў яе на вачах гусака.

— Гэта было ў пачатку кастрычніка, гадзін у дзевяць раніцы,— гаворыць гаспадыня.— Толькі хацела я выйсці з хаты, адчыніла дзверы і не паспела яшчэ пераступіць парог, як бачу — рыжая ліса валачэ нашага гусака ў кусты. Трымае гусака за шыю, а той ужо і крылы апусціў, і не супраціўляецца. Мусіць, яна адразу горла перакусіла, ён і агледзецца не паспеў.

— Што ж вы тады зрабілі? — спытаў я.

— А што я магла зрабіць? — гаворыць жанчына.— Закрычала, пабегла за ёю, ды дзе там! Хіба лісу зловіш? Знікла ў кустах, нібы скрозь зямлю праваліласся разам з маім гусаком. А хмызняк тут, самі бачыце, які густы, і аж да лесу цягнецца.

Хата знаходзіцца на ўзгорку. З аднаго боку ідзе спуск да возера, а з другога ўзгорак пераходзіць у балоцістую нізіну, якая аддзяляе вёску Купу ад грады з сасновым лесам.

Гаспадыня паказала мне месца, дзе ліса схапіла гусака.

— Тут, на гэтым схіле, дзе цяпер кукуруза, летась была пасаджана бульба,— растлумачыла яна.— Незадоўга перад тым мы выбралі бульбу, і гусі хадзілі па бульбянішчы. Адзін гусак падышоў да самага краю поля каля ручая, а ліса, відаць, даўно там хавалася ў кустах ды пільнавала. Калі гусак наблізіўся, яна і схапіла яго. Астатнія гусі нават і не заўважылі, бо ён і не крыкнуў. Ходзяць сабе спакойна ды падбіраюць бульбу... Цяпер мы гусей сюды да ручая не пускаем,— закончыла свой расказ гаспадыня,— тут для лісы падступ надта зручны. Цяпер гусі ходзяць толькі ў гэты бок, да возера.

Калі глядзець з узгорка, дзе стаіць хата, уніз, то добра відаць між агародамі і лесам звілістая паласа хмызняку, па якой здалёк можна вызначыць напрамак ручая: ён перасякае дарогу з рыбгаса ў Купу і ўліваецца ў Нарач. Дзе-нідзе ручай разліваецца па нізіне, утвараючы топкія балотцы з чорнай тарфяністай вадою. Кусты вольхі і лазы густа растуць па яго берагах ад самага лесу, дзе ручай выцякае з яру.

У кустах над ручаём сакочуць сарокі. Толькі яны і могуць выкрыць лісу ў гэтым густым хмызняку і перашкодзіць яе паляўнічым хітрыкам.

## СУСТРЭЧА З ЛІСОЙ

На другі дзень я пайшоў уздоўж ручая, каб прасачыць паляўнічы маршрут лісы.

Мінуўшы балотца, апынуўся ў густым лесе. Тут пераважаюць сосны, але густа расце і ядловец, і маладыя дубкі, і арэшнік. Сустракаюцца часам і вялізныя яліны.

Пад нагамі часта трапляюцца грыбы. Вось расце грыб-сіняўка. Калі яго разрэзаць, белая сярэдзіна на вачах зробіцца сіняя.

На кустах ядлоўцу чарнеюць ягады. Палова з іх зусім чорныя, астатнія ўсё яшчэ зялёныя. У паветры ўжо адчуваецца набліжэнне восені, але дзе-нідзе па сухіх грудка́х яшчэ чырванеюць асобныя познія суніцы.

У густым і падсохлым знізу маладым сасняку я натрапіў раптам на трох маладых глушцоў. З шумам узняліся яны з зямлі, густа заваленай галлём, ледзь не з-пад самых маіх ног і паляцелі адзін за адным, лопаючы крыламі. Узлятаючы, першы з іх ад неспадзяванасці кудыкнуў спалохана, нібы курыца.

Блукаючы па лесе, я выйшаў на маляўнічую палянку, недалёка ад ручая.

На возеры сёння вецер, а тут, у лесе, ціха і спакойна.

Я прылёг на сухі мох каля старой паваленай бурай сасны і задумаўся.

Над верасам пералятаюць з месца на месца шэрыя пліскі. У кожнай чародцы па пяць-шэсць птушак. Я ўпершыню бачу плісак у лесе, далёка ад возера. Там, ля возера, яны часта скачуць, лёгка і грацыёзна, як на спружынах, па мокрым пяску каля самай вады. Калі набягае хваля, зграбныя птушкі спрытна адскакваюць ад паласы белай пены. Калі ж хваля адступае назад у возера, пліскі бягуць за ёю, збіраючы на мокрым пяску здабычу, непрыкметную для чалавечага вока. Тут, у лесе, яны, відаць, ловяць над верасамі дробных насякомых.

Між зараснікаў папараці, метраў за дзесяць наперадзе мяне, мільганула раптам нешта ярка-рыжае.

Няўжо ліса?..

Так, гэта лісіца-хітрыца!

Вось яна выслізнула з-пад жоўтых галінак папараці.

На фоне маладых зялёных елачак рыжае футра гарыць, як агонь, падкрэсліваючы белую грудку і чорныя ногі. Блішчаць ясныя бурштынавыя вочы.

Вострая мордачка лісы прынюхваецца да зямлі...

Лёгкім трушком ліса перабегла палянку і спынілася каля старой яліны, крыху прыўзняўшы пярэднюю лапу, нібы паляўнічы сабака, які робіць «стойку». Гнуткая постаць лісы застыла на месцы. Вострыя чорныя вушы насцярожаны. Уся яна — увасабленне напружанага, цярплівага чакання. Толькі кончык пушыстага хваста ледзь прыкметна варушыцца.

«Мышкуе»,— падумаў я.

Ветрык дзьмуў мне насустрач, і ліса не магла пачуць чалавека. Я ведаў, што лісіцы так захапляюцца паляваннем на мышэй, што забываюць часам пра ўсё на свеце, нават пра ўласную бяспеку. Да таго ж ліса была з другога боку калоды і стаяла спінай да мяне. Калі б яна і павярнулася, то адразу таксама не магла б мяне заўважыць, бо стары павалены сасновы ствол амаль цалкам мяне закрываў.

Стрымліваючы дыханне, я любаваўся спрытнымі рухамі невыказна прыгожага звера.

Ліса не варушылася некалькі хвілін.

Раптам чорныя, нібы аксамітныя лапкі яе ўзняліся ўгору, рыжы хвост з белым кончыкам мільгануў у паветры. Ліса падскочыла і схапіла нешта між тоўстых карэнняў яліны. Пачуўся слабы піск мышы. У тую ж хвіліну ліса знікла між дрэў.

Можа, гэта тая самая ліса, што ўкрала калісьці гусака ў маёй гаспадыні? Напэўна, яна. Але я быў так захоплены прыгажосцю рухаў лісы, яе грацыёзным і лёгкім скачком, што зусім забыў пра гэтае «злачынства».

У горадзе, на станцыі юных натуралістаў, я часта наглядаў за лісіцамі ў клетках, але гэта было зусім не тое. Цяпер мне здавалася, што я ніколі ў жыцці не бачыў такога прыгожага звера. Хіба можна было параўнаць паводзіны свойскага ліса ў вальеры з прывабнымі, поўнымі лёгкай грацыі рухамі гэтага цудоўнага стварэння на волі?

Я ўспомніў, што мышы з'яўляюцца асноўным кормам лісы. Паляўнічыя кажуць, што на працягу дня ліса знішчае да пяцідзесяці — шасцідзесяці мышэй. Яна ловіць іх не горш за кошку. Адзін даследчык бачыў, як лісіца несла сваім лісянятам у нару адразу шэсць мышэй. Хвасты і заднія лапкі злоўленых звяркоў звісалі з бакоў лісінай пашчы накшталт нейкай дзіўнай барады... Ліса ахвотна есць і майскіх жукоў, конікаў і іншых шкодных насякомых.

Тым, што ліса знішчае мышэй, яна прыносіць бясспрэчную карысць. І гэтая карысць ураўнаважвае тую шкоду, якую робіць ліса, калі схопіць часам на двары курыцу, ці качку, ці гусяня, ці калі крадзе яйкі баравой і вадаплаўнай дзічыны ў лесе і ў зарасніках на возеры.

У прыродзе ніколі не бывае так, каб той ці іншы звер або птушка былі заўсёды і пры ўсіх умовах толькі карысныя ці толькі шкодныя.

Пра гэта я думаў, калі ўстаў з-за калоды і паглядзеў у той бок, дзе знікла ліса.

Пакінуўшы лясную паляну, я спусціўся ў нізіну, перайшоў па кладцы ручай і агародамі пайшоў у Купу.

На доўгай, абсаджанай старымі таполямі вуліцы было ціха і бязлюдна. Амаль усе дачнікі раз'ехаліся, і вёска набыла свой звычайны будзённы выгляд.

У перадвячэрнім святле прыгожыя хаты з белымі, сінімі і чырвонымі аканіцамі здаваліся асабліва ўтульныя. Некаторыя з іх маюць зашклёныя веранды і мезаніны з балкончыкамі. У прысадах перад вокнамі растуць вяргіні, мак, рамонкі.

Над вёскаю апускаўся ясны, цёплы вечар.

Сонца яшчэ не зайшло, а на блакітным небе ўжо з'явіўся бледны месяц. Залацісты шар сонца набыў журавінавы колер, а неба зрабілася шаравата-сіняе. Потым сонечны шар падзяліўся далёкімі воблачкамі на чырвоныя палоскі, і тыя праз некалькі хвілін зніклі ў вячэрняй сіні.

## СТАРЫ ПАСТУХ

Дарога ў вёску Варанцы ідзе праз сасновы лес.

На кожным кроку на вочы трапляюць грыбы — баравікі, маслякі, бабкі. Асабліва многа тут лісічак, хоць ты іх касі, як казаў адзін мой знаёмы. Усюды яны жаўцеюць у зялёным моху.

Пра гэтыя грыбы пісаў наш зямляк, вялікі польскі паэт Адам Міцкевіч у сваім «Пане Тадэвушы»:

> ...лісічкі,
> Апетыя ў Літве, лісічкі-невялічкі —
> Эмблема чысціні: іх ні чарвяк не точыць,
> Ні насякомае на шапачку не ўскочыць.

Сапраўды, у грыбах-лісічках ніколі не бывае чарвей.

Лес неўзабаве скончыўся. Наперадзе забалочаная нізіна.

Па каменнях я перайшоў на другі бераг рачулкі і падняўся на ўзгорак. Да вёскі засталося з паўкіламетра, не больш.

Я прыпыніўся.

Раніца была да гэтага часу пахмурная, а цяпер з'явілася раптам сонца і асвятліла сваімі лагоднымі праменнямі і зялёныя схілы ўзгорка, і забалочаную нізінку з кустамі вольхі, і празрыстую ваду. Усё навокал

ажывілася, зазіхацела, набыло новыя, яркія і свежыя фарбы.

Мне захацелася пабыць тут, паглядзець з узвышша на палі і пералескі, на гэты знаёмы і блізкі сэрцу пейзаж, які заканчваўся на даляглядзе сіняй палоскай возера.

Я лёг на траву каля вялікага каменя, непадалёку ад ручая, што звінеў і струменіў унізе.

Ад вады патыхае перадасенняй свежай прахалодаю. Белыя і чорныя авечкі мірна скубуць непадалёку траву. З-за суседняга ўзгорка на тым баку нізінкі з'явіліся каровы.

Я задумаўся і не заўважыў, як да мяне падышоў пастух. Высокая постаць яго вырасла раптам над маёй галавой.

— Дзень добры,— павітаўся ён і сеў побач.

На ім шэрая ватоўка, старая кепка, цёмныя штаны з саматканага сукна і боты.

Каровы, што пасвіліся дагэтуль на забалочанай лугавінцы, падымаюцца ўсё вышэй і вышэй па схіле ўзгорка. Хутка яны апынуліся каля нас. Іх неадступна суправаджае вясёлая чарада драздоў. Жвавыя птушкі перапырхваюць з месца на месца ў густой траве і смела скачуць пад нагамі і перад пысамі кароў.

Пастух адмахваецца ад мух, якія з'явіліся над нашымі галовамі.

— Вядома,— гаворыць ён,— дзе жывёла, там і розныя мухі, мошкі, сляпні ды авадні. Для кароў гэта — чыстая пляга, а для птушак — здабыча. Вось дразды і трымаюцца ля кароў. Часам ходзіць такі дрозд ці шпак па спіне ў каровы і ловіць насякомых. І яму карысна, і карове прыемна.

Статак перайшоў тым часам на другі бок узгорка, і разам з каровамі зніклі і мухі ў паветры, і дразды ў траве.

Пастух прымасціўся зручней. Яму хочацца, відаць, пагаварыць з незнаёмым чалавекам.

— Адпачываеце? — пытаецца ён для пачатку.

— Але.

— Самі з горада?

— З Мінска.

— Клімат у нас добры,— паведамляе ён.— Вада тут крынічная, чыстая, ніколі не мутнее, для здароўя карысная.

Абвіслыя пракураныя вусы пастуха рассунуліся ў лагоднай усмешцы.

З далейшай гутаркі высвятляецца, што дзядзьку Вінцуку, так завуць пастуха, шэсцьдзесят чатыры гады і што нарадзіўся ён і ўсё сваё жыццё, калі не лічыць Першую сусветную вайну, пражыў у Варанцах.

— У тую вайну пазіцыі ў нашай мясцовасці трымаліся аж тры гады,— успамінае ён.— Тады ў газетах часта пісалі: «У раёне возера Нарач перастрэлка», ці «пошукі разведчыкаў», ці «баі мясцовага значэння». Усе жыхары былі адсюль выселены. Маю сям'ю загналі аж у Свянцяны, а сам я ў арміі служыў. Быў і на Мазурскіх азёрах, і ў Галіцыі. Свет, як кажуць, пабачыў. На вайне, праўда, мне пашанцавала, жывы застаўся. І паранены не быў, і не хварэў, і ў палон не трапіў. У васемнаццатым годзе вярнулася мая сям'я дахаты. Тут якраз і я з арміі прыйшоў. На ўсходзе ў той час паноў скінулі, а нам тут давялося пакутаваць яшчэ гадоў дваццаць. Не жарты! А потым зноў вайна, Гітлер праклятгы наваліўся... А цяпер? Цяпер жывём няблага. Для мяне ўсё гэта, праўда, павярнулася крыху пазнавата, ды што ты зробіш! Я так лічу, што добрае жыццё чалавеку і на старасці не пашкодзіць.

Дзядзька Вінцук устаў, падышоў да падпаска, хлопца гадоў пятнаццаці, з доўгаю пугай, і штосьці сказаў яму. Потым вярнуўся і сеў на ранейшае мéсца каля валуна.

— Жыву я разам з дарослымі сынамі, жанатым і халастым,— казаў ён далей.— Працую ў калгасе пастухом, а да той вайны быў рыбаком. Рыбачыў разам з

дзядзькам. Потым ажаніўся, а тады армія, сёе-тое, розныя падзеі, дзядзька памёр, гаспадарка зруйнавалася, вось і закінуў я тое рыбацтва. І наогул рыбакоў у нашай вёсцы няма. Да возера ад нас, самі бачыце, не так ужо і блізка. Не тое што Купа ці нават Антонісберг.

— Адкуль у гэтай вёскі такая дзіўная назва? — пытаюся я.

— А хто яе ведае,— дзядзька Вінцук пацiснуў плячыма.— Раней гэта быў маёнтак на дзесяць валок. Належаў ён пану Каліноўскаму. Гэта быў адзінокі стары, гаспадарку вёў дрэнна. Усё больш пазычаў грошы ў банку. Дапазычаўся да таго, што хацелі забраць маёнтак у казну. Тады ён прадаў Антонісберг нейкаму Бычкоўскаму. Той пачаў прадаваць зямлю па ўчастках сялянам. Вельмі, кажуць, на гэтым нажыўся. Вось і вырасла тут наша вёска на зямлі былога маёнтка. А перад тым на месцы Варанцоў стаялі толькі пяць хат, у якіх жылі парабкі з Антонісберга.

— Калі ж гэта было?

— Даўно. Пра Каліноўскага мне мой бацька расказваў.

## ДЗЯДЗЬКА ВІНЦУК І ЯГО БУСЛЫ

Над намі праляцеў бусел.

Вялікія крылы яго шырока распасцёрты, дзюба выцягнута, чырвоныя ногі адкінуты назад.

Мы правялі бусла вачыма.

— На лугавіну за Антонісбергам падаўся,— гаворыць дзядзька Вінцук.

— Адкуль вы ведаеце?

— Гэта наш бусел, з Варанцоў. Ён жыве на маім двары.

— Значыць, сусед?

— Сусед.

Размова набывае новы кірунак.

— Даўно ён у вас пасяліўся? — пытаюся я.

— Гадоў з пятнаццаць. Усцягнуў я тады на старую алешыну, што расце на маім двары, барану. Няхай, думаю, буслы жывуць. Яны і пабудавалі на ёй гняздо з дубцоў ды палак. Будавалі дзён дваццаць, калі не больш. Панацягалі ў гняздо розных лахманоў, анучак, сена, саломы. А ў сценках вялікага буслінага гнязда пасяліліся дробныя птушкі. З таго часу буслы і выводзяць на маёй алешыне сваіх буслянятак. Ніколі яшчэ гняздо не пуставала. Сёлета гадуюць трох.

Твар старога пастуха набыў нейкі добры выраз. Пра буслоў ён гаворыць з яўным замілаваннем.

— Заўсёды трох? — спытаў я.

— Як калі,— адказаў дзядзька Вінцук.— Здараецца часам, што бусел выкіне з гнязда лішняе яйка ці малое бусляня. Людзі кажуць, што ён выкідвае чацвёртага, калі ёсць. Толькі я не ведаю, ці гэта праўда, бо гады тры назад буслы выгадавалі аж пяцёра малых і нікога не скінулі. Яшчэ ў нас гавораць, быццам, калі бусел выкінуў яйка, то гэта на ўраджай, а калі бусляня, то на недарод. Але я так думаю, што бусел выкідвае з гнязда малое — няўдалае ці хворае, якому ўсё роўна не жыць, а яйка — пустое. Сёлета якраз выкінуў яйка.

— А навошта вы паклалі на вольху барану? Хіба вам гэтак патрэбны ўжо буслы на двары?

— А чаму не? — здзівіўся дзядзька Вінцук.— Хай жывуць. Калі пасяліўся бусел каля хаты, то гэта на шчасце. Так у нас лічыцца. Ды і весялей з ім.

— Але ж ён прыносіць на двор жывых змей. І пахне ад гнязда нядобра. І кураня на двары можа падхапіць. Ці ж не так?

— На двары ён нічога не чапае, бо корміцца на лугах ды балотах. Змеі часам і падаюць з гнязда. Але што ты зробіш? Усё роўна бусла чапаць няможна. Бусел, як

і голуб,— добры птах, друг чалавека,— упэўнена сцвярджае дзядзька Вінцук.

— А ў чым гэта выяўляецца?

— Як гэта ў чым? — У голасе дзядзькі гучыць нездавальненне.— Бусел знішчае мышэй, гадзюк, пацукоў, вусеняў, жукоў і ўсякую нечысць. Чаго ж яшчэ? І нагул... такі ўжо звычай: не крыўдзіць бусла, і ўсё. Трэба з ім жыць у згодзе, у добрым суседстве. Так ужо здаўна вядзецца ад нашых дзядоў і прадзедаў. І, мусіць, нездарма,— падкрэсліў ён павучальна.

— За гэтыя пятнаццаць гадоў вы, мабыць, блізка з бусламі пазнаёміліся? Ведаеце ўсе іхнія звычкі?

— А як жа! Мы да іх прывыклі, а яны да нас. Вядомая рэч, столькі часу жывуць на маім двары. Усё іхняе жыццё на маіх вачах праходзіць. Чаго толькі не ўбачыш!

— Калі ж яны вяртаюцца з выраю?

— Звычайна ў красавіку. Спачатку прыляціць адзін гаспадар і стаіць сабе пасярод гнязда цэлы дзень, як на варце. Чужога бусла і блізка не падпусціць. Вось неяк гляджу, прыляцеў мой бацянок, стаіць на гняздзе, пільнуе свой участак. Аж тут да яго чужы падсунуўся. Гаспадар яго не пускае, а той лезе. Такая бойка між імі тады пачалася! Хацеў я свайму буслу дапамагчы, ды дзе там, не ведаю як. Хіба тут разбярэш у бойцы, хто свой, а хто чужы? Мільгацяць толькі белыя спіны, чорныя крылы ды хвасты, чырвоныя дзюбы ды ногі. Толькі пер’е ляціць у паветры. Ну што ты зробіш! Нарэшце наш бусел перамог, а чужы адступіўся, паляцеў прэч. Вядома, хто свой кут бароніць, той заўсёды смялейшы. І адкуль толькі адвага бярэцца! А той, хто чужое хоча захапіць, не такі рашучы, бо адчувае, што праўда не на яго баку. Так і тут. Гаспадар перамог, а праз два дні прыляцела і яго бусліха. Тады яны разам узяліся рамантаваць гняздо, чысціць яго, пашыраць. Гняздо з кожным годам робіцца ў іх усё большае, расце і ўгору, і ўшыркі.

Потым busліха кладзе яйкі і разам з буслам, па чарзе, сядзіць на іх цэлы месяц.

— Няўжо ўсё тыя самыя буслы гняздзяцца ў вас? — пытаюся я.— А можа, кожны год прылятаюць новыя?

— Мне здаецца, што тыя самыя,— упэўнена адказвае пастух.— Я свайго бусла заўсёды пазнаю. Маладыя буслы, мабыць, будуюць сабе гнёзды дзе-небудзь далей, бо паблізу іншых гнёздаў у нас тут няма. Наогул, буслы гняздзяцца асобнымі парамі, далёка адна ад адной. Участак нашых буслоў каля кіламетра ва ўсе бакі ад гнязда. Калі б яны жылі па некалькі сем'яў разам, то ім не хапіла б корму. Надта ж яны ненажэрныя, асабліва бусляняты.

Дзядзька Вінцук змоўк і пачаў скручваць цыгарку.

З кніг мне было вядома, што бусел абзаводзіцца сям'ёй толькі на чацвёртым-пятым годзе жыцця. Да гэтага часу маладыя буслы бадзяюцца паміж месцам зімоўкі і месцам, дзе нарадзіліся. Некаторыя з іх прылятаюць часам і на радзіму, але значна пазней дарослых. Калі ж надыходзіць час заводзіць сям'ю, малады бусел шукае вольнага гнязда ці будуе сабе новае ў той мясцовасці, дзе ён сам з'явіўся на свет.

Пакуль мы размаўлялі пра буслоў, каровы адышлі ад нас даволі далёка.

Дзядзька Вінцук падняўся.

— Прыходзьце да нас у нядзелю паглядзець на маіх кватарантаў,— сказаў ён мне на развітанне і пайшоў даганяць статак.

## БУСЛЯНЯТЫ ВУЧАЦЦА ЛЯТАЦЬ

У нядзелю я пайшоў у Варанцы паглядзець на буслоў дзядзькі Вінцука.

Вузкія вуліцы вёскі то ўзбягаюць на ўзгорак, то спускаюцца ўніз. За плятнямі садоў пладовыя дрэвы

згінаюцца пад цяжарам яблыкаў, груш і сліў. Каля хат чырванеюць рабіны.

Вось і двор дзядзькі Вінцука. Перад вокнамі хаты густа разрасліся кветкі. Высяцца жоўтыя вяргіні.

Гняздо бусла знаходзіцца на высокай алешыне са зрэзанай вяршалінай. Яно ўпрыгожвае старое дрэва, нібы вялізны шырокі вянок.

Пасярод гнязда стаяць тры маладыя буслы. Іх ужо не адрозніць па выгляду ад дарослых, але гнязда яны яшчэ не пакінулі.

На парозе хаты з'явілася высокая, крыху сутулая постаць дзядзькі Вінцука. Сёння ён ужо не ў ватоўцы. На ім белая вышываная кашуля і чорны пінжак. На галаве новы картуз.

— Дзень добры! Прыйшлі на маіх суседзяў паглядзець? — гаворыць ён, вітаючыся са мною, як са старым знаёмым.— Калі ласка!

Мы селі на лаўку перад хатай. Над намі звісаюць чырвоныя гронкі рабіны.

— Вось якая ў мяне буслянка,— хваліцца дзядзька Вінцук, паглядаючы на гняздо.

Да алешыны падляцеў стары бусел і павольна апусціўся на край гнязда.

— Бачыце, што прынёс? — ажывіўся дзядзька Вінцук.

У чырвонай дзюбе бусла я ўгледзеў даволі вялікую змяю. Бусел кінуў яе ў сярэдзіну гнязда і адразу паляцеў прэч.

Маладыя буслы замітусіліся вакол кінутай ім здабычы. Шпарка апусціліся ўніз дзюбы. Адзін з іх апярэдзіў астатніх. Ён першы схапіў змяю, падкінуў яе ўгору, і ў тую ж хвіліну змяя знікла ў шырока раскрытай дзюбе.

— Буслы не кормяць сваіх малых з дзюбы ў дзюбу, як іншыя птушкі,— сказаў дзядзька Вінцук.— Яны кладуць прынесеную здабычу проста ў гняздо, а бусляняты самі яе падбіраюць.

Тым часам малады бусел адкінуў галаву на спіну і заклекатаў. Далёка па наваколлі разнёсся гэты клёкат, які замяняе маўкліваму буслу голас. Стукаючы верхняй палавінкай дзюбы аб ніжнюю, бусел выказвае такім спосабам усе свае пачуцці.

— Бач, які! — засмяяўся дзядзька Вінцук.— Дзякуе, мабыць, за пачастунак.

Праз некаторы час зноў падляцеў да алешыны дарослы бусел і кінуў яшчэ нешта ў гняздо.

— Калі бусляняты малыя,— тлумачыць гаспадар,— адзін з бацькоў ляціць па здабычу, а другі застаецца пільнаваць, каб ніхто малых не пакрыўдзіў. На шаснаццаты дзень малыя спрабуюць станавіцца на ногі, а на трыццаты — махаць крыламі. Калі бусляняты ўжо стаяць на нагах, бацькі вылятаюць на здабыткі разам. Ім цяпер лягчэй, бо малым ужо не патрэбна ахова. А корму бусляняты патрабуюць з кожным днём усё больш і больш.

Адзін з буслоў, стоячы ў гняздзе, раскрыў шырокія крылы і з сілай пачаў узмахваць імі. Потым заняўся гэтым і другі. Паветра напоўнілася шумам.

— Практыкуюцца,— сказаў дзядзька Вінцук.— Неўзабаве пачнуць лятаць. Спачатку каля гнязда, а потым усё далей і далей.

## ПАЛЯЦЕЛІ!

Тыдні праз два я зноў наведаўся ў Варанцы. Буслоў у гняздзе ўжо не было.

— Паляцелі! — сказаў мне дзядзька Вінцук.

Ён стаіць пасярод двара каля вольхі з пустым гняздом, упіраючыся рукою ў ствол дрэва.

— Калі? — пытаюся я.

— Пакінулі мяне суседзі з тыдзень назад,— гаворыць дзядзька, і мне здаецца, што ў голасе ў яго гучаць нібы

ноткі жалю.— Цяпер яны трымаюцца ўсе разам на лугах каля возера, але зрэдку яшчэ прылятаюць сюды. А потым знікнуць раптам зусім і не з'явяцца аж да самай вясны.

Дзядзька Вінцук задумаўся. Ён закурыў, зрабіў зацяжку і сочыць вачыма за шызым дымком, які струменіць у чыстым паветры.

— Раней у нас казалі старыя, што вырай, куды ляцяць птушкі на зіму з усёй зямлі, знаходзіцца дзесьці далёка, за марамі ды за гарамі,— гаворыць ён пасля невялікай паўзы.— Толькі ніхто не ведае дзе. Яшчэ казалі даўней, быццам туды вядзе па небе ясная дарога з зорак, светлых і дробных, нібы мак. Так яна і называецца — Птушыны шлях. Па гэтай дарозе і ляцяць птушкі адусюль у вырай. От, каб даведацца, дзе мае бацянкі зімуюць.

— Зімою буслы жывуць у Афрыцы,— кажу я.

— Блізкі свет! — здзівіўся дзядзька Вінцук.— Адкуль жа гэта вядома? Ці хто за імі прасачыў?

— Пра гэта людзі даведаліся пры дапамозе кальцавання,— расказваю я.— Аднаго бусла, акальцаванага ў Белавежскай пушчы, знайшлі мёртвым у Афрыцы, у Паўднёвай Радэзіі. Адтуль паведамілі пра гэта ў Маскву і прыслалі кальцо, знятае з бусла.

На дзядзьку Вінцука гэта робіць моцнае ўражанне.

— Гэткае падарожжа! Дзе мой двор і дзе тая Афрыка! Праўда, бусел — птах вольны, куды хоча, туды і ляціць. Крылы ў яго дужыя, нялёгкі шлях трэба вытрымаць, і туды, і назад. Гэта ж не жарты!.. Але ж і людзі чаго толькі не выдумаюць.

Стары пастух задаволены і вынікамі кальцавання, якое прыдумалі людзі для вывучэння птушыных пералётаў, і самімі буслам

— Аж вунь куды ляцяць! — не можа ён супакоіцца.— Нездарма бацькі і дзяды нас вучылі, што вялікі грэх забіваць птушак, калі яны вяртаюцца з выраю. Супроць гэтага і навука, мусіць, не пярэчыць?

— Не, дзядзька Вінцук. Не пярэчыць. Наадварот, падтрымлівае.

У той жа дзень, вярнуўшыся з Варанцоў, я ўбачыў на лугавіне каля Нарачы пяць буслоў. Сонца схілялася на захад, афарбоўваючы возера залаціста-ружовым водбліскам вячэрняй зары.

Паважна і сур'ёзна, з глыбакадумным выглядам, хадзілі цыбатыя птахі па вільготнай траве. Яны нібыта вывучалі і вымервалі родную зямлю пад нагамі, перш чым яе пакінуць, нібыта рабілі нейкія складаныя, вядомыя толькі ім разлікі.

Гэта былі, відаць, буслы дзядзькі Вінцука. Яны рыхтаваліся да свайго вялікага і далёкага падарожжа.

## ДУМКІ ПЕРАД ВЯРТАННЕМ У ГОРАД

Надышоў час развітацца з Нараччу.

Я гляджу ў апошні раз на блакітны прастор возера, на сіняе неба з белымі воблачкамі, на чаек над вадой, на пясчаныя ўзгоркі з высокімі соснамі, на зялёны ядловец, на ліловыя верасы і думаю: як добра, што я сюды прыехаў.

Злева на беразе я ўбачыў раптам знаёмую высокую постаць. Да мяне набліжаўся шпаркім, бадзёрым крокам Міхал Роліч.

Стары быў апрануты ў святочны чорны касцюм. Твар у яго ясны, задаволены.

— Адкуль гэта вы? — спытаў я, прывітаўшыся.

— З Маладзечна,— весела адказаў рыбак.— Быў у горадзе. Пенсію персанальную мне прызначылі. Раней была звычайная, а цяпер, знаеш, персанальная...

Ён выняў з кішэні і паказаў мне новенькую, толькі што атрыманую пенсіённую кніжку.

Я павіншаваў знатнага рыбака.

— Вы свой адпачынак даўно заслужылі.

— Які там адпачынак! — усміхнуўся Роліч.— Я сядзець склаўшы рукі не магу. Усё роўна рыбацкую справу не пакіну. Толькі, зразумела, рабіць буду па сваёй сіле, не так, як калісьці.

— Куды ж вы ідзяце?

— Дахаты, у Наносы. З Маладзечна ехаў да рыбгаса на аўтобусе, а адтуль іду берагам на сваёй пары.

Ён паказаў на ногі ў новых ботах.

— А не цяжка ў іх? Гэта ж далёка ўсё-такі.

— Якое там далёка! Кіламетраў дванаццаць вакол затокі, ды і таго, мусіць, не будзе. Баркас пойдзе толькі заўтра, а я чакаць не хачу. Гадзіны праз дзве буду дома, якраз пад вечар.

Роліч развітаўся і тым жа роўным, бадзёрым крокам рушыў далей уздоўж пясчанага берага.

Я паглядзеў старому ўслед і сказаў сам сабе: «Хацеў бы і я гэтак хадзіць у восемдзесят чатыры гады!»

Думкі мае, перапыненыя сустрэчай з Ролічам, вярнуліся да ранейшага.

Так, вельмі добра, што я сюды прыехаў. Праўда, чаек тут не так многа, як казаў мой знаёмы ў Мінску і як я сам спачатку меркаваў. Затое мне давялося блізка пабачыць не толькі чаек, але і чапляў, і шмат якіх іншых птушак. І, самае галоўнае, я пазнаёміўся тут з цікавымі людзьмі — з нарачанскімі рыбакамі, з іх жыццём і працай, з маладымі практыкантамі на біялагічнай станцыі — будучымі вучонымі арнітолагамі, іхтыёлагамі, гідрабіёлагамі. На берагах Нарачы я набыў новых сяброў.

Хто ў юнацтве не марыў аб вялікіх падарожжах у далёкія і невядомыя краіны, аб бяскрайніх прасторах акіяна, аб незвычайных і небяспечных прыгодах у трапічных джунглях і спякотных пустынях, у дрымучых лясах і сярод снегавых вяршыняў недаступных гор?

Гэта — вельмі добрыя мары. Яны абуджаюць у сэрцы мужнасць і адвагу, высакародныя імкненні да ведаў, да пазнання свету, да барацьбы і подзвігаў.

Тройчы шчаслівы той, хто змог своечасова ажыццявіць гэтыя мары, ператварыць іх у рэальнасць, бо падарожжы, і малыя і вялікія, і па родным краі, і па іншых краінах, назіранні над прыродай, звярамі і птушкамі, збіранне вуснай народнай творчасці пашыраюць наш кругагляд, узбагачаюць новымі разнастайнымі ведамі, новымі незабыўнымі ўражаннямі. У падарожжах фарміруецца і мацнее характар. Падарожжы спрыяюць большаму і лепшаму разуменню жыцця народаў, іх культуры, побыту, нацыянальных асаблівасцей.

Але не кожны можа пераплываць акіян, вандраваць у Андах, наведваць Палінезію, вывучаць Антарктыду. Што рабіць таму, для каго, па тых ці іншых прычынах, далёкія падарожжы немагчымы?

У свой час і я не мог рабіць далёкія падарожжы па заморскіх краінах. Але я не вельмі аб гэтым шкадаваў. Я вандрую па той краіне, дзе жыву, вывучаю яе прыроду, назіраю за жыццём яе звяроў і птушак.

Я ведаю, што прырода маёй краіны зусім не такая звычайная, як гэта некаторым здаецца толькі таму, што яны тут выраслі, што яна ім знаёма з маленства. Часам яны проста вельмі мала яе ведаюць, не ведаюць нават добра тую мясцовасць, дзе самі нарадзіліся і жывуць дзесяткі гадоў.

Справа ў тым, як на прыроду глядзець, якімі вачыма.

Для жыхара берагоў Белага мора, ці Камчаткі, ці Сярэдняй Азіі, ці Паволжжа, ці нават Каўказа блакітныя празрыстыя азёры нашага паўночнага захаду і лясы ў вярхоўях Бярэзіны з іх бабрамі, выдрамі, ласямі і мядзведзямі, наша Палессе з яго паўнаводнымі, спакойнымі рэкамі і балотамі, багатымі на ўсялякіх птушак, Белавежская пушча з яе зубрамі, аленямі і рысямі, прыгожыя краявіды Гродзеншчыны з сінім Нёманам, магутнымі дубровамі і рамантычнымі руінамі замкаў на зялёных узгорках здаюцца такімі ж далёкімі, незвычайнымі і прывабнымі, якімі нам здаюцца бязмежныя прасторы

снежнай Арктыкі, высокія горы суровага Алтая і паэтычнага Каўказа, непраходныя нетры сібірскай тайгі, шырокія стэпы Казахстана і сонечны бераг Крыма з яго вінаграднікамі і цёплымі хвалямі Чорнага мора.

Рабіць нечаканыя адкрыцці, перажываць незвычайныя прыгоды, наглядаць цікавыя з'явы можна ўсюды. Трэба толькі вандраваць з адкрытым сэрцам і адкрытымі вачыма і ўмець бачыць.

Многія з нас вельмі рэдка выкарыстоўваюць свой вольны час для таго, каб быць бліжэй да прыроды, а яна так жыватворна ўплывае на чалавека! Прырода не толькі аднаўляе нашы сілы, але і ачышчае нас ад усяго лішняга, штучнага, непатрэбнага, што засталося ў спадчыну ад мінулага.

Пра ўсё гэта я думаў, калі стаяў у апошні раз на высокім беразе пад стромкімі соснамі. І мне захацелася хутчэй вярнуцца ў горад і напісаць аб тым, што бачыў я і што адчуваў на Нарачы.

Калі мне ўдасца перадаць чытачу свае ўражанні, даць яму хоць некаторае ўяўленне аб «Беларускім моры», я буду глыбока задаволены. Калі ў чытача абудзіцца любоў да роднай прыроды, зацікаўленасць да таго, што ён прачытае, калі яго ахопіць дух вандравання і ён захоча сам папільнаваць птушак у зарасніках чароту, прыслухацца да плёску азёрнай хвалі і да крыку чаек, я палічу гэта за найвышэйшую сваю ўзнагароду. Дзеля гэтага варта блукаць па дрыгве, мокнуць у лодцы пад дажджом і ветрам, бадзяцца ў лясным гушчары і начаваць каля вогнішча.

Мне хочацца сказаць усім, хто прачытае гэтую кнігу:

— Трэба часцей вандраваць па роднай краіне, трэба больш яе вывучаць! Мы яшчэ недастаткова ведаем прыроду і жывёльны свет айчыны, мы яшчэ мала любуемся цудоўнай красой яе краявідаў.

*1957—1958*

# *На сініх азёрах*

## ІНДЗЕЕЦ КУАНЕБ

Пра існаванне на свеце андатры я даведаўся ўпершыню з аповесці «Рольф у лясах» канадскага пісьменніка і мастака Эрнста Сетана-Томпсана. Я вельмі яго любіў за тонкае разуменне прыроды і любоў да жывёл.

Быў я тады хлапчук, але мне запомнілася надоўга цікавая кніга, у якой расказвалася пра паляванне старога індзейца на невядомага мне звярка з дзіўнай назвай — андатра.

Школьныя ўрокі на заўтра падрыхтаваны, за акном шуміць халодны лістападаўскі дождж, а на стале даўно раскрыта кніга пра адважнага і чыстага душою індзейца Куанеба, пра бяздомнага хлапчука Рольфа, якому ён даў прытулак, і пра іх жыццё ў лесе. Непрыкметна ляціць час, у скупым святле газавай лямпы паспешна гартаюцца старонка за старонкай, і сцены пакоя нібы рассоўваюцца, і перад вачамі ўзнікаюць чароўныя вобразы дзікай прыроды. Паўстае, як жывая, постаць старога паляўнічага, спрытнага і маўклівага, з цёмным, чырванаскурым тварам, са стрэльбаю ў мускулістых руках.

...Вось ён ідзе па беразе невялікага ляснога азярка і вострым, як у сокала, позіркам аглядае лёд, які яшчэ трымаецца па краях затокі. Каля самай вады ён бачыць на лёдзе нешта цёмнае.

Гэта — андатра.

Паўзком крадзецца паляўнічы ўздоўж берага. Апынуўшыся на адлегласці стрэлу ад звярка, ён бярэцца за зброю сваіх бацькоў — лук і стрэлы.

Да канца стралы індзеец прывязвае вяроўку. Потым скручвае вяроўку кальцом і нацягвае лук. Страла паляцела, пацягнула за сабою вяроўку і трапіла ў звярка.

Пачуўся ўсплёск вады — андатра нырнула пад лёд. Але другі канец вяроўкі быў у руках у паляўнічага. Індзеец выцягнуў андатру і забіў. Калі б ён стрэліў у яе са стрэльбы, звярок мог бы і не трапіць яму ў рукі.

Куанеб вярнуўся ў свой вігвам, зняў з андатры шкурку і павесіў сушыцца на дрэве, а мяса пакінуў сабе на абед...

Так палявалі на андатру ў лясах Канады ў даўно мінулыя часы. Лавілі яе і пры дапамозе пастак. У пасёлку індзеец Куанеб мяняў здабытыя андатравыя шкуркі на тытунь, чай і цукар.

Больш нічога не было сказана ў кніжцы пра андатру, але малюнак, апісаны Сетанам-Томпсанам, стаяў у мяне ўваччу, і невядомы звярок застаўся надоўга ў памяці.

У тыя далёкія гады маленства мне і ў галаву не прыходзіла, што я змагу калі-небудзь убачыць андатру: у Еўропе яна, як вядома, не жыве.

Непрыкметна праляцела чарада гадоў, за плячамі застаўся немалы жыццёвы шлях. І раптам мне давялося сустрэцца з андатрай. Для гэтага зусім не трэба было перабірацца цераз акіян. Каб назіраць за жыццём заморскага звярка ў прыродных умовах, варта толькі сесці ў звычайную аўтамашыну і паехаць у... Браслаўскі раён. Падарожжа, трэба прызнаць, не вельмі далёкае і не вельмі складанае.

Калі б мне хто-небудзь сказаў пра такую магчымасць у дні майго маленства, я ніколі б гэтаму не паверыў. Занадта вялікая была тады адлегласць паміж рэальным жыццём і кніжнай фантазіяй.

## КАРЫСНЫ ЗВЯРОК

Але што ж гэта за звярок — андатра? І якім чынам апынуўся ён на Беларусі? Ці варта ім цікавіцца? І чаму, каб яго ўбачыць, трэба ехаць у Браслаў?

На гэтыя пытанні, якія могуць узнікнуць у чытача, я пастараюся адказаць падрабязна.

Андатра належыць да грызуноў. Яна жыве і корміцца ў вадзе, у азёрах і балоцістых мясцовасцях. Часам яе называюць яшчэ і мускусным пацуком, але гэтая назва няправільная. З пацукамі андатра не мае нічога агульнага, апрача некаторага знешняга падабенства. Сваім жыццём, сваімі звычкамі яна вельмі нагадвае бабра. Яшчэ называюць яе часам балотным зайцам, ці балотным трусікам. І гэтыя назвы таксама няправільныя.

Радзіма андатры — Канада і Злучаныя Штаты Паўночнай Амерыкі. Не так даўно яна вялася толькі там і больш нідзе. Індзейцы палявалі на андатру задоўга да з'яўлення ў Амерыцы еўрапейцаў. У далейшым промыславае здабыванне андатравых шкурак набыло вельмі шырокі характар. Спецыялісты падлічылі, што па колькасці шкурак, здабытых на працягу года, андатра займае сярод усіх іншых пушных звяроў трэцяе месца ў свеце.

У пачатку XX стагоддзя ўзнікла зацікаўленасць да андатры як да промыславага звярка і ў еўрапейскіх краінах.

У пяцідзесятых гадах пачалося планавае засяленне андатраю вадаёмаў Беларусі. Умовы для яе тут вельмі спрыяльныя. Асабліва добра прыжыліся андатры ў азёрах Браслаўшчыны. Па волі чалавека жывёльны свет Беларусі ўзбагаціўся яшчэ адным новым дзікім пушным звярком, карысным для гаспадаркі.

Вось што такое андатра, вось чаму яна варта ўвагі і вось чаму я паехаў у Браслаў.

## ЗАМКАВАЯ ГАРА

Раніца была пахмурная і халаднаватая.

Я прачнуўся ў маленькім пакойчыку раённай гасцініцы і адразу пайшоў знаёміцца са старажытным, але новым для мяне горадам.

Браслаў раскінуўся на перашыйку між азёрамі. Адна з дзвюх яго асноўных вуліц — Савецкая — цягнецца па беразе возера Навяты. Другая, паралельная першай,— Ленінская,— уздоўж возера Дрывяты.

Паміж гэтымі вуліцамі высіцца пасярод перашыйка гара, на якой знаходзіўся калісьці замак. Ён быў пабудаваны ў часы панавання тут полацкага князя Брачыслава, між 1001 і 1054 гадамі. Па імені князя горад і называўся раней — Брачыслаўль, а потым — і да нашага часу — Браслаў.

Замак, як відаць, быў вялікі. Магчыма, на гары былі нават два замкі. Цяпер тут нічога няма, акрамя абеліскапомніка, пастаўленага на сродкі мясцовага насельніцтва ў памяць папулярнага на Браслаўшчыне ўрача Нарбута. Унізе захаваліся па схілах нязначныя рэшткі мураванай сцяны, якая апаясвала калісьці ўсю гару. Характэрная сярэдневяковая кладка з камення і цэглы нагадвае рэшткі замка Гедыміна ў Вільнюсе.

У стратэгічных адносінах месца для Браслаўскага замка было выбрана вельмі ўдала. Гара пануе над ваколіцамі. З вышыні замчышча далёка відаць усё наваколле. Подступы да Браслава ў тыя часы лёгка было абараняць. Натуральнай аховай служылі шырокія водныя прасторы.

Вада акружае горад амаль з усіх бакоў. Уражанне такое, быццам знаходзішся на востраве. З вяршыні гары відаць на даляглядзе цэлы ланцуг азёр, малых і вялікіх, даўгіх і круглых. Рэчка Друйка звязвае іх, як пацеркі, у адну агульную водную сістэму. Іх тут каля трохсот. Край сініх азёр — так называюць Браслаўшчыну.

Духам старажытных паданняў веяла ад гэтай мясцовасці. Я стаяў на высокай гары, глядзеў на замчышча, на бліскучыя люстры азёр, і думкі мае пераносіліся ў нейкі казачны свет. У памяці ўзніклі радкі летапісаў, паўсталі вобразы «Слова аб палку Ігаравым», эпізоды напаўміфічнага жыцця князя Усяслава Чарадзея.

Але на гэты раз мяне цікавілі не старадаўнія руіны і звязаныя з імі паданні, не рамантыка гісторыі. Мэта майго падарожжа — андатра. І я спусціўся па вузкай і крутой сцежцы ўніз, на гарадскую вуліцу.

## ПЕРАД ШКОЛАЙ

Мне сказалі, што ў Браславе андатру доўга шукаць не трэба. Звяркоў тут развялося так многа, што яны жывуць нават у самім горадзе.

— Іх можна бачыць на маленькім азярку перад школай,— так мне сказалі ў рэдакцыі раённай газеты.

Я ішоў і любаваўся маляўнічым гарадком. Вуліцы з плітачнымі тратуарамі, з прыгожымі домікамі ў густой зяляніне садоў віюцца між узгоркаў. У садах квітнеюць яблыні, ігрушы, вішні. Усюды пахне бэзам і язмінам. Усюды ліпы, клёны і сосны.

Сярэднюю школу № 1 я знайшоў даволі хутка. Знаходзіцца яна ў самым канцы пясчанай Чырвонаармейскай вуліцы, на ўзгорку пад маладымі соснамі.

Вакол драўлянага будынка школы квітнее сад. Сярод дрэў стаяць вуллі з пчоламі. На двары, пад соснамі,— сталы і лаўкі для заняткаў на свежым паветры.

Перад школай зіхаціць у нізінцы невялікае азярко. З усіх бакоў наступае на вадзяное люстра густая зялёная расліннасць. Пройдзе яшчэ некаторы час, і азярко ператворыцца ў балота.

Я падыходжу да вады.

Бераг азярка тарфяністы. У ярка-зялёнай сакавітай траве жаўцеюць адуванчыкі. Каля вады бялеюць ландышы. З супрацьлеглага боку азярко ледзь не да паловы зарасло рагозам. Дзе-нідзе высяцца сцяблы чароту.

Пасярод азярка я заўважыў некалькі хатак андатры. Яны ўзвышаюцца над вадою як маленькія астраўкі. Пакрытыя жоўтымі сухімі сцябламі рагозу, яны з выгляду вельмі падобныя на бабровыя хаткі, толькі значна меншыя памерам. Па хатках весела скачуць шпакі. Нізка над вадою лятаюць ластаўкі.

Каля самага азярка стаяць на пясчаным узгорку дамы. Агароды спускаюцца па схілах ледзь не да самай вады.

Каля кладкі плёскаюцца ў вадзе белыя качкі. Тут жа пасвіцца на беразе стрыножаны конь.

Такое блізкае суседства з чалавечым жыллём, з хатняй жывёлай і птушкай андатру, відаць, зусім не трывожыць. На азярку можна ўсюды заўважыць сляды яе дзейнасці. Пянькамі тырчаць сцяблы рагозу, як нажом зрэзаныя вострымі зубамі андатры крыху вышэй паверхні вады. Зараснікі рагозу няроўныя — у адным месцы яны густыя, а ў другім нібы выстрыжаны.

З дома, каля якога я стаю, выскачыў хлопчык гадоў трынаццаці. Ён падыходзіць і з цікаўнасцю глядзіць на мяне.

— Што гэта такое? — пытаюся я і паказваю, нібы нічога не ведаючы, на хаткі андатры.

Хлопчык ажывіўся.

— Андатравыя хаткі,— адказвае ён і, не чакаючы далейшых пытанняў, тлумачыць мне, што гэта за звярок і адкуль ён узяўся.

— А сам ты бачыў андатру?

Хлопчык смяецца, паціскае плячамі. Пытанне здаецца яму недарэчнае:

— Кожны дзень!.. Пад вечар яны заўсёды вылазяць з хатак і плаваюць. Тады іх можна бачыць.

— А людзей хіба не баяцца?

— Не. Іх тут ніхто не чапае, вось яны і не баяцца.

— А на агародах не шкодзяць?

— Што вы,— здзівіўся хлопчык.— Яны кормяцца толькі тым, што расце ў возеры. Калі якая і выйдзе на бераг, то ад вады далёка не адыходзіць. Па зямлі яны хутка рухацца не могуць. Не тое, што ў вадзе. Летась адна андатра выйшла на бераг, тады яшчэ лёд не ўсюды сышоў, дык яе наш сабака злавіў. Я кінуўся, хацеў адняць, толькі не паспеў. Сабака яе задушыў.

— Дзе ж ты яе падзеў?

— Мы з хлопцамі аднеслі мёртвую андатру ў школу, і настаўнік Мікалай Антонавіч зняў з яе шкурку. Яна і зараз захоўваецца.

— Ці даўно жывуць андатры на гэтым азярку?

— Трэці год,— адказаў хлопчык.— Як прывезлі іх аднекуль, каб выпусціць у возера Цно, то нейкі дзядзька ўзяў самца і самку ды пусціў іх сюды, перад нашаю школай, каб паглядзець, што з гэтага будзе, а яны тут і прыжыліся. Спачатку была ў іх на азярку адна хатка, а цяпер аж дзевяць. Адсюль не ўсе відаць, але я вам магу і з таго боку паказаць. Нават падлічыце, калі захочаце.

Хатак сапраўды дзевяць.

Хлопчык задаволены.

— Іх тут усюды многа, на ўсіх азёрах,— гаворыць ён, і шчырая радасць гучыць у яго словах,— але больш за ўсё на Друйцы, каля Заборных гумнаў.

— Заборныя гумны? — перапытаў я.— Што ж гэта такое і як туды трапіць?

— Так называецца ў нас ускраіна горада, у самым канцы Ленінскай вуліцы,— удакладніў мой субяседнік.

Ён паказаў мне напрамак і дадаў:

— Калі вы так цікавіцеся, то трэба вам пагаварыць з настаўнікам. Мікалай Антонавіч усё пра іх ведае.

— Дзе ж яго знайсці?

— Ён жыве ў канцы Савецкай вуліцы, у фінскім доміку, каля аптэкі.

Сёння нядзеля, школа закрыта, і знайсці Мікалая Антонавіча можна было толькі дома. Я хутка адшукаў яго па адрасу, які мне даў Уладзік.

Гэта быў жывы і гаваркі чалавек гадоў каля трыццаці пяці.

Скончыўшы Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію, ён вярнуўся ў свой родны горад і выкладае прыродазнаўства ў той самай сярэдняй школе, каля маленькага азярка, у якой вучыўся некалі і сам.

Мікалай Антонавіч вельмі любіць Браслаў і яго ваколіцы. Адразу і нават ахвотна згадзіўся ён паехаць са мною на рэчку Друйку і паказаць месцы, заселеныя андатрай.

Мы выйшлі з доміка, у якім ён жыве, і паехалі ў самы канец горада. Апошнія хаты ўскраіны засталіся ззаду.

— Вось гэта і ёсць Заборныя гумны,— сказаў Мікалай Антонавіч.— Мой вучань даў вам правільны арыенцір.

## РЭЧКА ДРУЙКА

Пераехаўшы па драўляным мосце цераз Друйку, мы пакінулі машыну на дарозе і пайшлі па балоцістай пойме.

Друйка, невялікая рэчка з павольнай плынню, злучае азёры вакол Браслава з Заходняй Дзвіной. Пойма ў Друйкі вельмі шырокая. Вясной, у час паводкі, яна ўся затапляецца вадою, зліваючыся ў адно цэлае з возерам Цно, якое пачынаецца адразу за мостам.

Мы ідзём паўз бераг рэчкі, яна густа зарасла рагозам, асакой і чаротам.

— У Друйцы шмат вугроў,— гаворыць мой спадарожнік.

Вакол пануе незвычайная цішыня. Падышоўшы да шырокага плёсу, за якім пачынаецца паварот рэчкі, мы спыніліся.

— Андатра асабліва любіць рагоз,— ціха сказаў Мікалай Антонавіч.— Тут для яе сапраўдны рай. Кармавыя ўгоддзі выключна багатыя, вады ўсюды многа, умовы для існавання і размнажэння вельмі спрыяльныя. Вясной тут можна бачыць андатру не толькі вечарам, але і днём. У гэты час адбываецца ў іх шлюбны перыяд і рассяленне, узнікаюць новыя сем'і, якія шукаюць сабе вольныя месцы для жылля. На працягу сакавіка і красавіка андатры праяўляюць вялікую актыўнасць і плаваюць усюды і днём, і ноччу. На сухіх берагах яны, як і бабры, жывуць у норах, а на балоцістых месцах будуюць сабе хаткі.

Настаўнік уважліва глядзіць на ваду.

Над соннаю рэчкай нізка навісла перадвячэрняе неба. Дзьме халаднаваты вецер, і ад яго павеваў светла-шэрая, нібы алавяная паверхня вады пакрываецца серабрыстаю рабізной.

Мікалай Антонавіч схапіў мяне за руку.

— Глядзіце!..

У вадзе, недалёка ад берага, хутка рухаецца нейкая цёмная кропка.

Андатра! Зусім як тая, што падстрэліў індзеец Куанеб. Толькі плыве яна не па канадскім возеры, а па беларускай рэчцы.

Плыве андатра вельмі шпарка. Цяпер яна зусім блізка ад нас. З вады тырчыць толькі круглая галава, сама яна пад вадою. За андатраю застаецца на паверхні вады доўгая светлая паласа.

Уздоўж супрацьлеглага берага плыве яшчэ адна андатра. Ад зараснікаў рагозу аддзялілася і выплыла на сярэдзіну рэчкі трэцяя.

Іх тут, відаць, сапраўды нямала!

Цяпер я ведаю, дзе знаходзіцца «андатравы рай» і ў далейшым змагу наведвацца сюды адзін. А пакуль, каб не траціць марна часу, варта было б сёння пазнаёміцца і з астатнімі азёрамі, што акружаюць горад.

Пра гэта я кажу Мікалаю Антонавічу і пытаюся, ці не хоча і ён паехаць разам? Настаўнік згаджаецца.

Мы выйшлі на дарогу і селі ў машыну.

— Паедзем на ўсход, а вернемся з захаду,— гаворыць ён.

## ПА ВАКОЛІЦАХ БРАСЛАВА

Кругавы аб’езд мы пачалі з возера Цно. За ім ляжыць возера Неспеж. Чым далей едзем, тым больш прыгожыя, паэтычныя, маляўнічыя робяцца краявіды.

Я ўключыў радыё.

Зайграла музыка, пачуліся словы знаёмай песні.

Край родной и любимый,
Край озер наших синих...

Мелодыя і змест песні адпавядалі нашаму настрою.

— Якраз дарэчы,— усміхнуўся настаўнік.— Вось яны, нашы сінія азёры!

Сапраўды, усюды сярод узгоркаў, лясоў і нізін зіхаціць азёрная гладзь.

...Дрывяты, Навяты, Воласа, Снуда, Струста, Окменіца, Святцо...

Азёры з дзіўнымі летапіснымі назвамі абкружылі Браслаў, нібы бліскучыя каралі. Нязвыклае гучанне іх імёнаў абуджае фантазію. Колькі дзесяткаў стагоддзяў, колькі незлічоных пакаленняў людзей яны перажылі!

Аднак вернемся да андатры.

— Да гэтага часу асноўным багаццем нашых азёраў была толькі рыба,— сказаў Мікалай Антонавіч, калі мы пад'ехалі да возера Неспеж.— А цяпер мы маем яшчэ і андатру. За апошнія гады звяркі рассяліліся амаль па ўсіх азёрах Браслаўшчыны.

— А як ставіцца да новага звярка насельніцтва?

— Прывыклі. Не звяртаюць увагі. Толькі рыбакі нездаволены андатрай.

— Чаму?

— Яна ім часам перашкаджае. Трапіць пад вадою ў сеткі, заблытаецца ў іх, прагрызе выхад і ўцячэ, а за ёю ўцякае і рыба. Вось рыбакі і лаюцца, клянуць андатру: «Запаскудзілі нашы азёры гэтым пацуком».

— А вы як думаеце?

— Думаю, што рыбакі глядзяць на гэта занадта вузка. Я ўпэўнены, што засяленне нашых азёр андатраю мае вялікае народнагаспадарчае значэнне. Яшчэ ў 1945 годзе абмяркоўвалася ў Мінску пытанне аб андатры.

— Праўда,— успомніў я.— Была гаворка, каб выпусціць андатру ў Князь-возера, на Палессі.

— Так,— пацвердзіў Мікалай Антонавіч.— Тады ворагі звярка перамаглі. Яны давялі, што нібыта рассяленне андатры скажацца адмоўна на развіцці рыбнай гаспадаркі. Сцвярджалі, быццам андатра не толькі грызе сеткі, але і знішчае рыбу. Гэта, зразумела, няпраўда. Але паколькі пытанне выклікала спрэчкі, яго пакінулі адкрытым. Вырашылі з акліматызацыяй андатры на Беларусі пачакаць. Але ў тым жа годзе ў Брэсцкай вобласці былі заўважаны андатры, якіх ніхто не прывозіў.

— Адкуль жа яны ўзяліся?

— А самі, без дазволу і ўзгаднення, не чакаючы пастановы, перабраліся на тэрыторыю Беларусі з суседняй Польшчы, куды трапілі з Чэхаславакіі. Тады, паколькі звяркі самі з'явіліся, пярэчанні адпалі. Пачалося планавае засяленне андатраю вадаёмаў рэспублікі. Больш трохсот звяркоў было выпушчана ў 1953 і 1954 гадах

у Князь-возера і столькі ж у 1955 годзе ў азёры Пастаўскага раёна. Нарэшце ў 1956 годзе прывезлі ў Браслаў і выпусцілі ў Цно чатырыста дзевяноста сем звяркоў. Цяпер кожнаму ясна, што гэта — звярок карысны, каштоўны, як кажуць, рэнтабельны. Да ўмоў жыцця ён непатрабавальны, размнажаецца вельмі хутка, дае прыгожае, трывалае і недарагое футра, а корміцца балотнымі раслінамі. Каму патрэбны вадзяны хвошч, асака, рагоз, гарлачыкі? Абсалютна нікому! Значыць, утрыманне і развядзенне андатры не патрабуе ні дзяржаўных сродкаў, ні чалавечай працы, а карысць прыносіць вялікую. Гэта — сапраўднае багацце.

Мікалай Антонавіч змоўк. Яго довады здаліся мне вельмі пераканальныя. Я хацеў яму сказаць пра гэта, але гаворка наша раптам спынілася. Пакуль настаўнік гаварыў, дарога падымалася на высокую гару, пакрытую лесам. Цяпер мы абагнулі выступ гары, і перад намі адкрыўся цудоўны пейзаж.

Унізе, пад гарою, раскінулася возера Воласа, з усіх бакоў аблямаванае лесам. Ці не ў гонар язычаскага бога Валоса, або Вялеса, было названа так у старадаўнія часы гэтае возера?

Яно сустрэла нас глыбокім і велічным спакоем. І мне здалося, быццам нейкая дзівосная «машына часу» перанесла нас на якую добрую тысячу гадоў назад. На берагах такіх спакойных азёр стаялі калісьці драўляныя ідалы і глядзелі ў чыстыя, празрыстыя воды.

Горы, вада, стройныя сосны на ўзвышшах, цёмныя елкі ў нізінах. На кожным кроку — новы цуд невыказнай прыгажосці. Мясцовасць — як казачны сон. Над усім пануе адвечная гармонія паміж небам, вадой і лесам.

Мы выйшлі з машыны і доўга стаялі над стромкім ярам.

— На гэтым возеры андатры няма і не будзе,— сказаў нарэшце настаўнік.

— Чаму?

— Яно не кормнае. Тут для андатры занадта прыгожа — вада чыстая, берагі сухія, пясчаныя. Андатра любіць такія азёры, як Цно,— неглыбокія, з багатай расліннасцю і балоцістымі берагамі, ці рэчкі з павольнай плынню і шырокаю поймай.

Вочы нашы не могуць адарвацца ад краявіду. Але як тут ні прыгожа, трэба ехаць далей.

За гарамі, пакрытымі лесам, адкрылася перад намі новая водная гладзь. Гэта — возера Снуда. І яно мае не менш велічны, эпічны выгляд.

Вада, лес і ўзгоркі. Цішыня.

Над пясчаным берагам ляцяць кнігаўкі. Я спыніў машыну і, па сваёй даўняй звычцы, пытаюся ў сустрэчнага пажылога дзядзькі:

— Як называюцца гэтыя птушкі?

Калгаснік зірнуў на мяне недаверлівым вокам і, хаваючы здзіўленне, адказаў:

— Піліпцы.

— А можа, гэта кнігаўкі?

— Не.

— Тады, можа, чыбісы ці пігаліцы?

— Ніколі не чуў. У нас іх называюць піліпцамі.

Ён паглядзеў на бераг і, паказаўшы рукой на чубатую птушку з белай грудкаю і цёмна-зеленаватымі крыламі, дадаў упэўнена, каб не было ніякіх сумненняў:

— Вунь яшчэ піліпец паляцеў.

На сенажаці, над якой праляцела кнігаўка, стаяў маўклівы бусел. Пакуль дзядзька прыкурваў у Мікалая Антонавіча, я спытаўся зноў:

— А гэта хто?

Дзядзька выпусціў з-пад светлых вусоў струменьчык дыму.

— Гэта бацян,— адказаў ён не адразу.

— Буслом яго ў вас не называюць?

— Не. Так у нас не гавораць. У нас гэта — бацян.

Настаўнік пацвердзіў сказанае калгаснікам. Дзядзька цяпер, відаць, цалкам пераканаўся, што з яго не жартуюць. Развітаўшыся з ім, мы паехалі далей.

Недалёка ад возера Снуда знаходзіцца вёска Краснагорка. Тут жывуць так званыя стараверы. Іх продкі перасяліліся ў гэтую мясцовасць з Расіі яшчэ ў XVII стагоддзі.

— Жыхароў Краснагоркі можна адразу пазнаць па гаворцы,— тлумачыць Мікалай Антонавіч.— Яны заўсёды кажуць «могет» замест «можа». Прайшло трыста гадоў з таго часу, як іх продкі перасяліліся сюды, але мова ў іх захавалася ў аснове сваёй руская. Праўда, у гэтай мове цяпер сустракаюцца беларусізмы.

Дарога тым часам пагоршылася. Машына скача сярод сасновага лесу з узгорка на ўзгорак. Колы грузнуць у пяску.

Мінулі адно лясное азярко, потым другое і выехалі на адкрытае роўнае месца.

Злева цягнецца возера Струста з двума астравамі. На адным з іх, даволі вялікім, размясцілася паселішча з трох хат.

— Дзеці адсюль кожны дзень прыплываюць у нашу школу на лодцы,— гаворыць мой спадарожнік.

З правага боку з'явілася возера Ельня. Потым, нібы на змену яму,— светлае і суровае возера Святцо. Як сядло, высіцца побач Святая гара — голая, бязлесая, самотная.

— Адкуль такія назвы? — спытаўся я.— Святая гара, Святцо!..

— На гары і на беразе стаялі, відаць, ідалы багоў,— адказаў настаўнік і словамі сваімі пацвердзіў мае думкі.— Тут адбываліся, напэўна, язычаскія святы. Нашы далёкія продкі вадзілі тут карагоды, спявалі, прыносілі ахвяры. Усё гэта даўно сцерлася з памяці людской, толькі назвы засталіся да нашага часу, як сведкі мінулага, як прыкметы для гісторыкаў і археолагаў.

За Святцом узнікае перад намі возера Бярэжжа.

— Гэта апошняе на нашым шляху,— сказаў Мікалай Антонавіч.

Зрабіўшы круг у шэсцьдзесят кіламетраў, мы вярнуліся ў Браслаў з супрацьлеглага боку.

## ВОЗЕРА ЦНО

На другі дзень, пад вечар, я паплыў на возера Цно.

Гэта шырокае, але не глыбокае, травяністае возера — найменш прыгожае з усіх, якія я тут бачыў.

Надвор'е ціхае, і вада, здавалася, заснула. Возера выглядала, нібы светлае люстэрка ў цёмнай аправе берагоў. Ледзь чутна перашэптвалася трысцё.

Байдарка бясшумна слізгала па ціхай вадзе, сярод даволі аднастайнага пейзажу. З правага боку высілася зялёная сцяна трысця і рагозу, злева рассцілалася адкрытая паверхня возера. У вільготным паветры адчуваўся гаркавы пах балотных раслін.

Наперадзе я ўбачыў хатку андатры.

Байдарка рассунула сваім вострым носам сцяблы трысця, падмінаючы іх бартамі, разагнала маленькіх рыбак, якія плавалі між раслін, і спынілася каля хаткі.

Цяпер я мог разгледзець жыллё андатры з усіх бакоў.

Хатка ўзвышалася над вадою метра на паўтара, а ў аснове сваёй мела ў дыяметры, мабыць, каля чатырох метраў. З выгляду гэта — невялікі стажок, складзены з тонкіх галінак лазы, карнявішчаў гарлачыкаў, сцяблоў трысця, чароту, асакі і рагозу.

У такой хатцы андатра жыве і зімою. Пад гэтым дахам яна хаваецца са сваім сямействам ад халодных вятроў, ад снегу, сцюжы і маразоў у цёплым гняздзе, якое знаходзіцца ў хатцы над узроўнем вады. З гнязда зроблены выхад у ваду. Зімою андатры плаваюць у вадзе

пад лёдам і здабываюць сабе корм з дна возера. Яны могуць грызці і зразаць сцяблы раслін пад вадою, не раскрываючы рота. Вусны ў андатры пад вадою сціснуты, бо вострыя пярэднія зубы-разцы настолькі высунуты наперад, што звярок дзейнічае імі і з закрытым ротам. Інакш андатра захлынулася б пад вадою. Есць андатра не ў самой хатцы, а на кармавой пляцоўцы непадалёку, летам — на беразе, зімою — на лёдзе.

## МАЛОДШЫ БРАТ БАБРА

Агледзеўшы хатку, я адплыў крыху далей і спыніўся зноў. Да берага адсюль зусім блізка. Байдарка стаіць нерухома пасярод круглых і цвёрдых лістоў гарлачыкаў.

Правую лопасць вясла я палажыў на чорную карчагу, якая высоўваецца з вады.

Сяджу і цярпліва прыслухоўваюся да цішыні, што пануе над возерам.

Вечар, як і ўчора, халаднаваты, але спакойны. Пакуль усё яшчэ светла, толькі неба пачынае трохі цямнець.

Раптам недалёка ад байдаркі пачуўся ўсплёск. З зараснікаў рагозу вынырнула на паверхню андатра. З вады відаць не толькі галава, але і верхняя частка спіны звярка. Вось ён падплыў зусім блізка, быццам сам захацеў паглядзець на чалавека, які цікавіцца андатрамі.

Я не варушуся.

Андатра агледзела байдарку і паплыла вакол яе, трымаючыся на адлегласці не больш як адзін метр ад бартоў.

Вось яна плыве пад вяслом, між байдаркай і карчагай, нібы пад мостам.

Мне добра відаць, як спрытна яна рухаецца, прыціснуўшы кароткія пярэднія лапкі да грудзей і вяслуючы толькі вялікімі заднімі лапамі з перапонкамі паміж

пальцаў. Здаецца, нібы вакол байдаркі плавае маленькі бабёр.

Нездарма індзейцы называюць андатру «малодшым братам бабра». Яна нагадвае бабра не толькі сваімі рухамі ў вадзе і на зямлі, але і пабудовай хатак, і звычкамі, і ўсім сваім жыццём. Толькі будаваць грэблі і рэгуляваць узровень вады ў вадаёмах, як гэта робяць бабры, андатра не ўмее.

Адрозніваецца яна ад бабра і формай свайго хваста. У бабра хвост шырокі, тоўсты і плюскаты, пакрыты дробнай луской, а ў андатры — вузкі, сціснуты з бакоў. Ён пастаўлены да паверхні вады рабром, і андатра карыстаецца хвастом і як вяслом, і як рулём.

Пад вадою і на вадзе андатра плавае заўсёды толькі ўверх спінаю. Гэта — не выдра, якая можа плаваць як хоча — і бокам, і спінаю ўніз, куляючыся цераз галаву і робячы пад вадою самыя нечаканыя віртуозныя павароты. Выдры гэта неабходна, бо яна ганяецца пад вадою за рыбай і мусіць быць спрытнейшая за сваю здабычу. Андатра корміцца раслінамі, жыццёвая практыка не вымагае ад яе такіх прыёмаў падводнага плавання, якія выпрацаваліся і развіліся ў выдры.

## СМЕЛЫ ЗВЯРОК

Я цярпліва чакаў.

Зрабіўшы вакол байдаркі круг, а потым і другі, андатра нырнула і апынулася пад вадою каля карчагі.

З вады высунуўся нос, потым паказалася круглая мокрая галава. Маленькія лапкі-ручкі трымаюцца за слізкі, аброслы зялёнай цінай край карчагі.

Праз хвіліну, пераканаўшыся, што ёй нішто не пагражае, андатра вылезла з вады і апынулася на вясле. З невялікага, прыплюснутага з бакоў хваста сцякае вада.

Андатра села на лопасць вясла, як на зручную пляцоўку, не вельмі шырокую, але роўную і гладкую. Вочкі звярка, круглыя і бліскучыя, дапытліва паглядаюць на мяне з-пад мокрай карычневай поўсці.

Я сяджу па-ранейшаму нерухома.

Андатра ўзнялася слупком, склаўшы пярэднія лапкі і прыціснуўшы іх да грудзей. Галава ў яе выцягнулася наперад. Носік увесь час безупынна варушыцца, а доўгія вусы тапырацца. Велічынёю звярок быў з маладую кошку.

Мне ўспомнілася, што расказваў пра андатру Мікалай Антонавіч.

— Андатра,— казаў настаўнік,— зусім не палахлівая. Пры малейшай пагрозе яна смела кідаецца, не чакаючы нападу, і на чалавека, і на сабаку, хоць і гіне пры гэтым заўсёды.

У тым, што андатра мала баіцца чалавека, я цяпер і сам мог пераканацца. Праяўляць да андатры варожыя намеры ў мяне не было ніякай патрэбы.

Я не крануўся з месца, і гэта супакоіла звярка. Ён перастаў звяртаць на мяне ўвагу і заняўся сваім туалетам. Седзячы на задніх лапках, ён пярэднімі, як рукамі, прыгладжваў мокрую поўсць на схіленай галаве, на шчоках, на патыліцы і на шыі, ачышчаў грудзі і брушка ад наліплых ціны, раскі і водарасцей.

Нюх у андатры слабы і зрок таксама не з лепшых. Я для яе больш не існаваў, хоць і знаходзіўся вельмі блізка. Цяпер я для андатры, мабыць, проста нейкая нерухомая рэч, частка байдаркі і ўсяго навакольнага свету. Але слых у звярка неблагі. Час ад часу ён спыняе свае занняткі, прыўзнімае галаву і ўважліва прыслухоўваецца да ўсяго, што робіцца навокал, потым зноў бярэцца за свае ўборы.

Андатра ўмывалася амаль як чалавек. Пры гэтым яна моршчылася і пазяхала. Пярэднія лапкі ў яе нагадвалі маленькія чалавечыя рукі, толькі пальцаў на іх

было не пяць, а чатыры. Вось яна чухае і скрабе праваю пярэдняй лапкай левае плячо, а потым абедзвюма лапкамі чысціць вушы, перабірае поўсць на жываце.

Наглядаючы за туалетам андатры, я зноў міжвольна ўспомніў бабра. І ён чысціцца і мыецца гэтаксама, калі вылазіць з вады на бераг.

Цікава было назіраць смешныя выхадкі і забаўныя паводзіны звярка, але мне надакучыла сядзець нерухома. Я ўжо збіраўся пацягнуць вясло да сябе, каб паглядзець, як будзе рэагаваць на гэта андатра, але яна сама спыніла свае заняткі і слізганула ў ваду.

У вячэрнім паветры пачуўся ціхі ўсплёск, па вадзе разышліся кругі. Андатра вынырнула і шпарка паплыла да зараснікаў трысця.

## ЖЫЦЦЁВЫЯ КЛОПАТЫ

Неба пачало цямнець. На супрацьлеглым баку возера ўсё яшчэ ружавела вячэрняя зара.

Мне ўжо цяжка было бачыць з адлегласці, што робіць андатра ў трысці, але пакідаць занятую пазіцыю і парушаць цішыню азёрнай гладзі я не хацеў.

Праз некалькі хвілін андатра вярнулася. Яна плыла недалёка ад байдаркі, трымаючы ў зубах кавалак трысцінкі. Сваімі вострымі зубамі яна зрэзала сцябло расліны і спяшалася з ім на кармавую пляцоўку.

Падплыўшы да берага, андатра выйшла на невялікі выступ, села на заднія лапы і, трымаючы сцябло пярэднімі, спрытна абгрызла яго з усіх бакоў. Неўзабаве яна пакончыла з гэтай закускай, слізганула ў цёмную ваду і паплыла па новы корм.

Пакуль я наглядаў за вячэрай ці, хутчэй, снеданнем андатры, на спакойнай паверхні возера з'явілася яшчэ некалькі звяркоў.

Усюды чуліся ўсплёскі і шорганне. Сонная і ціхая дагэтуль вада нібы ажыла. Андатры пакінулі свае хаткі, у якіх адпачывалі на працягу дня. Адна за адной з'яўляліся яны ў вадзе сярод трысця і пачыналі сваю начную дзейнасць. Цяпер яны плавалі па ўсіх напрамках, занятыя заўсёднымі жыццёвымі клопатамі, ганяліся адна за адной, гуляючы ў вадзе, і шукалі сабе корм.

Некаторыя з іх вярталіся ў хаткі з пучкамі водарасцей у зубах, з галінамі лазы і сцябламі трысця. Яны рамантавалі і ўдасканальвалі жыллё. Да бліжэйшай хаткі падплыла андатра з даўгім сцяблом рагозу. Крыху затрымаўшыся, звярок узлез на хатку і палажыў сцябло наверсе, пакорпаўся там яшчэ пару хвілін, выгнуўшы спіну, асцярожна спусціўся і знік у вадзе.

Сярод дарослых звяркоў, якія плавалі па ўсіх напрамках, я заўважыў і малых. Яны трымаліся на паверхні вады, як круглыя пушыстыя паплаўкі, куляючыся з боку на бок, і веславалі даволі бездапаможна то адной, то другой лапамі.

Старыя андатры плавалі каля іх, нібы ахоўваючы сваіх дзяцей, але ў сапраўднасці малыя былі пакінуты на волю лёсу. У выпадку сур'ёзнай небяспекі дарослыя нічым не маглі ім дапамагчы. Андатры не маюць моцных сродкаў абароны ад ворагаў у вадзе, на зямлі і ў паветры. У гэтым я неўзабаве пераканаўся ўвачавідкі.

Вада каля малых пакрылася раптам рабізною. Адно з андатранят неяк дзіўна закруцілася і знікла пад вадою. На гэтым месцы ўзнік невялікі вір, па вадзе і разышлося некалькі кругоў. Гэта вострыя зубы разбойніка-шчупака схапілі малога і пацягнулі ў ваду. Яно нават і не піснула. Над вадою мільгануў хвост шчупака, і на гэтым усё скончылася. Андатраня з вады не вярнулася. Астатнія не звярнулі на страту ніякай увагі, быццам нічога і не здарылася. Яны па-ранейшаму былі заняты сваімі справамі. Усюды па вадзе плавалі вузкія лісты асакі, абгрызеныя карнявішчы гарлачыкаў, кавалкі сцяблоў рагозу.

Над сцяною трысця бясшумна з'явіўся балотны лунь. Усе андатры нібы па камандзе зніклі пад вадой, пахаваліся ў трысці. Лунь паляцеў далей, і на паверхні вады зноў, нібы па нейкім таямнічым сігнале, з'явіліся круглыя мокрыя галовы і цёмныя спіны звяркоў.

Ворагаў у андатры шмат, але асабліва церпіць яна ад балотнага луня. Хапаюць андатру з паветра і арлан-белахвост, і коршак, і канюк. У вадзе андатру можа праглынуць тлусты, непаваротлівы сом. Але тут, у Цно, сом для андатры не страшны, тут вялікіх самоў наогул няма. Вусаты сом ляжыць звычайна, як калода, у глыбокай яме на дне, а Цно — возера мелкае. На беразе звярку трэба асцерагацца лісіцы і тхара. Спрытная і злосная норка небяспечна для андатры і на зямлі, і ў вадзе.

Амаль ніколі не дажывае андатра да старасці. Асноўны ратунак гэтага звярка ад поўнага знішчэння, як і ва ўсіх іншых грызуноў, пладавітасць. Андатра размнажаецца вельмі хутка. Некалькі пакаленняў гэтых заморскіх звяркоў нарадзілася і вырасла тут, на Браслаўшчыне. Яны адчуваюць сябе не горш, як іх продкі ў лясных азёрах далёкай Канады.

Непрыкметна насунуўся змрок і запанаваў над возерам. Цяпер цяжка было наглядаць за андатрамі нават і з блізкай адлегласці.

Я павярнуў байдарку і паплыў туды, дзе з водамі Цно зліваецца Друйка. Наперадзе цямнела Замкавая гара.

З возера дзьмуў ветрык, і я доўга яшчэ чуў з усіх бакоў плёскат, шоргат і тузаніну звяркоў у трысці.

*1959*

## ЗМЕСТ


Падарожжа ў нязнанае. *Якаў Герцовіч* . . . . . . . . . . . . . . . 3

ПАДАРОЖЖА ПА КРАІНЕ БЕЛАРУСАЎ

*ПАЛЁТ СКРОЗЬ СТАГОДДЗІ*

Паветраныя лайнеры і... кілім-самалёт . . . . . . . . . . . . . . . 9
Круг над старажытнымі лясамі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 12
Круг над знаёмымі рэкамі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 24
Прызямленне першае . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28
Адхіленне ад курсу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 41
Круг над Нясвіжам і прызямленне другое . . . . . . . . . . . . 46
Прызямленне трэцяе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53
Тры кругі над Мінскам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 57
Бывай, кілім-самалёт!.. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 68

*НА ПРАСТОРАХ БЕЛАРУСІ*

Белавежская пушча . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
Край лясоў, балот і казак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 73
Блакітная карона паазер'я . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 77
Азёрны край . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 79
Хто на рыбалку, а хто па грыбы . . . . . . . . . . . . . . . . . . 82
Расказ старога рыбака . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 87
Перад развітаннем . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 89

## У ЛЯСАХ НАД БЯРОЗАЙ

Паездка ў запаведнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 91
Размова з дырэктарам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 94
Бабраня на двары . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97
Арлан-белахвост . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 99
Па дарозе ў Нешкава . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 102
Бабровая хатка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 103
Рачныя будаўнікі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 108
Бабры ў Бярэзіне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 110
Урочышча Залазы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 115
Перад ад'ездам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 116
Знаёмым шляхам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 117
Аднаўленне фермы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 119
Сергучоўскі канал . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 125
Егерава жонка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 128
Рэчка Сергуч . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 130
Добрыя суседзі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 132
Беларуская тайга . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 134
Чорны бусел . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 135
Спатканне з мядзведзем . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 137
На бузянцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 140
Урочышча «Вокны» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 142
«Лейзарава піпка» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 143
Домжарыцкае возера . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 144
Бабры за работай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 149
Ласіныя ямы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 153
Лясная трагедыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 157
Ваўкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 163
Развітанне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 167

## ЧАЙКІ НАД НАРАЧЧУ

Хутчэй на Нарач! . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 172
Залаты бераг . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 173
Беларускае мора . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 174
На пляжы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 176
На біялагічнай станцыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 178
Варанкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 180
Чайкі над Нараччу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 181

Лунь . . . 182
Каршун і шчупак . . . 186
У рыбгасе . . . 190
Рыбацкі стан . . . 191
Вярнуліся з лову . . . 194
На баркасе . . . 196
Вёска Наносы . . . 197
У знатнага рыбака . . . 198
«Грачуны» ці «кагаркі» . . . 200
Шкодная ці карысная чайка? . . . 201
Зімні лоў . . . 204
Дзіўная рыба . . . 207
Здарэнне на востраве . . . 210
Па дарозе на фэст . . . 211
Свята песні . . . 214
Навальніца . . . 216
На касе . . . 218
Старыя акопы . . . 223
Сіняя птушка . . . 225
Гняздо сіваграка . . . 229
Пустальга . . . 231
Лёс сакалянят . . . 237
«Дзікае месца» . . . 240
На гняздоўі чапляў . . . 244
Рыжая госцейка . . . 251
Канюкі і ляляк . . . 252
Сарока . . . 255
Саракуш . . . 257
Чорны дзяцел . . . 260
На палянцы . . . 264
Каровы і заяц . . . 268
Гадзюка, жаба і вожык . . . 270
Над абрывам . . . 273
Ліса і гусак . . . 276
Сустрэча з лісой . . . 278
Стары пастух . . . 281
Дзядзька Вінцук і яго буслы . . . 284
Бусляняты вучацца лятаць . . . 287
Паляцелі! . . . 289
Думкі перад вяртаннем у горад . . . 291

## НА СІНІХ АЗЁРАХ

Індзеец куанеб . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 295
Карысны звярок . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 297
Замкавая гара . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 298
Перад школай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 299
Рэчка Друйка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 302
Па ваколіцах Браслава . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 304
Возера Цно . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 309
Малодшы брат бабра . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 310
Смелы звярок . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 311
Жыццёвыя клопаты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 313

**Вольскі, В. Ф.**

В71 Падарожжа па краіне беларусаў : нарысы / Віталь Вольскі. — Мінск : Маст. літ., 2006. — 319 с.

ISBN 985-02-0835-X.

З мастацкай дасканаласцю, замілавана і шчыра расказвае пісьменнік пра родную краіну, яе прыроду, людзей, уваскрашае яе даўнюю і нядаўнюю гісторыю.

**УДК 821.161.3**
**ББК 84(4Беи)**

Літаратурна-мастацкае выданне

**ВОЛЬСКІ** Віталь Фрыдрыхавіч

ПАДАРОЖЖА ПА КРАІНЕ БЕЛАРУСАЎ

*Нарысы*

(Скарочана)

Рэдактар *М. А. Яршова*
Мастак *А. В. Яўмененка*
Мастацкі рэдактар *М. Я. Шкурпіт*
Тэхнічны рэдактар *Л. І. Астрэйка*
Стылістычныя рэдактары *М. А. Паддубская, А. М. Анцытовіч*

Падпісана да друку 25.05.06. Фармат 84 × 108 $^1/_{32}$. Папера афсетная.
Гарнітура Тып Таймс. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 16,80.
Улік.-выд. арк. 14,63. Тыраж 2300 экз. Заказ 1608.

Выдавецкае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Мастацкая літаратура» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
ЛИ № 02330/0056778 ад 17.02.2004.
220600, Мінск, праспект Пераможцаў, 11.

Адкрытае акцыянернае таварыства
«Паліграфічны камбінат імя Я. Коласа».
220600, Мінск, вул. Чырвоная, 23.

Раніца была да гэтага часу пахмурная, а цяпер з'явілася раптам сонца і асвятліла сваімі лагоднымі праменнямі і зялёныя схілы ўзгорка, і забалочаную нізіну з кустамі вольхі, і празрыстую ваду. Усё навокал ажывілася, зазіхацела, набыло новыя яркія і свежыя фарбы.

Мне захацелася пабыць тут, паглядзець з узвышша на гэты знаёмы і блізкі сэрцу пейзаж, які заканчваўся на даляглядзе сіняй палоскай возера.



ISBN 985-02-0835-X

9 789850 208354 >

Віталь Вольскі • Падарожжа па краіне беларусаў